Франц Сіўко

# Удог

www.kamunikat.org

2001

# ТРОЕ

## I

І тут, у гэтым пляскатым, падобным на блін стозе, на які ўзбіліся выпадкова надвячоркам, не было спакою. Сякач доўга не мог заснуць, усё тоўк Юрку нагамі ў спіну, то мармытаў нешта няскладнае, то падхопліваўся як апараны з месца, сціснуўшы ў руцэ тронак страпарэза, тупа азіраўся наўкола. Ад аднаго ягонага цяжкога, звераватага позірку ў Юркі міжволі замірала сэрца. Лежачы на спіне, ён рабіў выгляд, што спіць, а сам тым часам пільна сачыў з-пад рукі за кожным рухам хаўрусніка.

Нарэшце той, сцягнуўшы боты, нібыта супакоіўся: уладкаваўся побач валетам, захроп. Смурод ад ягоных ног так моцна шыбануў Юрку ў нос, што яго ледзь не званітавала. Ён памкнуўся павярнуцца да Секача спінаю, але беспаспяхова: той адразу напружыўся, пачаў шнарыць рукою па лежбішчы.

Змірыўшыся з лёсам, Юрка ўхутаўся з галавою ў каўнер курткі, прымусіў сябе змежыць павекі.

Калі ён прачнуўся, Секача побач не было. Не было і плашча. Толькі ўмяціна ў саломе ды востры, да рвоты прытарны пах брудных ног напаміналі аб ім у гэтай пустэльні.

Юрка паляжаў яшчэ колькі часу, затым падняўся, пазяхаючы, накіраваўся да краю сцірты.

Ад месца, дзе з'ехаў уніз Сякач, вяла да хмызу вузкая, пракладзеная нагамі паўз атаву няроўная паласа. Ля кустоў яна рэзка зварочвала ўправа і неўзабаве гублялася за пагоркам.

Ён спусціўся са стога, стараючыся трапляць нагамі ў Секачовы сляды, падаўся полем да кустоўя. Падарожжа аказалася не з прыемных: раса праціўна студзіла ногі, штаніны хутка набрынялі вільгаццю, зрэзаная напярэдадні саломаю скура пад імі зачырванела, пачала свярбець.

Сякач, убрыўшы па калені ў ваду, мыўся. Зачуўшы ззаду шоргат, ён імгненна выпрастаўся, выхапіў з кішэні штаноў страпарэз.

– А, ты, прыдурак! – сказаў, убачыўшы Юрку. Схаваў нож назад у кішэню, павольна зачэрпваючы жменямі ваду, узяўся абліваць белыя, сколатыя іголкамі грудзі. – Жэрці хочацца... Пашукаў бы чаго.

– Збоч хмызу бульбянае поле, – сказаў Юрка. – Можна набраць бульбы і спячы на агні.

– Дык спячы! – Сякач наблізіўся да берага, пачаў церці па чарзе трыснягом брудныя свае, парослыя валасіннем ногі. І чым больш цёр, тым больш зласлівым рабіўся, наліваўся чырванню ягоны твар. – Халера, такі сверб між пальцаў. Зар-раза!

Юрка шмыгнуў у кусты, подбегам кінуўся па следу назад, да сцірты. Там знайшоў у кішэні мяшэчак і запалкі, зноў саслізнуў уніз, падаўся на поле.

Бульба яшчэ дзе-нідзе цвіла, але шмат ужо было і сухіх, зрудзелых кустоў. Падчапіў адзін такі палкаю – тры буйныя клубні выкаціліся на паверхню баразны, заззялі ў промнях празрыстаю, у цёмныя вочкі, скураю. Капнуў другі, трэці – тое ж самае. Набраўшы паўмяшэчка, старанна зараўняў баразну, пашыбаваў да сцірты.

Сякач ужо ляжаў наверсе, фыркаючы ад задавальнення, глымзаў нейкую скарынку. З-пад цеснай майкі, якую ён паспеў на сябе ўспянцёрыць, выглядваў кавалак татуіроўкі: жаночыя ногі з доўгімі, загнутымі ўнутр птушынымі кіпцюрамі.

– Накапаў?

– У-гу.

– Што далей?

– Трэба раскласці вогнішча.

– Дык раскладзі!

– Запалак не маю.

– На. Ды глядзі, ашчадна – апошнія. Нож ёсць?

– Не.

– Ух, нядбаліца... Ладна, на страпарэз, – Сякач зласліва шыкнуў, перавярнуўся на жывот.– Будзе гатова – паклічаш.

– Свіння ты праціўная! – Жанчына пэцнула карову па шыі, зноў апусцілася на зэдаль.

Тонкі белы струменьчык, пенячыся, бадзёра забіўся аб дно даёнкі. Карова скасавурылася, памахваючы хвастом, выцягнула шыю, пачала са смакам абскубваць лебяду, што сям-там вытыркалася па-над плотам.

– Вось толькі б гойсала, ды жэрла, ды дратавала лехі, – працягвала жанчына. – Ну, няпраўда, дам жа табе рады. Запру ў хляве, тады паскачаш, нягодніца!

Карова, звычная, відаць, да такіх пагроз, абыякава зірнула на гаспадыню, тыцнулася мордай у хустку.

Юрка счакаў, пакуль старая ўправіцца з даеннем, вылез з хмызу, няўпэўненаю хадою накіраваўся да хлява.

– Дзень добры, цётка, – сказаў, кідаючы пагляд на схоў, дзе застаўся Сякач. – Як маецеся?

Жанчына хвіліну-другую стаяла нібы скамянелая, моўчкі глядзела на нязванага госця.

– Добра жыву, дзякаваць Богу, – сказала нарэшце, падхопліваючы даёнку з малаком. – Сам хто будзеш?

– Ды вось, еду ў Полацк па справах. А тут, як на злосць, матацыкл сапсаваўся, кукую на дарозе. Есці захацелася – не вытрываць, можа, дасі якога харчу?

Яна згодна матлянула галавой, хуценька падалася праз панадворак да хаты.

– Скварчыну дам, хлеба, малака во... Здалёк едзеш?

– Здалёк.

– Ну дык пачакай, зараз прынясу. Дала б чаго гарачага, ды не паліла сёння. Адной ці шмат трэба? Таго лізнеш, сяго – і сыты. І дроў мала, ашчаджаю.

Дзвярэй у сені яна не зачыніла, і Юрка выразна чуў, як яна размаўляла сама з сабою, бразгаючы посудам:

– Дам, а як жа... Дарога – гэта не жартачкі, у дарозе ўсяляк здараецца... Сёння ты чалавеку, заўтра – чалавек табе. А як жа, трэба дапамагаць адзін аднаму. – Яна выйшла на ганак, падала Юрку ладны скрутак. – Во, малака ж яшчэ. – Зноў знікла ў праёме, зноў вярнулася, на гэты раз са слоікам. – Во, сам сабе налі. Лі, лі, не саромейся. Хочаш, тутака папі, хочаш – з сабою бяры. Слоікаў у мяне шмат, не збяднею. Лі паўней. Ну, от – парадак.

Яна прысела на хвіліну на зэдаль, і цяпер нарэшце Юрка мог разгледзець яе ўсю. Гэта была кабета гадоў шасцідзесяці пяці, камлюкаватая, з тоўстымі агрубелымі рукамі, даволі мажная. Адно вока ў яе было крыху вузейшае за другое, а над брывом чарнела даволі вялікая барадаўка, але гэта неяк зусім не псавала твару – можа, з-за дабрыні, якою яна, здавалася, была наскрозь праніцана. Апранута жанчына была вельмі проста: ватоўка, чорная,

вышмальцаваная дзе-нідзе спадніца, на нагах – гумавыя шырокія адразанікі.

Яна таксама разглядала Юрку, але не адкрыта, а ўпотайкі – збоку, з-пад рукі, нібы незнарок. Затым падхапілася, пасміхаючыся сама сабе, пачала перацэджваць малако з даёнкі ў бітон. Зрабіўшы гэта, ускінула зверху на бітон накрыўку, панесла пад вішняк, дзе стаяў напоўнены вадою цабэрак.

– Навошта вы гэта робіце? – здзівіўся Юрка. – Малако ў ваду стаўляеце!

– Адразачку бачна, што не дзеравенскі, – засмяялася яна. – Гэта – каб адстаялася. Адстаіцца ў халодным – смятана будзе. Канечне, лепш бы ў пограбе, ды ў мяне няма. Каторы год ужо сынка свайго недарэку прашу – выкапай... дзе там! І ў той бок не глядзіць. Студня тэж няблага, ды зноў жа – трэба капаць, а хто будзе? Але нічога, мая Лысуха тлустая, і таго, што ў цэбры выстойваецца, мне адной хапае.

– А сын?

– Ён асобна жыве, у Шмулёўцы. У яго свая гаспадарка. Кароў ажно дзвюх трымаюць, – яна ўздыхнула. – Вось як яно бывае: усё, здаецца, ёсць – а жыцця няма.

– Чаму так?

– Ат! – яна махнула рукой, адышлася ад цэбра.

– Дык я пайду, цётка, – заспяшаўся Юрка.– Дзякую за пачастунак.

– А на здароўе. І табе дзякуй.

– Мне за што?

– А за тое, што пагаманіў са старой, хоць жывога чалавека ўбачыла.

Секача ў схове не было. Але не паспеў Юрка і з дзесятак крокаў ступіць ад умоўленага месца, як дзве чэпкія, дужыя рукі абцугамі абхапілі яго ззаду за шыю, прыгнулі долу.

– Ну, надыбаў?

– Ага.

– Што сказаў? Нябось, расплявузгаў...

– Не.

– Глядзі мне! – Сякач пагрозліва шыкнуў. – Калі што – галаву адарву. – Ён выхапіў з Юркавых рук слоік, пачаў павольна, смакуючы кожны глыток, піць. Час ад часу ён адрываўся ад пасудзіны, і кроплі, што заставаліся на вуснах і падбародку, тонenькімі паскамі сцякалі

назад, у слоік. І толькі калі на дне засталося зусім крыху, спахапіўся, падаў слоік Юрку.

– Пі.

– Я ўжо папіў... там, – зманіў Юрка.

– Не хочаш – не трэба. – Ён дапіў малако, шпурнуў пусты слоік у куст, дробна, па-бабску хіхікнуў. – А ты зух, малы! Бач, як падлабуніўся да цёці: напаіла, яшчэ і з сабою дала. Мабыць, дагадзіў! Ну, кажы, як на споведзі, памацаў крыху? Маўчыш? Значыць, было! Было-было! О, а тут што? Ого, сала! Ну, зух! – Ён падняў разгорнуты скрутак на далонях угору, прытанцоўваючы, весела пакіраваў напрасткі праз хмызняк да стога.

Сала аказалася ледзь-ледзь гарклявае, з ялчынаю, але на гэта не зважалі: елі хутка, са смакам, прыкусваючы хлебам і рэшткамі бульбы. Сякач, нейкі вачавідкі палагаднелы, усё пасоўваў да Юркі лепшыя кавалкі, прыгаворваў:

– Еш, ты малады, табе патрабуецца.

Гэткая рэзкая змена ў настроі хаўрусніка і дзівіла Юрку, і бянтэжыла. Што гэта ён? То зверам кідаўся, а то раптам на ягня перарабіўся...

Сякач тым часам адваліўся ад стала, улёгся ніцма на плашч.

– Мо паспім гадзіну якую? – сказаў ціха, як не сваім голасам. – Га?

Юрка прыпарушыў саломаю недаедзеныя кавалкі хлеба, зняў куртку, лёг побач.

– Колькі гадоў табе? – Халодная кіпцюрыстая далонь легла яму на лоб, паволі з'ехала да шчакі.

– Шаснаццаць.

– А выглядаеш маладзей. Відаць, не надта шчыравалі вас карміць у інтэрнаце?

– Усяляк здаралася. – Юрка таксама перавярнуўся на жывот.

Рука апусцілася на плячо.

– За што цябе?

– За крадзеж.

– Шчасце тваё, што са мною спаткаўся. Адзін бы нізавошта не ўцёк з таго смярдзючніка. Я, брат, кэпэзэшнік сталы, усе хады-выхады знаю. Так што трымайся мяне – не прападзеш. – Сякач пасунуўся бліжэй – так што стала чутно яго перарывістае, з пахам нячышчаных даўно зубоў, дыханне, шаргануў рукою па спіне...

І ў гэтую ж хвіліну ўдалечыні выкаціўся з-за кустоў «Беларус», фыркаючы гарам, пакіраваў напрасткі да хутара.

– А гэта што за кент такі пхнецца? – прымаючы руку з Юркавай спіны, незадаволена прамармытаў Сякач. – Што за праява?

Трактарок, параўняўшыся са стогам, нечакана спыніўся. Малады, гадоў пад дваццаць пяць, трактарыст у кепцы набакір і збадзяным, запарушаным пацярухаю ватніку выкараскаўся з кабіны, пачаў спраўляць на кола патрэбу. Затым прыкурыў, не зашпіліўшы кятуркі, уладкаваўся побач з лужынаю, узяўся разглядаць абутак. Бот на яго правай назе быў кірзавы, другі, значна шырэйшы ў халяве, – больш нагадваў здаля гумавы. Маладзец, пахістваючыся, недаўменна жмурыўся, мацаў адну нагу, другую і ўсё, здавалася, не мог уцяміць, як гэта такое здарылася. Нарэшце ён падняўся, бразнуў вобзем акурак, палез назад, у кабіну. Трактар жвава фыркнуў, памчаўся полем у накірунку хутара.

– Што яму тут трэба? – заклапочана азваўся Сякач. – Ну ж боўдзіла! – Ён ускінуў угору сколатае сваё, спружыністае цела, пачаў апранацца. Па тым, як загарэліся, заблішчэлі ягоныя вочы, Юрка здагадаўся: пойдзе за трактарам следам. Ён хацеў запытацца, ці так гэта, але не асмеліўся.

– Цябе не тычыцца, – нібыта адгадваючы ягонае запытанне, што камяком засела ў горле, рыкнуў Сякач. – Сядзі ціха і не выпендрывайся. – Ён споўз са стога, шырока, неяк па-звярынаму стаўляючы ногі, пасунуўся аблогаю да кустоў, туды акурат, адкуль з'явіўся трактар.

Юрка счакаў, пакуль ён знікне ў лагчаку, таксама з'ехаў уніз, азіраючыся штохвіліны на тое месца, дзе знік Сякач, пашыбаваў да хутара.

Раса ўжо спала, і толькі дзе-нідзе ў ніжэйшым выблісквалі з-пад лісця вільготныя, бы́ццам прысыпаныя інеем кусцікі трыпутніку і пакручаных, нізенькіх рамонкаў. Сонца было даволі высока, прыпякала. Але то была ўжо не летняя спёка – адчуваўся жнівень.

Юрка перасек наўскос лагчыну, выйшаў напрасткі да хаты і адразу ўбачыў жанчыну. Яна сядзела на парозе хлява, карміла з гарца курэй. Побач сядзеў трактарыст, хістаючыся, тоўхаў яе пад руку.

– Адчапіся, слата, – адмахвалася яна. – Кажу няма – значыць, няма. А каб і было, не дала б, бадзяка ты паскудны. Сонейка ледзь у моц увабралася, а ён ужо заліў вочы... Сораму не маеш, сябе не шкада, дык хоць дзяцей пашкадаваў бы...

– Ну, матка... – не зважаючы на ўшчуванні, працягваў квіліць маладзец. – Апошні ж раз прашу, будзь чалавекам! Апошні, кажу табе, а болей і ў рот не вазьму. Ну-у вось адну толькі кропельку дай, а там паглядзіш.

– Сказала табе – няма. – Жанчына паднялася з месца, змахнула з падолу рэшткі круп. – Едзь на работу, лыга, нябось тры дні ўжо не паказваўся. Вось улепяць штраф, тады запяеш.

Трактарыст нехаця ўстаў, чапляючы нага за нагу, павольна паплёўся да «Беларуса».

– Не даеш – у іншым месцы знайду, – сказаў, узлазячы ў кабіну. – Мяне людзі паважаюць, дзе ні папрашу, усюды не адмовяць. Не тое што ты... Гады ў рады папрасіў, дык кукіш паказала.

Трактар рэзка ірвануў з месца, папоўз узмежжам да дарогі. І ўвесь час, пакуль ён быў відзён, жанчына нерухома стаяла пасярод панадворка, са стоена-скрушлівай жальбаю ў вачах глядзела яму ўслед. Затым спахапілася, ускінула гарнец на плот, падалася да хлява, пачала адкідваць віламі ад дзвярэй гной.

Юрка варухнуўся, падаўся наперад. Сухая галінка, праразаючы цішыню, трэснула пад нагамі. Але жанчына, занятая сваімі клопатамі, нават не схамянулася. Спарадкаваўшы гной, яна дастала з падстрэшша касу, прынялася абкошваць бытьнёг вакол дрывотні. Рабіла яна гэта спрытна, з веданнем справы, і Юрка, які за ўсё сваё жыццё ні разу не трымаў касы ў руках, міжволі ёй пазайздросціў. Захацелася выйсці са схову, папрасіць павучыцца. Але думка, што кожную хвіліну можа ўзбіцца сюды Сякач, астудзіла яго.

Жанчына тым часам адклала ўбок касу, узялася збіраць накошанае ў кошык. Цяпер, калі яна стаяла амаль побач, бокам да куста, за якім ён хаваўся, Юрка заўважыў, што яна не такая ўжо і старая, як падалося па першасці. Зараз ёй можна было б даць і пяцьдзесят пяць, і меней. Была яна без хусткі, і гэта вельмі неяк ажыўляла, маладзіла даволі прывабны, з шыракаватым носам твар. Праўда, было шмат маршчын пад вачыма і на шыі, але і яны не псавалі агульнага ўражання: ўсё згладжвалі рахманасць і рухавасць моцнага, здатнага да любой працы чалавека.

Яна пераступіла праз парог хлява, і бадзёрае, працяглае, крыху надрыўнае скавытанне падсвінка рванулася ёй насустрач.

Юрка вярнуўся ў хмыз, да таго месца, дзе чакаў яго ўранку Сякач. Расхінуў куст чаромхі: слоік ляжаў на месцы. Ён падабраў пасудзіну, рушыў назад, да хлява.

Жанчына ўсё яшчэ валаводзілася з падсвінкам: чуцён быў голас – такі ж засяроджаны, ушчувальна-пяшчотны, як раніцой, калі яна размаўляла з Лысухай.

Нарэшце яна выйшла з хлява. Паставіла пад дрывотню кошык, пачала счышчаць з ботаў травой камякі гною.

– Не пужайцеся, цётка, то я.

Яна хіснулася ўбок, у вачах яе, чамусьці чырвоных і вільготных, мільгнуў страх.

– Ты, малец? Фу, напалохаў! А казаў – направіш матацыкл і паедзеш. Не направіў?

– Не. – Юрка выцягнуў руку. – Вось, слоік вам прынёс.

– Які слоік? – яна няўцямна пацiснула плячыма. – А-а, гэты... Дарэмна стараўся. У мяне іх, гэтых слоікаў, можа, мільён. Вунака цэлая гара быткуецца. – Яна адчыніла паветку. – Колькі разоў прасіла ягамосця: завязі здай – дзе там!

– Ягамосць – гэта хто?

– Сына так называю, – яна махнула рукой. – Трактарыстам робіць у калгасе. Во толькі ад'ехаў, з паўгадзіны. Мо бачыў?

– Бачыў трактар.

– Ну, ён быў... Дык не направіў, кажаш, матацыкл?

– Не.

– Шкада, з Косцікам размінуліся. Ён у мяне кемлівы, петрыць у тэхніцы, не зважай, што выпівоха. От ён бы наладзіў. Шкада, што раней не прыйшоў. – Яна павярнулася, падалася панадворкам наўскос да хаты. – Хадзі з'еш што-небудзь. Наварыла, думала, можа, паесць, аж яму даволі ўжо, накармілі чужыя ледзь не да гарачкі.

– Як гэта – чужыя?

– А так. Машына ў ягоных руках, вось і карыстаюцца... Падвязе каму што, соткі пабаранує ці абарэ – і плацяць гарэлкай. Яму радасць, а матцы – гора. Ды што зробіш: цярпі, Зося, так прыйшлося.

– Вас Зосяй зваць?

– Ды не! – засмяялася жанчына. – Я Мар'я. А пра Зосю гэта ў нас прыслоўе такое. – Ну, хадзі, хадзі ў хату. – Яна амаль сілаю ўцягнула Юрку ў кухню, пасадзіла на лаву, пад абразамі. Наліла ў талерку варанай капусты, дастала з-пад прыпека ладны кавалак мяса. – Вось, еш... У цябе бацькі далёка?

– Дык... у горадзе, – зніякавеў ад нечаканасці Юрка.

Жанчына ўсміхнулася.

– У горадзе жыць добра, – сказала, адразаючы ад акрайца лусту хлеба. – Магазіны побач, вада ў доме. Прыйшоў з работы, паеў і спачывай сабе. Не тое што ў вёсцы – клопат на клопаце. Статак гэты, зноў жа – хату трэба дагледзець: то комін абваліцца, то страха падзіравіцца, то склеп залье... У горадзе, канечне, лягчэй... Бацькі твае заможна жывуць?

– Нішто сабе.

– Тэлевізар маеце?

– Угу.

Яна падхапілася, адчыніла дзверы ў лепшую хату.

– А мой жа няспраўны каторы тыдзень стаіць, – сказала ўзрадавана. – Трэба б майстра выклікаць, ды хіба дазавешся яго! Можа, ты паглядзеў бы, га? Глянь, даражэнькі, я і прыплачу, калі што...

– У вас чорна-белы? – Юрка застыў на парозе. – Не, у такім я не разумею. У нас каляровы, дык той мог бы...

– А, каляровы... – жанчына расчаравана ўздыхнула. – Бач ты, каляровы... Ну, то ладна, хай сабе стаіць, можа, уламаю як-небудзь Косцьку завезці ў райцэнтр.

– Ну, цётка, дзякуй вам яшчэ раз, – Юрка падняўся з-за стала, накіраваўся да дзвярэй. – Пайду я.

– Як знаеш сабе. – Жанчына прынялася парадкаваць посуд. – Шчаслівенька.

Юрка выйшаў у двор, і яна амаль тае ж хвіліны выбегла следам.

– Як не направіш, то прыходзь унаначкі, – гукнула з ганка. – Не саромейся, месца хопіць. Так што прыходзь.

– Дзякую. – Юрка весела махнуў рукой, насвістваючы, падаўся да хмызу. І чым болей аддаляўся ад хаты, тым менш хацелася плесціся ў логава. Можа, плюнуць на Секача ды вярнуцца на гасцінны панадворак? Паесці яшчэ, адаспацца як след, а там... Ды не, небяспечна. Вунь як з тэлевізарам ледзь не засыпаўся. Хм, каляровы! Што б ужо рабіў з ім: усяго раз і бачыў – год таму, калі Лідзія Трафімаўна, дырэктрыса, зазвала неяк пасля ўрокаў дахаты. Да таго дня і не ведаў толкам, што гэта такое – кватэра. Сядзеў дурань дурнем у куце, баяўся да ўсяго дакрануцца, каб не нарабіць неспадзеўкі якой шкоды. І нарабіў-такі. Захацелася па малой, і замест туалета тыцнуўся ў дзверы кладоўкі. Лідзіі Трафімаўне стала смешна,

а яму... Ледзь дачакаўся канца таго вечара. Пайшоў і, ачмурэлы ад нервовага напружання, заблудзіўся ў мікраараёне, адстаў ад аўтобуса. Мусіў вярнуцца назад. Лідзія Трафімаўна ўзрадавалася, кінулася ладзіць пасцель.

То была пасцель! Ад аднаго толькі паху ландыша, што зыходзіў ад бялізны, можна было звар'яцець і не прачнуцца.

Але ён прачнуўся. Ускочыў з ложка і жахнуўся, убачыўшы на бялюткай прасціне здрадлівую пляму. Такое і ў інтэрнаце зрэдзьчас з ім здаралася, асабліва калі сніліся дзяўчаты, і тады моцна перападала ад уедлівай кастелянкі. Але то быў інтэрнат, а тут... Похапкам успянцёрыў на сябе ненавісную казённую апратку – і апрометцю з кватэры.

І колькі тыдняў запар потым не мог пераадолець сораму. Сядзеў на ўроках нахіліўшыся над партай, баяўся зірнуць Лідзіі Трафімаўне ў вочы. Але ўрэшце ўсё неяк наладзілася. Недзе праз месяц пасля таго прыкрага выпадку яна зноў паклікала яго дахаты, але ён больш не наважыўся пайсці ў гасціннае тое жытло.

Затое наведаўся ў іншае месца, пасля чаго і трапіў у міліцыю. А там – Сякач, праціўная морда. Уявіў, як той ляжыць, раскінуўшы рукі-ногі, у стозе, і аж нядобра стала.

Аднак Секача на месцы не было. І гэта так узрадавала Юрку, што ён амаль не падскочыў ад шчасця. Няма! Ці надоўга-то?

Ён сцягнуў з ног чаравікі, паслаў куртку, з задавальненнем кульнуўся дагары на салому.

Неабсяжнае, з шырокімі вокнамі блакіту паміж рэдкіх кучаравістых аблокаў неба дыхала роўна і ўрачыста. Зрэдку парушала гэтую ўрачыстасць чародка птушак, і тады ўсё неяк мянялася ў краявідзе.

А яшчэ праз хвіліну выглядвала сонца, і адразу ўсё рабілася навокал рэзкім, асляпляла, слязіла.

Расслаблены промнямі, самавітым абедам і цішынёй, Юрка і не заўважыў, як праваліўся ў сон.

Прачнуўся ён ад прыкрага адчування ў вуху. Расплюшчыў вочы і ажно здрыгануўся ад пярэпалаху: побач сядзеў, крывячы вусны, нецвярозы Сякач і казытаў у вуху саломінай.

– Спіш? Ну-ну...

Юрка падхапіўся, пачаў абувацца. Сякач тае ж хвіліны паваліўся на ягонае месца, выцягнуў з кішэні недапітую бутэльку.

– Хочаш? – спытаў сіпла, жмурачы асалавелыя вочы. – На, пі.

– Не хачу. – Юрка адхіліў Секачову руку, выпрастаўся. Той імгненна ўскінуўся, схапіўшы Юрку за локаць, вывернуў руку назад, за спіну.

– Не хочаш? Як гэта? Ха-ха, – засмяяўся пагана, шчэрачы гнілыя зубы. – А вось захочаш! Усё, што загадаю, будзеш рабіць. Ну, пі, каму сказаў! Пі, гад! – Ён тыцнуў гарляк Юрку ў губу.

Юрка глытнуў – раз, другі. Саладжавае, з пахам мяты пітво абпаліла вусны, камяком засела ў горле...

– Слабак! – фыркнуў пагардліва Сякач. – Не тут, свінёнак! Марш уніз, там колькі хочаш ванітуй.

Юрка з'ехаў са стога, нахіліўся над дзірваном збоч кусціка. Праціўны рэзкі боль у грудзях нібыта крыху адпусціў, але паранейшаму было блага, усё ўнутры пераварочвалася, ногі лекацелі. Нарэшце яго званітавала, і адразу зрабілася лягчэй дыхаць – пасвяжэла галава, перасталі мітусіцца ўваччу жаўтлява-зялёныя мятлікі.

Тым часам надвор'е стала мяняцца. Раптам узняўся вецер, неба з захаду замікіцілася, пакрылася аблокамі. Задрыжэла, забілася хвалістымі пасамі трава, зашапацела працягла збоч поля густое альховае лісцё. Потым яшчэ раз ірвануў, збіваючыся з рытму, вецер, і пайшоў дождж.

Сякач штосьці крыкнуў зверху, са стога, але што – Юрка не пачуў. Ён усхапіўся з месца, хаваючы твар ад дажджу, скасабочыўшыся, кінуўся да дрэва, што расло на ўзмежку паміж аблогаю і ўзгоркам. То была ліпа. Тоўстая, з рудым, парэпаным знізу ствалом, яна, відаць, неаднойчы давала ў непагадзь прытулак падарожнікам: усюды валялася смецце, неглыбокая вузкая яміна побач зеўрала галавешкамі нядаўняга кастра.

Юрка толькі паспеў забрацца пад голле, як дождж перастаў. Гэтак жа імгненна, як і ўзляцеў, аціх вецер, аблокі рассеяліся, выпростваючыся, бадзёра зашумелі, загаманілі ўверсе набрынялыя сукі.

– Гэй, шчанюк, дзе ты? – праціўны голас Секача данёсся здалёк, стаяў у шарачковай цішы.

Юрка, які ўжо намерваўся вылазіць з-пад голля, міжволі забіўся глыбей, прынік тварам да пабурэлага, цёплага камля. Недзе

непадалёк, па-над кустоўем, успырхнула спужаная чалавечым голасам сарока, замяцеліла крыламі, засакатала па-дурному.

– Гэй! Гэ-эй!

Юрка падняўся на ўвесь рост, учапіўся абедзвюма рукамі за ніжэйшы сук. Дрэва калыхнулася, абдало градам кропель, але ён стрываў. Падцягнуўся, борзда перастаўляючы па ствале босыя ногі, пачаў паволі караскацца ўгору. Узабраўшыся на сук, хвіліну перадыхнуў, учапіўся за наступны. Так лез і лез, спачываючы, аж пакуль не дапяў амаль да самай вершаліны.

І зноў крыкнуў Сякач, на гэты раз аднекуль збоку, з-за стога. Юрка азірнуўся і ўбачыў яго: прыкладваючыся на хаду да бутэлькі, той брыў няўпэўненым крокам да ракі. Затым рэзка змяніў накірунак, крутнуўся наўкола сябе, паплёўся ўсцяж кустоў да хутара.

Хутар таксама з дрэва, хоць і было ўжо цемнавата, быў добра відзён. Жанчына, якая дагэтуль корпалася ў гародзе, нібы прадчуваючы прыход чужога, падхапілася, падалася ў хату. Праз некалькі хвілін яна зноў выйшла на панадворак. Трымаючы ў адной руцэ лусту хлеба, у другой даёнку, накульгваючы, пашкандыбала за хлеў – туды, дзе жыравала на ланцугу між пуняй і гародамі карова. Лысуха падняла галаву, мыкнула, кінулася насустрач гаспадыні. Тая паставіла даёнку, пачала карміць з рукі жывёліну.

Расхрыстаны Сякач між тым пераадолеў апошнюю канаву, ступіў на ўзгорак. Зараз ад хаты яго аддзяляў толькі хмыз, што цягнуўся на ўсход вузкай, як знарок абсаджанай абапал сцяжыны палоскай алешніку, сярод якога пракідаліся дзе-нідзе кволыя белаватыя бярозавыя ствалы.

З-за кустоў, ад рэчкі, зноў павеяла халадком. Юрка сцепануўся. Кашуля, якую так неабачліва змачыў, калі караскаўся на дрэва, ліпла да цела, студзіла плечы, непрыемна муляла каўняром вільготную шыю. Трэба было б падсушыцца, але дзе тут цяпер раскладзеш вогнішча? Трымаючыся адной рукой за сук, ён сцягнуў з сябе адзежыну, шпурнуў камяком уніз. Затым пачаў паволі злазіць сам. На ягонае здзіўленне, гэта аказалася куды складаней, чым падымацца: вільготнае голле выслізгвала з далоняў, шурпаты ствол дзёр жывот, ды і дацягнуцца нагамі ад аднаго сука да другога падалося не так проста. Двойчы ён ледзь не гупнуў на зямлю, страціўшы раўнавагу, але ўсё абышлося.

Кашуля трапіла акурат на мурашнік. Цэлае воблака рудавата-жаўтлявых мурашоў роспачліва мітусілася па ёй сюды-туды, імкнучыся сцягнуць з жытла.

Юрка падняў кашулю, моцна трасянуў. Аднак мурашоў гэта не напалохала, і прыйшлося сапстрыкваць іх па адным пазногцем. Калі ён урэшце даў рады мурашам, зусім сшарэла.

Ён абуў чаравікі, трымаючыся хмызу, пасунуўся следам за Секачом да хутара. Але ўжо праз колькі крокаў так змачыў абутак у вільготнай пасля дажджу траве, што зноў мусіў зняць яго. Так, басанож, і дапяў да хаты, і толькі ўладкаваўшыся за бліжэйшым ад панадворка кустом бэзу, усцягнуў чаравікі на пачырванелыя, заляпаныя гразёю ногі.

Жанчына перацэджвала малако. Яе вузкія, з рэдкімі светлымі вейкамі вочы спалохана міргалі, вусны трымцелі ў збянтэжанай усмешцы. Яна баялася чужога чалавека і не хавала гэтага. «З чым ты прыйшоў?» – нібы пыталася ўсёй сваёю постаццю.

А той сядзеў на нізкім зэдліку побач з ганкам, моўчкі цікаваў за кожным яе рухам звар'яцелымі сваімі, расшыранымі зрэнкамі.

– Гэта... старая, плюхні кроплю.

Жанчына нагнулася, адвярнула кранік. Сырадой борзда заструменіўся ў падстаўленую бутэльку.

– Ды не гэтага! – раўнуў Сякач. – Ты што, з глузду з'ехала? – Ён усхапіўся, хіснуўся да жанчыны, паклаў руку ёй на клуб.

Яна рэзка выпрасталася, адштурхнула яго ўбок.

– Што ты, што ты, чалавек, здурэў?

Малако, высвечваючы ў цемры струменем, палілося на зямлю, да радасці ката, што цёрся тут увесь гэты час у чаканні пачастунку.

– А ты, можа, дзеўка? – Сякач хіхікнуў, прыхінуўся плячом да вушака. – Дзеўка... гы-гы!

Жанчына зачыніла кран, паставіла бітон у цэбар з вадою.

– Грэх табе, маладзён, – сказала, прыкрываючы цэбар дошкаю. – Я матка табе, а ты... Паскуднік.

– Што-о? Я паскуднік? – вочы няпрошанага госця пагрозліва бліснулі. – Ах ты... – Ён хацеў адхлюбнуць з бутэлькі, але, разгарачаны злосцю, не патрапіў – малако пацякло па падбародку, на шыю, пад каўнер. – Вучыць мяне будзеш? Ну, сцерва!

Жанчына памкнулася ў сені, але тут жа спынілася – зняможана апусцілася на ганак, склала рукі на каленях. Сякач шпурнуў бутэльку пад плот, плюхнуўся побач.

– Ладна, – сказаў прымірэнча, зазіраючы ў вочы. – Давай пляшку – і квіты.

– Няма ў мяне.

– Брэшаш! Бэйбус твой казаў – ёсць. Так што не скнарся, бабуля, нягожа матцы. – Сякач пасунуўся бліжэй да жанчыны, абхапіў яе за плечы.

Яна спрытна, нібы чакала гэтае ягонае брыдкасці, падхапілася з месца, адбегла на колькі крокаў.

– Ой, Езус, што ж за насланнё на маю галаву! – заенчыла, сплёскваючы рукамі. – Што за ліха?

– Ліха ты яшчэ не бачыла. – Сякач падняўся з ганка, пырскаючы слінай, гучна рагатнуў. – Ведаеш, што я зараз зраблю? Ведаеш? Ну, здагадайся!

Жанчына суцішылася, моўчкі насцярожана пазірала здаля на крыўдзіцеля.

– Ну, здагадалася? Не? А я вось што зраблю – падпалю тваю хату. Чырк-чырк – і пад страху. Ото пагрэемся. – Ён дастаў з кішэні карабок, чыркнуў запалку, паднёс яе да ніжняга вянца ў тым месцы, дзе вытыркаўся з паза шматок моху. Мох успыхнуў, полымя жвава папаўзло ўздоўж бервяна.

Жанчына роспачліва заекатала, кінулася да сцяны, пачала збіваць агонь далонню.

– Вось бачыш, як добра! – Сякач абхапіў яе ззаду. – Ну, што, адшкадуеш пляшку?

Жанчына адштурхнула яго. Але і сама не ўтрымалася на месцы, павалілася ніцма побач з ганкам. Затым хуценька паднялася, абцягваючы на хаду спадніцу, накіравалася ў сенцы.

Вярнулася яна вельмі хутка і не з пустымі рукамі: з паўбутэлькай, у якой боўталася на трэць вадкасці.

– Ну, саўсім іншая справа. – Сякач адкаркаваў зубамі пасудзіну, паднёс гарляк да носа. – Нябось, хлебная?

– Хлебная... апошняя, ад сына надоечы схавала. – Яна адышлася воддаль, стала ля плота, заплакала – гучна, уголас, не выціраючы слёз. – Ап-пошняя, ад сына хавала.

Сякач здзіўлена зіркнуў на яе, прыклаўся да гарляка. І смактаў, і булькаў з асалодаю, пакуль не засталося на дне ні кроплі. Жанчына тым часам сіганула ў сені. Бразнула засаўка.

Сякач павярнуўся тварам да дзвярэй, паспрабаваў седзячы дацягнуцца да клямкі. Затым устаў, хістаючыся, ударыў некалькі

www.kamunikat.org

разоў штосілы кулаком у аўшак. Жалобна дзынкнула пад ботамі, паляцела долу даёнка, перапалоханы кот, не дапіўшы сваёй порцыі, апромеццю кульнуўся пад ганак.

Жанчына не адчыняла, і Сякач накіраваўся да акна. Паскроб кіпцюрамі па шкле, размахнуўся, каб ударыць, але нешта яго стрымала. Вярнуўся назад, зноў узяўся лупіць кулаком у дзверы – цяпер ужо нагой. Жанчына штосьці крыкнула з сяней, але разабраць слоў з-за грукату было немагчыма. Ды Сякач і не слухаў – здавалася, адчыні яна, і толькі тае і будзе палёгкі, што змалоціць, здратуе на горкі яблык.

– Вось я зараз табе! – Сякач выхапіў з кішэні страпарэз, ціснуў на кнопку. Раздаўся пстрычок, бліснула лязо. Ён працісунуў яго ў шчыліну між дошак. – Во, бачыла? Ну, б.., зарэжу карову!

Ён збег з ганка, нечакана шпарка для п'янага чалавека, падскокам хіснуўся да хлява.

Жанчына енкнула, адшчапіла засаўку, выбегла на двор. Роспачліва размахваючы рукамі, кінулася следам за бандытам. Яна ўжо не плакала і не казала нічога, толькі сцішана, упаўголаса скавытала, як паранены шчанюк, што стрэў неспадзеўкі на шляху больш моцнага, жорсткага звера, і не засталося аніякае надзеі на паратунак.

Абое зніклі за вуглом. Юрка хуценька перабег да дрывотні, прынік плячамі да шурпатых, негабляваных дошак сцяны.

Сякач, трымаючы ў адной руцэ страпарэз, другой адшчэпліваў засаўку. Карова ў хляве занепакоена мыкнула, узбуджана засакаталі, пасыпаліся ўніз з шаста куры.

– Зар-рэжу, зар-рэжу падлу!

Жанчына злёту навалілася ззаду на яго, драпнула пазногцямі па руцэ. Страпарэз упаў лязом у гной, і гэта яшчэ больш раз'юшыла Секача. Ён ударыў жанчыну наводмаш па твары, яна павалілася. Ён яшчэ два разы садануў яе нагою ў бок, схапіў за локаць, пацягнуў да парога. Яна ўпіралася, чапляючыся ботамі за сцяну, але сілы былі няроўныя: нават п'яны ён быў дужэйшы за яе. Падцягнуўшы яе да парога, Сякач на хвіліну прыпыніўся – перадыхнуць, затым зноў узяўся тузаць яе, нібы бервяно, сюды-туды. Зразумеўшы, што праз парог перацягнуць яе не здолее, ён схітраваў: заламаў адну руку за спіну, пачаў распранаць.

Яна закрычала, адняла ногі і вольную руку ад апірышча, і ён гэта імгненна выкарыстаў, ірвануў яе праз парог, вывалак на гнаявішча.

– Ну, не хацела дабром, дык я зараз табе пакажу, – сказаў, цяжка дыхаючы, і стаў здзіраць вопратку, якая яшчэ на ёй заставалася.

Яна паспрабавала падняцца, але дарэмна: ён тут жа збіў яе з ног моцным ударам у жывот. Яна аціхла, сціскаючы ў жмені ашмётак спарахнелай саломы, поўнымі жаху вачыма глядзела на раз'юшанага нягодніка.

Кроў ударыла Юрку ў галаву, ды так моцна, што ажно зазвінела, зацвэнькала ў вушах. Ён высунуў галаву з-за паветкі, рукою падаў жанчыне знак. Яна сцепанулася ад нечаканасці, уся імгненна напружылася, падабралася.

Сякач, стоячы да Юркі спінаю, сцягваў з цела праз галаву брудную сваю, у гнаі і пацярусе, кашулю. У спешцы ён забыўся адшпіліць на рукавах гузікі і цяпер ніяк не мог даць адзежыне рады.

Юрка маланкаю выслізнуў з-за вугла, кінуўся ззаду бандыту пад ногі. І амаль тае ж хвіліны жанчына, сабраўшы апошнія сілы, падхапілася, штурхнула на яго Секача. Той ахнуў, кулем паляцеў пад сцяну. Жанчына схапіла вілы, што стаялі побач у кучы гною, тыцнула імі Секачу ў жывот.

## II

Яна слаба варухнулася, падняла галаву, каб зірнуць, што сталася з Секачом (ад тае хвіліны, як ён паваліўся, яна ўсё ляжала моўчкі на адным месцы, церабіла рукамі гной наўкола сябе). Убачыўшы нерухомае цела, войкнула, абапіраючыся плячом аб край кучы, падалася спінаю ўгору, далей ад жахлівай постаці. Затым перавярнулася ніцма, пастагнваючы ад болю, пачала паволі ўставаць.

Юрка ўсхапіўся з парога, кінуўся ёй на дапамогу, але яна адмоўна хітанула галавой: не трэба. Паднялася, абцягнула парваную спадніцу, хістаючыся, наблізілася да Секача. Той ляжаў дагары з расплюшчанымі вачыма. Тонкі струменьчык крыві сцякаў з рота на шчаку, ланцужком віўся па шыі за брудны, не мыты даўно каўнер кашулі. Жанчына датыкнулася далонню да ягоных валасоў і тут жа з жахам адняла руку, енкнула, схапілася за галаву.

– А Божачкі, а Божа, а Бо...

Недзе зусім блізка дзынкнула, пачуўся шоргат колаў па сцежцы. Жанчына роспачліва замітусілася паміж Секачом і дзвярыма пуні,

выхапіла з падстрэшша ватнік, якім запханая была дзірка, накінула на труп, хіснулася на панадворак.

– Здароў, Манюся! – Чалавек спрытна прытармазіў, абжаргаўшы раму ровара, стаў ля лавы побач з ёю. – Як маешся? Во, грошы прывёз, доўг, значыцца. Роўненька трыста рублёў, хочаш – лічы.

– Грошы... – яна недаўменна паціснула плячыма, але тут жа спахапілася. – А-а, грошы! Ну, дзякуй.

Мужчына дастаў з кішэні пачак «Беламору», прыкурыў.

– Сёння ўжо і не паехаў бы, ды мая чыста затлуміла галаву: едзь ды едзь, можа, патрэбныя. Ну, як ты тутака адна?

– Нішто сабе, дзякую. – Яна перасмыкнула плячом, нібы ад холаду, захінула шчыльней на шыі каўнер кофты.

– Ну і дзякаваць Богу, калі гэтак, – заварочваючы назад, на сцежку ровар, сказаў мужчына. – Дык я паеду. Дзякуй яшчэ раз за пазычку. Спатрэбіцца што – таксама прыходзь, выручым.

– Добра.

Ён выехаў з панадворка, аднак, праруліўшы колькі метраў, зноў спыніўся.

– Ты, гэта... можа, здарылася што? – спытаў, пераводзячы пагляд на кучу гною, побач з якой ляжаў Сякач. – Га?

– Ды свіння, падла, затузала, – адказала яна, устаючы. – Як звар'яцела ўсё роўна. Гноем заляпала, спадніцу во парвала.

– Вось яно што! Тое я гляджу – нібыта ты не такая, як заўсёды. Ну, бывай. – Ровар рыпнуў, пакаціўся па пясчаніку.

Жанчына счакала, пакуль ён знікне за кустоўем, знясілена боўтаючы рукамі ўздоўж цела, вярнулася да хлява.

– Гэта не пра вас казалі надвячоркам па радыё? – спытала глухім голасам у Юркі. – Уцяклі двое з-пад аховы, шукаюць іх. Адзін па апісанню да цябе вельмі падобны. І той... – Яна падышла да Секача, адхінула ватнік. – І гэты таксама.

І тут толькі, здаецца, да яе нібыта дайшло, што здарылася. Яна ўскрыкнула, прыкрыла рот рукамі, гледзячы няўцямна на вілы, што тырчэлі ў нябожчыка ў баку, пахіснулася, аб'ехала на зямлю.

Юрка кінуўся ёй на падмогу, але яна не спатрэбілася. Праз хвіліну-другую жанчына паднялася, зноў нахілілася над целам, лёгкім дотыкам пальцаў прыкрыла нябожчыку павекі, адышлася ўбок.

– Выцягні ты вілы, – загадала, адводзячы позірк.

Юрка ўзяўся за цаўё, паціху пасунуў па ім руку ўніз, да таго месца, дзе пачыналася жалеза. Раптам цаўё калыхнулася, пахістваючыся

туды-сюды, пачало запаволена хіліцца ўбок. Зашамацела, распаўзаючыся па шве, зашмальцаваная апратка, вілы слаба рыпнулі, бразнуліся дзеравам аб парог. Юрка расхінуў у мерцвяка на спіне кашулю і ажно войкнуў ад нечаканасці: на целе не было ані драпіны.

– Ну, што там? – сціснутым ад жаху голасам спытала жанчына. – Га?

– Цётка... вы не пацэлілі, – дзівячыся радасці, што міжволі ахапіла раптоўна ўсю ягоную істоту, адказаў Юрка. – Вілы трапілі ў адзежу і заселі ў ёй. Во, гляньце.

Жанчына наблізілася да нябожчыка.

– А й праўда, хлопец. Але ж... як жа тады... Як гэта? – Яна апусцілася на калені, пачала ліхаманкава церабіць дрыжачымі рукамі Секачову ўскудлачаную галаву. Пальцы яе нібыта штосьці намацалі ззаду, на патыліцы – гэта Юрка зразумеў па тым, як яна рэзка адняла руку.

– Давай перавернем яго...

Яны адцягнулі цела далей ад парога, асцярожна, нібы баючыся, каб не нарабіць яшчэ горш, чым ужо сталася, перакулілі на жывот. Жанчына зноў прыклала руку да галавы нябожчыка, расхінула зблытаныя, спэцканыя крывёю валасы.

– Бач, ударыўся, небарака, – сказала, гледзячы паўз Юрку невідушчымі вачыма. – Ой, бяда, ой, горачка. Трэба ж гэтак... Пасля вайны на хворага немца ў кустах узбілася, дык аж пакуль не сканаў даглядала, а тут... Што ж цяпер будзе?

– Вы не вінаватая, цётка, – падаў голас Юрка. – Ён жа сам...

– Як гэта не вінаватая? – усхапілася яна. – Чалавека забіць – і невінаватая! Эх, хлопец!

Нечакана зацерусіў дожджык. Спачатку як заімжыў – дробны, нібы вільгаць ад туману, але хутка ўвабраўся ў моц, паліў спорны, сцюдзёны, як увосень.

– Трэба ў пуню перанесці неяк. Ды не стой жа ты слупам, дапамажы.

Юрка падхапіў Секача за ногі, і яны асцярожна перацягнулі яго праз парог, паклалі на салому.

Затым жанчына выйшла, чвякаючы ботамі па гнаі, знікла недзе за вуглом. Праз колькі хвілін яна зноў з'явілася – з вядром у адной руцэ і бляшанкаю з-пад кансерваў у другой.

– Хадзі, пасвеціш, – сказала, кіруючыся да дзвярэй хлява. – На ліхтарык.

Юрка ўключыў ліхтарык, свецячы ім пад ногі жанчыне, падаўся следам за ёю.

– То для курэй. – Яна паставіла бляшанку ля катуха, пацягнула на сябе драўляную засаўку загарадкі, за якою вар'яцеў галодны парсюк. Жывёліна замітусілася па загарадцы, з прарэзлівым енкам кінулася гаспадыні пад ногі. Тая агрэла парсюка засаўкай па спіне, загарадзіла нагамі карыта, шмякнула ў яго мешанку. Падсвінак тыцнуўся лычам у ежу, задаволена рохкаючы, узяўся жвава сёрбаць рудаватую мучністую юшку. Жанчына пастаяла моўчкі хвіліну-другую над ім, вылезла з загародкі, пайшла прэч з хлява.

– Цяпер Лысусе падкінуць, і ўсё, – сказала, дастаючы з падстрэшша касу. Затым зняла вяроўку, што вісела на цвіку збоч вугла, перакінула яе цераз плячо, накіравалася да ўзмежка.

Юрка зноў свяціў, а яна касіла – размашыста, па-мужчынску, нават не верылася, што не мінула і паўгадзіны, як яна ляжала амаль непрытомная на кучы гною. Прайшоўшы колькі метраў, яна разаслала ля пракоса ў дзве столкі вяроўку, паскідала на яе атаву, ускінула Юрку на плячо.

Вываліўшы карове накошанае, жанчына зачыніла хлеў, падалася да хаты. Юрка чуў, як яна падымалася на ганак, як бразнула дзвярыма. Затым усё сціхла, і неўзабаве ў вокнах успыхнула святло.

Юрка падышоў да хаты, зазірнуў у незапятую шыбу кухні. Гаспадыня, нахіліўшыся над цабэркам, шаравала рагожкаю рукі. Потым дастала з шафы чыстае адзенне, пачала пераапранацца. Рабіла яна ўсё неяк павольна, нават урачыста, і адчуванне нечага нядобрага кальнула Юрку, але ён тут жа прагнаў яго. Ці ж мала таго, што ўжо здарылася?

І калі жанчына выйшла зноў з хаты і наблізілася да пуні, ён нічога не сказаў, толькі спадылба зірнуў на яе збоку. Яна падышла да Секача, стала натужліва, да ўтрапення ўглядацца ў ягоны белы, і цяпер нават, калі ён быў нежывы, перакошаны злобаю твар. Пасля павярнулася, пайшла назад.

Бразнула засаўка, і амаль тае ж хвіліны патухла святло ў вокнах.

Юрка падбег да ганка, тузануў дзверы. Жанчына не адазвалася. Тады ён падышоў да акна, праз якое выбівалася вонкі хісткае, ледзь прыкметнае святло лямпы, пастукаў у шыбу.

– Што табе трэба? – адгукнулася яна гучным незадаволеным голасам. – Ідзі ў паветку, там знойдзеш што падаслаць і апрануць з

Косцікавага. Сваю кашулю на плоце можаш пакінуць, раніцой памыю.

Ён ледзь-ледзь змусіў сябе зможыць вочы, як зноў прачнуўся – ад нейкага сцішанага гуку, быццам хто шаргануў далонню па сцяне. Падхапіўся, асцярожна, каб не перакуліць што ў цемры, стаіўся ля дзвярэй. «Што, калі Сякач?» – мільганула дурная думка. Памацаў рукою засаўку – яна была на месцы. Тае ж хвіліны на двары пачуліся крокі – нехта аддаляўся ад паветкі. Счакаўшы крыху, Юрка пасунуў засаўку, прыадчыніў дзверы, зірнуў у шчыліну.

То была гаспадыня. Яна хуценька перайшла паласу святла, што выбівалася з запятага нечым цёмным акна сяней, разматваючы на хаду вяроўку, знікла ў праёме дзвярэй.

Юрка запхнуў назад засаўку, вярнуўся да свайго лежбішча. Але класціся зусім не хацелася – сон нібы рукой зняло. Які ўжо там сон, ды яшчэ амаль упобачкі з мерцвяком! Дзіва, як дагэтуль задрамаў.

Успамін пра нежывога Секача, думка, што нешта трэба з ім рабіць, бо не можа ж ён вось гэтак ляжаць, зусім развярэдзіла ўзбуджаны мозг. А гаспадыня? Што яна надумалася? Можа, здасць яго заўтра міліцыі? Складзе на яго ўсю віну, і даказвай ім... Выкручвайся, як можаш. Пагаварыць з ёю, ці што?

Ён усхапіўся з дошак, рынуўся да дзвярэй. Выскачыў вон, спатыкаючыся, кінуўся да хаты.

Святло па-ранейшаму выбівалася з акенца сяней – бляклае, няпэўнае, хісткае. Ён пастукаў у дзверы – раз, другі... Жанчына не адзывалася, хоць і была (Юрка адчуваў гэта) недзе зусім блізка.

Ворах ахапіў хлопца. Не помнячы больш сябе, ён з усяе сілы рвануў дзверы – так моцна, што калі яны адчыніліся, ледзь не адляцеў да самага плота.

Яна стаяла на невысокім самаробным зэдлі, адвязвала ад маціцы вяроўку, што пятлёю звісала ўніз побач са сцяной.

– А-а, ты, – сказала, разблытваючы апошні вузел. – Што, спужаўся? Ды не бойся, не зраблю... Адна была б, можа, і наважылася б, а так...

Яна злезла з зэдля, хістаючыся, паплялася ў закутак, за шафу, дзе быў яе ложак.

Неўзабаве яна вярнулася. Трымаючы ў руках Юркаву брудную, у рудыя пісягі, кашулю, тыцнула пад нос інтэрнатаўскім штампам.

– Целявізар, каляровы... Навошта хлусіў? Думаў, разумнейшы за ўсіх? Ладна, што цяперака пра тое гаварыць. Ідзі ў тую хату ды

кладзіся, позна ўжо. А раніцой, як развіднее, пазвонім з фермы ўчастковаму.

www.kamunikat.org

# МЯЦІНА ДАЧКА

*...будзе ж слова ваша: «але, але», «не, не»,*
*а што апроч таго, тое д'яблава.*
Мацв., 5,37

## Данусят

Мабыць, ён праўду сказаў, той вяплаваты дзяцюк, што прыпоўз у кафэ надвечар і з якім потым доўга мітрэнжыліся, пакуль вытурылі з залы. «Усе вы тут б...». Мы з Наташкай, канечне, зайшліся смехам, а загадчыца наша, Галіна Сяргееўна, так зірнула на нас, што і датэтуль той пагляд стаіць у мяне ўваччу.

Вярнуўшыся з працы дахаты, я расказала ўсё маці. Але яна, занятая зборамі ў чарговую паездку, толькі перасмыкнула вуснамі: «Смешна табе, дурная. Не тое яшчэ пачуеш, калі не возьмешся за розум». Узяцца за розум у яе ўяўленні значыць паступіць вучыцца куды-небудзь у інстытут ці, на горшае, хаця б у тэхнікум. Сама яна робіцъ экспедытарам у быткамбінаце, а гандляваць пачала, як толькі гэта стала дазволена. Набірае па крамах рознага друзу і вязе ў Польшчу. Вяртаецца заўсёды ледзь жывая ад стомы і адразу бяжыць да Галіны Сяргееўны. Яны сяброўкі, ва ўсялякім разе, калі на пачатку лета вызвалілася гэтае месца афіцыянткі, мяне ўзялі на яго без аніякага-якога.

Мне дзевятнаццаць, я ў пазамінулым годзе скончыла школу. Збіралася паступаць у педагагічны, але тут нечакана з'явіўся Сашка, і ўсё пераблыталася.

У мяне досыць вясёлы нораў і прыгожая (так усе кажуць) пастава. Нездарма большасць мужчын, што наведваюцца ў кафе, імкнуцца трапіць за мой столік. Не скажу, каб гэта было мне непрыемна, хоць і

мае такая папулярнасць адваротны бок. На свае вушы чула, як нейкі заезджы боўдзіла гадкоў пад пяцьдзесят плявузгаў напаўголасу суседу нешта наконт «каб з ёю пагушкацца». Відаць, з такім жыватом ён толькі на тое і здатны. А наогул я на дурняў стараюся не зважаць.

Жывем мы ў цэнтры гарадка. У мяне асобны пакой, які перайшоў мне ад старэйшай сястры Люды пасля таго, як яна выйшла замуж. Люда жыве зараз у суседнім райцэнтры і наязджае да нас толькі тады, калі трэба прыдбаць што-небудзь на продаж. Як і маці, яна ўся ў гандлёвых справах

Бацька мой працуе вадзіцелем на міжгародніх маршрутах, сноўдае тыднямі на «Ікарусе» па вобласці. Гандлем ён, як і я, не займаецца, але зрэдку прывозіць для маці з рэйса што-небудзь з таннейшага рыззя. Выглядае ён для свайго ўзросту даволі прыстойна. Маці, якая апошнім часам вельмі здала з-за пастаянных вандровак, побач з ім нагадвае калі не цётку, то старэйшую гадоў на дзесяць сястру – дакладна. Асабліва заўважна гэта з раніцы: твар адрузлы, у замаршчаках, пагляд абыякавы, бляклы, як у чалавека, якому даўно ўсё нецікава, апроч прыбытку. І хоць сама яна, здаецца, зусім на тое не зважае, мяне ўсё гэта вельмі непакоіць.

Абодва: бацька і маці – тутэйшыя. Бацька гарадскі, а мама гадавалася ў Александрыне, гэта вёска вёрст за шаснаццаць ад райцэнтра. У Александрыне датэтуль жыве бабуля Алена, маміна маці. Паўгода таму карова здратавала ёй нагу, і зараз старая ходзіць з кіем. Карову бацька адразу ж здаў на мясакамбінат, а «зайцоў», каб не папражыліся з-за інфляцыі, равёў у даляры. Мы амаль кожны тыдзень дведваемся бабы, а я калі-нікалі нават застаюся ў яе ўнаначкі. Апошнім часам гэта не надта прыемна, бо бацька завёз туды нядаўна нейкае халеры труціць пацукоў, і ў хаце зрабілася не прадыхнуць ад смуроду. Быццам цэлая плойма іх там палегла. Баба кажа – нічога дзіўнага. Хаты пусцеюць у Александрыне на вачах, вось паразіты і цісну цца туды, дзе яшчэ ліпіць жывое. Калі, маўляў, і надалей гэтак будзе, неўзабаве давядзецца небаракам шукаць прытулку дзе-небудзь у іншым раёне.

Зараз без дзесяці восем, яшчэ гадзіна – і мы з Наташкай вольныя. А пакуль што сядзім на кухні, чакаем, калі з'явяцца дзве апошнія міжгародкі. Раз-пораз да нас зазірае Галіна Сяргееўна, уздыхаючы, нецярпліва пазірае на гадзіннік.

Нарэшце з вуліцы даносіцца гул матора. Наташка хуценька ставіць на пліту патэльню з катлетамі і чайнік, я дастаю з пасудамыйкі посуд.

І калі вадзіцель, грукаючы чаравікамі, з'яўляецца ў зале, у нас усё чын чынам.

– Каторы, Аляксеевіч ці Сашка?

– Нясі ты, – адказвае Наташка, і мне ўсё зразумела.

Сашка сядзіць на сваім звыклым месцы ля акна, гартае газету. Ягоны твар падлетка, што зусім не стасуецца да знешнасці дарослага мужчыны (Сашку дваццаць шэсць), ажывае, расплываецца ва ўсмешцы.

– Прывітанне!

– Прывітанне!

Я стаўлю паднос на стол, падсаджваюся збоч.

– Сустрэнемся пасля?

– Можна. Я прыйду да гатэля.

Тае ж хвіліны дзверы ў залу адчыняюцца і ўваходзяць яшчэ два кліенты – вадзіцель другой міжгародкі Аляксеевіч і незнаёмая дзяўчына гадоў дваццаці трох з чорнаю дарожнаю сумкай цераз плячо. Аляксеевіч вітаецца з Сашкам за руку, садзіцца побач, жэстам прапаноўвае месца дзяўчыне. Тая стаіць колькі хвілін у нерашучасці, затым скідвае з пляча сумку, нясмела прытыкаецца на крэсла пасярод мужчын. Блакітна-шэрая хлапечая кашуля торбаю тупырыцца на яе худым целе, падфарбаваныя валасы няроўнымі пасмамі спадаюць па шыі ўніз.

– Вам таксама катлеты, Аляксеевіч?

– Таксама.

– А вам?

Дзяўчына паціскае плячыма, няўпэўнена глядзіць на паўпустую Сашкаву талерку.

– Мне б якой салаты...

– Салаты няма. Можна зрабіць бутэрброды.

– Бутэрброды дык бутэрброды.

– З сырам ці з кілбасой?

– З сырам.

– Пачакайце хвілін пяць, – кажу і накіроўваюся ў кухню.

– Парадак? – пытаецца Галіна Сяргееўна, віхляючы тоўстымі, як жорны, клубамі, шыбуе да свайго кабінета. – То я тады, напэўна, пайду ўжо, дзяўчаты. Глядзіце тут, каб акуратна ўсё... Будзеце адыходзіць – не забудзьцеся падключыць сігналізацыю.

– Добра.

Дзяўчына сядзіць на тым самым месцы, глымзае скарынку. Сашкі няма, пад сподкам ляжаць дзве новыя тысячарублёўкі. Гэтулькі каштавала ў нас вячэра паўмесяца таму, але я ўсё не адважваюся яму пра тое сказаць.

– Вось, галодная, а толькі сыр заказалі, – звяртаюся да дзяўчыны. – Можа, усё-такі што-небудзь яшчэ прынесці?

– Прынясіце, – са смакам накідваючыся на бутэрброд, пагаджаецца яна. – Што-небудзь... і чаю яшчэ, калі ласка.

Я зноў вяртаюся ў кухню, пачынаю ладзіць яечню. Наташка тым часам наводзіць марафет на твары – збіраецца адыходзіць.

– Я пайшла.

– Шчаслівa.

Аляксеевіч таксама ўжо скончыў вячэру, чакае мяне, каб разлічыцца. Праз хвіліну і ён знікае, і мы застаемся з незнаёмкаю ўдзвюх. Яна прымаецца за яечню, я стаю ля акна, гляджу, як Аляксеевіч вырульвае са стаянкі на праезную частку.

– Дзякуй вам! Скажыце, гатэль далёка адсюль?

– Недалёка, з паўвярсты будзе.

– Цудоўна. Я, ведаеце, упершыню ў гэтым горадзе.

– У камандзіроўку прыехалі?

– Не, па асабістых справах. Вёску адну шукаю. Александрынай называецца – можа, ведаеце?

– Ведаю, мая матка александрынская. А бабуля і дагэтуль у Александрыне жыве. Аўтобус ходзіць туды два разы на дзень: апоўдні і а сёмай вечара.

– Апоўдні – пазнавата, – моршчыцца яна. – А раней нічога няма?

– Няма.

– Ат, ладна, па крамах пахаджу.

Я апранаюся, уключаю сігналізацыю, і мы выходзім на вуліцу. На дварэ цёпла і суха, пахне таполяй.

– А хто вам у Александрыне патрэбен?

– Ды так, чалавека аднаго шукаю, – яна на хвіліну нібыта ніякавее. – А як яно там будзе – невядома.

– Як-небудзь будзе, – кажу, зварочваючы ў завулак. – А вунь і гатэль.

– А калі там месцаў не будзе?

– Павінны быць.

Ля гатэля Сашка корпаецца ў салоне «Ікаруса». Уладкаваўшы дзеўку, я выходжу на двор, ускокваю ў аўтобус. Сашка абдымае мяне,

саладкая звыклая млявасць ахутвае ўсё маё цела, падкошвае ногі, робіць мяккай і падатлівай, бы яблычнае павідла .

– Не тут... ад’едземся куды...

Мы развітваемся праз гадзіну. Сашка накіроўваецца ў гатэль, а я шыбую напрасткі ў цэнтр горада. І доўга яшчэ потым кружляю па пустых вулках, дарэмна стараючыся атрэсці пах бензіну, што смалою ўеўся ў вопратку і цела. Калі ж падыходжу, нарэшце, да сваёй хаты, бачу праз фіранку бацьку: ён сноўдае сюды-туды па пакоі, размахваючы рукамі, нешта даводзіць бабулі, што сядзіць сцюцюрыўшыся за сталом і абыякава глядзіць на зяцевы бзікі.

– А, ты, – маці стомлена ўсміхаецца, клацае за спінаю ключом. – Вячэраць будзеш? Не? Ну, як сабе хочаш... Там баба прыехала па грошы, што за карову выручылі, а бацька не хоча аддаваць, дык, можа, ты іх як-небудзь супакоіш?

– Самі супакояцца.

– І то праўда. Ну, я пайшла класціся. – Яна пазяхае, знікае ў дзвярах спальні.

Я дастаю з паліцы кніжку, стараючыся не зважаць на сярдзіты бацькаў голас, што раз-пораз даносіцца з кухні, пачынаю гартаць старонку за старонкай. Але гэта працягваецца нядоўга. Дзесяць гадзін. Толькі што скончылася вячэрняе набажэнства, на дарозе, што вядзе ад касцёла акурат паўз нашу хату, з’яўляецца натоўп малельнікаў. Сцішана перагаворваючыся, людзі паважліва развітваюцца, рассейваюцца па бліжэйшых завулках. Быццам паганяючы іх, з-за паварота паказваюцца дзве постаці ў чорным. Гэта ксёндз Рэгімантас і пляменнік александрынскай цёткі Манькі Івон. Івон шыбуе прама да нашай хаты, ксёндз, блытаючыся ў сутане, зварочвае ля скрыжавання на свае Лапухі. Ён прыгожы, як Езус, і ў свае трыццаць пяць выглядае на дваццаць. Не дзіва, што з ягоным прыездам касцёльнае жыццё ў парафіі гэтак ажывілася: дзеўкі спяць і мрояць, каб хутчэй пабачыць зграбнага латыша. Затое старэйшыя, наадварот, незадаволеныя: па-першае, казанні прамаўляе па-беларуску, па-другое, занадта сучасны, маўляў, слухае абы-якую музыку, а па буднях днях гойсае па горадзе ў джынсах.

Івону семнаццаць, ён калека ад нараджэння – адна нага карацейшая за другую. З-за гэтага калецтва ён, відаць, і пахінуўся да Бога і вось ужо другі месяц дапамагае ксяндзу ладзіць службы. Зрэшты, што ён там робіць у касцёле, дакладна не ведаю, не пыталася. Бо гаварыць з ім на падобныя тэмы – марная справа.

Адзінае, у чым не сумняваюся, дык гэта тое, што семінарыяй, хоць ксёндз і прыспешвае, ён зусім не трызніць.

Ля хаты ён запыняецца, прыціскаючы да бока перакрапаны ружанцам малітоўнік, ветліва матляе мне галавой. Твар яго, пахлапечы чысты, з ледзь прыкметнымі вусікамі пад носам, расплываецца ў шчырай усмешцы. Ён хоча нешта сказаць, але з-за падвойных вокнаў (так і не дабраліся за лета выставіць) я нічога не чую, таму паказваю жэстам, каб заходзіў у хату. Ён паслухмяна ідзе да ганка, знікае ў сянёх. Лёгкі пярэпалах у кухні... «дзяньдобры»...

– Я да Даны.

Я сустракаю яго седзячы на канапе, напусціўшы на сябе абыякавасць, чакаю, што ён скажа.

– Я, гэта... хацеў папытацца наконт Александрыны. Ты паедзеш?

– У Александрыну? Яшчэ не ведаю, але, магчыма, паслязаўтра. А ты?

– Заўтра выпраўляюся. Цётка Манька сена збіраецца вазіць, дык трэба дапамагчы.

– Трэба, канечне, – кажу, ледзь стрымліваючы дурны смех. – Надвор'е во гэткае стаіць.

– Ага, надвор'е. – Ён таўчэцца на месцы, па-жаўнерску прыціснуўшы да бядра малітоўнік, ніякавата ўсміхаецца. – А то хутка дажджы абяцаюць, тады паспрабуй.

– Тады не паспрабуеш.

Ён чырванее, адводзіць пагляд убок.

– Дык да сустрэчы?

– Да сустрэчы.

Ён выходзіць з пакоя, накульгваючы, сунецца калідорам да дзвярэй.

– Гэткі слаўны хлопчык, а вось пакараў Бог немаведама за што, – калі зачыняюцца за ім дзверы, абзываецца-ўздыхае баба. – А мой ты дзяцёнак.

# Алена

Гэта было нават крыху і дзіўна: упершыню за ўвесь апошні час, што Алена ездзіла ў горад, яна выйшла на прыпынку не адна. Следам за ёю выскачыла з аўтобуса дзяўчына гадоў пад дваццаць пяць, у разгубленасці стала збоч дарогі.

Алена счакала хвіліну, ці не звернецца тая па дапамогу, але дзеўка маўчала. Змаўчала і Алена, абапіраючыся на кіёк, паплялася каляінай у бок лесу, туды, дзе тулілася сярод бярозак і хваін яе хата.

Хата... Колькі памятала Алена сябе, заўсёды да яе спяшалася. Бо заўсёды мела поўны хлеў статку, а ўсё ж трэба было дагледзець, спарадкаваць, усяму даць рады. Давала, нягледзячы, што вось ужо больш пяці гадоў жыла па смерці Алеся, мужа, адна. І не абы-як, прыскакам, а так, як належыць самавітай гаспадыні. Ва ўсялякім разе карову не ў пару ні разу не падаіла.

Цяпер каровы не было, але дадому ўсё роўна карцела. Бо засталіся свінчо, і авечка, і куры.

Яна ўжо прайшла ад прыпынку ладны кавалак, як пачула ззаду нечыя няроўныя, быццам чалавек спяшаўся пад цяжарам, крокі.

– Цётка, пачакайце!

Алена не бачыла жанчыны, толькі чула яе голас, але адразу здагадалася: тое самае дзяўчо.

І сапраўды, гэта была яна – дзяўчына з чорнаю сумкай. Параўняўшыся з Аленай, яна прыпыніла хаду, пайшла нетаропка побач.

– Вось, удзвюх, пэўна, весялей будзе, – сказала, перакідваючы паклажу на другое плячо. – А вы жывяце тут?

– Ага, недалёка адсюль, – сказала Алена.

– Баліць нага?

– Баліць, каторы месяц... Карова, ліха яе, здратавала.

– І моцна баліць?

– Цяпер ужо не так. Але і хадзіць як след не пускае. Доктар кажа, аперацыю трэба рабіць, нейкую трасцу ўстаўляць у калена. Але я не хачу, нажывеш ужо з тым жалеззем.

– І як жа вы з гаспадаркаю ўпраўляецеся?

– Упраўляюся неяк. Карову здала. Сама, можа, і не наважылася б, ды зяць настояў. Яна яму даўно воўкам пахла. Бо касіць жа трэба, а ці ж хочацца? Сам і завёў на мясакамбінат. Так во засталася без каровы. Цяпер надумалася цялушку купляць, дык ездзіла па грошы да ягамосця. А ты ж чыя будзеш?

– Я... здалёку, – сумелася дзяўчына. – Нетутэйшая.

– Тое, гляджу, з рускага гаворыш. Ці не да Гайдуковых на вяселле, – выказала здагадку Алена. – Але ж ранавата, здаецца, сёння толькі панядзелак яшчэ.

– Не, не на вяселле. Так, чалавека аднаго шукаю.

– І каго ж? – Алена скасілася з-пад рукі на дзяўчыну, неўпрыкмет агледзела ўсю з галавы да ног: здаецца, нічога, стан як стан. Хоць ліха іх ведае, цяперашніх, – перавяжацца іншая, падціснецца, дык аж пакуль не народзіць, не здагадаешся, што цяжарная.– Ці не з хлопцаў каго?

– Не, цётка, не тое, што вы падумалі, – усміхнулася дзяўчына. – Жанчыну шукаю. Вёска ж ваша Александрынай называецца?

– Александрына, праўда. Але я не ў самой вёсцы жыву, а збоч, амаль на хутары. А табе ўправа, во мінем зараз ручай, адразу і зварочвай.

– Дзякуй вам за падказку. – Дзяўчына звярнула на сцежку, папраставала ў накірунку Александрыны.

– Хоць скажы, каго шукаеш? – крыкнула наўздагон ёй Алена. – Можа, падкажу, як знайсці.

– Олю Шумскую.

– Олю? Дык то ж мая пляменніца. Другая хата будзе ад крыжа. Блакітная такая, з белымі аканіцамі.

# Дануся

Грамадзянскі Кодэкс! Яе чырвоную кідкую хустку я заўважаю здалёку, ад хлебнай крамы. Яна стаіць у чарзе да акенца прыёму шклатары, пыхкае тоўстаю, змайстраванай з газетнага аркуша самакруткай. Людзі наўкола азіраюцца на яе, свідруюць няўхвальнымі позіркамі: жанчына, якая паліць, у нашай глухамані вялікая рэдкасць. Але ёй, здаецца, тое зусім не абыходзіць.

Яе імя – Гвіда. Мянушка ж Грамадзянскі Кодэкс прыліпла гадоў дваццаць таму, калі распачаліся амністыіі і яна кінулася дамагацца яе для раскулачанага бацькі. Бацьку рэабілітавалі, але ёй здалося гэтага замала, і яна пачала даходжваць кампенсацыі за матэрыяльныя страты. З таго, вядома, нічога не атрымалася. Затое законы яна зараз ведае, напэўна, не горш за любога пракурора.

Яна таксама заўважае мяне, ставіць на зямлю стракатую сваю, працертую да дзірак турэпку, шлыгаючы атопкамі па асфальце, бяжыць насустрач – павітацца.

– Дзень добры, цётка! Што новага ў цябе?

– Ат, што там можа быць новага ў Гвідкі! Вось, бутэлек назбіралася, дык хачу здаць... Дваццаць штук, не вялікі скарб, а тым часам.

– Бабу нашу не бачыла апошнія дні?

– Бачыла, учора. Яна з аўтобуса чыкільгала. Дзеўка нейкая з ёю была.

– Якая дзеўка?

– Хто ж яе ведае якая, я не пыталася.

– Ценькая такая, з рудаватымі валасамі?

– Ага, яна. Худая-расхудая, я яшчэ падумала, ці не сваячка якая да Алены з горада прыехала ад'ядацца. Сама ж у Александрыну не збіраешся? Як прыедзеш, глядзі, мяне не абміні. Зойдзеш? – Яна азіраецца, шпурляе вобзем акурак, стрымгалоў ляціць назад, да чаргі.

– Зайду, цётка, абавязкова.

– Што ты вярзеш, якая я табе цётка!

Тое яна выкрыквае ўжо ад самай чаргі, і людзі глядзяць на яе, бы на вар'ятку.

А можа, і сапраўды яна вар'ятка? Пасля гэтулькіх гадоў вандровак па высокіх кабінетах прызначылі якую-ніякую пенсію – ледзь не адмовілася. Маўляў, тое, што адабралі: каня, карову, адрыну – вярніце, а на хлеб сама зараблю, не зломак. Вунь колькі садоў наўкола нічыйных, раз прайдуся ўвосень па кожным – і на цэлы год мне хопіць.

Апошняе дадумваю ўжо на панадворку, пад вясёлы бацькаў посвіст. Ён сёння вольны, капае ў расадніку чарвякоў для рыбалкі. На ім кароткая чырвоная майка, праз якую прабіваюцца месцамі плямы поту, і зялёныя, па калені, шорты.

– Прывітанне!

– Прывітанне!

Маці, як заўсёды, пакуе сумкі. Яна так занятая справаю, што, здаецца, грымні зараз страляніна, наўрад схамянецца.

– Дана, ты? Есці будзеш?

– Не.

– Ну, добра. – Яна адрываецца на хвіліну ад баула, глядзіць паўз мяне ўдалеч невідушчымі вачамі. – Я ад'язджаю ў восем. Халадзільнік поўны. Глядзі тут за бацькам. Будзе званіць Люда – скажаш, ейнае ўсё ўзяла. К наступнаму разу хай расстараецца што-небудзь з сантэхнікі, кажуць, попыт на яе...

– Што напрыклад?

– Яна ведае.

– Ладна.

Ходзікі паказваюць палову сёмай, можна збірацца ў кафэ. Папраўдзе, сёння ў мяне выхадны, але прыязджае Сашка, таму я, як заўсёды па серадах, вырашыла памяняцца зменаю з Наташкай.

– Ужо? – бацька падцягвае шорты, утыкае лапату ў глебу. – Павязу матку на аўтобусную, магу і цябе падкінуць.

– Не варта.

– А, ну-ну, глядзі...

– І ты глядзі

– Што значыць – глядзі?

– А тваё што?

– Нічога, так кажу – глядзі сама, як лепш.

– А-а...

У кафэ ні чалавека, адно адмысловая Сяргеіўніна прычоска ўзвышаецца вежаю над буфетам. Наташка, якая корпаецца над посудам на месцы, дзе звычайна вячэрае шафярня, паказвае мне штосьці на мігі, вабіць у кухню.

– Слухай, я пакуль што Сяргееўне пра замену нічога не казала, чакала цябе. Сашка твой сёння раней прыехаў, паеў ужо.

– Як гэта – раней?

– Вось так, рэйс ягоны перанеслі на гадзіну. У гатэль пакіраваў.

– Пра мяне пытаўся?

– Не, паеў і пайшоў маўчком.

– А ты, канечне, не сказала, што я буду пазней.

– Не, мы ж не дамаўляліся.

– Магла б сама здагадацца!

– А, я вінаватая, – сяброўчын твар чырванее ад абурэння. – Ён сядзіць – каб паўслова, вачэй ад талеркі не падымае, яна – не папярэдзіць як след, а ты вылузвайся тут перад абаімі, дагаджай...

– Ладна, не злуйся, – кажу і накіроўваюся прамым ходам да Сяргееўны.

– Ну, што скажа Дануся? Ці не зноў будзе прасіць пра замену?

– Не, Галіна Сяргееўна, не буду.

– Што ж так?

– Маці ад'язджае на Польшчу, трэба дапамагчы сабрацца.

– Вось яно што. – Яна глядзіць на гадзіннік, і хітраватая задаволеная ўсмешка прабягае па ружовым, з акуратна падведзенымі вуснамі твары. – Тады канечне... Ад'езд – вельмі ўважлівая прычына.

– Для чаго ўважлівая?

– Каб не рабіць замены, для чаго ж яшчэ.

Злосць расце ўва мне, нібы цеста, камяком засядае дзесьці ў горле, гатовая вырвацца вонкі, слізгае на языку. Але не, не зараз! Я хутка разварочваюся, выбягаю на двор.

Найкарацейшы шлях ад кафэ да гатэля – прысадамі збоч шашы. Але там зараз даволі шматлюдна, а мне гэта зусім недарэчы. Таму я выбіраю іншы: паўз закінуты тартак ля возера. Там ніхто не ўбачыць, а калі і надарыцца якая нespадзяваная сустрэча, заўсёды можна зрабіць выгляд, быццам так сабе забрыла, палюбавацца краявідам. Хоць, папраўдзе, які там краявід! Захламлены гнілымі яловымі абцінкамі бераг, сапрэлыя апілкі пад нагамі, замест вады – твань, смярдзючка-верашчака няпэўнага колеру, на якой гайдаецца пара непрамасленых дзіравых лодак. Да таго ж, кажуць, тут поўна п'явак. Ды што там п'яўкі! Похапкам скідваю туфлі, пераадольваючы гідлівасць, брыду водмеллю да адной з пасудзін. Лодка пагрозліва асядае пада мною, але не тоне – ці то занадта мелка, ці то водарасці не пускаюць. Ва ўсялякім разе, перачакаць тут, пакуль сшарэе, можна. А да таго – мільён светлавых дзён, бо яшчэ толькі восем, і недалужнае сонца, як знарок, спынілася і вісіць недапечаным блінам над усім гэтым бязладдзем пад назваю зямля. Як на злосць, і кніжку якую з сабою не прыхапіла, усё ж хутчэй мінуў бы час. Праўда, тут недалёка бібліятэка, ды туды лепш не совацца: маці колішняй сяброўкі-аднакласніцы, што робіць на абанеменце, давядзе да знямогі роспытамі пра жыццё-быццё ды разважаннямі пра тое, як удала, «у прынцыпе», вызначылася ў жыцці яе Танечка. Але побач з бібліятэкай універмаг, можа, туды пайсці?

Чвякаючы па глеі, паціху кірую назад, да берага, выбіраюся на сухое.

Чырвоны «Ікарус», чысцюткі, як толькі што з канвеера, самотна туліцца збоч гатэля. Я не вытыркаюся – з-за вітрыны, з-за лесвіцы другога паверха і так усё бачна, як на далоні. У салоне Сашка і... Божа літасцівы!

# Алена

Яна расплюшчыла вочы, пасунула ўбок фіранку: сонца было досыць высока. Зірнула на гадзіннік, і ажно зайшлося ў грудзях:

палова восьмай, статак даўно ў полі, а яе Царыца марнее нядоеная ў хляве.

Не зважаючы на звыклы ранішні боль у калене, спаўзла з ложка, хіснулася ў сенцы па даёнку.

І толькі калі ўжо адчыніла дзверы хлява, успомніла: каровы ж няма.

– Ёй, ці не парсюка ты надумалася даіць! – Ля ганка стаяла, пахітваючы галавой, жонка мужавага брата Юзюка Манька, шчэрыла ў з'едлівай усмешцы рудыя, пакрышаныя напалову зубы.

Хоць і даводзіліся адна адной нібыта раднёю, гэтую мусовую сваячку Алена не любіла за пацвеллівы нораў і зараз, убачыўшы ў такі ранні час, міжволі сцялася ад прадчування нейкае прыкрасці.

– Гэта, ведаеш, заўчора дзеўка з вечара прыбілася. Бытта Олю шукае. А Оля трэці месяц ужо як у Віцебску. От і дай ты веры. Што за дзеўка? З твару дык быццам знаёмая, а хто такая – хоць рэж, не ўспомню. Кажа, бабу адну прыехала шукаць, а Оля абяцала ёй дапамагчы. А што за баба – маўчыць, ні слова не кажа. Пытаюся, як хату знайшла, а яна на цябе і паказала. Маўляў, ад аўтсбуса разам ішлі. От я і падумала, можа, ты што ведаеш.

– Не, не ведаю. – Алена паставіла даёнку, прысела на лаву пад акном. – Мы і не гаварылі амаль.

– Ну дык што тады... Што ж яна, так і будзе сядзець? Не кажа нічога, а ты думай. Без яе клопатаў хапае. Учора апоўдні, ні слова не мовіўшы, у горад выправілася, сказала, к вечару вернецца, а датэтуль няма. Можа, ты, як вернецца, з ёю пагаварыла б?

– Няхай прыйдзе, – пагадзілася Алена. – Скажы, каб прыйшла.

Манька хітанула галавой, недаверліва ўсміхнулася.

– А можа, ты гэта... можа, ведаеш што, ды не кажаш, – сказала дрытоткім – ці не ад радасці, што адпадае лішні клопат – голасам.– Пэўна ж, сказала табе што-небудзь? Быць таго не можа, каб не сказала.

– Не, нічога не казала.

– Ну, ладна, не дык і не, – супакоілася крыху, хоць бачна было, што так і не дала да канца веры, Манька. Падцяла доўгія, у нітачку, вусны, азіраючыся па баках, нібы шукала чаго, паклэпала з панадворка. Алена счакала, пакуль знікне між дубцоў арэшніку яе чырвоная, кідкая на фоне кустоўя хустка, падалася ў хату – распальваць печ. І доўга потым, пакуль кешкалася з дровамі, і пасля,

калі ладзіла катлы з бульбаю, усё думала і думала то пра карову, то пра дзівакаватую незнаёмку.

Ачнулася яна ад сцішанага стуку ў дзверы. Выйшла на ганак і ўбачыла дзяўчыну, пра якую гадзіну таму гаварылі з Манькай. На гэты раз дзеўка была ў джынсах, кароткая шэрая кашуля з шырокім каўняром вісела на ёй, бы на калку. «Чыста малец»,– падумала Алена.

Дзяўчына ўвайшла следам за ёю ў кухню, скінула з пляча сумку, борздзенька, быццам баючыся, што не дазволяць, шлёпнулася худым клубам на лаву. Чымсьці вельмі знаёмым патыхнула на Алену ад гэтага яе паспешлівага, палахлівага руху, ад звычкі схіляць, калі разглядала што-небудзь, галаву, ад усяго дробненькага, з кулачок, тварыка.

Госця тым часам расчыніла сумку, дастала з кішэньчыка расчоску, пачала прычэсваць рудаватыя, падфарбаваныя хной валасы.

– Дык знайшла, каго шукала? – пачала размову Алена.

– Яшчэ не, – уздыхнула дзяўчына. – І Олі няма... От, можа, вы, цётка, паможаце?

– Як змагу, дык памагу. А каго трэба табе?

– Слядоў маці шукаю.

– Маці?

– Ага. Яна тут недзе жыла.

– Дык ты... не ведала яе, ці што? – здзівілася Алена. – Як гэта?

– Мяне з радзільні адразу ў дзіцячы дом забралі. Маці хворая была надта, вось мяне ад яе і ўзялі. А я пра тое і не ведала аж да сёлетняга. Пачала распытваць у людзей, што ды як. Даведалася, што нібыта Оля Шумская з тутэйшых мясцін, сустрэлася з ёю. Але і яна нічога толкам не сказала, апроч таго, што маці ўжо памерла.

– Дык хто ж твая маці?

– Яе звалі Янінай. Яніна Арлоўская.

– Мяця?! – ахнула Алена. – Божачка, ці не трызніш ты, дзеўка? Хто табе гэта сказаў?

– У метрыках так напісана, – уражаная здзіўленнем гаспадыні, вымавіла няўпэўнена дзяўчына.

– Тое гляджу, твар мне твой знаёмы... Ажно Яніціна дачка! А дзе робіш?

– Касіркай у ашчаднай касе, бухгалтарскія курсы скончыла.

– А адкуль даведалася, што маці ў Александрыне жыла?

– Жанчына адна сказала ў сельсавеце. Я хацела больш распытаць, але яна так дзіўна сябе паводзіла... Дык вы ведалі маму? Якая яна была?

– Якая? – Алена на хвіліну сумелася. – Жанчына як жанчына. Звычайная.

– Яна тут увесь час жыла?

– Не, спачатку ва Узмёнах, а потым у Александрыне.

То была праўда, ды не ўся. Мяця ніколі не мела сваёй хаты, жыла дзе прыйдзецца, па людзях. Улетку начавала найчасцей па лазнях, узімку прыбівалася да якой-небудзь старой.

Упершыню яна прыйшла ў Александрыну гады праз два пасля вайны. З'явілася надвечар, адна, з драўлянаю лялькай у руках. Падышла да хаты Лазовікаў, неяк дзіўна падкурчыла пад сябе танюсенькія, кароткія ножкі, шлёпнулася прама на пясок перад ганкам. Алена, якая на тую хвіліну была адна ў хаце, выбегла папытацца, што здарылася, але дзяўчынка толькі мацней прыціснула ляльку да грудзей, мерна захісталася целам з боку на бок. Неўзабаве ля хаты сабралася паўвёскі – пaглядзець на прышлую. Пачаліся роспыты: хто, маўляў, адкуль. «Я Яніна, мне дванаццаць гадоў, – адказала, падымаючы ўгору ляльку. – А гэта Мяця. Мы жывём ва Узмёнах».

І тут хтось успомніў, што, сапраўды, ва Узмёнах нібыта ёсць такая дзіўная сям'я – маці і дачка, і ў абедзвюх крыху непарадак з галавой. Хата іх нядаўна згарэла, з таго часу туляліся па людзях у пошуках начлегу. Дзяўчынку двойчы забіралі ў нейкі дзіцячы прытулак, але яна кожны раз уцякала і вярталася ў родныя мясціны.

Гэлька, Аленіна матка, чуллівая, спагадлівая кабета, завяла дзяўчо ў хату, пасадзіла за стол, наліла талерку капусты. «Капусту не люблю, – скрывілася. – Мне поліўка падабаецца». Калі сцямнела, маці паслала на лаве кажух, прынесла падушку: начуй, маўляў, куды ты пойдзеш, ноч на дварэ.

З таго дня Мяця (гэтая мянушка хутка перайшла дзяўчыне ад лялькі) стала сваёй у Александрыне. Начавала там, дзе пускалі, сталавалася з гаспадарамі. Абышоўшы па чарзе ўсе хаты, праставала ў суседнюю вёску – так і вандравала да восені. З халадамі ж заўсёды вярталася ў Александрыну. Заходзіла ў першую стрэчную хату, не вітаючыся ні з кім, садзілася на лаву, пыталася, ці варылі поліўку.

Не ўсім даспадобы былі ейныя прыходы, і некаторыя з александрынцаў, каб пазбавіцца лішняга клопату, адшукаўшы

зручную зачэпку для самазаспакаення («яшчэ вошай наняе ці іншае якое трасцы»), выправоджвалі ўнаначкі да суседзяў. Але наогул ставіліся да яе добра, шкадавалі, дапамагалі адзеннем і абуткам. Яна ж ніколі нічога сама не брала, а калі нешта давалі – не дзякавала, а толькі моўчкі ўсміхалася ў адказ задаволенаю, неўразуменна-сцішанаю ўсмешкай. Хлеб і іншы харч, які калі-нікалі перападаў ёй у торбу, яна акуратна перакладала сухім лісцём і пасля хавала дзе-небудзь у лазні – рабіла прыпасы. Там жа, у лазні, хавала ад чужога вока і шматлікіх сваіх лялек, і тое, што даставалася з вопраткі, калі хто-небудзь паміраў.

Потым яна раптоўна знікла і зноў з'явілася ў Александрыне без малога праз сем гадоў. Алена, на той час ужо сталая жанчына, ажно сцепанулася ад сполаху, калі нечакана позна ўвечары адчыніліся дзверы і тоўстая нізенькая маладзіца ў зашмуленым ватніку ўвалілася ў хату, не даўшы «дзень добры», жвава ўладкавалася збоч стала, мерна захісталася ў такт адной ёй чутнай мелодыі.

Пакрысе зноў усё стала, як было раней. Усё, апроч аднаго: цяпер не толькі боязь вошай кіравала кабетамі, калі адмаўлялі дзеўцы ў начлезе. Нябрыдкая з твару, жартаўлівая, Мяця занадта шмат гаварыла пра мужчын, і жанкам гэта, вядома, не падабалася. «Што ж ты хочаш, усё пры ёй, – казалі адна адной з перасцярогаю. – Вунь як на заляцанкі адгукаецца, дарма што калека». Але крыўдзіць пакрыўджаную Богам ніводная не асмельвалася.

У год свайго дваццаціпяцігоддзя Мяця зацяжарала. Жанчыны, і Манька паперадзе ўсіх, кінуліся распытваць, ад каго, але яна нічога не сказала. Набрынялая сокамі новага жыцця, сядзела, хістаючыся, на падлозе ў хаце ўдавы Мурмуліхі, перакладала з месца на месца лялек. А прыблізна за месяц да родаў склала ў торбу сёе-тое з жабрацкага свайго майна і знікла неўпрыкмет у невядомым кірунку.

Людзі ўсяляк нагаварыліся тады наконт бацькоўства. Не абышлося і без таго, каб абвінаваціць каго-нікага з мужчын-александрынцаў. Алена і дагэтуль не забылася, як прыбегла аднаго разу Манька, пачала ўзахлёб вярзці-нашэптваць штосьці пра Алеся...

Трэці, і апошні раз Мяця аб'явілася ў Александрыне два гады таму. Гэта была ўжо сталая кабета, яшчэ больш распаўнелая, з тоўстымі апухлымі нагамі, якім штохвіліны патрэбен быў адпачынак. У спусцелай напалову вёсцы яе стрэлі як родную, спагадліва і зычліва. Мех лялек, якіх яна прынесла з сабою, яна, як і калісьці гэта рабіла, схавала ў лазні і, ходзячы ад хаты да хаты, скардзілася, як кепска ёй

было ў «дзядульніку» і якія нясмачныя зараз вараць гаспадыні поліўкі. А яшчэ расказвала пра дачку, якой дала такое прыгожае, мілагучнае імя – Галя і якую адабралі ў яе адразу па нараджэнні нядобрыя людзі. Яшчэ праз год Мяця памерла. Змерзла ў лесе, заблудзіўшыся ў час завеі пры пераходзе з суседняе вёскі.

І вось гэтае танклявае, апранутае па-гарадскому дзяўчо – Мяціна дачка? Дай ты веры! Шукае матчыных слядоў, і няўцям ёй, што шукае.

– Чаму вы кажаце – Мяця? Яе ж звалі Янінай. – Гучны, крыху ўсхваляваны Галінін голас выводзіць Алену са здранцвення.

– Мяця? Дык гэта мянушка ў яе такая была.

– Ад слова мята?

– Ага, ад яго, – адчуваючы, як чырванее, адказала Алена. – Яна любіла мяту збіраць.

– А-а. А пра бацьку майго вы таксама, напэўна, ведаеце? – Яна дастала з сумкі тонкую зеленаватую кніжачку, падала Алене. – Бачыце, імя па бацьку ёсць, а сам ён чамусьці не ўпісаны. Чаму? Можа, я крапіўніца?

– Гэта... гэта, відаць, таму, што яны з маткаю не былі запісаныя, – пераадольваючы здрадлівае трымценне ў голасе, сказала Алена. – Бачыш – Іосіфаўна...

– Вы так кажаце, быццам вас гэта вельмі здзіўляе і вы дагэтуль нічога не ведалі.

– Нязвыклае нам гэтае імя – Іосіф. Мы тут усіх Іосіфаў Юзікамі ці Юзюкамі завём... Вось і не даўмелася адразу. Ты ўжо прабач.

– Што вы, цётка! Гэта вы прабачце, што назаляю.

– Не назаляеш ты мне, – уздыхнула Алена. – Хіба ты вінаватая, што так яно ўсё ў тваім жыцці сталася? А вось хочаш, на могільнік цябе завяду. Матчыну магілку паглядзіш. Якраз, пакуль карову даіць, і паспеем вярнуцца.

– Вы ж казалі – не маеце каровы, – здзівілася дзяўчына.

– Авохці мне! – спахапілася Алена. – От памяць стала. І колькі ўжо часу мінула, а ўсё трызніцца, бытта ў хляве мая Царыца.

# Гвіда

Дзеўка Лільчына – адыстар бацька. Пастава, рухі, твар – усё Стасева, да каліва падабрала. І гэткая ж таварыская, як Стась, ніколі міма не пройдзе, каб не зачапіць. Хто я ёй, здаецца, – збоку прыпёку,

а заўжды заўважыць, дарма што школу з нейкім там медалём скончыла, а ў мяне ўсяго тры класы за плячыма, як той казаў, з калідорам. А ўжо ўніклівая, Святы Езус! Усё заўважыць, усё запомніць. Неяк з месяц таму бульбу ў склепе ўдзвюх перабіралі, пра суседзяў зайшла гамонка. Скасавурылася так на мяне ды кажа: «Што гэта цябе, цётка, не шануюць у Александрыне?» – «Як гэта не шануюць?» – «А вось так, не шануюць, я ж бачу – кпяць, перастарэкваюць». Як прачытала мае думкі. Ну, я, канечне, адказала ёй, але і падзівілася: такая маладая, а гэтак кеміць ва ўсім.

А што не шануюць – дык праўда, не шануюць. Але я не надта бяру тое да галавы. Можа, зайздросцяць людзі. І то падумаць: усё жыццё з апошніх сіл выжыльваліся, а старасць надышла, і нічога, лічы, апроч хвароб, не зарабілі. Канечне, дзяцей сяк-так паставілі на ногі, адно гэта, бадай, і грэе.

А мне вось не даў Бог дзетак. Ці то пакараў тым, ці то пашкадаваў – яму аднаму ведама. Змоладу хацелася, канечне, мець, ды каму была патрэбная без кала, без двара. Бацьку як звезлі ў сорак сёмым, так і згінуў. Засталіся ўдзвюх з маткаю, ды і яна нядоўга ліпела. Забілася, небарака, упаўшы з воза, калі цягалі сена да чужое адрыны.

У калгасе я ні дня не была. Пастанавіла сама сабе і не ўпісалася. Колькі ні ўгаворвалі, колькі ні страшылі – так і засталася аднаасобніцай. Жыла неяк з шасці сотак, во, глядзі, і да сямідзесяці дацягнула. Цяперака, пад старасць, гаспадаркай абзавялася. А што, вунь колькі сотак наўкола пустых, хоць дзесяць гектар займай ды ўрабляй, абы сіла. І чакаць не трэба, пакуль нарэжуць, не тое што раней – пад самы вугал размецяць, не развярнуцца чалавеку.

Пенсію атрымліваю, прызначылі як дачцэ бязвінна забранага. Спачатку хацела адмовіцца, але потым раздумалася ды і ўзяла. Бацьку ды майна не вернеш, а жыць жа неяк трэба. Вось і шалеюць некаторыя: як гэта, маўляў, ніколі не рабіла ў калгасе, а пенсію далі. Адна Алена ніколі не кальне. Ну, у іх, у Лазовікавых, усе такія далікатныя, што старая, што Лілька яе. Дануся наогул цуд. Ды нешта ж сумная вельмі сёння.

– Плакала ты, ці што, дзеўка? Вочы чырвоныя.

– Нешта пад павека трапіла, можа, казюра якая... Ну, як ты тут? Ды не глядзі так, у мяне добра ўсё.

Можа, і так, ды не Гвідцы казаць пра тое, Гвідка – страляны верабей.

– Тамака дзеўка гэтая ў вас, дык калі даведаешся што, скажы мне.

Пайшла, нават брывом не варухнула, як не пачула ўсё роўна. Няйначай, здарылася што. Можа, у хаце якія непарадкі. Ды не павінна ж, здаецца, гэткая дружная сям'я.

Цікава, госця гэтая яшчэ ў Алены? Не бачна ж было, каб ад'язджала. Хто яна такая? Пэўна, не свая, каб радня была, Дануся ведала б. Дзеўка гарадская, адразу бачна, дзеравенскія такія не бываюць. А-вой, ці не яна гэта? Ну, яна, шыбуе з-пад ракі. Сукенка мокрая і падол падкасаны – значыцца, не праз кладку перабіралася. Ідзе... Але ж і ценькая, двума пальцамі, здаецца, перашчыкнеш. Не ядуць яны зусім у тым горадзе, ці што? А й то паспрабуй ты, па цяперашнім часе. З капейчыны людзі жывуць, казаў той, што прыдбаў у краме, тое і з'еў, не тое што ў вёсцы. Дабрыдзень жа ці дасць? А, дала, нават прыпынілася.

– І вам таго саменькага. Здалёку ідзяце?

– Ад ракі. Купацца хадзіла. Да Лазовікаў як тут карацей прайсці?

– Вунака ля крыжа звернеце ўправа і якраз у Аленіну хату і ўпрэцеся.

– Добра, дзякую. – Глядзіць, а сама адно не спявае, ажно свеціцца радасцю. Жыццё: у адной слёзы на вачах, другая з усмешкаю да вушэй.

– Ну, я пайшла.

Цікава ж, Манька ці заўважыць? Заўважыла, а як жа, вунь фіранка калыхнулася. Во ўжо ахвотніца пацікавацць, ля яе хаты хіба ўначы, і то калі зацьменне, неабгледжаны хто прабярэцца. Заўсёды ўсё згледзіць, нездарма за вочы Целявізарам называюць. Убачыла, значыцца, неўзабаве тут будзе. Ну, ідзе, ды так шпарка, быццам сама сябе падганяе.

– Гвіда, мая ты суседачка...

– А, ты, Маня? Здароў была. Што скажаш?

– Я нічога. А падумала – можа, ты што? Дзеўка гэна, што тутака круцілася, ведаеш, надта ж мне некага напамінае. А каго – ніяк не ўспомню, хоць зарэж. І што за халера: вось-вось, здаецца, успомню, а тут шась, і як перавернецца ўсё ў галаве. Твар гэты... ну, далібог, недзе бачыла, а вось дзе – не даўмецца, бытта знарок хто блытае. Ты, бачыла, нешта гаварыла з ёю.

– Паздароўкаліся.

– І ўсё?

– Усё.

– А мне падалося, быццам гаманілі.

– Не, нічога не гаманілі.
– І дзе я магла яе бачыць? Хоць бы Оля ўжо хутчэй прыехала.
– Маецца прыехаць?
– Ага, на вяселле. У пятніцу павінна заявіцца. Тады раскажа, што за дзеўка. Бульба, гляджу, нішто ў цябе.
– Дзякаваць богу. Вось толькі прыніцела крыху з-за лебяды.
– Соткі, суседачка, даглядаць трэба.
Вось і заўжды так: патрэбнае выпытае, а пасля, вачэй у сабакі пазычыўшы, і абліе брудам. Бедны Юзюк, як ён з гэткаю да шасцідзесяці яшчэ дацягнуў. Фанабэры – на дзесяцярых, бач, як паважна пасунулася, кіем носа не дастанеш. Быццам у самога Папы рымскага за куму сядзела.
А дзеўка тая, піскля, нарабіла-такі пярэпалаху. А й праўда, хто яна? Мне таксама ўсё здаецца, быццам знаёмая. Можа, Дануся што даведаецца. Ды штосьці ж доўга няма. Няйначай, частуюцца з дарогі. Алена частаваць майстрыца. Адных кампотаў у яе розных – на прычэпе зараз не вывезеш. Зноў жа, без мяса-кілбасы не сядзіць, парсюка пад весну на паўтоны гакнулі. І да кілуніны, ясна, сёе-тое знойдзецца. Цяпер не забаронена, дык штомесяц дымок па вечарах над лазняю ўецца. Гаспадыня што трэба. Вось толькі каровы не мае, ды, відаць, ненадоўга тое – куды ёй, такой мясюнні, без статку. Звар'яцее без працы ды па полі пабяжыць. Не Гвідка, якой што з каровай, што без яе – усё адно, як ёсць, так і ладна. Вядома, каб не адна была, можа, і інакш усё сталася б. Вось жа не сталася, ды, можа, яно і лепей так. Стрэла неяк днямі ў горадзе таго манцёра, што чапляўся некалі... Божухна, тоўсты, сівы, а рукі ажно лекацяць з перапою. Вось бы паспытала шчасцейка, з гэткім жывучы. Добра, што з'ехаў тады. Ой, калі ж тое было, ці не ў шасцідзесятым? Ага, у шасцідзесятым. Акурат алектрыку вялі ў Александрыну, і ён тутака за галоўнага ў іх быў. Высокі, плячысты, прыгожы – вачэй не адвесці. Ну, і пачаў заляцацца. А ці ўсур'ёз, ці жартам, ці з нядобрым якім намерам – пытацца ж не будзеш. І сам нічога не казаў, адно ціскаў па суботах ля Акуневічавай пуні, дзе вечарыны ладзіліся. Прыцісне да сцяны ды давай шнарыць рукамі, ненастойліва так, быццам нехаця. Ён тады ўжо добры быў лыга, можа, таму гэтакі выдаваў вялы... Потым... Ажно ўспомніць сорамна. Ноч цёмная, хоць вока калі, а мы ў стажку збоч пуні... А пасля мне дамоў трэба, бо валасы абы-як, і твар палае, і спіна, адчуваю, у пацярусе, а цётка Рэня, бацькава сястра, з іншымі кабетамі за вартавых на вечарыне па лавах, і ключ у яе.

Прыйшлося праз акно ў хату лезці. Баялася: ну, усё, зацяжарала. Аж не, абышлося. Не так ён там зрабіў што, ці як, але, лічы, дзеўкаю засталася. А праз месяц, скончыўшы лінію, з'ехаў разам з астатнімі. Во дзе было роспачы! Але неяк суцішылася з часам. Пасля зрэдку сустракала ў горадзе, але ён нават не вітаўся ніколі, што я яму, кухля дзеравенская, ды яшчэ падкулачнікава дачка?

Але што гэта Данусі няма? Напэўна, добра Алена частуе, да смаку прыйшліся кампоты-кілбаскі. А можа, да вады куды падаліся, гарачыня ж нясцерпная, а дзеўкі маладыя, хочацца пакулогацца. Некалі сама тое любіла, за вушы, бывала, не адцягнеш ад ракі, а зараз нецікава ўжо неяк, праўду кажуць – старасць не радасць. Яно й не дзіва: за дзень так нацягаешся ў гародзе ды ля статку, што й свет зробіцца нямілы. Самакрутку сасмаліш, «Марыю» глянеш прыскакам ды ў ложак хутчэй, якое ўжо там купанне.

# Сашка

Гарадок гэты, праўда, – нішто сабе. Ціхі, зялёны. Адно кепска – занадта ўжо панылы. Увечары на вуліцы каб табе душа дзе азвалася, адно старыя сноўдаюць перад касцёлам. Здаецца, аднае і радасці ў людзей, што маленне. Моладзі дык зусім не відно, разварушацца нібыта крыху пад захад сонца, і то ненадоўга, неяк цішком, быццам баючыся. А так неблагая мясціна. Дзеўкі прывабныя і неразбэшчаныя па цяперашнім часе. Вось толькі імёны нейкія нязвыклыя, маю, напрыклад, Данусяй завуць, Дануся, Дана... Першы раз як пачуў, ледзь вушы не звялі: што за імя такое? А потым прызвычаіўся – і нічога, здаецца. Што імя, абы чалавек, казаў той, добры быў. А яна якраз і неблагая дзеўка. Праўда, занадта нервовая часам бывае, ды хто зараз, пры такім жыцці, не нервовы? А галоўнае – любіць мяне. Спачатку, як толькі пазнаёміліся, паказвала нораў, не саступала. Але пасля той купальскай ночы ў гасцініцы палагаднела, як рукою бзікаватасць зняло. Словам, што трэба дзеўка. Цела дык наогул клас, адно грудзі вялікаватыя, але гэта ўжо што каму даспадобы. Так што хай будзе, не мех з бульбай, за спінаю насіць не трэба. А то прыедзеш у рэйс, дык хоць воўкам іншы раз вый ад суму ці вязі якую з сабою ажно з Мінска. Некалькі разоў, да Данусі яшчэ, так і рабіў. Халера іх, не гэтулькі таго задавальнення, колькі турбот! Тое не так, гэта не гэтак. І жаруць, быццам месяц пасцілі. Зноў жа, шампанскім трэба пачаставаць ці віном якім. А з пастаяннаю спакайней. Вунь цэны ў

кафэ, лічы, штодня скачуць, а яна як карміла па ранейшых, так і працягвае карміць.

Адно кепска – калі на сур'ёзнае што спадзяецца. Бо тады, даражэнькая, даруй, давядзецца развітацца. Ланцугі шлюбныя не па мне, паспытаў, даволі. Ды пакуль што ціха нібыта, маўчыць. Вось толькі не развіталася нешта перад ад'ездам у сваю Александрыну. Але ат, такой бяды, іншая знойдзецца.

Тут адна заявілася была. Думаў спачатку – клеіцца. Аж не – па справе. Таксама ніштаватая цёлка, толькі вось худая занадта. Пляскатая, бы лава, каб табе бугарок дзе, што спераду, што ззаду. А з твару нічога – беленькая, вочы, як пацерыны. І без комплексаў, здаецца, з гэткімі лепш за ўсё ладзіць справу. Заявілася ды адразу ў салон. Я ажно прысвіснуў ад здзіўлення – вось гэта, думаю, падфарціла. Так і гэтак да яе, з выкрутасамі, а яна і брывом не варухне. Нага за нагу закінула, бессаромніца, ды давай клопат свой выкладаць. Маўляў, бачыла, як я з Данусяю сустракаўся, а ў той нехта з бацькоў александрынскі, дык ці не мог бы я праз яе пра нейкую цётку даведацца. Я, канечне, паабяцаў, але і плату адпаведную запатрабаваў за паслугу. Не ў лоб, канечне, а далікатна, здалёку, нібы жартам. Але яна не зразумела, здаецца, вочы вылупіла і глядзіць гэткім немаўлём, быццам толькі ўчора на свет з'явілася. А мо і зразумела, ды выгляду не падала: жанчыну раскусіш хіба адразу? Ва ўсялякім разе размова тая так нічым і скончылася. Яно, можа, гэтак і лепш, крый Бог Данууся даведалася б – быў бы тарарам, а мне гэта зусім недарэчы. Але, з другога боку, шкада, што не наладзілася справа, дзеўка файная. І не бадзяжка якая. Хоць чорт іх там разбярэ, у іншай твар бы ў анёла, хоць абраз з яе малюй, а дапнеш – халява халяваю, бы ў бот соўгаеш.

Не, хай ужо Данууся будзе. Гэтая хоць паху бензіну не баіцца. А то і такіх даводзілася страчаць: аддацца аддасца, але перад тым усю душу выцягне напамінкамі пра лазню ды кпінамі. Дырэктрыса гэтая во ў кафэ, да прыкладу. Адно й ведае, што носік свой гузічак моршчыць. Вось кім таксама заняцца б! Прынадны кавалак, асабліва калі спінаю стаіць, абапершыся на сваю стойку. З такою памітрэнжышся напачатку, затое пасля... Нібыта незамужняя, а там хто яе ведае. У дзяўчат запытацца, ці што? Кепска, Данууся можа здагадацца, ды ліха з ёю, што яна мне, жонка, ці што? Дый момант зручны: акурат у вёску з'ехала і вернецца, Наташка казала, не раней нядзелі, вяселле там у іх нейкае...

# Дан/ уся

Лёгка сказаць: даведайся. У бабулі нашай хутчэй снегу ўлетку выманьчыш, чым што вызнаеш. Такая ўжо зацятая, як упрэцца, слова з яе не выцягнеш. Нізавошта не скажа, пакуль сама не надумаецца. І заўжды, колькі сябе памятаю, гэтак было.

Спачатку, калі малая яшчэ была, думала: не давярае нікому. Аж не. Проста характар такі, не любіць мянціць языком. Гэта, можа, і няблага, ды трэба ж нейкая мера. Вось два разы ўжо папыталася пра Галіну – каб паўслова ў адказ, застыла каменем ды арудуе пруткамі, быццам у ліпені толькі гэтым і займацца. Адно і даведалася, што Галькай дзеўку зваць. Паскудніца! Нават не зачырванела стрэўшыся. Вылупіла зенкі і яшчэ ўсміхнулася, нібы роднай. Ну але пабачым... Вось толькі раскапаць, хто яна. Але ж як? Можа, чым бабу тузаць, лепш пайсці самой запытацца? Скуль ты, маўляў, тут узялася, такая нахабная? Зараз недзе на двары, во і зручны момант прыхапіць неспадзеўкі. Знянацку, каб і апамятацца не паспела.

– Галіну не чапай. – Экстрасэнс яна, ці што, наша баба?

– Чаму гэта? Што яна – святая?

– Святая не святая, а госця наша. – Тонкія ногі ў нізкіх адразаніках сутаргава ўздрыгваюць, выпростваюцца ўздоўж палавіка. – Час прыйдзе, сама ўсё скажу.

– І што гэта за сакрэты такія, што чакаць трэба?

– Замалая яшчэ, каб ведаць, падрасці крыху. Колькі тамака на гадзінніку?

– Палова трэцяй.

– Авохці мне, зачмурылася з гэтымі шкарпэткамі. Гэта ж на могільнік з дзяўчынаю збіраліся.

– На могільнік?

– Ага. – Нават дзіва, як ад такога бязважкага цела застаецца на канапе гэткая ўмяціна. – Дзе яна там?

Галька поле градку з морквай. Яна ў купальніку, і я з задавальненем заўважаю, што цела ў яе – так сабе, а рукі і плечы густа, бы хлеб кменам, перасыпаныя дробным рабаціннем. Як ні дзіўна, назіранне гэтае прыносіць не толькі радасць, але і расчараванне: Божа, і з-за ўсяго гэтага сыр-бор? Але цягнецца яно нядоўга. Галька трымаецца так самаўпэўнена, што злосць зноў накатвае на мяне хваляй, і я ледзь стрымліваюся, каб не кінуцца на

паскудніцу з кулакамі. Во ўжо... А поле, поле як! Градак яна ніколі не бачыла, ці што?

– Ну, дык хадзем, Галя? – баба – расфранчаная – не пазнаць: з новаю хусткай на галаве, у лакірках, сыходзіць з ганка, застывае каралеўнаю ля плота.

– Зараз, Алена Міхайлаўна, хвіліну.

Баба, якую і імгненне лішняга чакання заўсёды гэтак нервуе, цярпліва стаіць на адным месцы, глядзіць паўз мяне некуды ўдалеч невідушчымі вачыма.

А што, калі і мне з імі пайсці? Я выходжу з сяней, рашуча накіроўваюся да яе. Але трэба ведаць нашу бабу.

– Данусю, я тут курэй выпусціла пажыраваць, дык зрабі ласку, папільнуй, каб лехаў не падратавалі.

# Алена

Дайшоўшы да кладкі праз ручай, ад якога заставалася да могільніка зусім блізка, спыніліся перадыхнуць і тут пачулі недалёка людскія галасы. Побач пачыналіся пожні, і першая ад кустоўя належала Шумскім. Як на злосць, Манька была тут, нешта камандавала сыну і пляменніку Івону, што грузілі на падводу сена.

Алена прыспешыла крок, каб хутчэй згубіцца між алешніку, але не паспела. Азірнулася і са сполахам убачыла, што непрыяцелька яе стаіць тварам да сцежкі і цікуе за імі з-пад рукі. Аднак сполах той трываў нядоўга. Тузануўшы за локаць да сябе дзяўчыну, нібы загадзя паказваючы тым самым, што перамога ўсё роўна будзе за ёю, Алена шпарка выйшла на чыстае, упэўнена пашыбавала далей.

Што ж яна, Манька, мала паздзекавалася з яе, калі грашыла на Алеся, быццам гэта ён з Мяцяй... Ужо хто-хто, але каб Алесь! За ўсё жыццё сваё, бадай, ні разу не схлусіў. І што ж? Перад самай ягонай смерцю не ўтрымалася, выказала набалелае. А аказалася – няпраўда ўсё. Дык ці не час папомсціцца? Тыцнуць паскудніцу носам у тыя метрыкі, хай паглядзіць... І так выразна паўстаў перад Аленінымі вачамі гэты неспадзяваны, маланкава-пякучы малюнак адплаты, што яна ажно ўскрыкнула ад узбуджэння.

– Што, цётка, зноў нага? – азірнулася занепакоена Галіна.

– Ага, крыху аступілася. Але нічога, зараз будзем на месцы, вунь ужо вароты відаць.

Мяціна магілка, самая сціплая тут, з танным, зладжаным у складчыну помнікам, знаходзілася наводшыбе. Наведваючыся да сваіх, александрынцы, аднак, не абыходзілі яе, па чарзе прыбіралі, таму выглядала яна заўсёды прыстойна.

– А здымка няма, – сказала разгублена крыху – ці не ад няведання, як сябе паводзіць – дзяўчына. – На ўсіх помніках ёсць, а на маміным няма. – Што яна – не любіла фатаграфавацца?

– Не любіла, – коратка адказала Алена і пацягнулася паўз агароджу ў процілеглы канец могільніка, туды, дзе ляжалі бацькі, Алесь і сынок-першынец. Адчувала: лепш за ўсё пакінуць зараз дзяўчыну адну.

Вярнулася яна не хутка, блізу праз паўгадзіны. Галіна сядзела побач з магілкай на разасланай адзежыне, ладзіла букет з рамонкаў, якіх паспела нарваць дзесьці непадалёку. Затым паставіла слоік з кветкамі ў нагах кургана, быццам здагадваючыся, што няправільна зрабіла, запытальна зірнула на Алену.

– У нас не так ставяць, – сказала лагодна тая. – Ва ўзгалоўі трэба.

Галіна пераставіла слоік, адышлася воддаль – паглядзець.

– Я пасунуся паціху, – сказала Алена. – А ты пабудзь яшчэ крыху ды даганяй мяне.

Дзяўчына нагнала яе ля ручая, акурат у тым самым месцы, дзе ўгледзела іх Манька. Хлопцы па-ранейшаму тузаліся ля падводы, але самой Манькі не было відно. «Зырыць дзе-небудзь са схову», – падумала Алена. І сапраўды, ледзь перабраліся цераз кладку, як убачылі яе. З'явіўшыся аднекуль збоку, кабета прайшла з абыякавым выглядам метрах у ста ад іх, папраставала да сваёй дзялянкі. Гэта было неяк зусім непадобна на Маньку – прайшла побач і нават не зачапіла словам, быццам не заўважыла. Але яна і сама тае ж хвіліны, мусіць, адчула недарэчнасць уласных паводзін: раптам рэзка развярнулася, узмахнула рукой, пакрочыла хуценька жанчынам напярэймы. Наблізіўшыся, павабіла да сябе Галіну, адвяла ўбок, пачала казаць нешта на вуха.

– Што яна табе сказала? – калі дзяўчына вярнулася, спытала Алена.

– Што Оля заўтра маецца прыехаць. Яе запрасілі на вяселле, і яна можа і мяне ўзяць з сабою.

«Дык вось яно што – вяселле, – адчуваючы, як халадзее ў грудзях, жахнулася Алена. – Што ж яна робіць, гэтая дурніца? Збяруцца людзі, пачнуць лезці захмялелыя з аповядамі ды ўспамінамі, уводзіць у вушы

непатрэбнае... Ну ж, зламысніца!» Падумала так, але нічога не сказала.

# Дануся

Бацька выскоквае з кабіны, здымае на хаду майку, стрымгалоў кідаецца да вядра з вадою.

– Але ж спякота, даруй, Божа!

Баба колькі часу назірае здаля, як ён спалосквае, фыркаючы ад задавальнення, рудыя, загарэлыя грудзі, моўчкі, неяк па-петушынаму падыходзіць бліжэй, становіцца ўпобачкі.

– Ну, прывёз?

– Прывёз.

Ён вяртаецца да машыны, дастае з-пад сядзення партманет, вымае грошы, падае бабе. Тая задаволена ўсміхаецца, трымаючы купюры абедзвюма рукамі, нясе ў хату. Бацька праводзіць яе засяроджаным паглядам, падсядае да мяне на лаву. У вачах яго, блакітных, пачырванелых ад гарачыні, – нічога, апроч стомы.

– Званіла Люда, цікавілася, як ты.

– Знайшла чым цікавіцца!

– Што ж дзіўнага, сёстры як-ніяк.

Некалькі хвілін сядзім моўчкі, пазбягаючы глядзець адно на аднаго, думаем кожны сваё.

– Матка, пэўна, ужо ў Гданьску. І ахвота ж цягацца гэткую далеч па спякоце. Быццам без тых ейных заробкаў не пражылі б. А то думай, як яна там.

– Яна – нармальна, – кажу, асабліва націскаючы на першае слова.

Ён ускоквае з месца, ляпае далонню па сядзенні лавы – заўсёды гэтак робіць, калі што-небудзь не па-ягонаму.

– Што значыць – яна? А я што, па-твойму, ненармальна?

– Ну, гэта як паглядзець.

– Як паглядзець! Без рэбусаў ты, канечне, не можаш? – ён міжволі зрываецца на крык. Мяне гэта і весяліць, і адначасова палохае: упершыню бачу бацьку ў такіх нервах.

– Без якіх рэбусаў?

– Без такіх! – ён ужо не проста крычыць – заходзіцца словамі. – Знарок заўсёды гаворыш незразумела, каб пазлавацца! Я бачу! Ты... ты...

– Магу і зразумела.

Ён раптам абмякае, нібы спалохаўшыся, што я і сапраўды здзейсню намер выказаць усё, што думаю, ніякавее, адыходзіць ад лавы. Яго хлапечая, з вострымі лапаткамі спіна гарбаціцца, як у прадчуванні ўдару, твар крывіцца ў безабароннай усмешцы. Ён баіцца мяне, ды страх той, канечне, дарэмны.

– Ну, сашчупіліся ўжо. – Баба выходзіць з сянец, абапіраючыся на кіёк, прастуе да нас. – Пасаромеліся б пры староннім чалавеку. Ну, хай яна, маладая, а ты...

– Ну, вось, маеш літанію, – бацька сплёўвае, паволі крочыць да машыны.

Але мяне ўжо забрала – нібы д’ябал падсуклечвае.

– Пачакай, – кажу, ускарасквaючыся следам за ім у кабіну, плюхаюся на гарачае сядзенне.

– Што яшчэ?

– Ты хацеў ведаць...

– Што?

Я моўчкі адчыняю дзверку «бардачка», дастаю з кута карабок ад запалак з Сяргеіўнінай завушніцай. Завушніцу я знайшла ў кабіне ў мінулую пятніцу пасля таго, як ён вярнуўся з рэйса пазней звычайнага. Сяргееўна акурат перад тым, нейкая нязвыкла мітуслівая, пайшла ў той дзень дахаты адразу па абедзе, а назаўтра заявілася ў кафэ без упрыгожанняў. Гэта было так непадобна на яе, што ніякіх сумненняў у мяне не засталося.

У яго, відаць,– таксама, бо маўчыць, як вады ў рот набраўшы, адно зобам варочае, быццам паветра яму не хапае. Сядзіць, абшчаперыўшы руль абедзвюма рукамі, і кропелькі поту несупынным раўчуком сцякаюць па шыі пад кашулю.

– Толькі гэтага клопату не хапала, – кажа нарэшце, паварочваючы ключ запальвання. – Не хвалюйся, матцы сам скажу.

Я выскокваю з кабіны, не азіраючыся, крочу да хаты. Сорам і сполах трымцяць ува мне камертонам, вязнуць увушшу, ледзяняць кроў. Няўжо сапраўды скажа? Не, толькі не гэта. Я паварочваюся, каб спыніць яго, але ўжо позна: фургон кранаецца з месца.

# Гвіда

– А куры?

– У паветку заперла.Вернуцца – хай удзвюх пасвяць, калі гэткія сяброўкі.

Зарослы чаромхаю лог нарэшцн канчаецца. Мы перасякаем луку і неўзабаве апынаемся ля затокі. Некалі тут была купальня, а зараз усюды густое кустоўе альхі, і прадзерціся праз яго не так проста. Апроч гэтага даймае крапіва, яе таксама з каптуром, і адкуль толькі насеялася. Вада ў рацэ рудаватая, але толькі на вірах, на быстраку ж вясёлая і празрыстая, як і даўней.

Дануся скідае туфлі, не зважаючы на пякучку, шлэпае хмызам да касы, што вытыркаецца метры на два на згібе пратокі. Затым, не распранаючыся, кідаецца ў вір, знікае пад вадой. Ну ж нялюдскае!

Але страх мой дарэмны. Праз колькі хвілін яна вынырвае, вылазіць назад, на касу.

– Зноў вочы чырвоныя, ці не плакаць пад ваду хавалася?

– Выдумляй абы-што, – кажа, адводзячы пагляд. – Купацца будзеш? Дык распранайся. Ці, можа, саромеешся мяне?

Я расшпіляю верхні гузік кофты, але сцягваць яе не спяшаюся.

– А як жа ў лазні распранаешся?

То ў лазні: скінуў усё, і гатова. Ніхто не бачыць, якое яно на табе, дзе лапіна, а дзе, можа, і не надта чыстае.

– Ладна, я адвярнуся.

Яна адварочваецца, я хуценька скідваю з сябе ўсё, не чакаючы, калі выгляне з-за хмары сонца, уваходжу ў ваду.

– Летаў пяць не купалася, – кажу, пераадольваючы непрыемнае адчуванне холаду ў нізе жывата. – Чаго добрага, сутарга яшчэ сцягне.

– Колькі прыязджаю ў Александрыну, гэтулькі і чую ад цябе ды ад бабы пра сутаргу.

– Што ж дзіўнага?

Яна ведае – нічога. І я таксама ведаю, хоць і даўно тое было, гадоў ці не дванаццаць таму. Во гэтак шлыганула дзеўка ў ваду, і ледзь рады пасля далі. Адразанік, што не ўратавалі, напэўна, згніў дасюль у ціне, другі, што застаўся на назе, Алена спаліла адразу, каб не заставалася напаміну.

Але яна, падобна, іншае памятае.

– Гэтак ногі тады змуляла, здаецца, і зараз яшчэ гараць.

– Скажы дзеду-нябожчыку дзякуй, што паганяў вакол хаты, каб не ён, невядома, ці купалася б сёння. Запаленне – гэта не жартачкі.

– Дзякуй. І табе таксама.

Куст воддаль ад касы гучна расхінаецца, і на беразе нечакана, як з-пад зямлі, вырастае мажная, камлюкаватая Маньчына постаць.

– Купаецеся? Тое, гляджу, пашыбавалі логам. Мы з мальцамі якраз сена на дзялянцы парадкавалі, я і заўважыла. А там Алена з дзеўкаю гэнай, на могільнік цягаліся... Ужо дахаты пайшлі. Я здагадалася, гэта ж яны на Мяціну магілку хадзілі, далібог. Мяціна дачка яна, вось хто! – апошнія словы яна вымаўляе чамусьці шэптам, азіраючыся па баках. – Я адразу, як толькі яна сюды заявілася, заўважыла падабенства. А цяпер і зусім пэўная. Ты ж глянь, Гвіда, чыстая Мяця, адно танейшая за матку...

– Ну дык што?

– Як гэта – што? Забылася хіба, як яна вашай сям'і нашкодзіла, тая дурніца?

– Дзеці за бацькоў не адказваюць.

– А, бач, не адказваюць! Якая ты добрая! А табе ж ці добра было, як без бацькі засталася? – Манька падкасвае падол спадніцы, мільгаючы ікрамі, перабягае праз вузкую палоску вады назад, да хмызу. – Ну, глядзі. Сама сабе гаспадыня.

Яна знікае ў кустах, і мы з Данусяй зноў застаемся адны.

– Што гэта за гісторыя з Мяцяй? Што яна пляла тут?

– Так, было дзела. Было ды сплыло... Што ты возьмеш з дуракаватай? Узялі за сведку, задалі некалькі пытанняў пра бацьку ды і ўхапіліся за тыя адказы. Як не бачылі, каго дапытваюць. На ейных паказаннях і справу зладзілі... Цяпер гэтая заявілася.

– Паскудніца.

– Табе ўжо што яна зрабіла?

– Можа, не менш як табе, – Дануся мая на вачах хмурнее, твар робіцца калючы, нібы ажынавы куст. – Што яна цягаецца тут? Хай бы ехала сабе, адкуль з'явілася. І чаму ты мне ніколі пра гісторыю гэтую не расказвала?

– У бабы сваёй пра тое папытайся, а не ў мяне.

– Папытаюся.

– Ага, паспрабуй.

– І паспрабую, – кажа і глядзіць у твар такімі вачамі, быццам есці просіць.

Распавесці ёй, ці што? Не дзіця, дзевятнаццаць дзеўцы. Але ж чорт яго, наробіш звады расповядамі. Хто ведае, што ў Алены наўме? Не, хай самі разбіраюцца.

– А можа ты ўсё-такі...

– Барані Бог, – кажу, ледзь-ледзь вытрымліваючы зацяты, з мальбою пагляд. – Што ты, Дануся?

Сапраўды – што? Забылася, хто я? Гвідка-вар'ятка ды і чужая табе.

# Дануся

І не думала ніколі, што можна во гэтак... «Што ты, Дануся?» Ды голасам якім – быццам чуж-чужаніца адна адной. Адно не сказала таго – і за гэта дзякуй.

Баба ж, наадварот, здаецца, сама сябе пераплюнула. Нават угаворваць не прыйшлося, ад першага запытання як на споведзі ўсё выклала. І пра Мяцю, і пра дачку яе. І пра размову з Манькай таксама. Апошняга, пэўна, не зрабіла б, калі б ведала пра мае да дзеўкі рахункі. Ды хто ёй скажа пра іх? Не сама ж Галька, вядома. Яна, дуракаватая курыца, мабыць, і сама не здагадаецца, аж пакуль носам не тыцну. Цяцера цяцерай – ды што ж, казаў той, яблык ад яблыні...

Вось усё, лічы, і пастала на свае месцы. Цяпер толькі Гвідку ўламаць, а там, глядзіш, і папомсцімся. Доймем так, што сама лататы дасць.

Бабе, канечне, не след нічога казаць. Яна дзіўнаватая, акурат, глядзі, наадварот зробіць, парве план. Сама ж наўрад здагадаецца, не да таго – бы сляпая, вобмацкам ходзіць, усё думае аб нечым. Можа, па карове сумуе. Пяць хвілін таму запыталася, дзе ніткі – каб схамянулася. Але гэта не страшна, з ёю здараецца: перуны смалі – нізавошта не пачуе. Раней, калі меншая была, мяне гэта палохала, а цяпер нічога, прывыкла. Іншы раз, як надакучыць усё, дык нават хочацца, каб нешта такое здарылася. Адно непрыемна – вельмі ўжо ўніклівая робіцца ў такія хвіліны. Быццам у душу глядзіць, а што там бачыць – аднаму Богу ды ёй вядома. Вось так, як зараз, галаву падыме ўгору, нос прыморшчыць і ўзіраецца, узіраецца. І галоўнае, пасля ніколі пра тое не ўспомніць, запытайся – адно плячыма пацісне: ты пра што гэта, маўляў?

А я адчуваю, не так сабе ўсё гэта, ёсць нешта нейкае, куды яна знарок нікога не пускае.

– Эх, людзі...

Ага, нібыта пачынае адыходзіць. Вось уздыхне зараз, апусціць рукі і пойдзе, быццам нічога ніякага, па справах.

Але што гэта – не рухаецца. Стаіць, як аслупянелая, на месцы, глядзіць на Гальку праз шыбу. А тая і вухам не вядзе, адно ведае ля парэчак круціцца. Не бачыла яна іх раней ніколі, ці што? Паўкуста

амаль аблаташыла, і як не званітуе ад кіслі. Во за ажыну ўзялася, няўжо і яе будзе пхаць у рот, зялёная ж зусім. О, жуе. Вось і скажы ты, што вар'яцтва не спадчынная хвароба. Матка ў лялькі да пяцідзесяці гуляла, дачка свет спазнае на трэцім дзесятку, кіслае ад салодкага, небарака, не адрозніць. Сямейка! І баба – хоць бы што, маўчыць, як нямая, каб я гэтак, даўно ад куста таго пагнала б, а тут... Тая тым часам зноў на парэчкі ўссела, можа, дустам іх пасыпаць?

– Ты гэта вось што, унучка, – а голас жа, голас! – з Манькаю не надта радніся.

І шыбуе на ганак, адтуль – праменька да парэчніку. І пачынае сама ягады абіраць. Выбера спялейшую, ды не сабе ў рот, а дзеўцы на далонь: частуйся, маўляў, даражэнькая. А тая нібыта толькі і чакала гэткае выгоды, адно і ведае, што жменю падстаўляць. Вось табе: з Манькаю не радніся, а самой чужое раднейшае за роднае. Далібог, нічога не цямлю, усё ў галаве перавярнулася. Во да жоўтых дапялі. Ужо не па адной, а прама з галінак зубамі сашморгвае. Праціўнота. Чым такое бачыць, лепей з Гвідкаю пустапарожняе пераліваць.

– Надоўга ты? Не заседжвайся надта. У Галі сёння дзень нараджэння, трэба адзначыць як след. Так што не марахонь тамака, хутка вяртайся.

Ага, абавязкова. З пукам кветак, руж ды гладыёлусаў, каб надоўга запомніліся імяніны.

– Віншую!

– Ой, дзякуй, мне дваццаць чатыры споўнілася. А табе колькі?

– Дваццаць дзесяць!

– Прабач, я не...

– Не зважай, любая, гэта ў яе настрой кепскі. А так яна неблагая дзеўка.

І на тым дзякуй!

Апромеццю выскокваю з панадворка, брыду ледзьве прытомная ў накірунку Александрыны. Да вёскі рукой падаць, але спякота такая, што, здаецца, шляху гэтаму не будзе канца.

Гвідка сядзіць на кукарачках у засені дрэва, палошча ў начоўцы дробную, з арэх, радыску.

– Халера, так і не вырасла, трасца яе, – кажа, адкідваючы з узмакрэлага ілба паску валасоў.

– Дык хай бы расла яшчэ, да Купалля, глядзіш, і аклямалася б.

– Ага, краты дадуць, злыдні. Паўгарода за тыдзень перакапалі. Ведала б, што гэтак будзе, тытуню лепш насадзіла б.

– Пасеяла б сланечніку. Чытала недзе, надта баяцца яго краты.
– Праўда? К налецему пасаджу, калі не забудуся. Няўжо сапраўды дапамагае?
– Так напісана.
– Ат, дрэнь, што напісана, толькі галовы людзям тлумяць сваімі пісаннямі... Дзеўку бачыла?
– Бачыла.
– Вось яшчэ на нашу галаву. Сядзіць, і што ты ёй зробіш.
– Нічога і не трэба рабіць, само зробіцца.
– А-ей, што ты надумалася? – выцвілыя шэрыя вочы імгненна цямнеюць, надброўныя дужкі з рэдкімі валасамі цягнуцца вышэй.
– Нічога, адчапіся ад мяне.
– Ладна. Можа, з'есці што хочаш? Павідла ёсць.
– Не, дома вячэра чакае. Дзень нараджэння ў нас.
– Дзень нараджэння? Ты ж у лістападзе нарадзілася. Баба ў сакавіку, здаецца.
– Галька імяніннiца.
– Вось яно што! І хто стол ладзіць?
– Хто? Баба!
– А госці ж будуць? – Яна злівае з начоўкі брудную ваду, закурвае.
– Не ведаю, не пыталася.
– На вяселле збіраешся да Гайдуковых?
– Збіраюся.
– А дзеўку запросяць, як думаеш?
– А гэта не мой клопат.
– А чый жа тады?
Чый? Ой, Гвідка, не надзівіцца на цябе: ці сапраўды ты вар'ятка ці толькі ўдаеш?
Дадумваю тое ўжо на вуліцы, па дарозе дахаты. Думаю сабе, а ногі самі нясуць паўз цёткі Манькі сядзібу. Бо яе не сустрэць у радыусе паўкіламетра – стопроцэнт немагчыма. Але што гэта? Ужо і параўнялася з хатаю, і гароды мінула, а яна хоць бы шэптам азвалася. Не, нібыта ляпнулі нечым ззаду. А вось і голас – крыху сіплаваты ад хвалявання, але гучны, без звыклага прысвісту.
– Пляменніца, а, пляменніца! Што гэта ты, ля хаты была, а нават не даведалася мяне. Я сяджу ля акна: чакаю: ну, зараз зверне, а яна ў той бок не зірнула. Ці не ўсердзілася чаго?
– Мы ж не сварыліся з вамі, здаецца, дык чаго мне сердзіцца?

– А й праўда. – Яна згодна матляе галавой, бярэ мяне пад руку, цягне да хаты. – З Аленай калі пасварымся, дык то наша справа. У мяне характар, у яе таксама, ці мала як бывае ў жыцці. А ты маладая, што табе нашы звады, сваім одумам павінна жыць. Оля мая заўтра маецца прыехаць, вось, можа, сходзіце куды разам.

– Куды тут сходзіш, у гэткай глухамані?

– Як куды? А на вяселле?

– Ну, хіба што на вяселле. Але ж я яшчэ няпэўная, ці пайду. Бо толкам не запрашалі, цераз бабу перадалі.

– Праз бабу? – цётчыны вочы круглеюць, вусны крывяцца ў няшчыра-здзіўленай усмешцы. – Я скажу Надзі, што гэта яна! Хай палюдску запросяць, як след. А то – праз бабу... І дзеўку могуць запрасіць, не абʼесць.

– Яе ці не запрасілі ўжо.

– Ну дык вось! – цётка ўскідвае галаву, у вачах яе – блакітных, з кароткімі вейкамі – непрыхаваная радасць. – Вось і добра, і пойдзеце разам.

І хоць мне і брыдка ад яе весялосці, я ўсміхаюся, пераадольваючы непрыязнасць, па-змоўніцку міргаю ў адказ.

– Пойдзем.

– І я кажу, – працягвае яна. – А то што ж гэта такое – рады ў гады сустракаемся, нібы чужыя. Ізноў жа, дзяўчына хай паглядзіць, як у нас вяселлі ладзяцца, таксама ж не чужая.

– Як гэта – не чужая?

– Ат, хадзіла некалі пагалоска, – цётчын пагляд робіцца ўніклівавінаваты, быццам яна міжволі, сама таго не жадаючы, выказала немаведама якую тайну. – Хіба баба табе не казала нічога?

– Не.

– Ну, на Алену гэта падобна. – Яна на хвіліну змаўкае, прыжмурвае вочы. – Наконт дзеда твайго тут... Нібыта... Ай, не буду казаць, закрыўдуеш яшчэ на мяне.

Мне і клопату толькі – на яе крыўдаваць.

– Кажыце, не бойцеся.

– Ну, калі так... Але ж няго сапраўды не ведаеш? Не? Ну, тады скажу. Толькі ж глядзі, бабе ні слова. У яе, у Алены, заўжды паўтара людскога, ужо як уабʼе што ў галаву, калом адтуль не выбʼеш. А справа от якая. Дзеўка гэтая, Галька, што ў вас зараз, ці не дзеда твайго дачка...

– ?

– Ага, уся Александрына некалі пра тое гаманіла. Канечне, толкам ніхто нічога не ведае, але ж гуляла такая пагалоска. Мне што, я тое толькі, што ад людзей чула, кажу, аднак дыму без агню не бывае. Ёсць, значыць, нешта нейкае, так, без дай прычыны, вярзці не будуць. Дзеўка ў яе, у Мяці, знайшлася... І дасць жа Бог калецы. Бач, і не крывая якая, і не дурная, здаецца. Як каму разумнаму, дык чортведама што пашле, а тут...

Яна гаворыць хутка, без супынку, праглынаючы канчаткі – не жанчына, а камбайн на вытворчасці слоў. Мне і брыдка гэта, але разам з тым і соладка: хвіліна, здаецца, і сама ператваруся ў гэткую ж няўцямную, аслепленую злосцю балаболку.

– Але ж вам, цётка, што яна зрабіла?

– Мне? – падцінае яна вусны і змаўкае ў недаўменні. – Мне-е? Ды праціўна, мая ты пляменніца. У Александрыне ад веку нічога такога не здаралася, а тут на табе, маеш... Цяперака, чакай, гэтая сухарэбрына маладая што-небудзь выкіне. Вар'яцтва, яно, кажуць, і праз колькі каленаў перадаецца.

– Але ж дзіўны вы прыдумалі спосаб яе пакараць.

– Які спосаб? – усхопліваецца яна. – Я хіба сказала табе што? Гаворыш, як спіш.

# Гвіда

А-ей, во каша заварылася. Гэта ж жылі сабе спакойна, як людзі, і гэтак усё за два дні перавярнулася. Хоць, папраўдзе, што нам тая дзеўка? Ну, прыехала і прыехала, і хай сабе. Дык не ж... Халернае здарэнне. А дзеўка сапраўды вылітая Яніна, што з твару, што з хады. Аднае розніцы, што розумам Бог не абдзяліў. Вывучылася во, глядзі, робіць, значыць жа, кумекае нешта. Матка, тая, бывала, і ў той бок не зірне, дзе работа, толькі і здатная была поліўку сёрбаць. Аднаго разу прапанавала дзеля смеху ў талаку – бульбу палоць. Як усхадзілася! Ажно затрэслася ад абурэння: што ты, маўляў, якое поліва, не бачыш хіба, што я інвалідка. Ах ты, сякая-такая, кажу, як з мужчынамі пацвельвацца, дык першая, а як зрабіць што – няма цябе. А яна: дык што ж я – вінаватая, што чапляюцца?.. Потым з цяжарнасцю гэтай гісторыя... Гэтулькі часу мінулася, а так ніхто нічога толкам не ведае. Нават Манька не ведае, хоць і выдае, бытта нешта вынюхала. Каб так было, іначай сябе паводзіла б. А то на аднаго тыцне пальцам, на другога. Ну, але яно і зразумела – сама не святая. Дакладна ведаю, на

уласныя вочы бачыла гадоў дваццаць таму. Юзюк ейны тады на ферме фуражырам рабіў, але надта ж загадчыкам хацеў стаць. А тут якраз нагода: папярэднік ягоны, Сцяпанавіч, нечакана памёр. Ну, Юзюку і прапанавалі пасаду, толькі загадалі перад тым у парцію ўступіць. Ён і ўступіў, хоць матка з бацькам і страшылі, што праклянуць, бо парцейцы ўсе Бога не прызнаюць і ў касцёл не ходзяць. Але ён не паглядзеў на тое. Бо надта ж выгодная была справа тое загадчыцтва. Бурак які, мучыну, шматок сена – усё можна прыцягнуць дармавое з фермы, і высільвацца не трэба. Зноў жа, конь у руках. Казаў той, і ўлежна, і ўежна.

Ну, уступіў, значыцца. У дзень прызначэння сам старшыня Савуць, нібыта блаславіць, прыехаў. І з ім яшчэ адзін – ці то сваяк які старшынёў, ці то з канторскіх хто. Манька, вядома, застолле наладзіла, а мяне папрасіла радоўку за карову адбыць, іхняя чарга якраз была. Адбыла я, ганю ўвечары Васіліну дадому. Чую, гамэрня ад ракі, ажно кусты разлягаюцца. Глядзь, а то Савуць з Юзюком, штаніны падкасаўшы, бродаюць у адбымку ўздоўж берага, песні спяваюць. Упіліся, значыць. Я да Шумскіх, карову ж трэба спарадкаваць. Прывязала Васіліну ды ў хату. А там... І пасёння тое рыпенне ды Маньчыны стогны ўвушшу стаяць. Яна, Манька, тады не такая была, як зараз. Статная была кабеціна, вось ён і ўспянцёрыўся. Не ведаю, ці бачылі яны мяне, мабыць, не, але выскачыла я з хаты, бы кіпенем апараная, ды ходу.

Во такая Манька: як кажуць, у сваім воку... А мне дык тая Мяціна любошч ані не абыходзіць. Іншае смыліць: як яна тады бацьку падставіла. Дай ты веры, злавілі небараку на ўездзе ў горад: «Ты чаго тут з мяшком за спінаю цягаешся, Савецкую улась ганьбіш? Александрынская? Аніську Петрака ведаеш? Што за чалавек? Жартаўлівы? З калгасу кпіў? Ага!» І загрымеў чалавечак.

Яно, канечне, дзеці за бацькоў не адказваюць. Але ж во прыехала, і ўскалыхнулася ўсё. І як ты ні круці, варожасці не пазбудзешся. А можа гэта я такая занадта помслівая, што гэтак усхадзілася? Ну, але хай сабе я – вядомая справа. А Дануся? Што ёй трэба ад гэтай няшчаснай? Ліні, здаецца, з конаўкі – засіпіць ад злосці. Што да чаго? Можа, у горадзе як сутыкнуліся? І пра Сашку свайго каб слова. То, бывала, вушы ўсе прагудзіць, а тут маўчок, быццам і няма яго. Адчуваю, нешта не так, а пытацца няёмка. Хто яна мне? Чужая, а чужы родным, як ты ні жадай таго, не стане. Як і дурань разумным. Во хоць бы Мяціну сям'ю ўзяць. Матка яе, дзеўчына баба, таксама

нібыта з выкрутасамі была. Не такая, як дачка, але ж усё роўна... Няшчасная дзеўка! Выйдзе замуж, народзіць дзяцей, а якія яны будуць? Вось і задача Алене: сказаць усё ці лепш змаўчаць? Скажаш – з панталыку саб'еш. І не сказаць нельга, бо ўсё роўна знойдзецца які дабрадзей, ляпне, і тады яшчэ горш будзе. Во такая Манька, да прыкладу. Не сама расплявузгае, дык іншага каго падсуклеціць. Знарок, каб Алене наўпроць зрабіць. У іх даўняя варажнеча, не любяць адна адну, хоць і былі за братамі. Асабліва пасля той залеташняй мітрэнгі, калі Баранок-выпівоха памёр. Таксама гісторыя. Пайшоў чалавек уранку да Зінкі-ўдавы касіць, а апоўдні знайшлі нежывога на пожні. Перапіў небарака, рынуўся спаць ды і не прачнуўся. Ну, Бараніха, хоць, вядома, не надта і шанавала нябожчыка, на дыбы супраць Зінкі: пасаджу, маўляў, сцерву, навошта паіла. І нарабіла б непрыемнасці, калі б не Алена. «Што ты, – кажа, – Зіна, хіба пра помсту зараз трэба думаць. Чалавек памёр, ушанаваць яго трэба як след. Ну, не дала б Зіна гарэлкі, у іншым дзе месцы знайшоў бы». Тым і скончылася.

І наогул яна дзіўная, Алена. От, здаецца, спагадлівая, а іншы раз такою чэрствай падасца, што ажно вусцішна зробіцца. Нядаўна, з месяц таму, да прыкладу, Вольгу, сяброўку яе найлепшую, хавалі. І што ж? Слязінкі не праліла, хоць бы для выгляду. «Няўжо табе ані не шкада Вольгі? – пытаюся. – Ніколі ж болей не стрэніцеся, не пагамогніце». – «А мы пра ўсё, што трэба, пагаманілі», – адказала і чырк па шыі: маўляў, досыць, во гэтак нагаварыліся. Ці той выпадак узяць, калі хлеў у яе загарэўся. Усе мітусяцца наўкола, гвалт, крык – а ёй хоць бы што, сядзіць сабе на прызбе ды на агонь пазірае, быццам зачараваная. «Не сядзі так, Алена, – штурхаюць яе, – рабіць нешта трэба, восень на дварэ, куды скаціну дзенеш». А яна: «Так трэба», і каб табе зварухнулася з месца.

І заўжды во гэтак, што б ні здарылася – адна песня: так трэба.

Цікава, як тут ужо будзе з дзеўкай? Ці ўстане-то яна супраць Манькі? Бо тая, далібог, на месцы не ўседзіць, нештачка будзе надумляцца. Калі ўжо не надумалася, вунь якая ўзрушаная ходзіць.

# Манька

Матка мая так казала: усё, што ні зрабі, назад да чалавека вяртаецца. Як у ваду нябожчыца глядзела, разумная была, дарма што

неадукаваная. Вось каб яшчэ да таго, да каго след, тое зробленае вярталася.

Дзіва, як я яе, дзеўку гэтую, адразу, калі першы раз убачыла, не прызнала. Бо ўся ж Юзюк. І нос гэткі ж кірпаты, бульбінай, як у яго, і вочы, і вусны. Дай ты рады, радзімка на перадплеччы – ну акурат як у яго была, гэткім жа шматком. Не ўцямлю, як Алена яе не заўважыла.

Кілун недарэзаны, мала баб было яму наўкола, на вар'ятку паквапіўся. Я адразу здагадалася, што гэта ён. Пасля думаю – не, дай праверу, а раптам няпраўда. Прыціснула яе ў лазні ды давай сцюдзёнай вадою паліваць: кажы, маўляў, сякая-такая, ад каго, а то на лядзяшку замаражу. Ну, яна і не вытрымала, расказала ўсё як было.

А так было. Ён з фермы захмялелы вяртаўся, яна з лялькамі сваімі на водмелі кулогалася. Ну, і загарэўся сабачына, п'янаму што – вада па калена. Яна адбівалася нібыта, але я не надта ў тое веру. Колькі там таго Юзюка было, ды яшчэ на падпітку – пальцам піхні і паваліцца. Словам, дамогся свайго.

Адно дзякаваць богу – ні сам нікому не пахваліўся, ні яна не прадала. А то б хоць ты ў магілу жывая ад сораму кладзіся. Спачатку разыходзіцца хацела, ды куды падасіся з малымі: Олі паўгода, Віцю пяць з паловай. Каму патрэбная будзеш? А тут, як-ніяк, выгода. Статку поўны хлеў, і спадніцы на анучы не трэба дзерці. Нашкуматаў цадзілак і насі сабе, аж пакуль мазалёў не натрэш. Раздумалася гэтак і вырашыла: буду цярпець, не я адна такая, з горшымі бабы жывуць. Канечне, да сябе перастала паскудніка падпускаць, ды ён не надта, здаецца, аб тым бедаваў.

І вось жа собіла за гэткага выйсці. Маладая была, дурная, на цяперашні розум нізавошта не згадзілася б. Дзеўкай выходзіла, а ён – што, падзякаваў за тое? Аддзячыў дык аддзячыў: учотчыку клюгастаму, ці хто ён там, у пашчу кінуў. Сам упіўся, а жонку з мужчынам чужым сам-насам пакінуў: выкручвайся, маўляў, як знаеш. А той пеўнем: «Фярмоўства – гэта, гаспадыня-хазяюшка, справа выгодная». Ды бліжэй, ды ў абдымкі. От табе і анучкі-цадзілачкі... Добра, не ўведаў ніхто. А маглі б уведаць, Гвідка акурат адбывала радоўку, што, калі б зазірнула? Яму, вепруку, што – на ложак паваліў ды арудуе, а ты тут потам халодным ад сораму ды страху аблівайся. Цьфу! Больш дваццаці гадоў мінула з таго дня, а дагэтуль помніцца.

Цяпер гэтая прыпаўзла немаведама чаго. Сядзела б у сваім горадзе, дык не, маткі надумалася шукаць. Быццам матцы той толькі і клопату было, каб яе шукалі. Настырная, бачна па ўсім, дзявуля. Але ж нічога, дамо як-небудзь рады. На Гвідку, відаць, мала спадзеўкі, а вось Данусю ўпаўне можна ўламаць. Яна, папраўдзе, дзеўка наравістая, з чужой указкі не надта возьмецца што рабіць, але ёсць адна прынада. Ведаю пра ейныя з Івонам шашні, вось і пацягну за матузок. Гэта ж не жартачкі, хлопцу семнаццаць ледзь споўнілася, а з чужой пасцелі не вылязае. Абы сшарэла, так коўдру ў рукі ды на двор. У хаце, маўляў, горача, дый мухі пад раніцу даймаюць, лепей на кладні, у прахалодным начаваць. А сам тым часам да Лазовікаў. Вось табе і кладня. Што яны там удвух – венікам адзін аднаго абмахваюць, ці што? Мне што, хай сабе, а калі непрыемнасць якая здарыцца? Ці яшчэ горай – прывучыць мальца да сябе, а пасля кіне калеку, нацешыўшыся. Куды ён потым? Так што Данулька ў руках, лічы...

Ногі гэтыя, халера іх – ані заснуць. Абы прылёг, так і пачынаюць гудзець. Да доктара, можа, зноў звярнуцца? Ды што яны, тыя дактары, разумеюць. «Солі, цётка, солі...» А я наогул салёнага не ем, наадварот, колькі жыву, на салодкае цягне. Дык што ён, той цукар, на соль у брусе перарабляецца? А то яшчэ на ўзрост паківаюць. А што ўзрост? Вунь Гвідку ўзяць... Семдзесят амаль, а смаліць больш за любога мужчыну, і не баліць ніколі нічога. Ці тая ж Алена: на шэсць гадоў за мяне старэйшая, а хоць бы што ёй, каб не з нагою непярэліўкі, жвавей за любую маладзіцу бегала б. Ну, у яе характар такі, хвіліны без справы не пасядзіць, заўжды папярэдзе ўсіх. Гэтак і Алеся перахапіла. Ён да мяне спачатку заляцаўся. Паўгода сустракаліся, а потым як рукою любоў зняло. Не ведаю, чым яна яго прываражыла, толькі неўзабаве пабраліся. А мне за Юзюка давялося ісці, бо нікога лепшага побач не аказалася. Так во парадніліся. Хоць, папраўдзе, якая там радня, яны, Юзюк з Алесем, не аднаго бацькі былі. Таму і прозвішчы розныя: яе Лазовік, мая – Шумская. А магло б быць наадварот. От тады я паглядзела б... Ды ладна, што старое варушыць, што было, таго не вернеш, адно нервы ўспамінамі развярэдзіш. Казаў той, жывому жывое, а яны абодва даўно ў магіле, добра, калі ад костачак што засталося.

А з дзеўкаю – давяду-такі справу.

# Дануся

Цікава, колькі яна можа выпіць? Трэцюю кульнула, а цверазей цвярозага, хоць бы ў адным воку. Вось гэта страўнік. Кажа, ад бацькі, прадзеда майго, перадаўся. Той нібыта штовечар еў хлеб з салам, а запіваў малаком, а ўранку скардзіўся, што кішкі змацаваліся. Мо і мне часам той гарт перадаўся? Няблага было б, ды дзе там. Вось ужо і галава закружылася, і перад вачамі паплыло. У Галькі таксама, відаць, – языком ледзь варочае, сто першы раз дзякуе за падарунак.

Ежы – поўны стол, але ніхто не есць, бо горача. Затое мухам раскоша.

Хлоп-хлоп-хлоп. Баба прыўзнімаецца, страсае з пеліны на падлогу з дзесятак камякоў. Яна майстрыца лавіць мух, колькі памятаю яе, заўсёды гэтым займалася. Галька – бялюткая, як снег, адно вушы гараць ды носік уздрыгвае ад агіды.

– Вошай латвей паляваць, – заўважаю я. – Злавіў ды цісь на зуб – усяго і клопату.

Госця, глытаючы сутаргава паветра, выскоквае з-за стала, апрамеццю імчыць з пакоя на веранду, адтуль – на двор. Праз хвіліну яна стаіць ля плота, трымаючыся за штыкеціну, ванітуе ў вяргіневы куст.

– Вярзеш абы-што, – голасам, у якім ні на каліва пачуцця, кажа баба. – От стварэнне.

Я маўчком падымаюся з месца, прастую ў сенцы, адтуль – у пуню. Дзесятая гадзіна, і спаць хочацца так, што ажно зводзіць сківіцы.

– Коўдру вазьмі, змерзнеш на скразняках.

– Не бойся, не змерзну, – кажу, узбіраючыся па драбінах на кладню. – Лета на двары.

Праз дзірку між дошак закота панадворак бачны, як на далоні. Баба з Галінаю таўкуцца ля плота, адна ліе з каструлі ваду, другая палошча зубы. Ужо цемнавата, і іх постаці адсюль, зверху, нагадваюць цені. Нарэшце абедзве знікаюць.

Я вяртаюся да лежбішча, плюхаюся з разгону на прахалодную прасціну. За сцяною хлява патрывожаны певень выдае кароткае «кы-кы», і зноў усё аціхае. Напэўна, да раніцы, бо калі прыйдзе Івон, я буду так моцна спаць, што наўрад прачнуся. Я, канечне, не чакаю яго, але ведаю: прыйдзе абавязкова. Кульнецца ўпобачкі, баючыся варухнуцца, будзе да раніцы карміць байкамі. І нічога такога, крый Бог. Бо калека і да таго ж занадта далікатны. Чырванее, як дзяўчына.

Ад угрэтай за дзень рубероіднай страхі гарачынёй патыхае, як з печы. Кашуля мая імгненна робіцца воглай, цела апаноўвае сверб – здаецца, уся жамяра, колькі яе тут ёсць, на кладні, накінулася на яго.

Унізе чуецца слабы шоргат, нехта адчыняе дзверы. Але то не Івон, яго я адразу пазнала б.

– Хто там?

– Гэта я, Галіна, – адказ гучны, хоць і не вельмі ўпэўнены. – Ты спіш?

– Сплю.

– А-а, – яна змаўкае, у нерашучасці топчацца ля кладні. – А я пагаварыць хацела з табою.

– Пагаворым заўтра, я стамілася.

– Заўтра дык заўтра. – Дзверы з рыпам зачыняюцца, я чую, як яна асцярожна шлэпае па трасотніку ўздоўж сцяны да хаты. Урэшце крокі аціхаюць, і тае ж хвіліны дзверы зноў адчыняюцца, нехта сунецца вобмацкам да драбін. Гэта Івон. Я бачу скрозь цемру, дакладней, адчуваю кожны ягоны рух, чую, як стрымлівае ён няроўнае сваё, збітае хваляваннем дыханне. Я пасоўваюся ўбок, даючы яму месца побач. Ён валіцца на прасціну, моўчкі кладзе далонь мне на плячо. Гэта штосьці новае, і яно мяне бянтэжыць. Я выпростваю руку, каб адпіхнуць яго ад сябе, але тут жа адхопліваю яе.

– Ты голы?

– Я купаўся, усё мокрае. Майку зняў унізе, думаў, тут будзе горача, як мінулы раз.

– Сёння не горача. – Я накідваю на ногі прасціну, адсоўваюся ўбок... – Спі ці ідзі дахаты.

Ён паволі ўстае, колькі хвілін моўчкі стаіць нада мною.

– Таму што я калека, так?

Божа, што ён выдумляе?

Я хапаю яго за нагу, цягну штосілы назад, на прасціну.

– Івон...

Я адчуваю ягоныя слёзы на руцэ, абдымаю яго, цалую ў мокрую шчаку. У галаве – суцэльны туман. Я сілюся разгледзець у цемры ягоны твар, але бачу замест яго худы, з блакітнымі вачамі пад рудаватымі вейкамі – Галінін... Калека... Хлопчык-мужчына з кульгаваю паходкай... Дзяўчо з лялькай у руцэ... Слёзы... Тоўстая маладзіца з вялізным жыватом на падлозе, хістаецца... Дзеўка ля плота... Рука...

– Данусся!
– Івон...
Дыханне роўнае, як сонечны прамень. Посвіст цвыркуна – адкуль ён тут? Рука на плячы – не тое, не, не! Я вызваляюся, адсоўваюся.
– Івон, ты мне падабаешся.
– Няпраўда.
– Падабаешся. Ты цудоўны хлопец.
– Але ж ты не любіш мяне.
– Люблю.
– Кахаеш?
– Люблю.
– Але не кахаеш?! Чаму!
– Гэтага ніхто не ведае.
Гарачыня імгнення змягяецца сцюжай, я пераварочваюся ніцма, нацягваю на спіну ватоўку. Каўнер адзежыны пахне рошчынай – на млын у ёй возяць, ці што? Івон туліцца да мяне, прыхінаецца шчакой да шчакі. Губы нашы на імгненне сутыкаюцца, але толькі на імгненне. Ён раптам размыкае рукі, і ўсё ягонае доўгае, спружыністае цела робіцца вялым, бы кісель.
– Івон, табе нядобра?
Ён ляжыць дагары на голым сене, сам голы, збоч прасціны, раскінуўшы ўбакі ногі, устрапёна ўзіраецца ў цемру. Што ён думае, якую ісціну імкнецца спасцігнуць? І хто дапаможа яму?
Я паварочваюся на бок, тварам да яго, нахіляюся – так блізка, што адчуваю вуснамі ягоныя вусы.
– Івон!
Але ён, падобна, ужо не чуе мяне. Моцным штуршком адпіхнуўшыся ад лежбішча, ускоквае на ногі, сцішана брыдзе да драбін.

Гадзінніка няма, а сонца, якое ледзь-ледзь узбілася на прысады, паказвае самае вялікае на палову сёмай. Але баба ўжо на нагах. Я бачу ў шчыліну, як яна накульгваючы спяшаецца да хлява. У правай руцэ ў яе даёнка, у левай – луста хлеба. Дайшоўшы амаль да дзвярэй, яна раптам спыняецца, бразгае даёнку вобзем, зможана апускаецца на бэльку паўразбуранага прысценка. Няйначай, зноў забылася, што каровы няма. Мне ўсё гэта смешна і разам з тым шкада яе – відаць, да скону будзе сябе кваліць.

Тым часам з хаты выходзіць Галіна. На ёй жоўтая кашуля і кароткія, няпэўнага колеру, шорты. Спехам спаласнуўшы пад рукамыйнікам твар і далоні, яна бяжыць бабе насустрач, падхоплівае даёнку, штосьці кажа напаўголасу. Тая згодна матляе галавой, нешта паказвае на мігі.

Яшчэ зусім рана, і мне хочацца спаць, але гэта ўжо наўрад удасца.

– Данутся, ты не спіш?

Я вытрымліваю паўзу – такую акурат, якой дастаткова, каб паказаць, што яна мяне разбудзіла, стараючыся не шамацець сенам, адсоўваюся ад шчыліны.

– Хто там? – пытаюся, прыкрываючы рукою рот – нібы пазяхаю. – Што здарылася?

– Нічога не здарылася. Хачу пагаварыць з табой. Учора ж дамаўляліся.

– Н-не ведаю, я яшчэ, здаецца, як след не прачнулася. Але ладна, давай, толькі нядоўга.

Яна ўзлазіць на кладню, колькі хвілін уважліва глядзіць на мяне, быццам вагаецца, казаць тое ці не, што надумалася, затым пасоўваецца бліжэй, датыкаецца незнарок нагамі да маіх.

– Ой, прабач!

Я гляджу на яе з-пад паўраскрытых павек, дзіўлюся з яе нерашучасці.

– Ну, дык што ты хацела сказаць?

– Не сказаць – параіцца. Алена Міхайлаўна раіць мне тэрмінова ехаць адсюль. А чаму – нічога толкам не кажа. Вось я і падумала да цябе звярнуцца...

– Да мяне? Па дапамогу?

– Да цябе. А што тут дзіўнага?

– А не скажы! І якая ж дапамога табе патрэбная?

Вочы яе халаднеюць: мой недружалюбны тон, відаць, насцярожвае яе і адштурхоўвае. Яна колькі часу вагаецца, але ўрэшце патрэба бярэ верх.

– Наконт мамы. Быццам штосьці недагаворвае твая баба. Хваліць, апавядае, якая маці была добрая і разумная, але я адчуваю... Мне здаецца, ёсць яшчэ нешта.

– Табе, мабыць, уяўляецца гэта.

– Не ўяўляецца. Нешта не так. А што? Дапамажы мне даведацца.

– Ну, я ж таксама не тутэйшая, адкуль мне ведаць. Гэта па-першае. Па-другое...

– Што па-другое?

– А, так, глупства.

– І што мне зараз рабіць?

– Гэтага я не ведаю.

То праўда – сапраўды не ведаю.

І спаць ужо зусім не хочацца.

Баба стаіць спінаю да хлява, штосілы мянташыць палавіком аб вугал прысценка. Убачыўшы Галіну, якая выходзіць з пуні, яна кідае палавік на траву, вабіць дзеўку да сябе, і яны ўсаджваюцца на лаве пад вокнамі ў некалькіх кроках ад мяне. Чуваць іх добра, і я міжволі навастраю вушы.

– Я не разумею, вы такая спагадлівая да мяне, а гэтак... выштурхваеце. Чаму?

– Таму што іншыя могуць не быць такімі. Трэба ехаць.

– Я ўжо сабралася.

– І куды падасіся?

– У мяне жаніх у Петрапаўлаўску. Запішамся, і паеду туды.

– Петрапаўлаўск – гэта далёка, пэўна?

– Далекавата. Але ўсё роўна я сюды зноў калі-небудзь прыеду. Хоць праз дзесяць гадоў.

– Прыязджай.

Праз хвіліну абедзве накіроўваюцца ў хату, а яшчэ праз чвэрць гадзіны зноў з’яўляюцца на панадворку. У Галіны цераз плячо сумка, баба трымае ў руцэ нейкі вандзэлак – ці не харч у дарогу. Не зважаючы на дробны дожджык, яны моўчкі шыбуюць да сцяжыны, што вядзе паўз гароды да аўтобуснага прыпынку.

Я стрымгалоў выскокваю з пуні, у роспачы, не ведаючы, што рабіць, гляджу, як абедзве аддаляюцца ад хаты. Першае, што прыходзіць у галаву, – кінуцца зараз да Манькі, расказаць усё, а яна ўжо здолее іх апярэдзіць, затрымае, не дасць дзеўцы знікнуць.

І тут – бачу Івона. Ён нечакана з’яўляецца з-за гародаў, прытрымліваючы рукою хворую нагу, няспешна сунецца мне напярэймы.

– Ты куды гэта? – пытаецца, і зацятая, упарта-праніклівая ўсмешачка, якой я ніколі раней у яго не бачыла, раптоўна асвятляе ягоны звычайна пахмурны, неяк вачавідкі пасталелы твар. – Па цётку? Яна не выйдзе.

– Чаму не выйдзе? Што ты вярзеш?

– Я замкнуў яе ў хаце, – адказвае ён і паказвае ключ. – Прабач, я чуў вашу ўчарашнюю размову і пра ўсё здагадаўся.

www.kamunikat.org

І тут я сапраўды бачу паўз ягоную галаву цётку Маньку: яна роспачліва мітусіцца ля фіранак, бездапаможна тузаючы забітыя звонку цвікамі рамы вокан, крычыць штосьці наўздагон пляменніку.

Тым часам баба з Галінаю ўжо на грудку. Праз хвіліну-другую з'явіцца аўтобус, і ўсё будзе скончана. Я падбіраю ключ, які Івон кідае мне да ног, моўчкі гляджу, як ён, цягнучы нагу, подбегам, хутка, як толькі можа, кідаецца да прыпынку. Потым бачу, як ён дапамагае ўсцягнуць Галіне ў аўтобус сумку, як абое месцяцца на розных сядзеннях ля акна, паказваюць нешта бабе на мігі...

Калі баба вяртаецца, я сяджу на лаве пад акном, раблю выгляд, што чытаю.

Яна бярэ з плота даёнку, варушачы вуснамі, кульгае да хлява.

– Што кажаш? – пытаюся.

– Прыязджай, прыязджай, – не зважаючы на мяне, кажа яна. – Праз дзесяць гадоў тут нікога жывога не застанецца.

# ЭПІЛОГ
# Дануся

– Хоць бы зазірнула калі. – Наташка відавочна адчувае сябе няёмка, хоць і стараецца схаваць няёмкасць пад маскаю весялосці. – Усе ўспамінаюць цябе. Днямі Сяргееўна пыталася.

– Ладна, можа, як-небудзь зайду, – кажу так, дзеля прыліку.

Тры месяцы таму я звольнілася з кафэ. Цяпер сяджу дома, рыхтуюся да паступлення. Боўдзіла, што неяк улетку выказваў вялікае жаданне «пагушкацца», аказаўся не абы-кім – выкладчыкам сельскагаспадарчага інстытута. Жаданне ягонае хутчэй за ўсё так і застанецца жаданнем. Хоць гэта і не Івон – слова ласкавае сказаў – і даволі.

Дома ў нас, як заўсёды, вэрхал. Маці па-ранейшаму ў вандроўках. Колькі мы з бацькам ні ўгаворвалі яе кінуць гэтую дурную справу – нізавошта не згаджаецца. Падобна, уцягнулася і ўжо жыць не можа без яе.

Бацьку нядаўна перавялі на міжгароднія маршруты. Цяпер я яго таксама рэдка бачу, і калі сустракаемся – перакідваемся словам-другім, і на тым канец. Пра Сяргеіўніну завушніцу, я, вядома, нічога маці не сказала. Ён, здаецца, вельмі мне за тое ўдзячны.

Сашка знік. Перастаў ездзіць, і ні слыху, ні дыху, як скрозь зямлю праваліўся. Ва ўсякім разе са жніўня месяца я яго не бачыла. Але не надта аб тым бядую – святое месца, як кажуць... Так што хай здраджвае каму іншаму. Наогул, дзіўлюся, як тады яго да Галіны прыраўнавала, было б каго раўнаваць.

Баба нядаўна атрымала ад Галькі ліст з фотаздымкам, які павесіла над ложкам у самым прыкметным месцы. Яшчэ яна купіла карову, але не адна, а ў складчыну з Гвідкай. Зараз па чарзе даглядаюць. Наязджаючы зрэдку ў Александрыну, я, здараецца, жартую пад настрой, якія яны, маўляў, зрабіліся нягеглыя, што па адной не агораюць гаспадаркі, і тады абедзве ў адзін голас адказваюць: «Можа, і так яно, дзетка, але ж не заракайся. Ніхто не ведае, як век звякуе».

# ТАМ, ДЗЕ НАЙЛЕПШ

Самалёт зрабіў у паветры некалькі кругоў, пайшоў на зніжэнне. Манашка, што сядзела побач з Юрыем Іванавічам, перажагналася, з перасцярогаю пазіраючы ўніз, пачала маліцца. Толькі цяпер, угледзеўшыся ў твар жанчыны, ён заўважыў, якая яна маладая. «Гадоў дваццаць пяць, не болей», – падумаў і схіліў галаву да ілюмінатара, за якім ледзь прыкметна трымцела крыло «Боінга». Горы пад імі зніклі, але горада яшчэ не было відно.

Папраўдзе, яму не надта карцела ў гэты Рым. Нечаканае запрашэнне ад Янкі, якое Юры Іванавіч атрымаў з паўгода таму, напрадвесні, больш напалохала яго, чым узрадавала. Дзе тая Італія, ды і ўзрост, дзякаваць Богу, паважны – семдзесят тры. Яшчэ праз тыдзень сябар зноў прыслаў ліст, у якім прасіў напрамілы Бог не адмаўляцца ад паездкі. Тым больш, што ўсе расходы, звязаныя з пражываннем, ЯНЫ бяруць на сябе, а нейкія там паўтысячы даляраў на дарогу ў абодва канцы ды кошт страхоўкі для IX – наогул нявартая размовы драбяза. Што да гадоў, дык людзі, маўляў, і не ў такім веку вандруюць, і не па такіх мясцінах. Юры Іванавіч доўга вагаўся, але ўрэшце Янкава настойлівасць перамагла.

І вось яна – Італія.

Самалёт тарганууся раз, другі, пракаціўшыся колькі соцень метраў па паласе, спыніўся. Манашка скончыла маліцца, з палёгкаю ўздыхнула, усміхнулася Юрыю Іванавічу:

– Gratuluje panu,przylecielismy!1 – сказала, падхопліваючыся з месца. – Niech pan idzie za mna2.

Ён апрануў пінжак, пакорліва падаўся следам за жанчынаю да выхаду. Разгубленасці, якая гэтак неспадзявана апанавала пры пасадцы ў Варшаве, тут, у Фіумічыне, не было і блізка.

У багажнай зале народу было няшмат.

– Czy nie na pana czekaja, – здымаючы з эскалатара сумку, сказала манашка. – Z tamtej strony1.

Юры Іванавіч азірнуўся. На другім канцы залы, ля выхаду, сапраўды, стаяў чорнавалосы малады чалавек з плакатам у руцэ. На плакаце былі напісаны кірыліцай вялікімі літарамі ягонае, Юрыя Іванавіча, прозвішча і імя.

Ён падхапіў свой цяжкаваты, знарок для гэтага падарожжа куплены чамадан, накіраваўся да хлопца. Манашка, трымаючы высока прыгожую, у аздобе чорнага з белым, галаву, пакрочыла побач з ім.

– Signore Juri? Buongiorno! Mi chiamo Michele2, – ледзь яны наблізіліся, сказаў маладзец і дадаў па-руску: – Пожалуйста, идите со мной. Сеньёра с сеньёром?

– Nie, – манашка адмоўна хітнула галавой. – Jestem sama3. Мы разэм с паном летели из Варшавы.

– Jestem bardzo wdzieczny siostrze za opieke4.

Яна перажагнала мужчын і знікла ў натоўпе.

Мікеле вывеў Юрыя Іванавіча на вуліцу, і яны пайшлі ўздоўж жалезнай агароджы да аўтастаянкі.

Раптам нейкі чалавек у джынсах, які дагэтуль ціхамірна стаяў ля адной з машын, перагарадзіў ім дарогу, схапіў Юрыя Іванавіча за руку.

– Прывітанне, браце! – грымнуў басам і так ірвануў госця да сябе, што ў таго ледзь не зваліліся з пераносся акуляры. – Вось дык сустрэча!

Не пазнаць гэты голас было немагчыма.

* * *

– Гэтат дзяцёнак у мяне даскачацца! – цётка Антоля шпурнула кошык у кут, злосна перасмыкнула вуснамі. – Ану, хадзі сюды!

Ежык глыбей уціснуў голаў у плечы, стаў як укапаны між сталом і старою, сточанаю шашалем шафай. Здалося: жораў на набіўным дыванчыку над бабуліным ложкам спачувальна махнуў крылом. Але гэтага, каб уратавацца, было недастаткова. Ненавісны, з глыбокімі ямкамі на шчоках твар цёткі набліжаўся з кожнаю хвілінай.

– Не руш мяне, а то ўсім раскажу, як ты цалавалася з Адасём! – адчайна – адкуль бралася смеласць – закрычаў ён.

– Што? Што ты раскажаш? – Антолін голас зрабіўся сіплы ад абурэння. – Ах ты, шчанюк! Мала што паскудзіш усюды, дык яшчэ цікаваць надумаўся!

І яна з яшчэ большым імпэтам пайшла на Ежыка.

Тады ён, ледзь памятаючы сябе ад страху, і адважыўся на такі адчайны крок: адштурхнуў яе ўбок і выскачыў на двор.

Яна кінулася за ім следам і, напэўна, дагнала б, калі б з-за хмызу не выйшаў дзед з караваю на повадзе.

– Халера яе, знова Маліна на быка ўзнялася, – сказаў з прыкрасцю ў голасе і дадаў, звяртаючыся да дачкі: – Прынясі скібу хлеба, павяду ў сяло, да Зэнусевага бугая.

Цётка Антоля, пазіраючы спадылба на Ежыка (маўляў, пачакай, размова не скончана), нехаця паплялася ў хату. А ён тым часам хіснуўся на пагорак, за якім пачыналася адразу агромністае жытнёвае поле.

Яно, гэтае поле, цягнулася аж да Шальцінаў. Ва ўсялякім разе, калі маці тыдзень таму вяла Ежыка сюды, на дзедаў хутар, каб пабыў, пакуль пакладуць столь у новай хаце, нічога іншага па дарозе: ні лесу, ні гаю, ні нават хмызу – ён не бачыў. Адно поле. Месцамі такое сіняе ад васількоў, што адбірала вочы.

Ён зайшоў у збажыну, блытаючыся ў ёй босымі нагамі, пасунуўся ў супрацьлеглым ад хутара кірунку. Недзе далей, памятаў, мелася быць сцяжына. Толькі вось як яе знайсці? Але нічога, ён знойдзе. А як не? Што, калі заблудзіцца? Можа, вярнуцца, пакуль не позна? Неўзабаве прыйдзе з поля бабуля, і тады ніякая Антоля не будзе страшная. Тым больш – якая ягоная віна? Сушонік у беразнячку за хлявом, з-за якога разгарэўся сыр-бор, ён збіў зусім ненаўмысна. Да таго ж грыб быў ужо добра ўчарвелы, што за карысць з яго? Ды не. Цётка не даруе, асабліва цяпер, калі ён сказаў пра Адася... Яна наогул яго, Ежыка, недалюблівае, нездарма ўвесь час скардзіцца дзеду, нібыта ён усім замінае. Так што трэба шукаць сцяжыну.

І ён пайшоў далей. Нагрэтае за дзень калоссе балюча сцябала па твары і шыі, звычайна пяшчотныя васількі, крапаючыся між пальцамі ног, да крыві рвалі скуру. Апроч таго, даймала казяра.

І тут сонца, нібы вырашыўшы злітавацца і над уцекачом, і над бяскрайнім полем, пачало імкліва апускацца за небасхіл. Напалоханы думкаю, што хутка зусім сцямнее, Ежык сабраў апошнія сілы, расхінаючы жыта рукамі, адчайна рынуўся наперад.

Ён бег доўга, мабыць, з паўгадзіны, калі не больш – пакуль хапіла моцы. Калі ж яна скончылася, лёг ніцма на цёплую зямлю, заплюшчыў вочы.

Аднекуль здалёк, быццам з другога канца зямлі, пачуліся галасы. Ежык адразу пазнаў іх, асабліва другі, рэзкі і такі непрыемны –

цётчын. Хай сабе крычаць, ён усё роўна не выйдзе. Памрэ тут, на полі, і тады яны паплачуць...

Галасы колькі часу набліжаліся, але затым пачалі пакрысе аціхаць. І нарэшце зусім прапалі.

Ежык варухнуўся, праганяючы стому, ускочыў на ногі. Пэўна ж нельга тут заставацца, трэба далей шукаць дарогі. Але куды ісці, у які бок?

Ён падскочыў угору, напружыўшы вочы, паспрабаваў разгледзець няпэўнае, прыхопленае ўжо шарачком наваколле. Ды дарма: жыта было занадта высокае.

Тады ён заплакаў – моцна, уголас, нібы спадзеючыся на цуд.

І цуд адбыўся. Збажына паблізу заварушылася, зашумела. Нехта, расхінаючы перад сабою калоссе, сунуўся прама на яго. Ежык утуліў галаву ў плечы, не ведаючы, чаго чакаць ад невядомай істоты – збавення ці, наадварот, нападу, – пачаў адступаць назад.

– Што ж ты ўцякаеш, га? – Ценькі блакітнавокі хлапчына ў зрэбнай кашулі, не нашмат вышэйшы за Ежыка, як з-пад зямлі вырас перад ім, дружалюбна ўсміхнуўся, падаў руку. Ён таксама, як і Ежык, быў басанож, і між пальцаў у яго гэтаксама сачылася кроў. – Ты што, заблудзіўся?

– Ага.

– То ж край поля, як тут можна заблудзіцца, – не даў веры хлопец і паказаў пальцам убок. – А вунака наша хата. – Ежык зірнуў туды і сапраўды ўбачыў комін і страху. – Ладна, пайшлі.

Яны выйшлі на ўзмежак, нібы жадаючы апярэдзіць прыцемак, хуценька пакрочылі да хаты.

На панадворку маладая жанчына ў саматканай спадніцы, падобная з твару да хлопца, кінула развешаныя на вяроўцы пафарбаваныя ніткі, пайшла ім насустрач.

– Хто ты, малец, што тут робіш? Янка, дзе ты нашоў яго?

– У жыце, дзе яшчэ, – сказаў паважна Ежыкаў выратавальнік і саступіў убок

– Як зваць цябе? – працягвала дапытвацца жанчына.

– Ежык.

– Ежык? Ці не Марылін ты сын з Шальцінаў?

– Марылін.

– Як жа ты трапіў сюды?

– Ад бабы іду, заблудзіўся.

– Матка Боска – заблудзіўся! – Яна скубнула Янку за рукаў. – Сынок, вядзі яго ў хату. Ён, пэўна, прастаў. І есць, пэўна, хочаць. Пачастуй яго... – яна схілілася да сынавага вуха. – А як паясцё – адразу кладзіцеся спаць. А зрання завяду цябе, маміна згуба, у Шальціны, добра?

Янка праводзіў нечаканага госця ў сені. Адтуль, натыкаючыся ў цемры адзін на аднаго, трапілі ў істопку. Гаспадар запаліў лямпу, паставіў яе на стол.

– А гэта ты ці відзеў? – сказаў нейкім урачыстым голасам і адчыніў адну з дзежак, што стаялі, накрытыя дзяругай, радком ля сцяны. – Хочаш пакаштаваць?

– Хачу.

– Тады на лыжку. – Янка падаў самаробную драўляную лыжку, пераставіў бліжэй лямпу. – Еш, сколькі захочаш, у нас многа яго.

Ежык пасунуўся да дзежкі, пераадольваючы няўпэўненасць і сарамлівасць, тыцнуў лыжкаю ў мёд раз, другі. І доўга смакаваў, і зноў чэрпаў і аблізваў лыжку – аж пакуль не загарчыла ў роце.

* * *

– Я таксама не люблю самалётаў. – Янка зняў капялюш, прыгладзіў далонню густыя, нягледзячы на ўзрост, валасы. – Ну, але ўсё ў мінулым. Вось, пазнаёмся, гэта мой зяць Мікеле.

– Мы пазнаёміліся ўжо.

– Si, e vero1, – пацвердзіў малады чалавек і пайшоў з чамаданам наперад, да бліскучага чорнага аўто.

– Зараз да мяне паедзем, – працягваў Янка. – Сядай наперадзе, лепш бачныя будуць табе нашы краявіды.

Юры Іванавіч уладкаваўся поруч з Мікеле, які аказаўся і за вадзіцеля, Янка – на заднім сядзенні, дзе ўжо сядзела нейкая немаладая жанчына ў летнім капялюшыку і такой шырокай сукенцы, што вольнага месца побач з ёю не заставалася. Янка бесцырымонна змахнуў падол з сядзення, прыкурыў ад газнічкі сам, даў прыкурыць жанчыне. Абое з асалодаю зацягнуліся дымам. Мікеле запусціў матор, і аўто кранулася – так імклівa, што Юры Іванавіч ад нечаканасці амаль што ўліп у спінку сядзення.

– Напалохаўся? – засмяяўся Янка. – Прывыкай, брат, у Італіі ўсе гэтак, без разгону, стартуюць.

Выехалі на шашу. Юры Іванавіч прагна ўзіраўся ў краявід за акном, але нічога адметнага, незвычайнага пакуль што не бачыў. Бетон, нейкія ангары абапал дарогі, несупынны рух. Расліннасць на ўзбочыне – чэзлая, рудаватая ад сонца. І толькі агромністыя, усе ў квецені, кусты дэкаратыўных раслін крыху ажыўлялі, разнастаілі даволі невыразнае, падпісаванае блізкасцю вялікага горада відовішча.

– Вунь Апіева дарога, – абыякава паведаміў Янка, паказваючы ўбок. – Тая самая, пра якую, калі памятаеш, дырэктар наш у гімназіі, пан Войцік, расказваў. Да горада дванаццаць вёрст, праз паўгадзіны будзем дома.

– Як не трапім у затор, – падала голас жанчына. – Не загадвай наперад – прагаворыш.

Гаварыла яна па-беларуску, праўда, з акцэнтам. Юры Іванавіч азірнуўся. Жанчына глядзела на яго з-пад капелюша ўважлівым засяроджаным паглядам і іранічна ўсміхалася. «Але ж і фарбы на ёй, – падумаў ён, пераводзячы позірк на дарогу. – Жывога цела не відаць». Уявіў гэтак размаляваную сваю Таццяну і ледзь утрымаўся, каб не зарагатаць.

– Даляцеў без прыгод? – спытаў Янка. І тут жа, не дачакаўшыся адказу, дадаў: – Хто тая манашка?

– Не ведаю, не пытаўся. Мы ў Варшаве пазнаёміліся, у зале чакання. Яна не ўпершыню ў Італіі, ну, я і вырашыў на ўсялякі выпадак побач трымацца.

– Ого, дык вы Селадон?[1] – гучна сказала жанчына і засмяялася.

Тым часам уехалі ў прыгарад. Уласна, гэта быў і не прыгарад: усё тая ж шаша, толькі збоч яе і крыху далей углыб – рады жылых дамоў. Абгароджаныя высокімі жалезнымі платамі, яны нагадвалі крэпасці. На засмечаных тратуарах перад імі не было відаць ні душы. Усё як вымерла: вокны закрыты жалюзі, і толькі зрэдку дзе ўгледзіш на балконе, між кветак, чалавечую постаць.

– Цяпер улева, – скамандавала жанчына. – Во так.

Мікеле прытармазіў. Жанчына выйшла з машыны, абдаўшы мужчын воблакам парфумы, цырымонна развіталася з кожным за руку.

– A presto![2]

Затым падышла да варот, націснула кнопку і праз хвіліну, не азіраючыся, ужо крочыла па дарожцы ўгору, дзе патанаў у зеляніне соснаў і магнолій будынак Дома паляка.

– Хто яна? – ашаломлены паводзінамі старой, а яшчэ больш – яе знешнасцю, спытаў Юры Іванавіч.

– Няўжо не пазнаў? Не можа таго быць! – здзіўлена выгукнуў Янка. – Ну, паўспамінай, паўспамінай як след!

* * *

Сабака выскаліў зубы, напяўшы ланцуг так, што між ім і ганкам застаўся зусім вузенькі лапік панадворка, пагрозліва гыркнуў.

– Ну, ты, забыў ужо? Перастань! – Юрка штурхнуў дзверы, зайшоў у сені. – Ёсць хто ў хаце?

– Ёсці, – пачуўся з кухні жаночы голас. – Уваходзьце. А – ты, Ежык. Добры вечар. Янка, хадзі глянь, хто прышоў.

Янка выйшаў з пакоя ў кухню, грукаючы чаравікамі па ўтрамбаванай да звону земляной падлозе, падаў госцю руку.

– Мама, не заві яго Ежыкам, ён не любіць. Я ж казаў табе.

– Прабач, Юрачка, – папраўілася жанчына. – Я ўсё па старой звычцы. Як твае маюцца?

– Нішто, дзякаваць Богу.

– Радыя, пэўна,што ты вывучыўся? Дзе робіць будзеш? Цяпер, кажуць, і вучоным нялёгка працу дастаць.

– Цяжкавата, праўда. Хацеў у школу дзе ўладкавацца – няможна, усе месцы занятыя. Хоць ты ў агародніке да пана наймайся.

– Брэшуць, няйначай, што занятыя, – сказаў Янка. – Ім беларусы ў школах, як навароджанаму табака. Усюды б сваіх толькі ставілі. Вун Стасік Альшэўскі на бракоўшчыка па льне хацеў уладкавацца – таксама адмовілі, здароўе нібыта не дазваляе. На словах за роўнасць усе, а як да справы дойдзе...

– Ціху ты, – панізіўшы голас да шэпту, накінулася на сына Вольга. – Пачуець хто – тады паагітуеш. – І дадала, звяртаючыся да Юркі: – Вось і вучоба тая, Юрак! Шэсць гадоў ты сушыў мазгі ў гімназіі, а наедку з таго? Можа, і да лепшага, што нашаму не ўдалося давучыцца. Хоць і шкада, канечне... Спадзяваліся, усёй сям'і будзець палёгка, як вывучыцца, а тут во... Знова, грошай ці мала змарнавалі. Вун пакуль з запашкі на сваю зямлю ўзбіліся, сколькі сіл ды поту паклалі. А ўсё з-за пераезду гэтага. Каб сядзеўшы на хутары, дык якраз і абышлося б усё, можа, і давучыўся б малец.

– Падумаеш, вучоба! – азваўся весела Янка. – Толькі галаву забіваць усялякім глупствам. Ад аднае лаціны можна ачмурэць. Vanitas vani-tatum![1] Фу! Званітуе, пакуль выгаварыш.

Хлопцы засмяяліся.

– Хто ж яго ведаець, як лепей, – крыху павесялеўшы, паціснула плячыма жанчына і выйшла ў сені.

Няёмкае маўчанне, якое заўсёды ўсталёўвалася паміж маладымі людзьмі, як толькі яны заставаліся сам-насам пасля такіх размоў, і на гэты раз пагрозліва завісла ў паветры, пад нізкаю, абкуранаю дымам і параю ад катлоў столлю. Па Юрку дык наогул нічога на свеце больш прыкрага за яго не было. Але ж хіба ён вінаваты, што так сталася?

Янка першы паступіў у гімназію. Бацькі яго мелі невялікі кавалак зямлі, і тое давала надзею. За Юрку, як за бяднейшага, палову плаціла гміна. І дацягнула да апошняга класа. Лабэцкія ж, перабраўшыся з хутара ў вёску, неўзабаве змізарнелі, і Янка, не дабыўшы ў гімназіі апошняга, выпускнога года, вымушаны быў кінуць вучобу.

Так што якая ягоная, Юркава, віна? І ўсё роўна ён адчуваў сябе перад сябрам няёмка. Адно згладжвала сітуацыю: Янка ніколі на лёс не наракаў. Ды яшчэ, нібы знарок, заўсёды першы парушаў прыкрае маўчанне.

– Чалавек пятнаццаць будзе сёння на вечарыне, калі не больш, – сказаў і на гэты раз, прыгладжваючы пяцярнёю назад непаслухмяныя, густыя, як збажына ў добры год, валасы. Затым дастаў з-пад лавы святочныя хромавыя боты, пачаў асцярожна за вушкі ўсцягваць па чарзе на ногі.

– І даўно ў вас гэткая завядзёнка – вечарыны па запрашэннях? – спытаў Юрка.

– З мінулага лета. Заможныя ў мястэчку зазвычай ладзяць, ну, і нашыя, серадлякі, вырашылі... Дарэчы, цябе як самага вучонага тут запрасілі.

– Ну, дзякую. Але ж за гонар такі, напэўна, плаціць трэба.

– Не трэба нічога. Выдаткі за кошт гаспадароў. Пірагі, сам ведаеш, нябедныя людзі, калі трохі іх у кошт угонім.

Праз колькі хвілін хлопцы, абодва пры пінжаках на светлыя, з шырокімі каўнярамі, кашулі, перагаворваючыся, весела крочылі па апусцелай вуліцы да хаты Пірагоў.

Сустрэла іх дачка гаспадароў Зося – флегматычная непрыгожая дзяўчына гадоў дваццаці пяці. Яе ўжо некалькі разоў спрабавалі аддаць замуж, але як толькі справа даходзіла да заручын, заўсёды атрымліваліся непярэлійкі – найперш з-за яе характару. Цырымонна прывітаўшыся, Зося павяла новых гасцей у хату. Яны ўжо былі на ганку, як з сенцаў выскачыў ім насустрач Зосін брат Юзік, з гучным

воклічам кінуўся да хлопцаў. Ён, як і Юрка, вучыўся ў гімназіі, толькі на два класы ніжэй. Навука давалася Юзіку цяжкавата, але бацька ягоны, заможны млынар, не шкадаваў на тое грошай, так што к канцу года ўсё неяк уладкоўвалася. Улетку мінулага года, калі толькі-толькі пачала арганізоўвацца ў Шальцінах суполка па вывучэнні беларускай мовы, Юзік адным з першых прыйшоў да Юркі, папрасіў і яго запісаць. Але на занятк і так ні разу і не з'явіўся: не дазволілі бацькі.

– Juzio, co to jest? – Зося скубнула брата за рукаў, няўхвальна перасмыкнула вуснамі. – Поўна гасцей, а ты яшчэ у юхтовіках. – Co o nas ludzie pomyslia?

– Я ж па ваду хадзіў, – адказаў хлопец і маланкаю знік у бакоўцы – пераабувацца.

У хаце было досыць горача, але вокнаў не адчынялі: як заўсёды ў гэтую пару, баяліся, каб не напусціць з вуліцы мух.

Пасярод лепшага пакоя, дражнячы ежаю і пітвом, месціліся два сталы. Па-святочнаму прыбраныя дзяўчаты завіхаліся ля іх. З прыходу, ля дзвярэй, стаяў яшчэ адзін стол – на ім чакалі свае хвіліны музычныя інструменты.

Янка і Юрка павіталіся агулам з усімі, уладкаваліся на лаве ў куце, дзе сядзела ўжо дзяўчына гадоў семнаццаці ў бэжавай манголевай сукенцы. Незадаволеная, відаць, новымі суседзямі, яна грэбліва зморшчылася, пасунулася ўбок.

– Прабачце, што патурбавалі, – збянтэжаны яе непрыязнасцю, сказаў Юрка.

– Nie szkodzi, – холадна адказала дзеўка і неяк натужліва, быццам праз сілу, усміхнулася.

Зося, якая бачыла ўсю гэтую сцэну, мусіць, вырашыла прыйсці хлопцам на выручку.

– Czy masz juz zaproszenie na nastepna sobote, Halina?– спытала, адганяючы ручніком муху, што, нягледзячы на пільнасць гаспадароў, утачылася-такі ў пакой.

– Jeszcze nie, – крыху мякчэючы з твару, адказала дзяўчына. – Ale dzisiaj chyba dostane.

– Ага, дастанеш, – паблісікваючы з парога новымі ботамі, уступіў у размову Юзік. – Як заявяцца саветы, тады ўсе дастанем.

– Крый жа Бог, каб заявіліся! – азвалася з кухні старая Піражыха, Юзікава і Зосіна бабуля.

– Niech babcia sie nie martwi, Pan Bog i nasz Prezydent tego nie dopuszcza, – сказала Зося і, перажагнаўшыся, дадала: – Дык проша за стол, панове. Восьмая гадзіна, час падсілкавацца.

Так сталася, што вяртацца ў той вечар дадому Юрку давялося разам з Галінай. Дзяўчына жыла з бацькам (ён кіраваў у пана Аскеркі зямельнымі справамі) пры маёнтку, а гэта, як на злосць, якраз было яму па дарозе.

– Гэта праўда, што вы памянялі імя? – ледзь аддаліліся ад хаты Пірагоў, спытала яна. – Вы што, не ўважаеце сябе за паляка?

– Не ўважаю, – адказаў ён знарок як найбольш рэзка. – А вы сябе?

– Мая матка полька, а бацька – тутэйшы. Я ж, хоць тут і гадавалася і нават, як відзіце, збольшага гавару на мясцовым дыялекце, беларускай сябе не лічу.

– Вы тут гадаваліся? Але чаму тады я вас раней не сустракаў?

– Значыць, размінуліся. – Яна ўзняла ўгору бровы, спынілася. – Тут, у маёнтку, я не часта бываю – колькі тыдняў улетку. Стала мы жывем у мястэчку. Я і тата. Мама родам з Кракава, там яна і зараз жывець з маім малодшым братам Казікам. Яна выйшла за простага насуперак жаданню сваякоў. З гэтага прычыніўся скандал, і яны з татам жывуць зараз урозь. Я зрэдку езджу ў Кракаў, вось і скора знова збіраюся. А вы, Зося мне казала, гімназію скончылі?

– Скончыў.

– І дзе маеце намер робіць?

– Не ведаю яшчэ. Зараз цяжка ўладкавацца. Асабліва такому, як я...

– Вы і ваш сябар так дзіўна мовіце: кажа, піша, бачу, трэба, ведаю. Што гэта за дыялект такі?

– Гэта не дыялект, а праўдзівая беларуская мова.

– Зразумела. Ну, а што ў вас яшчэ адметнага, апроч яе? Вы сказалі: такому, як я...

– Я меў на ўвазе – такому... тутэйшаму.

– А-а, – яна ўпершыню за цэлы вечар усміхнулася, абагнала Юрку, пайшла паперадзе. Яе тонкая, як спавітая шаўковаю сукенкаю постаць, пагойдваючыся, паволі накіравалася да бальшака. – Ну, усё, далей не варта мяне праводзіць. Тут блізка ўжо, дайду сама.

Ён хацеў запярэчыць, але не асмеліўся.

Праз тыдзень яны зноў сустрэліся – на цвінтары ля касцёла, пасля імшы.

– От добра, што спаткаліся, – сказала яна першая і датыкнулася да Юркавай рукі. – У мяне навіна для вас.

– Навіна? Якая ж? – здзіўлены яе зычлівасцю, спытаў ён.

– Прабачце, што, можа, умешваюся не ў сваё, але я пагаварыла з бацькам пра ваш клопат наконт працы. І, здаецца, недарэмна. Ён не супраць узяць вас у маёнтак да сябе ў памочнікі. Ён даўно ўжо шукаець чалавека, які мог бы займацца паперамі. Дык вы згодны?

– Я... не ведаю, – сумеўся Юрка. – Канечне, я... напэўна, згаджуся. Дзякуй вам.

– Не дзякуйце загадзя, яшчэ ж не вырашана. А раптам бацьку не спадабаецеся? – Яна засмяялася, пайшла па дарожцы да лінейкі, што чакала яе на дзядзінцы ля плябаніі. – Прыходзьце заўтра ў маёнтак, самі з ім пагаворыце.

– Тады і добра, рады, што мы дамовіліся. – Пан Гіржда падаў Юрку на развітанне руку, хуценька пашыбаваў папарам да аборы. Неўзабаве ягоная невысокая, але складная пастава – адзінае, што выяўляла сваяцтва між бацькам і дачкою, – знікла за прысадамі.

І тут толькі Юрка ўспомніў, што з-за хвалявання забыўся спытаць, калі ж выходзіць на працу. Але даганяць Гіржду не стаў: урэшце, не гарыць, куды яму спяшацца.

Памочнік упраўляючага па зямельных справах, а дакладней – перапісчык – ці на такое спадзяваліся ягоныя бацькі, плацячы штогод за вучобу ў гімназіі трыста злотых? Ды і сам ён, папраўдзе, зусім пра іншае марыў. З другога боку, на бязрыб'і, казаў той, і рак рыба. Можа, зусім і неблагая для пачатку гэтая пасада. Галоўнае, зачапіцца неяк, а там відаць будзе. Рабіць усё роўна трэба. Бацька другі год хварэе на сухоты, усё часцей заводзіць гаворку пра продаж зямлі. А што прадаўшы? Хоць час і няпэўны, усё ж на зямлі з голаду не памрэш. А тут, на новай службе, і падвучыцца можна, як весці гаспадарку. Гіржда гэты, бачна па ўсім, неблагі чалавек. Без фанабэрыі, не тое што дачка. Звычайны мужык, і рукі, як у мужыка, у мазалях, парэпаныя.

З-за ракі, што аддзяляла маёнтак ад вёскі, не даносілася ні гуку. Паўдзённая спёка нібы выкасіла ўсё жывое наўкола, пазаганяла ў засень і людзей, і жывёлу, нават птушак. Толькі ўдалечыні на панскіх

папасах статак ды двое пастухоў ля яго варушыліся ледзь бачнымі, невыразнымі кропкамі.

Раптам захацелася піць – нясцерпна, да сухасці у роце. Юрка спусціўся да ракі, пайшоў берагам на ўсход – там быў быстрак і вада ў любую пару года выдавала чысцейшай. Зачэрпнуў яе рукою, смакуючы, паднёс колькі разоў да рота.

І ў гэты момант пачуў за спінаю тупат. Спачатку ціхі, крыху прыглушаны, але з кожнаю хвілінаю ўсё больш і больш выразны. «Мабыць, каровы загізавалі», – падумаў Юрка і выйшаў назад, на бераг – зірнуць, што там такое. Сапраўды, каровы, пазадзіраўшы ўгору хвасты, з пагрозлівым тупатам і ровам несліся, збіваючы ўсё на сваім шляху, да ракі. Следам за імі беглі пастухі і бездапаможна рэзалі пугамі паветра.

Раптам гучны крык данёсся ззаду. Юрка азірнуўся. За хмызам, якраз на шляху кароў, стаяла жанчына і, прыкрываючыся ручнікам, адчайна адступала да віра. Яна, відаць, толькі што пакупалася і цяпер у любую хвіліну магла стаць ахвяраю ашалелага статка.

Юрка не марудзячы кінуўся наперарэз каровам. Тыя сталі як укапаныя, матляючы галовамі, раз’ятрана, з прыхрыпам, замычэлі.

– Не бойцеся, хадзіце сюды.

Жанчына наблізілася да яго, блытаючыся нагамі ў ціне, пайшла следам да берага.

Каровы ціхамірна спусціліся да вады, пачалі піць.

– Дзе ваша адзенне? – па-ранейшаму стоячы да жанчыны спінаю, спытаў Юрка.

– Вун там, дзе пачынаецца хмыз, – адказала яна. І хоць голас і блізка не меў звыклае фанабэрыі, Юрка адразу пазнаў яго.

– Дык ідзіце апранайцеся, я не буду глядзець.

– Не магу, там пастухі блізка. Лепей падайце мне...

– Ну, панна Галіна, але ж і палахлівая вы, – не ўтрымаўся, пажартаваў Юрка. – А гэткая з выгляду паважная паненка.

Сны, якія і раней час ад часу наведвалі яго, цяпер зрабіліся насланнём. Але калі раней іх персанажамі былі незнаёмыя жанчыны, дык зараз – адна Галіна. Мокрая, з распушчанымі па плячах валасамі – такая, якую ўбачыў яе апошні раз, ля ракі. Яна то аддалялася ад яго, то зноў набліжалася, то зусім знікала. У такія моманты салодкая млявасць ахоплівала Юркава цела, а рукі самі выпроствалiся ў надзеі дакрануцца да яе. Але марна. Дзяўчына клікала яго да сябе, а ўжо

праз хвіліну, нібы знарок распальваючы і без таго разгарачанае мроямі ўяўленне, адштурхоўвала. Ён не разумеў гэтакай гульні, і крыўдаваў, і злаваўся. Яна ж толькі дражнілася ў адказ пагардлівай, памятнай ад першай той сустрэчы ў Пірагоў усмешкай.

Праз тыдзень пасля здарэння ля ракі яны спаткаліся зноў. Юрка ўжо працаваў у маёнтку, Галіна ж прыйшла да бацькі – паведаміць, што атрымала ліст ад маці з Кракава. Тая прасіла купіць дзе-небудзь у тутэйшых мясцінах найлепшага мёду.

– Дзе ж бы гэта дастаць яго, найлепшага? – Гіржда задуменна чухаў патыліцу. – Пан Юры, ці не падкажаце, дзе можна купіць?

– З шальцінскіх раней, калі на хутары жылі, Лабэцкія пчол трымалі. Дык, можа, і ў цяперашніх тамтэйшых гаспадароў яны не звяліся.

– То варта схадзіць даведацца. Сходзіце?

– Схаджу.

– І ты, дачка, дзеля шпацыру ды кампаніі з панам памочнікам схадзі. Ён хлопец рахманы – не пакрыўдзіць, не бойся.

Вярталіся з хутара ўжо прыцемкам. Гаспадыня, маленькая вёрткая жанчына сярэдніх гадоў, паклала ў невялічкі жбанок колькі лыжак свежага мёду з сотамі – для пана Гіржды, пакаштаваць. Аднак ледзь адышліся ад сядзібы, як стала зразумела: мёду таму наканаваны зусім іншы лёс. Спачатку Галіна раз-пораз запускала ў жбан свой тоненькі зграбны пальчык. А як падшарэла, і Юрка, не жадаючы болей перамагаць спакусу, памкнуўся зрабіць тое самае. Дзяўчына нямоцна ўдарыла яго далонню па руцэ, а калі ён скукучыўся, нібы ад болю, пачала прасіць прабачэння. Вочы іх сустрэліся, а рукі самі пацягнуліся насустрач адно аднаму... Тое дзіўна было: яшчэ якую гадзіну таму і падумаць не наважваліся, што гэтак лёгка ўсё вырашыцца.

– Мусім мёд забраць. – Галінін голас ледзь-ледзь трымцеў – як бы ад сполаху.

Юрка няўцямна пацісну ў плячыма.

– Дзе ты яго зараз знойдзеш, не бачна нічога. Хоць вока калі.

– А што бацьку скажам?

– Скажам, як ёсць: з’елі.

– Што ж, тое недалёка ад праўды, – яна прыхінулася галавою да Юркавых грудзей. – Ты такі гжэчны, Юрак. Ale dlaczego nie czujesz sie polakiem?

Так працягвалася да восені. Непазбежная сцюжа не ахалоджвала іх пачуццяў. Наадварот, з набліжэннем халадоў, як бы насуперак ім, яны сталі сустракацца яшчэ часцей, па некалькі разоў на тыдні. І кожны раз, аддаючыся адно аднаму ў самых, здавалася б, непрыдатных умовах, пасля развітання яшчэ больш прагнулі новай сустрэчы. Каламуты юнацкага шалу, што ўзнімаліся незалежна ад волі абаіх, ледзь толькі яны аказваліся побач, перамагалі і перасцярогу, і боязь быць выкрытымі, і нават страх перад Богам. З-за апошняга Галіна асабліва перажывала. Яна нават перастала хадзіць у касцёл і з жахам чакала таго дня, калі вымушаная будзе на споведзі сказаць ксяндзу ўсё, што здарылася з імі ў гэтае вар’яцкае, дзіўнае лета.

Юрку першаму прыйшла думка пра жаніцьбу.

Галіна згадзілася. Што бацька яе не будзе супраць шлюбу, яны не сумняваліся. А вось як паглядзіць на гэткую перспектыву для дачкі маці, сумненні былі. І Галіна, каб вырашыць усё на месцы, у сярэдзіне верасня выправілася ненадоўга да яе ў Кракаў. Казік, наадварот, пакуль сястра гасцявала ў Польшчы, прыехаў пабыць колькі дзён з бацькам у Шальцінах.

Ішоў трыццаць дзевяты год.

Нехта стукаў у дзверы – настойліва, упарта, без супынку. Юрка чуў, як паднялася з ложка маці, але вырашыў яе апярэдзіць. Саскочыў на падлогу, не абуваючыся, пабег на дыбачках да дзвярэй.

– Хто там?

– Гэта я – Янка, – азваліся знадворку. – Адчыні!

Юрка адшчапіў засаўку, памкнуўся да паліцы па лямпу.

– Не трэба святла, – запыніў яго сябар. – Так пагаворым.

– Што здарылася?

– Такое – не паверыш, – Янкаў голас гучаў ціха, але ўсхвалявана. – Саветы на падыходзе, вось-вось павінны заявіцца. У маёнтку пярэпалах. Пан з паняй і Гіржда на поўным рамарэнце, збіраюцца ад’язджаць.

– Ці не прыснілася табе ўсе гэта?

– Скажаш – прыснілася! Я цяпер за вартаўніка ў садзе. Толькі сабраўся прылегчы ў будане, як чую – нейкі вэрхал ля сядзібы. Аж

гэта яны клункі пакуюць. І ксёндз з імі. Ля ганка падводы ўжо гатовыя стаяць.

– Гатовыя? – адчуваючы, як халадзее ўнутры, неўпапад перапытаў Юрка. І, як быў басанож, куляю вылецеў з хаты, памчаўся гародамі да маёнтка.

Пан, пані і Галінін бацька з сынам сядзелі ў вазку, глядзелі, як фурман з чалядьнікамі ўвязваюць на падводах майно. Крыху воддаль, ля курціны, ужо чакала гатовая да ад'езду двойка ксяндза.

Убачыўшы Юрку, пані падхапілася з месца, роспачна загаласіла.

Гіржда падазваў Юрку да сябе, трымаючы за плячо, глуха сказаў:

– Што асталося – разбярыце па хатах. Можа, дасць Бог, яшчэ вернуцца гаспадары, тады і аддасцё. Ключ у Броні, пакаёўкі.

Але зусім іншае турбавала Юрку.

– Галіна не вярнулася? – нібы спадзеючыся на цуд, спытаў ён.

– Не, – Гіржда адвёў пагляд убок. – Што зробіш, такі ваш лёс, на яго дарэмна наракаць.

Праз паўгадзіны шэсць панскіх падвод і ксяндзова двойка выехалі з сядзібы.

* * *

Янкаў дом здалёку нагадваў палац – трохпавярховы, з радамі доўгіх, застаўленых кветкамі балкончыкаў. Дом патанаў у зеляніне і міжволі здзіўляў нязвыклымі для такой пары сутак засяроджанасцю і спакоем: ні гуку, ні знаку чалавечай прысутнасці.

– Ціха тут у цябе, непапушчы як у Шальцінах, – ідучы следам за гаспадаром па абсаджанай бамбукам і ружамі дарожцы, сказаў Юры Іванавіч.

– Э, не спяшайся хваліць! – Янка махнуў рукой. – Гэта толькі па першасці так здаецца, што ціха. На самой справе – кагал, браце. Апроч мяне, цешчы ды дачкі з Мікеле, тут яшчэ жончыны браты з сем'ямі жывуць. Усяго чатырнаццаць чалавек.

І сапраўды, ледзь зайшлі ў хол, як будынак, які дагэтуль ціхамірна падрэмваў у засені магнолій, імгненна ажыў, заварушыўся, быццам вулей. З усіх дзвярэй, з усіх пакояў пачалі выбягаць насустрач дарослыя і дзеці, усе чарнявыя, жыццярадасныя, гаманкія. Алівія... Арнэла... Карла... Альфрэда...

– Buongiorno! Buongiorno! Benvenuti!

«Езус, колькі ж іх!» – жахнуўся Юры Іванавіч і, згубіўшы ўсялякую надзею хоць бы аднаго запомніць па імені, толькі адбіваў паклоны ды паспяваў падаваць руку. Апошняя падышла да іх маладая жанчына ў доўгай чорнай сукенцы. Ветліва павіталася, стала побач з Янкам.

– Мая дачка Стэфанія, па-нашаму – Стэфа, – сказаў той і ўпершыню за ўвесь гэты час, што былі ў доме, усміхнуўся.– Адзіная мая ўцеха і памочніца. Каб не яна, не ведаю, як бы трываў у гэткім гармідары. – Ён уздыхнуў. – Ніякага парадку не стала ў хаце пасля смерці Элеаноры. Усе крычаць, і ніхто нікога не слухае.

– Тата, не варта пра тое, – па-беларуску, праўда, з моцным акцэнтам, сказала жанчына і ўзяла бацьку пад руку. – Хадзем лепш абедаць. Наш госць, пэўна, галодны, а вераб'я байкамі не кормяць.

– Не вераб'я, а салаўя, – паправіў яе Янка. – Салаўя байкамі не кормяць.

– Хай будзе салаўя, – засмяялася яна. – Сёння ў нас усё італьянскае: піца, макарона, гародніна. А дзе ж Мікеле?

Мікеле вынырнуў аднекуль з суседніх дзвярэй, і яны ўчатырох накіраваліся да Янкавага пакоя.

– Звычайна мы абедаем у сталоўцы, – ужо седзячы за сталом, сказаў гаспадар. – Але ж яна ў нас у такім тлумным месцы, што і не пагаворыш спакойна. А тут ціша.

Ціша – гэта, як зразумеў Юры Іванавіч, было перабольшаннем. Бо адусюль, з усіх пакояў даносіліся несупынныя воклічы і гамана, і з кожнай хвілінаю яны рабіліся ўсё больш выразнымі.

– Ты добра выглядаеш, – знарок, каб скіраваць Янкаву ўвагу на што іншае, сказаў Юры Іванавіч.

– А як жа яшчэ можна выглядаць у семдзесят чатыры, – падхапіў той і жвава крутнуўся ў крэсле. – А ты што ў пінжаку? Горача ж! Ану здымай.

Стэфа данамагла Юрыю Іванавічу зняць пінжак, сама занесла ў шафу.

– Наш бацька касцюмаў і пінжакоў не прызнае, – сказала, вяртаючыся да стала. – Джынсы насіць. А вы носіце?

– Не.

– Чаму?

– У нас у такім узросце іх ніхто не носіць. Няма завядзёнкі.

– Завядзёнкі? Што такое завядзёнка?

– Тое самае, што звычай ці звычка.

– А-а, зразумела. Вам наліць віна? Per favore. З вадою ці без?

– З вадою? Як гэта?

– Віно занадта кіслае, бо маладое. Таму некаторыя яго разбаўляюць, – патлумачыў Янка.

Грукат наўкола мацнеў. Двойчы ўжо дзверы пакоя адчыняліся, і ў праём уціскалася то адна чорная галава, то другая. Абодва разы цярплівы Мікеле падымаўся з-за стала, ішоў да дзвярэй, штосьці казаў дзецям па-італьянску.

– Тата казаў мне, вы да выхаду на пенсію ў школе працавалі, – працягвала размову Стэфа. – І які прадмет выкладалі?

– Геаграфію. І зараз яшчэ час ад часу гэта раблю. Хаджу на замену, як папросяць. У нас у вёсках зараз праблема з настаўнікамі.

– Вось, а калісьці не ўладкавацца было ў школу, – здзівіўся Янка. – Затое, я чуў, у вас цяпер паважлівае стаўленне да беларушчыны. Нібыта нават цэлыя школы з беларускаю моваю адчыняюцца. Праўда гэта?

– Была праўда. А зараз зноў усё перамянілася.

– Перамянілася? Гэтак хутка?

– Ці ж доўга ўмеючы.

– І як людзі рэагуюць на такія перамены?

– Хто як, па-рознаму. Многія радуюцца, хто-ніхто пратэстуе. А большасць дык маўчыць – ад абыякавасці, а то ад страху.

– Ад страху? Але чаго тут баяцца?

– Ну, ведаеш жа сам, нам для боязі шмат не трэба. Казаў той, толькі-толькі паказалі венік, а мышы ўжо пад ім. Такія мы.

– Ну, тады... Qui non habet eguum, vadat pedibus. Так, здаецца? Ну, а твае, пэўна, усе гавораць па-беларуску?

– А не скажы. – Юры Іванавіч сумеўся. – Сын выдатна гаворыць, а дачка, ці паверыш, – ледзь-ледзь, з натугаю. Муж яе беларус, але ні сам ён, ні ягоныя бацькі ніколі не прамінуць нагоды, каб з мовы не пакпіць. Так вось жывём. А вы дзе працуеце, Стэфа?

– У адной прыватнай фірме. Я дэкаратар, дапамагаю людзям з афармленнем кватэр. Гэта даволі прыбытковая прафесія. Але ж спрабуйце віно!

Юры Іванавіч адхлюбнуў з фужэра глыток і ледзь стрымаўся, каб не зморшчыцца. Сапраўды, кісля, такое на Беларусі і апошні п'янюга ці піў бы.

Янка, моўчкі назіраючы за сябравымі пакутамі, усміхаўся. Вусны яго, складзеныя ў нітачку, ледзь прыкметна трымцелі, дагэтуль сумнаватыя блакітныя вочы іскрыліся гарэзлівай жулікавацінкай.

– Што, нясмачна? – не маючы моцы больш трываць, зарагатаў ён. Насмяяўшыся ўволю, нарэшце, супакоіўся, сказаў штосьці зяцю па-італьянску.

Той выйшаў з пакоя, але зусім хутка вярнуўся – з бутэлькаю каньяку.

– У мяне цукеркі ёсць беларускія да яго. – Юры Іванавіч падхапіўся з месца, узяўся распакоўваць чамадан. – Вось... І гэта таксама.– Пляшка самаробнай, запраўленай калінаю гарэлкі годна стала побач з каньяком.

– Вось гэта дык прэзент! – ахнуў Янка.

Мікеле тым часам зноў устаў з-за стала, накіраваўся да дзвярэй, гукнуў дзяцей.

Мала не дзесятак чорнагаловікаў імгненна запоўніў пакой, пацягнуўся навыперадкі рукамі да ласунка.

– Яны неблагія ўсе, – сказаў, калі яны, нарэшце, адышлі, Янка. – Але ж бачыш, колькі іх. А тут спакою хочацца, цішыні. Сітуацыя, браток.

Галіна чакала іх на аўтобусным прыпынку паблізу Ватыкана. На гэты раз яна была ў сціплым паркалёвым сарафане. І адразу неяк змянілася з выгляду: худзенькая кабета сярэдняга росту з тонкімі, густа абсыпанымі рабацiннем рукамі і сумным паглядам не вельмі шчаслівых вачэй.

Яны адпусцілі Мікеле, а самі няспеша пайшлі ўздоўж сцяны да плошчы Пятра.

– Як адпачыў наш госць? – беручы Юрыя Іванавіча пад руку, спытала Галіна.

– У гэткай вар'ятні хіба адпачнеш! – адказаў за сябра Янка. – Сёння ж паедзем у Дом паляка.

– Там усё гатова, – пагадзілася яна і схавала вочы за цёмнымі акулярамі. – Але перад тым падымемся пад купал сабора. – І, не чакаючы згоды мужчын, дадала: – Італьянскія гарады зверху такія беззаблічныя!

«Як была фанабэрыстаю, так і засталася, – дзівячыся міжволі ўласнай непрыязнасці да немаладой гэтай, крыху дзівакаватай жанчыны, падумаў Юры Іванавіч. – Ані не змянілася».

Але, сапраўды, відовішча, што адкрылася вачам, ледзь дапялі – спачатку ліфтам, затым яшчэ амаль гэтулькі пешкі – да пляцоўкі агляду, не ўразіла яго. Ці то з-за мроіва, што віcела, пакалыхваючыся, у паветры, ці то яшчэ з-за чаго, але ўсё выглядала неяк невыразна, бязладна, хаатычна. Наогул, горад нагадваў з вышыні кучу рудаватага друзу.

Спусціўшыся назад уніз, прашпацыравалі колькі разоў сюды-туды па пляцы, хаваючыся ў засень прылеглых дамоў, накіраваліся да моста Сан-Анжэла. Туды, як зразумеў Юры Іванавіч, меўся прыехаць за імі праз гадзіну Мікеле. Янка, нібы знарок даючы ім з Галінаю пагутарыць сам-насам, збочыў да Тыбра, што зусім побач палохаў цікаўных колерам цвілі.

– Я багатая, дужа багатая, – сказала яна раптам і спынілася пасярод тратуара. – Хочаш, раскажу пра сваё жыццё?

– Было б цікава.

– Тады слухай, – працягвала яна – на гэты раз па-польску. – Калі Саветы занялі крэсы, я была ў Кракаве. Два дні ставалася да ад’езду ў Шальціны, але я не паспела. Усё рушылася на вачах. Неўзабаве бацька з Казікам прыехалі. Бацьку помніш майго?

– Канечне, помню.

– Ён загінуў падчас Варшаўскага паўстання. Перад самай акупацыяй Польшчы мы ўсёй сям’ёй перабраліся ў Варшаву, і там усё гэта і здарылася.

– А што з Казікам сталася?

– А Казік, хоць і быў хворы на сухоты, ацалеў. Пасля вайны скончыў школу, стаў будаўніком. Некалькі гадоў жыў з сям’ёй у Алжыры, затым перабраўся ў Канаду. Там, у Канадзе, і памёр пазалетась. Дарэчы, я таксама два гады жыла ў Канадзе, паблізу Манрэаля. Пераехаўшы туды, брат і мяне выклікаў, дапамог уладкавацца. Потым мама, якая адна засталася ў Польшчы, цяжка захварэла, і я мусіла вярнуцца ў Варшаву. Праз паўгода мама памерла. А я пазнаёмілася з удаўцом-палякам, які з вайны жыў у Рыме, і пераехала да яго. Франак на пятнаццаць гадоў старэйшы за мяне, але гэта быў надта добры, прыстойны чалавек. Я пацiху вывучыла італьянскую мову, уладкавалася на працу ў адну фірму. Муж не хацеў гэтага, бо марыў пра дзіця. Але я баялася раджаць – мне было ўжо за сорак. Тады мы дамовіліся ўзяць малое з дзіцячага дома. Ды не паспелі: Франак загінуў у аўтакатастрофе. Я засталася адна. Пасля адкрыцця Дома паляка перайшла працаваць туды –

гідам. Хоць, папраўдзе, магла наогул не рабіць. Таго, што засталося пасля мужа, хапіла б і мне, і дзецям, калі б яны былі. Працу я кінула ўсяго тры гады таму. Жыву ў Неапалі. Тут, у Рыме, кватэру прадала, бо з ёю было зашмат клопатаў. У Неапалі таксама, напэўна, прадам.

– Прадасі? А дзе жыць будзеш?

– Ат, знайду які прытулак.

Ля моста Сан-Анжэла рослыя, спартыўнага выгляду негры гандлявалі сумкамі і рознаю іншаю драбязой. Галіна спынілася збоч аднаго з іх, абаперлася плячом аб парапет. Сонца, выслізнуўшы з-пад хмары, нечакана разанула яе па твары, бязлітасна высвеціла кожную зморшчыну на лбе і шыі. Нібы адчуваючы гэта, яна страпянулася, прыкрыла цела рукамі.

Янка дагнаў іх, пайшоў побач.

– Можа, да Пантэона прашпацыруем? – сказаў, беручы Галіну пад руку. – Тут недалёка.

– Дзе Мікеле будзець чакаць?

– Ля банка «Di Roma». Але што гэта я чую – «будзець»? З мяне кпіла некалі, што гэтак гавару, а сама...

– Адчапіся, смала! Я вашай літаратурнай мове не вучылася, як умею, так і кажу. – У голасе жанчыны загучала так знаёмая Юрыю Іванавічу ўладнасць. – Не, лепей вярнуцца назад. Ля банка ёсць кавярня, а ў ёй, калі верыць рэкламе, – найсмачнейшыя ў горадзе лёды. Прабач, Юрак, не ведаю, як яны па-вашаму называюцца...

– Марожанае.

– А, добра... Ну дык вось, там і пачакаем Мікеле. А пакуль будзем вяртацца, наш шаноўны госць пра сябе раскажаць. А то ж нічога не ведаем пра яго.

Яны сышлі з моста, накіраваліся назад да вулкі, што ўрэшце ўпіралася ўдалечыні ў плошчу Пятра.

– Дык слухаем, Юрак.

– Але што расказваць? – Юры Іванавіч на хвіліну разгубіўся. – Ну, значыць, прыйшлі Саветы... Пачалі калгасы арганізоўваць. Начальства новага, розных упаўнаважаных шмат з'явілася. Беларускія школы пачалі адчыняць. Я ў пачатковую ў суседнім Чурылаве ўладкаваўся. Маляванне выкладаў. Гэта ўжо пазней я на географа перакваліфікаваўся. Потым – вайна. Ваяваў – аж да самага канца, дарэчы, без адзінюткага ранення. Пасля вайны – зноў школа. Ажаніўся. Таццяна мая па накіраванні ў Шальціны прыехала. Ды так і засталася ў вёсцы. Карову навучылася даіць... Яна бібліятэкарка па

адукацыі, але і ў школе таксама рабіла. Словам, усё добра было, пакуль не арыштавалі мяне. Гэта ў сорак шостым здарылася. Наогул, у нас, у глыбінцы, меней палявалі, як у горадзе. Але тут з-за былых маіх, даваенных яшчэ, вучняў, што ў горадзе ў педвучылішчы вучыліся, усё атрымалася. Яны там суполку патрыятычную стварылі. Ну там вывучэнне мовы, гісторыі і ўсё такое... Мне як удзельніку вайны неяк няёмка было да іх далучацца, дык хоць маральна падтрымліваў. А калі пабралі іх, тая падтрымка і адрыгнулася. Дарма што франтавік – не паглядзелі, пасадзілі.

– Што ж, хапіла табе пакутаў, – сказаў спачувальна Янка. – Прабач, калі вельмі тое непрыемна ці цяжка, не расказвай болей нічога.

– І непрыемна, і цяжка. Але найгоршае, ці паверыце, пасля, па вызваленні, чакала.

* * *

Пачынала шарэць, а за перабойкаю ў класе матэматык Васіль Андрэевіч Зізюк усё яшчэ церабіў паўрочнікаў, дамагаючыся нейкіх формул. Нарэшце голас ягоны аціх. Затым пстрыкнуў выключальнік, і ў настаўніцкую данесліся цяжкія, як пасля велізарнай фізічнай нагрузкі, крокі настаўніка і жвавая, бадзёрая хада вучняў. Васіль Андрэевіч увайшоў у настаўніцкую, стомлена апусціўся на канапу.

– Замардавалі, нягоднікі, – сказаў, паміргваючы вейкамі. – Нічога не разумеюць у матэматыцы, што ўбіў – тое і ўехаў. – І дадаў ужо ад дзвярэй: – Вось што, Юры Іванавіч, вы ў нас чалавек новы, да таго ж адзінокі пакуль што, дык запрашаю вас да сябе на вячэру. З жонкаю маёю пазнаёміцеся, пагутарым пад чарку. Як, згода?

– Можа, няёмка без папярэджання. Толькі клопату гаспадыні наробіш, – спрабаваў адмаўляцца Шымбарэвіч.

– Ай, кіньце, што там – няёмка! Мы людзі простыя. І рана яшчэ зусім, толькі палова шостай. Наседзіцеся за вечар у пустой хаце. Хадзем! – Зізюк падхапіў Юрыя Іванавіча над руку, пацягнуў да дзвярэй.

Праз чвэрць гадзіны былі на месцы.

– Вось бачыце, блізка зусім. – Васіль Андрэевіч адчыніў дзверы сяней, запаліў святло. – Уваходзьце. Ліда!

– Я тут, – сярэдняга росту жанчына ў ватоўцы і нізенькіх шэрых адразаніках, з-пад якіх выглядвалі карункамі зверху тоўстыя

самаробныя шкарпэткі, выйшла насустрач з варыўні. – Ой, хто гэта з табою, Вася?

– Гэта наш новы настаўнік, Юры Іванавіч Шымбарэвіч, пазнаёмцеся.

– Добра, што завіталі да нас, – сказала жанчына і, зірнуўшы ў твар госцю, неяк, падалося таму, нібыта сумелася. – Праходзьце далей, зараз вячэраць будзем.

І зноў Шымбарэвіч злавіў на сабе цікаўны, засяроджаны позірк. Ён ужо хацеў спытаць, што такое, як яна сама звярнулася да яго:

– А вы дзе раней працавалі, Юры Іванавіч?

– У школе, – адказаў ён і каторы раз за апошнія два гады пасля вызвалення сцяўся ад сполаху: што, калі яны дагэтуль сустракаліся і яна ўсё пра яго ведае?

– Ну, школ шмат усюды, – гаспадыня нібыта вырашыла праверыць на трываласць ягоныя нервы. – І ў якой канкрэтна вы працавалі?

– У Савейкаўскай, на Гродзеншчыне, да прыкладу...

– На Гродзеншчыне ніколі не даводзілася бываць. А ў Шальцінах на Віцебшчыне не рабілі адразу пасля вайны?

– Там я пачынаў працу. Шальціны – радзіма мая.

– Дык тады я ведаю вас. – Яна ажывілася, узрадавана ўсміхнулася яму. – Мяне ў сорак шостым фельчаркаю ў вашы Шальціны паслалі. Праўда, я зусім нядоўга там працавала, усяго паўгода. Але вас запомніла. Вы яшчэ жаніцца тады збіраліся. Нават імя вашай абранніцы памятаю: Таня. Так, ці не?

– Так.

– Бачыце, якая сустрэча, – яна яшчэ нешта хацела сказаць, але раптам асеклася, азірнулася на мужа. – Вось, Вася, мы знаёмыя з Юрыем Іванавічам. – І дадала – хутчэй, відаць, дзеля прыліку, чым з інтарэсу. – А жонка ж з вамі?

– Пакуль што не, але збіраецца неўзабаве прыехаць.

– Вось і цудоўна, – сказаў Зізюк. – Можа, пасябруюць, дык часцей сустракацца будзем. А то звар'яцець тут можна на нашым вясковым бязлюддзі.

– Сапраўды, – падтрымала мужа гаспадыня. – Здараецца, словам няма з кім перакінуцца. – І яна пачала апавядаць, як нялёгка жыць у глухамані адукаванаму чалавеку.

І ўвесь час, пакуль яна гаварыла, Шымбарэвіч успамінаў сваё. Як на пачатку лета, канчаткова вырашыўшы пераязджаць па

сямейных абставінах з Савейкаў назад у Віцебскую вобласць, пайшоў да дырэктара школы з заявао аб звальненні. Як той доўга-доўга ўзіраўся сумнавата-скрушлівым паглядам у паперу, затым, не падымаючы вачэй, з жалем у голасе сказаў:

– Шкада мне вас, Юры Іванавіч, адпускаць, добры вы настаўнік. І хоць увялі вы мяне ў зман пры паступленні, не ўсе дакументы паказалі, я на вас не крыўдую. Пэўна, не ад добрага жыцця вы тое зрабілі. Але, глядзіце, і на новым месцы асцярожны будзьце. Не пытаюцца паперак, дык і самі не паказвайце, у правілах прыёму на працу гэты пункт не агавораны. Няхай жа вам зноў пашанцуе...

– Ды вы і не слухаеце, Юры Іванавіч! – жанчына глядзела на яго з дакорам, нават асуджэннем. – Што з вамі? Вам нядобра?

– Не, нічога, не турбуйцеся, – страпянуўся Шымбарэвіч і падаўся следам за гаспадарамі ў кухню, дзе стыла вячэра.

Што ўсё кепска, ён здагадаўся ў панядзелак адразу, ледзь пераступіў парог школы. Настаўнікі, нібы не заўважаючы яго, стараліся праслізнуць міма. Вучні, збіўшыся гуртам ля гардэроба, разгублена чакалі, як жа будуць далей паводзіць сябе дарослыя.

З дырэктарскага кабінета выскачыў расчырванелы Зізюк, кулем кінуўся ў другі канец калідора.

– Юры Іванавіч, зайдзіце да мяне! – данёсся з глыбіні кабінета праз расчыненыя дзверы голас дырэктара. – Калі ласка!

Калі ён праз чвэрць гадзіны зноў выйшаў у калідор, там нікога не было. Ні гуку, ні шэпту не даносілася ў калідор з класаў, хоць усе дзверы і стаялі расчыненыя. Усюды панавала такая цішыня, якую і на хаўтурах не часта спаткаеш.

Хацелася неяк развітацца з людзьмі – сказаць ім што добрае, ці, наадварот, ад іх пачуць слова спагады. Словам, зрабіць па-людску. Але тым, пра каго гэтак думалася, усё тое, падобна, было непатрэбна.

І тады ён, насуперак усяму і ўсім, і дазволіў сабе той дзёрзкі і разам з тым такі наіўны, нягледзячы на трагічнасць сітуацыі, учынак – зарагатаў. Смех той, казалі яму пасля, доўга быў у раёне прадметам згадак і асуджэння пасля ягонага ад'езду.

* * *

– Ну, а цяпер як, блюзнерыш па-ранейшаму? Рагочаш?

– Цяпер – не, – Юры Іванавіч адмоўна пакруціў галавою. – Нават калі і кіпіць усё ў душы, стрымліваюся. Папеdepражываеш, перамелеш у сабе і супакоішся на тым. Во пра боязь мы гаварылі. Дык, можа, і не боязь гэта, а хутчэй звычка спакойна жыць. Бо каб пратэставаць – узрух патрэбен. А дзе ўзрух, там і клопаты лішнія, нервы. А мне што ўжо нерваваща ў гэткім узросце. Няхай маладзейшыя нервуюцца. Дарэчы, успомніў – цікава вам, напэўна, будзе... Юзіка Пірага памятаеце?

– Памятаю, а як жа, – адказаў за сябе і за Галіну Янка. – Сястра ў яго была, Зосяй, здаецца, звалі. Так?

– Так. Ён жывы, між іншым, і няблага сябе адчувае. Да пенсіі ў вучылішчы ў райцэнтры мову выкладаў. Дык вось ён у сямідзесятыя яшчэ, расказвалі, распісваючыся ў кнізе за ключы ад класаў, прозвішча сваё па-беларуску, а слова «здаў» па-руску пісаў. Гэта каб у нацыяналізме не абвінавацілі. І не дзіва: восем гадоў без малога, пачынаючы з трыццаць дзевятага, у лагерах адбухаў, з-за паходжання. А якое там паходжанне? Звычайныя сяляне, адно разбагацець больш за іншых здолелі. Ды фанабэрыі прапольскае набраліся.

– A, co ty gadasz! – нечакана раззлавалася Галіна і энергічна, зусім па-італьянску трасянула ў паветры далонню. – Chlop!1

– Ты ж як трапіў сюды, у Італію? – ужо шкадуючы, што не падумаўшы ляпнуў пра фанабэрыю, паспяшаўся перавесці гаворку на іншае Юры Іванавіч. – Так нечакана прапаў тады, ні слова, ні паўслова не сказаў.

* * *

З воласці вярнуліся адвячоркам. Восем падвод, адна з якіх была Шымбарэвічаў, ціха ўехалі ў вёску, нібы баючыся парушыць стоена-трывожную цішыню, што з учарашняга рання запанавала над небагатымі, але дагледжанымі палеткамі, пачалі па адной заварочваць на панадворкі.

– Ліха іх, гэтулькі часу змарнавалі, – турзаючы за лейцы вялікага, але ўжо стараватага і таму нядужага Лысака, сказаў Юркаў бацька Ясь і злез з калёс. – Шабуцкі гэтат, войт, акурат як ксёндз. Як завядзецца гаварыць, дык устрыму на яго няма. І складна, зараза, брэшаць.

– Затое і свой пры любой уладзе, – падала голас Марыля. – Ой, і што цяперака будзець?

– Неяк жа будзець.

Юрка, які на сход не ездзіў, бо трэба было некаму заставацца ў хаце за гаспадара, падышоў да падводы, пачаў распрагаць каня. Лысак удзячна заржаў, пераступаючы з нагі на нагу, нецярпліва затэпаў па пабурэлым ад дажджу восеньскім мурагу.

– Пра Янку, тата, нічога там не чулі?

– Чулі сёе-тое, а як жа. – Бацька зняў з павозкі дзяружку, сена, кінуў усё пад павець. – У Польшчы дагэтуль твой дружбак, напэўна. У ксяндзовай падводзе бачылі яго на пераездзе.

– Бедная Вольга! – уздыхнула маці. – Як яна перажывець усё гэта!

* * *

– Ён у мяне быў закаханы, – Галіна дастала з сумачкі цыгарэту, пачакала, пакуль каторы з мужчын здагадаецца паднесці агню. Першым аказаўся Янка. Яна зацягнулася дымам раз, другі – з такою сілаю, што ажно напружылася шыя. – А ты хіба не знаў, Юрак?

– Не.

Тым часам наблізіліся да Ватыкана. Галіна, засланіўшыся, бы вясковая кабета, далонню ад сонца, борзда завярнула насупраць банка ўлева, знікла за дзвярыма кафэ.

– Ну, пакаштуем жа тых яе хвалёных лёдаў, – сказаў Янка і неяк знянацку, без усялякага пераходу дадаў: – Цікава, пазнаў бы я цяпер Шальціны ці не?

У Доме паляка было ціха і прахалодна. Дзяжурная манашка аддала Галіне ключ, і яны ўтраіх падняліся ліфтам на трэці паверх.

Пакой аказаўся маленькі і вельмі сціплы: шафка для адзення, стол, ложак. За прасценькім, узнятым на палову акна ручным жалюзі відаць быў балкон. Збоч яго, крыху воддаль ад будынка, высіліся галінастыя, абсыпаныя вялізнымі недаспелымі шышкамі сосны. У самім памяшканні было ўтульна і чыста.

– Не шыкоўна, канечне, – сказала, закурваючы, Галіна. – Але і назаляць ніхто не будзець. Прыбіральня, душ – праз калідор насупраць. Сталоўка ўнізе, будзеш есці разам з пілігрымамі. Ну, мне пара ісці. – Яна ўстала, не гасячы цыгарэты, падалася да дзвярэй. – Калі што якое – звяртайцеся да сястры Ванды, яна ўсё ўладзіць. Заўтра ў Пампеі аўтобус ад'язджаець а сёмай. Я падсяду ў Неапалі.

Яна выйшла ў калідор, пакрочыла да ліфта.

– Колькі ж бяруць тут за пражыванне? – ледзь яна пайшла, занепакоіўся Юры Іванавіч.

– Не хвалюйся, усё ўжо аплачана. Галіна заплаціла. Я таксама мог бы, але яна не дазволіла. І выклік, дарэчы, і дарогу ў абодва канцы таксама яна аплаціла. Але тым не прымайся надта. У яе грошай – нам і не снілася гэтулькі. Так што адпачывай сабе спакойна.

– Няёмка неяк. Але што зробіш – давядзецца не зважаць. Дарэчы, ты так нічога мне толкам і не расказаў пра сябе. Як трапіў сюды, у Італію?

– О, гэта доўгая гісторыя.

– Праўда тое, што нібыта з-за яе, з-за Галіны?..

– Усё праўда. Ты нездагадлівы такі быў, нічога не заўважаў. Яна з першага таго вечара ў Пірагоў мне ў душу запала. А любіла – цябе. Памятаеш, цябе змяя ўкусіла на балоце? Як яна глядзела на цябе, пакуль чакалі доктара. Ніколі таго пагляду не забуду. І шмат што яшчэ міма тваёй увагі прайшло. І тут гэтая ноч, калі Саветы прыйшлі... Я іх ужо на бальшаку, пасля таго як ты адстаў, дагнаў. Ксёндз, мабыць, так, дзеля жарту прапанаваў з імі паехаць за фурмана, а я і ўхапіўся за нітачку... У Польшчы ў Кракаў спачатку паехалі. Галіна як убачыла мяне, дык прытомнасць ледзь не страціла. Здалёку не пазнала, думала – ты. Я ёй нічога пра свае пачуцці не сказаў, не наважыўся. Хацеў назад, дадому падацца, ды таксама не асмеліўся – што, як пасадзяць? Застаўся ў Польшчы. Парабкаваў напачатку. Затым з Гірждаваю дапамогай у адным мястэчку непадалёку ад Варшавы настаўнікам уладкаваўся. Калі немцы прыйшлі, падаўся ў падполле. У чэрвені сорак другога ўсю нашу групу схапілі. Мяне з нашым сувязным Кавальскім у Бухенвальд адправілі. Потым, праз чатыры месяцы, ужо аднаго (Кавальскі памёр) перавялі ў Натцвайлер, у каменаломні. Умовы там невыносныя былі. Да таго ж білі няшчадна. Таму з двухсот чалавек, што аднначасова прыбылі ў лагер, жывых засталося васьмёра. Затым яшчэ адзін перавод – у Дахау. Тут ужо крыху лягчэй было. Першага мая сорак пятага нарэшце вызвалілі нас амерыканцы. Як сам разумееш, дамоў я зноў не паехаў. Застаўся ў Германіі. Пазнаёміўся з Элеанорай, італьянкай, яна ў Чырвоным Крыжы працавала. Ажаніліся. Праз год яна зацяжарала, і мы пераехалі на сталае жыццё ў Італію.

Тут таксама пасля вайны нялёгка было. Да таго ж я амаль не ведаў мовы. Таму вырашыў пайсці туды, дзе веданне яе не так

патрэбнае,– у вінаградарскую справу. З часам, калі падрасла Стэфа, купілі дом у складчыну з жончынымі сваякамі. Элеанора тры гады таму памерла, пасля другога інфаркту. Вось такое маё жыццё... Дарэчы, наконт Галіны... Тут, у Рыме, мы з ёю ўпершыню незадоўга да Элеанорынай смерці спаткаліся. Выпадкова, у гэтым самым Доме паляка. Я сюды аднаго знаёмага варшавяніна ўнаначкі прывёз, і тут у ліфце носам у нос і сутыкнуліся. Яна мяне не пазнала, а я яе – адразу. Што значыць юнацкая любоў.

Пампеі сустрэлі іх несупыннаю гаманою. Сотні турыстаў, што таўкліся ля ўвахода на тэрыторыю нежывога горада з боку Марской брамы, ашаламілі Юрыя Іванавіча і спалохалі: што тут убачыш у гэтакім тлуме?

Першае, што найбольш уразіла яго ў самім горадзе, была лава. Шэрая, падобная да звычайнага попелу, яна жывасілам лезла ў абутак, асядала на целе і адзенні. Горад-мярцвяк нібы льнуў да жывога.

– Люблю тут бываць, – дастаючы з сумкі нейкую паштоўку, – сказала Галіна. – Бо тут усё, як у жыцці, і няма патрэбы прыхарошвацца.

«Ага, няма, як жа, – падумаў Юры Іванавіч. – А сама, бач, вусны падмалявала і вейкі».

– Адчуваеш сябе нейкім аскалёпкам мінулага, – працягвала жанчына. – І добра: менш клопату. Так жа?

– Так, – пагадзіўся ён і ледзь не спатыкнуўся аб камень, што ляжаў упоперак вулкі,– знак забароны для транспарту.

Ля руін вежы Меркурыя прыпыніліся: нейкай жанчыне-турыстцы стала дрэнна. Галіна першая кінулася да яе, паслухала пульс, дала таблетку. І менавіта ў гэтую хвіліну ўпершыню за ўвесь час ягонага побыту ў Італіі пачуццё блізкасці і спагады да яе страпянулася ў грудзях Юрыя Іванавіча. Упершыню думка, што яны не зусім чужыя, прабіўшыся праз тоўшчу непрынянцця экстравагантнасці яе знешнасці і паводзін, перамагла непрыязнасць, гарачаю хваляю ўспамінаў аб мінулым агарнула душу. Хто яны адзін для аднаго? І кім жадалі некалі і маглі б стаць, калі б не тыя трагічныя падзеі трыццаць дзевятага? Як даўно ўсё было! Усе гэтыя вулкі, храмы, тэрмы раскапанага горада, падалося на хвіліну, маладзейшыя за іх колішнія сумесныя прыгоды.

Галіна скончыла varажыць над хвораю, паднялася з каленяў, старая і безабаронная, пайшла побач.

– Вось, купіла паштоўку нядаўна ў Арвіета. А здагадацца, што тут намалявана, ніяк не магу. Ахвярапрынашэнне якое, ці што?

На паштоўцы мажны з выгляду дзяцюк, трымаючы адною рукою за рогі ці то быка, ці то карову, падносіў другою да горла жывёліны вялізны, падобны да шаблі, нож.

– Сапраўды, нібыта ахвярапрынашэнне, – сказаў Юры Іванавіч і падумаў, што недзе такое ўжо бачыў.

* * *

Маці ўвайшла ў хату, хуценька, каб не напусціць з сяней холаду, зачыніла за сабою дзверы.

– Нешта сёння Красуля падкачала. Добра, калі тры літры дала, – сказала, ставячы на зэдаль даёнку. – Цяля адсадзілі, а яна во – як знарок...

– Можа, дарэмна адсаджвалі, – азваўся бацька. – Пакуль прывыкнець цяпер без яго.

– Ай, не. – Маці села збоч стала, прыгарнула да сябе Ежыка. – Я і раней прыкмячала: нешта не тое. Мычыць без дай прычыны. А то стагнаць пачнець. Каб доктара паклікаць.

– Доктару плаціць нада. А ў хаце, сама казала, ні капейчыны.

– Пазычыць можна. У Лабэцкіх, можа... Пайду да Вольгі, яна не адмовіць, выручыць. А ты па доктара едзь, не марнуй часу.

– Ладна. – Бацька выйшаў з-за шафы, пачаў абувацца.

Доктар, вясёлы, усмешлівы мужчына гадоў пад пяцьдзесят, прыехаў а палове чацвёртай. Маці толькі-толькі паспела накарміць жывёлу і зараз стаяла ля печы, трымаючы напагатове чапялу, смажыла на вуголлі яечню. Яна чула, як пад'ехалі да хаты сані, але на вуліцу не пайшла. «Паглядзяць Красулю і без мяне», – сказала ніякаватым голасам Ежыку.

Ежык, седзячы ля размаляванага марозам акна, глядзеў, як доктар вылез з вазка, прытупваючы ад холаду, штосьці пытаўся ў бацькі. Затым абодва пайшлі да хлява, дзе стаяла Красуля. Маладая рабая курыца, спалоханая з'яўленнем людзей, вылецела на двор, замітусілася па гнаявішчы. Бацька засланіў рукавом ад ветру ліхтар,

паднёс да кнота запалку. Кнот успыхнуў, мужчыны, нібы баючыся, каб хто яго не загасіў, хуценька падаліся ў хлеў.

Праз паўгадзіны яны выйшлі, перагаворваючыся на хаду, пасунуліся да хаты. Першы ішоў доктар, за ім, унурыўшы галаву ў каўнер кажуха, бацька.

Яшчэ праз колькі хвілін дзверы расчыніліся і абодва ўваліліся ў хату. Бацька, сумны, нейкі на вачах пастарэлы, кінуў кажух на печ, сеў збоч стала.

– Усё, матка, не чакай дабра, – сказаў, гледзячы ў падлогу. – Запаленне ў Красулі.

Той прыгожы, пагодлівы лютаўскі дзянёк Ежык запомніў на ўсё жыццё. Уначы выпаў снег, і ўсё патанала ў яго пухкай, урачыстай белі. Дрэвы адразу быццам паменелі ростам, а сцяжына ад хаты да бальшака знікла, як ніколі яе і не было.

Маці, як заўсёды, завіхалася ў істопцы. Бацька толькі што вярнуўся з логу, дзе секлі талакою пану дровы, абедаў. Спехам праглынуўшы колькі кавалкаў, устаў з-за стала, падаўся да клеці. Неўзабаве выйшаў адтуль – крыху разгублены, з касою ў руцэ. Дастаў з-пад падстрэшка брусок, уторкнуў касу ў мох між вянцамі хлява, пачаў вастрыць. Навастрыўшы, пакінуў прычындалы на снезе, паныла паплёўся паўз сумёты да суседзяў.

Хутка ён вярнуўся. Жанчына і двое мужчын, што прыйшлі разам з ім, як здагадаўся Ежык, меліся памагаць. Мужчыны засталіся на двары, а цётка Вольга, тоўстая ў шырачэзным новым кажусе, зайшла ў хату, гледзячы скрушліва на маці, села на лаву.

– Ой, я не вытрымаю. Волечка, так мне яе шкода, – сказала маці і павалілася рукамі на стол. – Не магу.

– Нічога, вытрымаеш, – сказала суседка. – Канечне, шкода: толькі пачалі зажывацца, і на табе... Але ж карова – не чалавек. Так што трымайся.

Тым часам мужчыны зніклі ў хляве.

Ежык выбег следам за маці і суседкаю на двор.

Карова, якая ўжо другія суткі не падымалася з месца, ляжала на саломе і дробна ўздрыгвала ці то ад холаду, ці то ад болю. Бацька штосілы цягнуў яе за ланцуг да праёма, а старэйшы сусед Калиннік, далёкі іхні сваяк, без супынку мясіў вілавішчам па худым – скура ды косці – баку.

– Каб жа неяк выцягнуць, – прыгаворваў бацька. – А то здохнець у хляве, тады паспрабуй ты даць рады гэтакай тушы.

Нарэшце Красуля прыўзнялася, і мужчыны, скарыстаўшы момант, літаральна выпхнулі яе з будыніны. Яна тут жа, ля дзвярэй, павалілася на бок, выцягнуўшы шыю, пачала лізаць языком шорсткі марозны снег.

Бацька кінуў ланцуг, пайшоў за касою.

– Не бабскае і не дзіцячае дзела – глядзець? – сыкнуў на жанчын і Ежыка Калiннiк. – Адыдзіцеся!

Цётка Вольга, маці і Ежык адышліся воддаль, да хаты.

– Можа, ты зробіш, Пятрок? – спытаў бацька ў другога суседа.

Пятрок згодна матлянуў галавою. Бацька перадаў яму касу. Затым Калiннiк з бацькам схапілі карову за рогі, пачалі выкручваць галаву так, каб шыя аказалася наверсе...

– Не глядзі, сынок! – кінулася да Ежыка маці, загароджваючы сабою жахлівае відовішча.

Але як ні хутка яна гэта зрабіла, ён паспеў-такі ўбачыць, як гайдануўся і замёр у яе вачах ягоны ўласны, прыхоплены сполахам, позірк.

Калі ён расплюшчыў вочы, Красуля ляжала на тым самым месцы і сутаргава ўздрыгвала нагамі. Снег пад ёю быў чырвоны ад крыві і нагадваў старую посцілку, на якую ссыпалі увосень на гарышчы антонаўкі. Побач стаялі, унікаючы глядзець на няшчасную жывёліну і адзін на аднаго, мужчыны і ціха аб нечым перагаворваліся. Ля хаты, не хаваючы слёз, плакалі маці і цётка Вольга.

* * *

Экскурсія скончылася а трэцяй. На выхадзе з руінаў, як і колькі гадзін таму ля ўвахода, групу імгненна абступілі энергічныя гандляры сувенірамі.

– Per favore, signore! Per favore! – загаманілі дружна, пхаючы навыперадкі ў рукі турыстам маляўнічыя праспекты.

Галіна дастала з сумачкі некалькі тысяч лір, купіла адзін, падала Юрыю Іванавічу.

– Masz pamiatke, – сказала, закурваючы чарговую цыгарэту. – Twoja zona rozumie po polsku?

– Не.

Яна вярнулася да гандляра, узяла яшчэ адзін альбом – на гэты раз па-руску.

– Во, няхай чытаець,– сказала і падазвала таксі.– E Libero? Per favore, Napoli...

Дом, ля якога спыніліся, уражваў і сваімі памерамі, і адмысловай дагледжанасцю. Гаспадыня яго безуважна («gracie, signore») разлічылася з вадзіцелем, павяла мужчын да жалезных варотаў, націснула кнопку сігналізацыі. Дзверы расчыніліся. Немаладая жанчына ў простай летняй сукенцы, прыгаворваючы штосьці на хаду па-свойму, пакрочыла насустрач гасцям.

– Buongiorno, signori! Benvenuti!

– Гэта Габрыэла, мая сяброўка і кампаньёнка, – сказала Галіна і дадала нешта жанчыне па-італьянску.

Тая засмяялася, падхапіла Юрыя Іванавіча пад руку, пайшла побач.

– Sono molto lieto di fore la Sua conoscenca! – сказала скорагаворкай. – Lei piace stare a Roma?

– Яна пытаецца, ці падабаецца табе ў Рыме, – ператлумачыла Галіна.

– Вельмі падабаецца.

Унутры дом аказаўся яшчэ больш шыкоўны, чым звонку. «Палац, а не будынак», – падумаў Юры Іванавіч і ўспомніў сваю сціплую, хоць і ўтульную, праўда, хату.

– Гэтае жытло мы купілі з мужам дваццаць гадоў таму, – нібы адгадваючы ягоныя думкі, сказала Галіна. – І, папраўдзе, мне цяжкавата з ім развітвацца. Але што гэта я – не тое зусім, што трэба, гавару. – Яна падышла да дзвярэй сталоўкі, адчыніла іх. – Per favore! Калі ласка, да стала!

– Dei fuma, signore Juri? – зноў звярнулася да Юрыя Іванавіча кампаньёнка і, пакруціўшы між пальцаў незапаленую цыгарэту, неахвотна шпурнула яе ў фортку. – Il vedico mi ha proibito di fumare.

– Габрыэла цікавіцца, ці курыш ты, – зноў пераклала Галіна. – Маркоціцца, што ёй урачы забаранілі. Хто б мне забараніў. А давядзецца ж кідаць, хочаш не хочаш.

Сядзелі доўга – гадзіны дзве, аж пакуль не прагнала сонца. Яно вывернулася неяк раптоўна з-за даху суседняй будыніны, і адразу невыказны рай з Везувіем удалечыні ператварыўся ў пекла.

– C'e un cole che bracia! – згортваючы стол, загаварыла Габрыэла. – Non si respira!1

www.kamunikat.org

Перайшлі ў гасціную. Там працаваў кандыцыянер, і было зусім не горача.

– Збіраешся сапраўды гэты дом прадаваць? – калі зноў уладкаваліся за сталом, спытаў Юры Іванавіч у Галіны. – А дзе жыць будзеш?

– У кляштары, – зусім сур'ёзна адказала яна. – У Асізі ёсць ордэн сясцёр-кларысак. Да іх і пайду. Праўда, у іх дужа строгі закон, нават твару няможна паказваць цывільным. І курыць, вядома, ніхто не дазволіць.

– Няўжо вось так кінеш усё і пойдзеш у кляштар?

– Пайду.

– А што з Габрыэлай будзе? – уступіў ў размову Янка.

– Габрыэла вернецца ў свой Арвіета.

Кампаньёнка, пачуўшы знаёмую назву, імгненна ажывілася.

– Si, sono di Orvieto2, – сказала і ці не для большае выразнасці замахала рукамі.

– Яна любіць Арвіета, – сказала Галіна і абняла сяброўку за плечы. – Таму пераезд не станецца для яе няшчасцем. Да таго ж яна будзець няблага забяспечана. Юрак, а ты ўжо нагледзеў падарункі для сваіх? Не? І не глядзі, я сама куплю табе – усяго патроху. Гэтулькі, колькі скранеш з месца. Не чырванеі, для мяне тое – кропля ў моры. Ты, найахвярнейшы Янусю, які так мала зведаў ад мяне адданасці, таксама сёе-тое атрымаеш.

– Ты ўсё-такі падумай яшчэ...

– Думала, – яна жэстам рукі запыніла Янку. – Дзіўна, што ты не разумееш... Але досыць пра тое, дагаворым пасля. А цяпер я хацела б застацца сам-насам з маім найдалейшым госцем.

Габрыэла і Янка выйшлі. Галіна колькі часу моўчкі сядзела ў крэсле, затым паднялася з месца, пайшла да акна.

– Сягоння цудоўны дзень, – сказала, расчыняючы яго шырэй, так што стаў бачны ўвесь абсаджаны кветкамі двор. – Такіх і раней нямала было ў мяне. І наогул у мяне шмат добрага было ў жыцці. Добрыя бацькі. Добры муж. Неблагое здароўе. Але найлепшае там, у Шальцінах, засталося. І з ім, тым найлепшым, мне больш за ўсё хацелася развітацца. З ім і з табою. Таму я і прыдумала гэтае спатканне. Ужо прабач, што патурбавала. – Яна зачыніла акно, хутка, быццам баючыся, што ён яе затрымае, пайшла да дзвярэй.

Навальніца мінула гэтаксама нечакана, як і пачалася. І ледзь паспела на дварэ грымнуць апошні раз, як унутры сабора ўсё павесялела ад сонечных промняў, зайграла пазалотай.

Яны выйшлі на вуліцу. Дождж яшчэ крапаў, але ўжо такі рэдкі і дробны, што ніхто на яго не зважаў. На мокрых сходах, ля фантанаў мітусіліся, сноўдалі натоўпы турыстаў, задзірыстыя галубы, шоргаючы раз-пораз крыламі, блыталіся між ног. Сам сабор, які так уразіў Юрыя Іванавіча пры першым наведванні, цяпер, пры развітанні, здаваўся чамусьці і не такім велічным, і не такім таямнічым.

– У іх, у кларысак тых, сапраўды такія строгія законы?

– Строгія, – Янка адказаў адразу – нібы чакаў пытання. – Але не гэта галоўнае. У яе, ведаеш, гэты... КАР. Так, браце. Ну, да сустрэчы заўтра. Мы з Мікеле пад'едзем каля дзесяці. Так што к гэтаму часу будзь на рамарэнце.

– Цяпер, пэўна, на тым свеце ўжо спаткаемся. – Янка паўжартам адпіхнуў яго ад сябе, хаваючы за ўсмешкаю здрадлівую разгубленасць, што праслізнула-такі ў павільгатнелых вачах, пакрочыў назад, да стаянкі.

У зале, над уваходам у якую значыўся варшаўскі рэйс, ужо было поўна пасажыраў. Амаль усе яны размаўлялі між сабою па-польску. Юры Іванавіч прымасціўся ў адкідным крэсле збоч купкі маладых людзей з нейкімі музычнымі прычындаламі.

Адчуванне няпэўнасці і самоты, якое з раніцы тузала душу і пра якое ні словам не абмовіўся пры расстанні Янку, па-ранейшаму не пакідала яго. Быццам нешта было не так, а што – хоць памры, не ішло ў галаў. Апроч усяго, і тое, што не як след развітаўся з сябрам, не дадавала раўнавагі. Неяк нахапкам усё адбылося, бы скорагаворкай. Зрэшты, як атрымалася, так і ладна, што нявыказаным засталося, кожны сам сабе дадумае. Не, не тут трэба шукаць прычыну душэўнага бязладдзя.

І тут ён успомніў. Кар! Як ён адразу не здагадаўся! Гэтая звычка ў маленстве і пазней, калі ўжо вучыліся ў гімназіі, – пераварочваць словы, чытаючы іх наадварот. Янка – акня, Юрка – акрю... Кар... Дык вось што! Кар... Рак. А ён нават не паспачуваў. Хоць што ёй ягонае спачуванне. Ці захацела б яна яшчэ яго. Ды і як выказаць такое?

Ён прымусіў сябе супакоіцца, але ненадоўга. Зноў успомнілася благое – трымценне крыла, калі тыдзень таму садзіліся тут, у аэрапорце. Гэта ж крок да катастрофы! Згінеш, і касцей не збяруць. А

дома... статак і Таццяна хворая, скардзіцца на сэрца. Як яна адна будзе? Зноў жа, унуку пляцак модны, такі, што зараз усюды носяць, абяцаў прывезці. Дый ці мала што яшчэ.

А з другога боку, што яму засталося на гэтым свеце? Дык, можа, і не горш вось так, у самалёце – лёгкая смерць.

Але што гэта ён, пра што думае? Нельга так – грэх. І суседзі, пэўна, чакаюць. Яны, небаракі, за ўсё жыццё гэтулькі дабра не бачылі, колькі ён у чамадане вязе. Хай паглядзяць людзі, падзівяцца.

– Pan zle sie czuje?1 – Адзін з музыкаў нахіліўся над ім, спачувальна зазірнуў ў вочы.

– Не, проста задумаўся крыху, – сцепануўся Юры Іванавіч і борзда, як некалі ў лагеры па загадзе канваіра, падхапіўшыся з месца, пакрочыў следам за ўсімі да выхаду.

www.kamunikat.org

# УДОГ

## I

## 1831

# ПЕЛАГЕЯ

На небе не было ні хмурынкі, а гром не сціхаў увесь надвячорак. Сіплаваты, як кашаль сухотніка, ён нечакана ўсчынаўся дзесьці ўдалечыні, пракаціўшыся рэхам па наваколлі, павольна патанаў у знямелых ад пярэпалаху гаях і дубровах. Кожны раз зямля страхавіта ўздрыгвала пад ягонымі ўдарамі, а аблепленыя птушкамі дрэвы глуха рыпелі патрывожаным голлем. Раптам невядома адкуль узлятаў вецер, разбэрсваючы леташні сухастой на балацінах, з гучным самотным свістам кружыў над імшарамі. Спалохаўшыся яго, птушкі сягалі панад дрэвамі, павісеўшы ў паветры хвіліну-другую, як толькі ён аціхаў, роем клаліся назад, на голыя з зімы камлі. Зрэдку грымоцце суправаджала бліскавіца. Тады гром неяк адразу глушэў, рабіўся кароткі і рэзкі, бы пошчак пугі. Асветленае на кароткі момант лясное закуцце весела ўспыхвала мірыядамі падталых лужынак-льдзінак. Стомленыя доўгім чаканнем цяплейшых дзён людзі, са страхам гледзячы, як узмывае над палеткамі і тут жа знікае ў зямным прадонні вузкі, падобны да касы, пасак святла, з надзеяй уздыхалі: «Можа, дасць Бог дажджу».

«Лінуў бы ўжо, ці што», – прыхінаючы вольнаю рукою да грудзей саджанец, падумала Пелагея і навобмацак слізганула ў паўзмрок дзвярэй.

Цесная, з патрэсканых неабчасаных бёрнаў кухня сустрэла яе смуродам тытуню. Чатырнаццаць мужчын, якія дагэтуль аб нечым гучна гаманілі, убачыўшы госцю, дружна, бы па камандзе, сціхлі.

– Вучыцелька, – сказаў, падымаючыся з-за стала, гаспадар хаты Міхал Бабышка і з перасцярогаю зірнуў у кут, дзе стаялі прыслоненыя да сцяны чатырнаццаць жалязяк. – Па справе ці як?

– Чула, адыходзіце, дык рашыла разлічыцца. – Жанчына дастала з торбы некалькі бутэлек. – За тое, што страху ў школцы адрамантавалі.

Касінеры заўсміхаліся, падміргваючы адно аднаму, пацягнуліся рукамі да парожніх кубкаў.

– Што разлічвацца, дзеці нашы, не чужыя, Пелагея Юр'еўна, – незадаволена азваўся чырванатвары маладзец, што сядзеў першы ад парога. Яго звалі Каятан Аўласевіч, ён, хадзілі чуткі, быў сярод тутэйшых касінераў за галоўнага. – Ды і піць нам няможна, заўтра ў дарогу.

Астатнія мужчыны сярдзіта зашыкалі на яго. Маўляў, падумаеш, прычына – у дарогу. Да мястэчка рукой падаць. А адтуль да гасцінца, дзе мяркуецца далучэнне мясцовых паўстанцаў да канфедэратаў, на падводах маюцца падвезці. Панінаму брату Тамашу гэтая справа даручана, а ён чалавек надзейны, не падкачае.

Каятан, недаверліва паглядаючы на бутэлькі, падхапіўся з месца, штосьці шапнуў Бабышку на вуха.

– Кажаць пан Аўласевіч – нядобрае пітво, – сказаў той і пачухаў патыліцу. – Бытта пані вучыцелька прывезлі з Крайны нейкую трасцу і збіраецеся нас усіх ёю патруціць.

– Няпраўда! – зайшлася абурэннем жанчына. – У Крайну я па паперу ды падручнікі ездзіла, а не па атруту.

– А ў істопцы што, зачыніўшыся, два дні рабілі? – уступіў у размову Каятан.

– Дык... гнала гарэлку. – Пелагея рашуча пасунула да сябе адну з бутэлек. – Не верыце – першая вып'ю.

– Ладна ўжо, – прымірэнча сказаў гаспадар і дадаў, звяртаючыся да хаўруснікаў: – Што мы, звяры якія, што бабу будзем мучыць. – Сказаў і ўзяўся адкаркоўваць бутэльку.

Пелагея счакала, пакуль разліюць гарэлку, затым выскачыла з хаты на двор, тулячыся да сцяны, падалася ўсцяж панадворкаў да пакояў. Грымоцце сціхла, але маланкі па-ранейшаму працягвалі секчы, таму было відна, як удзень.

Дапяўшы да першай курціны, яна спынілася. Разграбла рукамі цвердаватую, прыхопленую вечаровым холадам зямлю, дастала з-за пазухі расліну, уторкнула ў ямку. Усміхнулася сама сабе: справа зроблена. І толькі гэтак падумала, як моцны раскат грому скалануў

наваколле. Пелагея хуценька падхапілася, шырокім крокам папраставала назад, у вёску.

З Бабышкавай хаты ўжо даносіліся спевы. Спявалі «Нужа, хлопцы...».1 Сэрца Пелагеіна зайшлося нянавісцю. Каб яны паздыхалі! Колькі ты іх ні вучы людскай мове, як аб сцяну гарох. Як ёй тут усё збрыдзела ў гэтым чужым, незразумелым краі! Але ж неяк будзе, нездарма кажуць: вада і камень точыць. Зараз галоўнае – пра ўцёкі падумаць. Пакуль не спахапіліся.

Канстанцыя выбегла следам за дзяўчатамі ў двор і знерухомела ад нечаканасці: сапраўды, усе чатырнаццаць мужчын, што надоечы збіраліся ў мястэчка, каб адтуль пад камандаю яе брата Тамаша рушыць насустрач асноўнаму войску паўстанцаў, сноўдалі па дзядзінцы, асцервянела дзяўблі косамі напалову адталую зямлю. Усе як адзін былі босыя, з расхрыстанымі на грудзях кашулямі. Змясіўшы дарэшты глебу на дзядзінцы, яны ўзяліся нішчыць кустоўе. Ледзь-ледзь набрынялыя пупырышкамі кусцікі ружаў, язміну, бэзу бездапаможна валіліся ніцма пад ударамі косаў, бязжаласна ўтоптваліся ў гразь. Канстанцыя памкнулася туды, але дзяўчаты не пусцілі яе: «Няможна, панечка, здратуюць!» І праўда, паўголыя касінеры з шалёнымі няўцямнымі вачыма нагадвалі гурт здзічэлага статку. Канстанцыя перажагналася, адступіла назад, да ганка. «Паклічце вучыцельку, Пелагею Юр’еўну, – загадала адной з чаляднiц. – Яе пабойваюцца, дык, можа, дасць рады.» – «Вучыцелькі няма», – адказала дзеўка. – «Як няма? Дзе ж яна дзелася?» – «Хто знаець. Кажуць, бачылі, як ішла дасвеццем да гасцінца.» – «Авохці мне! Уцякла, няйначай. Нездарма Тамаш ёй не давяраў. Як у ваду глядзеў.» – Канстанцыя зноў спусцілася на дзядзінец, у разгубленасці стала пад дрэвам. Што рабіць? Думкі, паганяючы адна адну, бязладным роем круціліся ў галаве. «Ідзіце дахаты!» – набраўшы ў лёгкія паболей паветра, выгукнула яна – хутчэй дзеля самазаспакаення, чым спадзеючыся на нейкі станоўчы вынік. Касінеры на хвіліну замерлі. «Разыходзьцеся! – скамандавала яна зноў, ужо больш упэўнена. – Ану, каму кажу!» Мужчыны, пагрозліва махаючы косамі, падышлі бліжэй. «Панечка, уцякайце!» – закрычалі перапалоханыя дзеўкі і стрымгалоў кінуліся да пакояў. «Я сказала – разыходзьцеся!» – словы самі сабою выляталі з вуснаў Канстанцыі. Страху яна болей не адчувала. «Ідзіце дахаты!» – крыкнула яшчэ раз і пайшла насустрач раз’ятраным

касінерам. І – здарыўся цуд. Мужчыны спыніліся, драпаючы насамі косаў скалечаную зямлю, пачалі паціху разыходзіцца.

Канстанцыя перавяла дух, акінула паглядам дзядзінец. Ён нагадваў пляцоўку пасля віхуры. Толькі адна раслінка, нібы насуперак усяму, ацалела ў нялюдскай калатнечы. І нават, нягледзячы на сцюжу, паспела ўжо выпусціць некалькі буравата-зялёных, з малюсенькімі іголачкамі на канцах, лісцікаў. Як яна называецца, Канстанцыя, хоць і была дасведчанай у батаніцы, не ведала. Але зараз ёй тое не абыходзіла. Куды больш непакоілі паводзіны касінераў. Што гэта з імі? Ці не павар'яцелі? Яна паклікала фурмана, з перасцярогаю паглядаючы ўслед мужчынам, што сунуліся краем прысадаў у накірунку вёскі, распарадзілася запрагаць каня.

– У мястэчка да Тамаша паедзеш, – сказала звычным да загадаў голасам. – Раскажаш яму ўсё, як было. Лекара няхай прышлець.

Лекар, сур'ёзны негаваркі чалавек гадоў шасцідзесяці, прыехаў надвячоркам. Ягоны прысуд быў кароткі, бы ўдар бізуна:

– Патруціліся.

– Патруціліся? – Канстанцыя здзіўлена ўзняла бровы. – Чым?

– Гэта аднаму Богу ведама, – усміхнуўся стары. – Ды яшчэ, можа, самім мужыкам. Папытайцеся ў іх, як апрытомнеюць.

Касінеры апрытомнелі, аднак ніякія размовы з імі наконт прычын масавага ачмурэння вынікаў не далі. «Мусіць, вучыцелька гэная нешта падрабіла», – сышліся на думцы, і на тым усё і скончылася.

## 2

## 1960

# РОМКА

Запалка порстка шарганулася аб край карабка, успыхнула і тут жа пагасла. Рэзкі серны смурод разліўся па кухні. Ромка паклаў карабок на месца, упіраючыся пятамі ў дошку ўслона, дастаў з пяколка другі.

З гэтага запалка загарэлася адразу. Хлопчык саскочыў з лавы, жвава перабіраючы нагамі па падлозе, накіраваўся ў сені.

З-за хісткай рудой перабойкі, ад суседзяў, даносіліся п'яныя галасы і гукі прайгравальніка. Ромка перабег вузкі, застаўлены рознымі гаспадарчымі прычындаламі калідор, выскачыў на панадворак.

Ля павеці дуракаваты Юзючок шчапаў дровы. Ён два дні таму прывалокся са сваёй вёскі ў заробкі і зараз так быў заняты справаю, што на Ромку і не зірнуў. І Ромка яго не зачапіў, хуценька, подбегам, папраставаў да пуні.

З-за несупынных дажджоў сена сёлета было крыху ваглаватае, і матка, каб яно не папрэла, штодня адчыняла дзверыну пуні насцеж. Але сёння перад адыходам у краму чамусьці гэтага не зрабіла – мабыць, забылася.

Стромкая вузкаватая кладня на гэты раз здалася больш высокай, як звычайна. Але Ромку тое не збянтэжыла. Чапляючыся рукамі за доўгія, сціснутыя верхнімі пластамі сена канцы цімафееўкі, ён імкліва палез угору і неўзабаве ўжо сядзеў на маціцы, якраз на тым месцы, дзе раней была столь, якую пару гадоў таму знеслі, перарабляючы лямус на пуню.

Тут акурат усё звычайна і адбывалася. Стоячы на маціцы тварам да выемкі ў сене, запальвалі запалку, шпурлялі яе ўніз, і як толькі сена схоплівалася агнём, ніцма валіліся на яго. Полымя гасла, і гэта азначала выйгрыш, перамогу. Калі не ўдавалася даць яму рады адразу, збівалі адзеннем. Забаву прыдумалі старэйшыя хлопцы. А ладзілі яе спачатку ў аборы, дзе, колькі памяталі сябе, валялася старое, паўстлелае пакулле. Днямі тое пакулле кудысьці вывезлі, і старэйшы Ромкаў брат Толік прапанаваў гуляць у пуні. Так і зрабілі – вядома, употайкі ад бацькоў.

Учора выйграў брат. Яму тройчы ўдалося дарэшты накрыць сабою агонь. Сёння ўранку ён выправіўся з маці ў краму на той бок Дзвіны, і Ромку нічога не засталося, як бавіцца ў адзіноце.

У дальнім куце пад самым паддашкам спаў бацька. Калі ён паспеў прыйсці сюды ад суседзяў, Ромка не бачыў, але па гучным, з падсвістам, храпе, імгненна вызначыў: п'яны добра і прачнецца не хутка. Ён дастаў з кішэні карабок, балансуючы босымі нагамі на колкай маціцы, чыркнуў запалкаю па рудым шурпатым баку.

Сена загарэлася ўмомант. Ён не паспеў нават нахіліцца перад скачком, як усё наўкола аказалася ахоплена полымем. Яго было так

шмат, што Ромка разгубіўся. Затым, не памятаючы сябе ад страху, кулем сігануў з кладні ўніз, пужаючы курэй, выкаціўся на трасотнік. Юзючок падбег да яго, размахваючы ў паветры паленам, адчайна заскуголіў.

Матчыну паставу ён пазнаў здалёк. Затым пачуў і Альбінін голас – перапалоханы, роспачлівы:

– Толік, бяжы па людзей!

Брат кінуўся да пакояў.

Суседзі павыскоквалі на двор, у паніцы замітусіліся ля пуні. Як заўсёды, калі здаралася нешта незвычайнае, каманду ўзяў на сябе Вітольды. Ромка чуў, як ён загадаў старэйшым хлопцам бегчы па коней. Але калі іх прывялі і пачалі запрагаць, каб падвезці да пажарышча вады, ратаваць ужо не было чаго.

Страх абручам скаваў Ромкава цела. За ўвесь час, што гарэла пуня, ён толькі аднойчы прыўзняў галаву – паглядзець, дзе маці. Альбіны ён у дыме не ўбачыў, затое выразна пачуў сярод вэрхалу яе спужаны голас. Падхапіўся, каб бегчы на яго, але не змог, неслухмяныя ногі нібы ўраслі ў зямлю. Стараючыся як менш удыхаць едкі пах гару, урэшце-такі падняўся, пасунуўся бульбянішчам да пакояў.

– Ромак, сынок! – матка абхапіла яго за галаву, прытуліла да сябе.

Толік, стоячы ўбаку, засяроджана глядзеў на брата ўважлівымі, крыху касаватымі блакітнымі вачыма. Ягоны прадаўгаваты, спэцканы сажаю твар нагадваў твар мурына са скульптурнай калекцыі дзядзькі Вітольдага.

– Няхай яму рукі адсохнуць, таму нягодніку, што падпаліў, – не выпускаючы Ромку з абдымкаў, сказала Альбіна.

Занятая меншым сынам, яна і не заўважыла, як перасмыкнуліся нібы ад болю пры гэтых яе словах вусны большага.

Куча галавешак яшчэ прывідна высільвалася рэшткамі дыму, а суседзі, збіўшыся гуртам, абмяркоўвалі, што рабіць далей. Бедавалі: сена згарэла, а касіць больш няма дзе. З утварэннем у Дубраўцы калгаса людзей паболела, і статку зрабілася цеснавата.

– Як-небудзь будзець, – не адпускаючы ад сябе ні на крок Ромку, сказала Альбіна і занепакоена дадала: – Гірона відзеў хто?

– Мабыць, спаць дзе рынуўся, – адазвалася Бакевічава Галіна. – Выпівалі з Петраком. Гляджу – захмялеў. Кажу: выпіў, дык ідзі

кладзіся, як чалавек. Ён у дубкі: давай, маўляў, яшчэ. Выпхнула нейк, пайшоў...

– У пуню пайшоў, – вымкнулася наперад старэйшая Галініна Валька.

– Матка Боска! У пуню! – выгукнула Альбіна і непрытомная павалілася на зямлю.

Шукалі Гірона доўга. Чацвёра прыезджых пажарнікаў і Вітольды спачатку прыгасілі брандспойтам галавешкі ад бёрнаў і дошак лямуса, што праваліліся ў пограб, і толькі пасля гэтага ўзяліся іх разграбаць. Рабілі без супынку некалькі гадзін, аж пакуль не натыкнуліся ў адным з куткоў на счарнелыя косці. З жахам гледзячы на тое, што засталося ад мужа, Альбіна так моцна сціснула Ромкаву руку, што той ускрыкнуў ад болю. Затым яна падышла да машыны, у якой сядзеў са звязанымі рукамі перапалоханы да паўсмерці Юзючок, сказала міліцыянеру:

– Пусціце, ён невінаваты.

– Невінаваты? – здзівіўся той. – Хто ж тады падпаліў пуню?

– Мужык мой заядлы быў курэц, запаліў п'яны, во і загарэлася, – адказала яна і страціла прытомнасць другі раз.

Гірона хавалі на трэці дзень пасля пажару. Майстравіты Вітольды збіў брату труну, аздобіў яе па баках адмысловаю разьбой. Увесь час, што дамавіна стаяла ў хаце, сямігадовы Ромка прасядзеў у суседзяў. І толькі на могільніку, падбадзёраны ласкавымі словамі маткі і ксяндза, крыху адтаяў і нават насмеліўся падысці да труны з бацькавымі парэшткамі.

Зямля пахіснулася пад ягонымі нагамі ў гэты момант і доўга, аж пакуль не ўзняўся над магілаю курганок, гайдалася сюды-туды, поўнячы сэрца скрухаю і адчуваннем віны.

Тыдзень пасля пахавання прайшоў у клопатах. Спачатку даводзілі да ладу месца пажарышча. І хоць рабілі гэта прыскакам, пасля працы ў полі, справа рухалася даволі спорна. І неўзабаве, пасля доўгай спрэчкі, ці варта ўзводзіць новы будынак на папялішчы, узяліся класці воддаль першыя вянцы, але не пуні, а шахі, каб хапіла месца і пад сена, і пад буракі і можна было ў выпадку чаго, як зараз вось, паставіць і статак.

Апроч сена ў агні згарэлі ладныя запасы мукі і мінулагодняй бульбы. У нядзелю Вітольды запрог каня, і Альбіна з Галінінаю сястрой Польцяй Свістуніхай выправіліся на латышскі бок па правіянт.

Грошай хапіла на тры мяхі сечкі, некалькі кіло пернікаў і з дзесятак боханаў пытляванага хлеба. Вярнуўшыся дахаты, жанчыны падзялілі муку між сем'яў, ласункі раздалі дзецям.

Ромка, які пасля смерці бацькі ўвесь час імкнуўся застацца адзін, на пачастунак не паквапіўся. Альбіна загарнула чатыры ягоныя пернікі ў анучку, паклала ў шафу, моўчкі падалася з хаты на двор, дзе каторы дзень запар завіхаўся ля тоўстага ліпавага пакалака самотны Вітольды. Думка вычасаць брату помнік з дрэва прыйшла яму ў галаў яшчэ падчас пахавання, і цяпер ён аддаваў гэтай справе ўвесь вольны час.

Занятай хатнімі клопатамі Альбіне помнік абыходзіў мала. Куды больш непакоілі сыны. Ромка ходзіць сам не свой, па начах будзіць яе і суседзяў нечалавечым крыкам. І Толік перамяніўся са смерцю бацькі – калодзеж суму ў вачах. А ёй і пагаварыць з хлопцамі як след не выпадае з-за праклятай некальніцы.

Напрыканцы тыдня на пляц перад пакоямі ўехала падвода. Кабета год сарака ў крэпдэшынавай сукенцы саскочыла з яе, часценька міргаючы кароткімі светлымі вейкамі, здзіўлена сказала:

– Место какое-то... странное.

Гаварыла яна не па-тутэйшаму, але ўсе зразумелі яе.

– Гэта былая панская сядзіба, – сказаў спадарожнік жанчыны старшыня сельсавета Сцяпанавіч. – Паны з'ехалі, а пакоі, бачыце, ацалелі. Цяпер тут калхознікі жывуць, маладыя сем'і. Казаў той, усё для народа. Гэна – шаха будуецца замест пуні, што згарэла...

– А для клуба где помещение?

– У пакоях. Вялікая зала, месца хопіць. І вам побач для жытла куточак знойдзецца.

– Электричества нет?

– Ёсць, але часова адключанае – лінію рамантуюць. Ці не заўтра падключаць збіраюцца.

Маладзіца няспешна абышла абсаджаны язмінам і ружамі пляц, спынілася перад Вітольдавымі скульптурамі.

– А это что?

– Гэта штукар тут адзін ёсць, дык штукуець, выразаець рознае...

– Что же, для украшения клуба вполне могут сгодиться. – Яна пакратала кожную фігуру рукамі, паблажліва ўсміхнулася. – Надо же: в такой глухомани и такой талант!

К вечару ўсе ў Дубраўцы ведалі: у вёсцы будзе клуб і загадчыцу яго, маладзіцу ў крэпдэшынавай сукенцы, зваць Славай.

– Слава? Нянашае нейкае імя, – круцячы галавой, сказаў Пятрок. – Стася і то лепей. Праўда, Раман?

– Не ведаю, дзядзька, – адказаў той і адвёў пагляд убок. Прыезджая яму спадабалася, і ён баяўся, што хто-небудзь пра гэта здагадаецца.

Толік расхінуў бэзавы куст, ступіў у гушчар. Пасталелае за апошні тыдзень дрэўца выглядала неяк непрытульна. Прыгледзеўшыся да яго як след, Толік зразумеў прычыну: усе ягады на ім нібы карова языком злізала.

Дрэўца яны з Ромкам апышкалі на пачатку лета. Ягады, хоць і былі зусім маленькія, аказаліся дужа смачныя. Што за яны, ніхто ў вёсцы не ведаў. Нават дасведчаны Вітольды адно пацiснуў плячыма: маўляў, на ягонай памяці такіх у Дубраўцы не сустракалася. Можа, птушкі адкуль занеслі насенне. Ягады з кожным днём рабіліся ўсё смачнейшыя. Дык ці дзіва, што нехта паабзбіраў?

Штосьці шаснула ззаду – быццам хто ішоў. Толік азірнуўся. Ромка, маленькі на фоне гонкага кустоўя, стаяў у некалькіх кроках ад яго і церабіў далонню кішэню прышмальцаваных картовых штаноў.

– Гэта... я абабраў, – сказаў вінаватым голасам і зрабіў яшчэ адзін крок наперад. – Тады, як...

– Як пуня згарэла? – здагадаўся Толік.

Брат раскрыў рот – мусіць, каб пацвердзіць ягоную здагадку, але вымавіць нічога не паспеў. Асляпляльна-жоўты сноп святла ірвануўся з акна бліжэйшай хаты, разануўшы прыцемак, разліўся ля самых яго ног.

*Агонь так хутка ахапіў кладню, што Гірон не паспеў ахнуць. Пасунуўся ўбок, хаваючы ад полымя твар, пачаў закопвацца глыбей у сена. Гэта не дапамагло, агонь з кожнаю хвілінаю пранікаў усё далей у тоўшчу кладні. Ромка кінуўся да бацькі, выпрастаўшы рукі, узяўся гасіць полымя далонямі. Усё было марна. Агонь не адступіў, наадварот, рабіўся ўсё больш страхавітым. А Гіронава цела ўсё*

*танела і ўрэшце ператварылася ў некалькі чорных костак. Ромка закрычаў, вопрамеццю кінуўся прэч ад жахлівага месца...*

Шукалі яго ўсёю грамадой. Знайшлі пад раніцу ля ракі, побач з млынам.

– Што цябе напалохала, сынок? – ведучы яго сцежкаю да пакояў, дапытвалася Альбіна. – Няўжо праўда, як Толік кажаць, – святло?

Ромка моўчкі матлянуў галавою ў знак згоды.

– Дык святло ўсё ж? Гэта ж алектарка, Ромак, яе не след баяцца. Наадварот, добра, што адрамантавалі... Цяпер у нас заўсёды відна будзець.

Апошнія яе словы прагучалі ў вушах меншага сына як прысуд, але яна пра тое не ведала.

## 3

## 1965

# ЛЮБОШЧЫ

*Водар парафіну расплыўся ў паветры, і тут жа да яго прымяшаўся пах гарэлага адзення. Бацька прыўзняў у труне галаву, ратуючыся ад агню, пасунуўся ўбок. Полымя ўжо лізала ягоны рукаў і аббіўку дамавіны. Трэба было нешта рабіць. Ромка здзёр з канапы выцвілую старую капу, пачаў збіваць ёю агонь. Але стала яшчэ горш: вогненныя пырскі, разлятаючыся, траплялі ў сцены, у столь, у мэблю. Ромка ў адчаі закрыў твар рукамі, апромеццю кінуўся з лепшага пакоя ў кухню, з якой даносіўся паважны, крыху сярдзіты голас ксяндза...*

– Велькія мальцы, а ў споведзі не былі. – Тонкі, чысты пробашчаў палец ушчувальна захістаўся перад Ромкавымі вачыма. – Нявольна гэтак.

– Даруйце, ойча, – паўтарала як заведзеная Альбіна і роспачліва мітусілася па кухні. – У школе страшаць, што выключаць, як пойдзеш. Што нам робіць?

Ромка, які яшчэ добра не ачнуўся ад сну, неўразуменна глядзеў то на ксяндза, то на маці.

– Бацькам грэх, не каму. – Ксёндз гаварыў, нібы ўбіваў у бэльку цвікі. Нарэшце, стаміўшыся, мусіць, павучаць, пайшоў.

Ромка, карыстаючыся момантам, слізгануў за парог следам за ім. Альбіна засталася ў хаце адна. Але не паспела яна выцягнуць з печы апошні кацёл, як на ганку зноў пачуліся крокі.

Стася, вясёлая, у новым ваўняным жакеце, увайшла ў кухню.

– Нікога больш няма? – сказала, зыркаючы па кутках. – Сёння рэпетыцыя, дык прыходзь. «Ленин всегда живой» будзем развучваць.

– Прыйду, а як жа. Вітольдаму сказаць?

– Сама скажу. Дзе ён?

– На трасотніку.

Стася, не зважаючы на гаспадыню, папраўіла перад люстэркам валасы, знарок няспешна, быццам нехаця, накіравалася ў сені. Альбіна хуценька ўправілася з печчу, таксама падалася на двор.

Ля прысланенага да плота Стасінага ровара стаяў Ромка і мацаў пальцамі бліскучую раму.

– Мама, купіш такі?

– Куплю, – сказала яна і ўздыхнула. Дванаццаць яе меншаму, а ценкі, бы васьмігадовы. Маўклівы, зацяты, слова не выцягнеш. І крычыць спрасоння. Вадзіла да шаптухі – каб што. Цяжка з мальцамі.

– Вітольды кажаць, фігуру можна прадаць, і будуць грошы...

– Хто яе купіць, фігуру!

Вітольды, абжаргаўшы босымі нагамі бервяно, дзяўбаў далатом напалову ўжо апрацаванае дрэва. Побач з ім стаяў, не адыходзячыся ні на крок, Толік і ўважліва сачыў за кожным дзядзькавым рухам. Крыху воддаль, на перакуленым пні, сядзела Валька і ела недаспелы гурок. Яна нядаўна вярнулася з Дзвінска, дзе вучылася на швачку і дзе з ёю здарылася непрыемнасць з-за аднаго мужчыны, і, падобна было, шчыраваць з маткаю па гаспадарцы не збіралася. На пачатку года ёй споўнілася семнаццаць, але выглядала яна на больш – з-за паставы, што неяк няўзнак, на вачах акруглілася, зрабілася пажаночы вабнай. Апошні месяц яна, як і Толік, не адыходзілася ад Вітольдага, і той, хоць і адчуваў няёмкасць перад Галінаю і суседзямі, не надта гэтаму праціўіўся.

Тут жа таўклася і Стася. Непрыязна пазіраючы спадылба на маладую суперніцу, рабіла выгляд, быццам думае нешта сваё. Убачыўшы Альбіну, схамянулася, заспяшалася.

– Чакаем на рэпетыцыі, Вітольд Іванавіч, – сказала, падцінаючы тонкія вусны. – У восем.

– Я таксама прыйду, – сказала Валька.

– Ксёндз, відалася, ішоў ад вас, – знарок не зважаючы на яе, а звяртаючыся да Альбіны, працягвала Стася. – Што яму нада?

– Сварыўся, што мальцаў у касцёл не ваджу, – адказала Альбіна.

– Глядзі ты! – Стасін твар успыхнуў ад абурэння. – А што дзяржава ў нас ад царквы аддзеленая – забыўся? – Яна вярнулася да хаты па ровар, узлезла на раму, напяваючы нейкую мелодыю, паруліла з панадворка.

Альбіна паставіла кошык на ганак, стомлена апусцілася побач. Ісці ў хату не хацелася – за два гады тая так і не стала сваёй. Залетась, акурат во гэткаю парою, як зараз, у пакоях парабілі склады для ўгнаенняў, а жыльцоў паперасялялі ў хаты вывезеных падкулачнікаў. Тады ім, Старынскім, і дастаўся дзірававper, хоць з выгляду яшчэ досыць прыстойны, трысцен дзядзькі Вайцюля. Пазней, калі зліквідавалі склады, а да пакояў пацягнуліся з усяго наваколля падводы па дармавыя дрэва і цэглу, да іх перабраўся Вітольды. Яна не хацела: мужчына нежанаты, што людзі скажуць? Але мусіла пацясніцца – радня ёсць радня.

А тым часам пакоі зусім заняпалі. Вельмі хутка ад іх засталася адна ніжняя, і то не ўся, частка. Бэлькі, перакрыцці, каменне перакачавалі на ферму, шмат што асела ў асабістых падвор'ях дубраўцаў. Цягнулі ўсё падрад, без разбору. На што ўжо нядбайны Польцін Янка, а і той прывалок дадому рэдалі каляровае кафлі ад печы, не ведаючы, як даць ёй рады, згрузіў грудаю ля хлява. Адзінае, што засталося на сядзібе некранутым, былі сутарэнні. У іх парабілі загародкі для авец, а ў апошнім ад лядоўні – клуб. Цяпер Стасі працы паменела, і напрадвесні яе прызначылі па сумяшчальніцтве звенавой па ільне.

Уздыхнула Альбіна: гэтак усё змянілася ў Дубраўцы апошнім часам. І ці ўсе гэта яшчэ змены? Вунь новаспечаная звенавая з ранку да змяркання бродае па наваколлі з тапаром, шукае, што яшчэ можна высекчы. Ходзіць пагалоска, нібыта назад, у сваю Крайну, збіраецца, вось і пляжыць падрад, што трапіць пад руку.

З-за кустоўя, ад пуні, пачуўся шоргат ровара. Брыгадзір Мэська Пілецкі, якога ўсе звалі за вочы Манолісам Глезасам, падрулiў да самае хаты, спыніўся побач з Альбінай.

– Заўтра лён церабіць, – сказаў надтрэснутым – ці не з перапою – голасам. – Дык прыходзьце ўсе.

Старэйшыя падавалі кулі на канвеер, дзятва пераймала абмалочанае з камбайна, адносіла да сціrты. Праца, хоць і здавалася на першы погляд няцяжкай, вельмі хутка стамляла. Апроч стомы, даймаў пыл. За якую гадзіну твары ў людзей зрабіліся шэрыя, бы прысак. Дадаваў клопату і вецер. Сцюдзёны, напорысты, ён віхураю ўрываўся на пляц перад камбайнам, зласліва насвістваючы, шпурляў дубраўцам у твар жмені пацяробкаў напалову з пылам. Брыгадзір усё часцей пасыкваў на дзяцей, каб варушыліся.

Альбіна з трывогаю зірнула раз, другі на свайго меншага. Зноў кепска спаў уначы і зараз ходзіць, нібыта здань. А яшчэ ж да катэхета ўвечары, цвічыць малітвы, дык ці вытрывае?

Ззаду нячутна падышоў Вітольды, перакрываючы голасам грукат камбайна, гукнуў у вуха:

– Ксяндза забралі.

– Куды забралі? – не зразумела яна. – Хто?

– Чортведама. Брыгадзірыха ваду прывозіла, дык казала.

– Твая ўжо ці не пастаралася...

– Якая мая?

– Ільнаводка. Звенавая, а на полі не паказалася нават. – Альбіна пераняла апошні куль, панесла да сціrты. – З бартаю сноўдаецъ у прыцемках... Каб на яе дрыстун.

– Шкода пробашча. – Галіна недаўменна пахітала галавой. – І чым ён Стасіндоры не дагадзіў?

– Вядома чым, – сказала Альбіна. – Пасварыўся, што сячэць наўкола, во і адпомсціла, данесла.

– Пакараецъ яе Бог.

– Глядзі, каб не пакараў. Хутчэй мы тутака ў пустэльні застанемся. Папляжыць усё ды паедзець.

– Думаеш, паедзець?

– Кажуць усе. Нібыта дачка там у яе хворая, няма каму даглядаць. Знова, на Вітольдага крыўда... А й варта! Было не квапіцца на маладога. Ён сабе і дваццацігадовую найдзець. А можа і маладзейшую. Тваю Вальку, да прыкладу.

– Няхай бы, я не проці была б.

– Казала яму – пасмяяўся. Замаладая, маўляў. Яму, мусіць, фігуры ягоныя драўляныя болей за ўсё абыходзяць. Ну дык няхай і халасцякуець.

Крокі харыстаў паволі стаялі ў вечаровай цішы. Вітольды, ніякавата ўсміхаючыся, моўчкі таптаўся на месцы. Ягоныя закаструбелыя ад пастаяннага сяброўства з далатом і малатком рукі на фоне бялюткай святочнай кашулі нагадвалі галаўні. Цяпер, застаўшыся з ім сам-насам, можна было пачынаць размову. Але Стася не спяшалася. Крыўда абручам перацiснула ёй горла. Як яна ўсіх іх ненавідзіць! Усіх – з іх недарэчнымі імёнамі і звычкамі. Гэтага нельга, тое – «нявольна». Адзіным, да каго гарнулася, быў ён, Вітольды. Ды і з ім, падобна, непярэліўкі. А гэтулькі сіл паклала, каб прынадзіць. І ўжо, здавалася, пасунулася справа, як адкуль ні вазьміся гэтая Валька... І ўсе старанні – кату пад хвост. Дык пра што гаварыць? Не, не будзе яна нічога казаць.

– Ад'язджаеш, чуў? Праўда гэта?

– Можа быць. – Стася збегла з ганка, рашуча ступіла ў густы, напоўнены водарам яблыкаў прыцемак. Тапор пры ёй, а больш нічога і не трэба. Маленькі востры тапорык – адзінае, што патрэбна ёй, каб выказаць сваю пагарду і нянавісць.

Валька зняла з плота даёнку, не даслухаўшы, што казала з істопкі праз адчыненыя дзверы маці, накіравалася да выгана. Спяшалася: карцела як найхутчэй пабачыць Вітольдага.

Вітольды з Толікам палілі на сотках падсохлы бульбоўнік. Было цеплавата, і на спінах у абаіх выступілі плямы поту.

Яна ўладкавалася пад Міртаю, робячы выгляд, быццам доіць, пачала цікавацца за імі.

Сталыя мужчыны заўсёды падабаліся ёй больш, чым аднагодкі. Таму і цяпер закахалася ў старэйшага. Праўда, ніколі нічога путнага з такога кахання не атрымлівалася. Вунь летась выкладчыка аднаго ў Дзвінску ўпадабала – і што? Такі вэрхал узнялі ў вучылішчы, што лепш і не ўспамінаць. Выклікалі маці, тая прыехала, каб забраць яе назад у Дубраўку. Сорамна ўспомніць! Прыехала ў ватоўцы і з парога – вучыць, як сябе паводзіць з мужчынамі... Тут зноў – Вітольды. Ёй шаснаццаць, яму – трыццаць шэсць. Да таго ж, ходзіць пагалоска, са Стасяй у яго штосьці.

Тым часам мужчыны скончылі працу, пакідаўшы вілы, накіраваліся да ракі мыцца.

Валька ўскочыла з-пад каровы, хіснулася следам у хмыз.

Паўголы Вітольды здаўся ёй падобным да Бога.

Быццам якая невядомая сіла гнала яго ў гэты вечар да ракі. Альбіна крыкнула наўздагон, каб перавязаў нанач авец, але ён, заняты сваімі думкамі, нават не павёў брывом. Ледзь дапяўшы да прыстані, сцягнуў праз галаву кашулю, убрыў у ваду. Хуценька абліў далонямі жывот і плечы, пацепваючыся, выскачыў назад на бераг. І тае ж хвіліны пачуў ад пакояў знаёмы стук тапара. «Халерная баба, – падумаў, абціраючы цела ручніком. – На ляду ператворыць мясціну.»

У лагчыне, як і ўчора, калі прыбіралі з Толікам бульбоўнік, Валька валаводзілася з каровай. Тая закрапалася за лазіну, і дзяўчына ніяк не магла яе адкрапаць. Вітольды кінуў на сцежцы ручнік, кінуўся Вальцы на дапамогу.

Яна трымала Мірту за вяроўку, а ён моўчкі кружляў з калком наўкола куста. Калі ланцуг, нарэшце, быў раскрапаны, уторкнуў яго ў ранейшае месца, падаўся да Валькі. Яна, часценька дыхаючы, неяк скоса, нібы не давяраючы, пазірала на яго з-пад рукі. Затым нечакана імкліва пасунулася бліжэй, датыкнулася грудзьмі да ягонага пляча. Ён схапіў дзяўчыну за руку, прыціснуў да сябе. Яна ўскрыкнула, але вырывацца не стала. Усё гэтак жа маўчком ён падвёў яе да хмызу, трымаючы адною рукой за шыю, пачаў другою таропка распранаць. Яна не праціўілася, толькі безуладна асядала целам усё ніжэй і ніжэй. Не памятаючы сябе ад узбуджэння, ён расшпіліў штаны, прытрымліваючы Вальку знізу за клубы, паваліў на траву...

...Страхавітая пачвара нечакана ўзнікла па-над кустоўем, раз’ятрана лаючыся, узмахнула ў паветры тапаром. Іржавае тупаватае лязо мільгнула ў паўзмроку, з глухім скавытаннем апусцілася долу.

Валька прыўзнялася, быццам хочучы скінуць з сябе Вітольдага, падалася целам убок. Крык вырваўся з ейных грудзей, зліваючыся з посвістам ветру, скалануў наваколле. Невядома адкуль узяўшыся, цёмная вялізная хмара закрыла неба, тарганулася колькі разоў сюды-туды і замерла над Дубраўкай.

Калі яна ачнулася, наўкола было ціха, як на могільніку. Варухнула рукамі – цэлыя. Тулава, ногі – таксама на месцы. Адзінае, што даймала няўтульнасцю, было адчуванне нечага мокрага на грудзях і шыі. Яна памацала пальцамі мокрыя месцы – падобна на кроў. Але чаму тады пад ёю суха? І дзе Вітольды?

Яна паклікала яго раз, другі – каб гук у адказ. Тады паднялася, пераадольваючы боль у нізе жывата, пасунулася да ракі мыцца. І ўжо калі амаль дапала да вады, успомніла ўсё і страціла прытомнасць.

Зноў ачнулася яна на чацвёрты дзень. У хаце было поўна людзей. Усе глядзелі на яе са шкадаваннем і нібыта чаго чакалі.

З сяней убегла ў пакой Галіна, не выпускаючы з рук секача, якім толькі што секла ў істопцы ахрап'е, кінулася да дачкі.

– Валя! Дачушка!

Валька прыўзнялася на ложку, нібыта шукаючы каго, абвяла прысутных вачыма.

– Ві-тольды... дзе?

Наперад прасунулася паўз суседак Альбіна, нахілілася над хворай.

– Бог ведаець, – сказала ўздыхаючы. – Як скрозь зямлю праваліўся. Чакалі, калі ты апрытомнееш, думалі – скажаш.

– Стася знаець, – Вальчын голас паслабеў, зрабіўся вялы, невыразны.

– Стася нам не памочніца, – папраўляючы ў дачкі пад галавою падушку, сказала Галіна. – Яна тры дні як з'ехала ў сваю Крайну.

Наваколле абшнарылі некалькі разоў, і ўсё дарэмна. Вітольды, сапраўды, нібы пад зямлю праваліўся.

Тады абшукалі ўсе віры, і таксама беспаспяхова.

І толькі праз два месяцы, ратуючы авечку, што звалілася недалёка ад ракі ў паўзакінутую бульбяную яму, натыкнуліся на дне яе на вымытую дажджом з-пад пяску мужчынскую руку.

Усе, хто прыйшоў паглядзець труп, у адзін голас прызналі ў ім Вітольдага. Паведамілі ў міліцыю. З раёна прыехалі пракурор са следчым, медэксперт і яшчэ некалькі чалавек. Апыталі ўсіх, але безвынікова. Пра абставіны трагедыі ніхто нічога не ведаў.

Тады Альбіна павяла прыезджых да Бакевічаў.

У хаце была адна Валька. Твар яе чырваніў ад слёз. Напярэдадні яна аб'явіла бацькам, што цяжарная, і ёй добра дасталося ад Петрака. Убачыўшы старонніх людзей, яна адразу здагадалася, што да чаго. І,

блытаючыся ад хвалявання і страху, расказала ўсё, як было. Усё, апроч аднаго, – галоўнага. На тое не хапіла духу.

# ПОЛЬЦЯ
## (з магнітафоннага запісу аспіранта М. Дзямешкі)

*Яно гэдак: не адно, дык другое. Тока Гірона паспелі пахуваць, як на табе – знова бяда. Вітольдага шкода, рабацяшчы быў. І ўмеў усё. Дужа шкода. Адзін за адным браты паляглі. Але што ж, рук, казаў той, не падкладзеш. Як падроблена ўсё роўна.*

*А што – падрабляюць. Вунака праз целявізар фігурнае катанне надавалі... Мужчына бабу, ці то дзеўку там, падымець і круціць, бытта на пальцы. А тады яшчэ кінець з усяго расшпару. І думаць нечага – падроблена. Гэтаксама і тут, з Вітольдым. Што ён, сам сябе ў яміне тэй засыпаў? Дай ты рады!*

*Валька, сястры маей стрыечнай дачка, пэўна, знаець, як было. Але маўчыць. Можа, баіцца... А можа і ня хочаць казаць, мала якая прычына. І я дагадаваюся, але тожа маўчу. А што, во гэдак вымкнесся, а тады і зробіцца што. Хош яе, Стасі, няма тут цяперака, а раптам вернецца? Усяк жа бываець.*

*Што пытаецеся? А, гэта? Гэта пакоі. Даўней паны жылі. Ад Саветаў у Польшч уцяклі, а ўсё іхнае асталося. Тут во – кветнікі, кветкі разныя. Улетку як зацвітуць – красна а красна ад цвету. Пакоі бураць. Халерая цябе: каму што нада, тое і бярэць. Пачкі разабралі ўжо. Тожа шкода. Пакоі ладныя былі, што кругом, што сама будыніна. У доле сцены таўстыя, мураваныя. Там кухня з пякарняй, склеп. Два коміны з капцільняй, для вэнджання. Вышэй – жылыя мяшканні. Сталоўка і шэсць пакояў, салон. Яшчэ два пакоі. Крэпкае ўсё, з дубу. Шчыткі красівыя, з маляванай кафлі.*

*Мне не наравіцца, што бураць. Распасорыць лёгка, а ці збярэш тады? Але як перабаразніць – не знаю. Казаць – што пугай па вадзе сцёбнуць. Тока ворагаў нажывеш. Можа, вы падказалі б, што робіць? Каму яны нада, кажаце? Во, усе так кажуць. Можа, і праўда гэта. Дык звініце, што патурбавала.*

*А што вы тутака ў нас, па справе ці сяк? Бабы, чула, казалі, бытта, як гаворым, запісываеце. І то работа. І песні тэж? Не, я не пяю, не даў Бог голасу. Тока як памрэць хто, тады разам са спявакамі, за кумпанію. Сястра, пра каторую казала, Галіна, красіва*

*пяець. Ужо ад'язджаеце? Шкода, а то Галіна многа песень знаець. Але як ад'язджаеце, дык што ж... Давідзэнька вам, дасвідання! Тэж паляту. Карова рана палёталася, дык во калі ацялілася, даіць нада.*

Неўзабаве пасля пахавання Вітольдага, на пачатку снежня, калі быў падняты з поля і перавезены ў шаху лён, Альбіна атрымала ліст. Пісаў з Рыгі стрыечны Гіронаў брат Лявон. Вія, ягоная жонка, месяц таму загінула пад машынай. У горадзе аднаму з дзіцем надта цяжка, таму ён хацеў бы вярнуцца на сталае жыццё ў родныя мясціны. Дык ці ёсць магчымасць зачапіцца?

Альбіна і не памятала, калі апошні раз трымала ў руках пісьмовыя прылады. Таму адпісваць ліст узяўся Толік – пад яе дыктоўку. Пасланне атрымалася кароткае, але змястоўнае. Ім вельмі, вельмі шкада Віі. А што да вяртання, дык, вядома ж, можна неяк уладзіць. Пустуе каней хаты Вітольдага, можна пажыць у ім колькі часу.

Яна адставіла кошык з бульбаю, выпрастала спіну. Ззаду хтосьці падышоў, спыніўся побач. Каторы з сыноў, падумала яна і азірнулася. Не, то былі не сыны.

– Гэтак скора? Мы і не чакалі... А дзе ж дзяўчына?

– У Віінай сяброўкі пакуль асталася.

Лявон, элеганцкі, у даўгім дэмісезонным паліто, стаяў ля бурта і весела ўсміхаўся. Ягоныя, па ўсім відаць, новыя, без адзінае зморшчыны на саюзках, туфлі ў камяках гразі нагадвалі хадакі.

– Чаго не паведамілі, што прыедзеце? – збянтэжана паўтарала Альбіна. – Мы каня папрасілі б у брыгадзіра падвязці... А то, бачыце, абутак зблоцілі...

Ён зноў усміхнуўся.

– Абутак не самае галоўнае ў жыцці, – сказаў і, лёгка падхапіўшы адною рукою кошык, панёс яго да хаты.

# 4
# 1966

# ЛЮСЯ

– Гэта я, адчыні. – Лявонаў голас гучаў крыху прастуджана.

Альбіна адчыніла засаўку, ратуючыся ад сцюдзёнага ветру, што ірваўся з вуліцы ў сені, кінулася назад, у хату. Лявон увайшоў следам за ёю, не распранаючыся, запаліў папяросіну.

– Дык як, не перадумала? – спытаў, зацягваючыся дымам.

– Перадумала? А хіба я што абяцала?

– Я так зразумеў учора, што ўсё вырашана.

– Ой, не ведаю... Года не мінула пасля Віінай смерці... Падумай сам.

– Думаў. Цяпер ад цябе залежыць, як скажаш, так і будзець.

– Куды ты гэтак спяшаешся?

Ён моўчкі пакруціў «Беламорыну» ў руцэ.

– Дзяцёнка шкода.

– Гэта іншая размова, – пагадзілася яна.

– На тым тыдні паеду, досыць ёй па чужых бадзяцца пры жывым бацьку. Дровы папілуем, і паеду.

– І я з табой.

– Добра, – сказаў ён і, абдаўшы усё наўкола адчуваннем спакою і трываласці, пасунуўся да ложка распранацца.

Альбіна таксама распранулася, хацела кульнуцца праз яго да сцяны, на сваё ўлюбёнае месца, але ён не даў – абхапіў дужымі, з каструбаватымі далонямі, рукамі, прыхінуў да сябе.

– Пусці, мальцы пачуюць.

– Не пачуюць. – Лявон схіліўся над ёю, пачаў лашчыць шыю і плечы. – Цяпер баішся, а што запяеш, як і дзеўка з’явіцца?

– Калі яшчэ тое будзець, – сказала яна і падалася да яго. Прыхінулася грудзьмі да мужавых грудзей, уздыхнула: ніколі яшчэ не было ёй так добра.

Цягнік прыйшоў у Рыгу а палове сёмай. Увесь час, што крочылі паўз сутарэнні, а потым праз мост да патрэбнага квартала, Альбіна разглядала натоўп. Так шмат людзей адразу яна ніколі не бачыла. Добра, Лявон побач, суцяшала сябе, усё тут ведае, дык дадуць неяк рады.

Тамарын дом знайшлі хутка, ён знаходзіўся недалёка ад чыгункі. Шэрая змрачнаватая будыніна нагадвала больш халупу, чым гарадское жытло.

І ўнутры будынка было не лепш. Цёмны, без аніводнае лямпачкі, калідор, рад пашэрпаных, з патрэсканымі вушакамі дзвярэй. Калі іх абміналі, пах цвілі так моцна шыбануў Альбіне ў нос, што яна міжволі сціснула яго пальцамі.

На званок не адазваліся, але ў памяшканні хтосьці быў: чутно было, як хадзілі. Лявон колькі разоў таргануў ручку дзвярэй угору-ўніз.

– Хто там? – жаночы голас гучаў спалохана.

– Тамара, гэта я, – сказаў Лявон і драпнуў пальцамі па дзвярах. – Я і Альбіна.

Дзверы павольна адчыніліся.

– Ты, Леванарды? – Гаспадыня, тоўстая пажылая кабета з бігудзямі на галаве, адступіла ў глыб прыхожай. – Уваходзьце! Люся, дзіцятка, хадзі сюды!

Яшчэ адна, меншая, постаць, няўпэўнена ступаючы па рыплівай падлозе, наблізілася да гасцей. Лявон правёў далонню па валасах дзяўчынкі, затым узяў яе і Альбініну рукі, звёў у адно.

– Пазнаёмся, дачушка...

– Пусціце! – выхопліваючы руку з Альбінінай далоні, закрычала малая. – Я да мамы хачу!

І апрометцю кінулася ў цёмны калідор.

Да могілак дабіраліся даволі доўга, амаль гадзіну. Седзячы ўпобачкі з Тамарай на мулкім сядзенні, Альбіна раз-пораз кідала заклапочаны пагляд на падчарку. Тая, уладкаваўшыся на каленях у Лявона, засяроджана малявала ўзоры на заінелым акне трамвая.

Курганок над Віінай магілкай, як і ўсе магілы наўкола, буяў фарбамі штучных кветак. Тамара расклала на століку абрус, дастала з сумкі гарэлку і сёе-тое з ежы.

– Што вы, піць тут будзеце? – Люся схапіла бутэльку, шпурнула ў куст.

Лявон замахнуўся, каб шлёпнуць дачку па руцэ, але Альбіна спыніла яго.

– Нічога, няхай перакіпіць, – сказала і краем вока заўважыла, як малая з удзячнасцю зыркнула на яе з-пад доўгіх павек.

Калі яны прыйшлі на станцыю, да адыходу цягніка заставалася пятнаццаць хвілін. Тамара, якая ўвесь гэты час, што Лявон паказваў жонцы Старую Рыгу, вартавала майно, узяла Люсю пад руку, павяла ў падземку. Альбіна і Лявон моўчкі пасунуліся следам.

Дзяўчынка пакорліва ўвайшла ў вагон, села побач з бацькам. Сядзела ціха, не варушачыся, глядзела, як старэйшыя развітваюцца. І толькі калі састаў крануўся і засталася дзесьці ззаду бліскучая Тамарына хуста, усхапілася з месца, адчайна, уголас, заплакала.

– Нічога, у Дубраўцы ані не горш табе будзець, як тут, – тулячы малую па сябе, сказала Альбіна.– Паглядзіш, ані. А можа яшчэ і лепей.

Толік і Ромка сустрэлі новую сваячку з насцярожанаю цікаўнасцю. Доўга разглядалі канапаты, з няўсмешлівым шырокім ротам твар, ценькую постаць. Гэтае нясклёпістае, палахлівае кураня – іх сястра? Дай ты рады!

Люся, надзіва, да новага жыцця прызвычаілася вельмі хутка. Нават навучылася даіць карову і неўзабаве стала рабіць гэта так спрытна, што не кожная з дубраўскіх равесніц магла з ёю сагнацца. І наогул, вясковы побыт пайшоў ёй на карысць: шчокі праз кароткі час заўважна папаўнелі, паходка зрабілася ўпэўненай і рашучай.

Мачыху, як і тады, у Рызе, яна па-ранейшаму звала цёцяй.

Альбіна выйшла з шахі, пазіраючы на нізкае, усцяж засланае белаватымі аблокамі неба, хутка пакрочыла дахаты. Спяшалася: дзесяць дзён таму скінула свіння, а зараз яшчэ і захварэла, другія суткі не дакранаецца да ежы. Крый Бог здохне, што тады рабіць?

Мужчын дома не было. Хлопцы гойсалі недзе на лыжах, Лявон са Свістуном яшчэ на дасвецці падаліся на паляванне. Люся, слінячы па чарзе каляровыя алоўкі, выводзіла ў сшытку па памяці купалы рыжскіх касцёлаў.

Альбіна ўторкнула штэкер у разетку, праз якую падавалася святло ў хлеў, подбегам выскачыла з сяней на панадворак.

Адчыніла дзверы ў хлеў і адразу зразумела: нешта не тое.

Свіння ляжала калодаю ў грудзе саломы і не падавала прыкмет жыцця. Альбіна прысела над тушаю. Слёзы самі паліліся з вачэй. Выслізнуў з рукі, хруснуў пад ботам шкляны градуснік.

Нехта яшчэ ўвайшоў у хлеў. Асцярожна наблізіўся да загародкі, крануў яе за плячо.

– Не плач, мамачка! Мама, чуеш?

Люся, збянтэжаная, у велізарных Толікавых ботах на босую нагу, стаяла ў праёме дзвярэй і глядзела на яе самотнымі, поўнымі спачування вачыма.

Гэтую хвіліну Альбіна запомніла на ўсё жыццё.

## 5

## 1972

# БРАТЫ

Фігура хіснулася, пахілілася набок, але з месца не зрушылася. Яе пачарнелы ад вільгаці, патрэсканы ад перападаў тэмператур твар дакорліва зірнуў на Альбіну пустым, абведзеным хімічным алоўкам, вокам.

Наогул, можна было загадаць сынам яе прыбраць, але яна не наважылася. Толік толькі ўчора прыехаў пасля сесіі на канікулы, і першае, пра што запытаўся, было, ці ўсе статуі на месцы. Спіць і трызніць давесці іх да ладу. Вучыцца на гісторыка, дык хоча ў Дубраўцы музей стварыць. Ёй што, хай стварае, ды каму ён тут, у такім бязлюддзі, патрэбны, музей? Спаліць тое Вітольдава дзерава і то, пэўна, больш карысці было б. Але яна гэтага ніколі не зробіць. Хоць часам, зазлаваўшыся, і пагражае. Не, з сынамі ў дубкі яна не пойдзе. А пчаляра перасунуць хацела, бо надта ж зручнае для стажка месца займае. Во, з раніцы мікіціцца, барані Бог, наняссе дажджу. Сена ўжо варочанае, гэткае больш за ўсё вады баіцца. Дык пры хляве спарадкаваць самы цымус быў бы.

З-за пуні пачуліся галасы сыноў.

– Складзем, пакуль не змокла, – выходзячы следам за братам да яе на трасотнік, сказаў старэйшы.

Яна згодна матлянула галавой.

– Добра, – сказала коратка і зірнула на Ромку. Той ад першае хвіліны, як прыехаў брат, паводзіў сябе неяк незразумела, быццам быў нечым незадаволены.

Хлопцы выйшлі з панадворка, сцішана перагаворваючыся, накіраваліся вуліцаю на другі канец вёскі, туды, дзе вытыркаліся з зарасляў дзядоўніку і крапівы ўгравелыя рэшткі колішніх пакояў.

Праца рухалася хутка – ведалі яе змалку. Толік, праўда, з непрывычкі спачатку крыху ўпацеў, але гэта працягвалася нядоўга, пакуль не ўвайшоў у звыклы рытм. Стажкі рабілі невялікія: такія і грузіць на падводу хутчэй, і раскідваць, калі трэба падсушыць, латвей.

Гаварылі няшмат, і завадатарам размовы ўвесь час быў Толік. Ромка больш слухаў і толькі калі брат што-небудзь пытаўся, адказваў – стрымана, коратка, адным сказам. Не, вучыцца пасля дзесяцігодкі ён не збіраецца. Дачакаецца восені і пойдзе ў войска. Матка хоча, каб паступаў, але не – гэта не для яго. Не ўсім жа вучонымі быць, трэба некаму і рабіць.

На ўзмежку, ля абрыва, сена было зусім сухое.

– Аж шашчыць. – Ромка ўдзюбнуў вілы ў зямлю, трымаючыся за цаўё, стаў – перадыхнуць.

Чырвонае няўрымслівае сонца, прамарудзіўшы хвіліну-другую за воблакам, імкліва вывернулася з-пад яго. Тысячы гарачых прамянёў, рассякаючы паветра, іскрамі паляцелі ў пожню...

*Бацька, лежачы скрай абрыва, п’яна замармытаў, паспрабаваў адсунуцца ад агню, але дарэмна. Полымя з кожным імгненнем падбіралася бліжэй і бліжэй. Ромка хацеў прыбіць яго граблямі, але раптам паміж ім і бацькам узнік Толік. Гледзячы брату ў твар, ён усміхнуўся, затым паклаў руку на плячо. Што ён хоча? Няўжо не разумее, што замінае ратаваць Гірона? Ромка паспрабаваў адштурхнуць Толіка ўбок, але той так грунтоўна асталяваўся на вузкім лапіку між бацькам і агнём, што зрабіць гэта можна было толькі спіхнуўшы брата з абрыва. Тым часам агонь усё набліжаўся. Бацька перавярнуўся набок, ратуючыся ад яго, падпоўз да самага абрыва. Яшчэ хвіліна – і кульнецца ў бездань. Не! Ромка разагнуўся, штосілы пхнуў брата пад дых. Той*

*паваліўся, трымаючыся рукамі за альховае карэнне, завіс над абрывам...*

Толік сядзеў на кукішках ля стажка і выціраў аб траву чырвоныя, здзёртыя да крыві рукі. Яго бледны, бы ў нябожчыка, твар зводдалеку нагадваў маску.

– Даруй, мне здалося, там бацька. – Ромка падышоў да брата, не ведаючы, мусіць, што яшчэ сказаць, моўчкі застыў побач.

Толік перавёў дыханне, абапіраючыся на граблі, падхапіўся з месца.

– Ладна, – сказаў ціха і ўсміхнуўся. – Я ўсё разумею.

– Што ты разумееш? – І без таго круглыя вочы Ромкі яшчэ больш акругліліся, твар успыхнуў чырванню. – Што?

– Што ён табе трызніцца, – збянтэжаны новаю хваляю братавай зласлівасці, сказаў Толік. Гэтай размовы ён даўно чакаў, але што ўсё адбудзецца вось гэтак – не спадзяваўся. – І часта такое здараецца?

– Заўсёды, калі бачу агонь. – Ромка гаварыў павольна, як бы нехаця: відаць, шчырасць давалася цяжка. Але раптам голас яго акрэп, зрабіўся зноў калючы і злосны. – Гэта цябе зусім, ані на грам, не тычыцца.

– Тычыцца! – Толік назгодна матлянуў галавою. – Ягады ягадамі, а віна за бацьку на нас абодвух.

Братавы словы неяк дзіўна паўплывалі на Ромку: ён абмяк, выраз жорсткай зацятасці, што ўвесь час не сходзіў з ягонага твару, саступіў месца разгубленасці.

– Я з'еду адсюль – падымаючыся з месца, сказаў ён ціха, але ўпэўнена. – Абавязкова, толькі школу скончыць.

Другая хмара, вялізная, няўклюдная, павольна пасоўваючы перад сабою дробныя аблокі, з'явілася на даляглядзе, густым шэрым ценем атуліла наваколле.

# 6
# 1975
# НАТАЛЛЯ

Салдат хуценька перабег вуліцу, ратуючыся ад дажджу пад голлем дрэваў, імкліва расчыніў знаёмыя весніцы. Дзверы на гэты раз не рыпнулі, а нібыта охнулі – натужліва, рэзка, бы чымсьці пакрыўджаныя. Але салдату было не да іх – думка аб недалёкім ад'ездзе не давала спакою. Убегшы ў хату, ён не распранаючыся кінуўся да ложка, на якім ляжала, прыкрыўшыся квяцістаю пухкаю коўдрай, жанчына.

– Дык што, надумалася? Едзеш?

Жанчына моўчкі павярнулася да яго тварам, засланіўшы далонню вочы ад святла, няўцямна спытала:

– Што? Куды ехаць?

– Вось табе маеш – куды? – ажно зайшоўся абурэннем Раман. І было чаго абурацца: тыдзень мінуў, як яго дэмабілізавалі, саслужыўцы даўно недзе па хатах ад'ядаюцца, адзін ён ніяк не зрушыцца з месца.

Жанчына схавала пад коўдру руку, лагодна ўсміхнулася.

– Ну, прычапіўся: едзеш? едзеш? Дрэнна табе тут?

– Я не кажу, што дрэнна. – Раман сеў скрай ложка. – Ды трэба ж некалі рашыцца...

– Хай яно згарыць, тое трэба. – Яна прыўзнялася на локцях, прыкрываючы прасцінаю шыю, наблізілася да яго, паклала галаву на калені. – І не злуйся.

– Ладна. – Ён скінуў кашулю, штаны, слізгануў да яе пад коўдру.

– Вось, так лепш, – сказала яна і абхапіла Рамана за шыю. – Паеду, а як жа.

Яны пазнаёміліся паўтара года таму. Наталля Сяргееўна рабіла буфетчыцай у сталоўцы, куды яны з таварышам зайшлі падсілкавацца падчас звальнення. Яна ветліва ўсміхнулася ім, запрасіла перакусіць. Ужо шарэла, і, папраўдзе, есці хацелася, але грошай на што грунтоўнае не хапала. Яна нейкім чынам пра тое

здагадалася, пайшла на кухню, прынесла дзве талеркі варанай бульбы, палітай зверху мясною жыжай.

Пакуль яны елі, яна распытвала. «Адкуль, вы, хлопчыкі? Ці даўно тут?» Яны адказвалі, а яна ўважліва слухала. Даведаўшыся, адкуль Раман, схамянулася: «А, чула, матцы маёй калісьці ў тых мясцінах даводзілася працаваць. А мяне Наталляй зваць. Можна проста – Наткай Сяргееўнай. І цётачкаю назавяце – таксама не пакрыўджуся. Дарэчы, я тут не заўсёды рабіла. Дыплом бухгалтара маю. – Яна зірнула ў акно, паказала рукою на бліжэйшую ад сталоўкі хату. – Вунь мая сядзіба. Калі што – заходзьце.»

«Спраўная кабетка», – калі выйшлі на вуліцу, сказаў саслужывец. – Во каб крыху маладзейшая.» – «Гэта не пашкодзіла б», – з выглядам знаўцы адказаў Раман. Дагэтуль мець справу з жанчынамі яму не даводзілася, але прызнавацца ў тым сябру, якога яшчэ толкам не ведаў, не хацелася.

Зноў яны спаткаліся дзесьці праз месяц, у чарговае звальненне. Напярэдадні хлопцы да сёмага поту рабілі на сотках ва ўзводнага, добра папацелі і ў выніку зарабілі свае законныя суткі.

Плошча, адзінае больш-менш прыстойнае месца ў гарадку, сустрэла іх знаёмаю шыльдаю над дзвярыма сталоўкі. Цётачкі Сяргееўны за стойкай не аказалася. Пасядзеўшы з паўгадзіны за сталом, маладыя людзі засумавалі, пайшлі на вуліцу – праветрыцца. Алег тут жа ўвязаўся за нейкаю дзеўкай, а Раману нічога не заставалася, як працягваць шпацыраваць у адзіноце.

Ён і не заўважыў, як аказаўся ля цётаччынай хаты. Там у вокнах гарэла святло, а гаспадыня, у фартуху зверху летняй паркалёвай сукенкі, завіхалася ў кухні. Падышоўшы бліжэй, Раман убачыў яшчэ адну – мужчынскую – постаць. Мужчына сядзеў на канапе ў лепшым пакоі і курыў папяросіну. На стале побач стаяла талерка з закуссю і бутэлька гарэлкі. Сяргееўна скончыла гатаванне, з патэльняю ў руках падалася да мужчыны. Ледзь паспела яна паставіць страву на стол, як той абхапіў яе за стан, паваліў на тое самае месца, дзе сам толькі што сядзеў. Святло пагасла. Ромка пастаяў яшчэ некалькі хвілін у надзеі, што яно зноў запаліцца, але дарэмна.

А праз два тыдні ён і сам неўпрыкмет аказаўся на месцы таго незнаёмца. Ляжаў у ложку, з прыкрасцю думаў, як бы хутчэй збегчы. Да таго гідкім і няўтульным здавалася ўсё навокал. Дапамагла яна,

Наталля. Скінула коўдру, хаваючы ад яго белае, з таўставатымі нагамі, цела, пачала вобмацкам апранацца. Хацела ўключыць святло, але ён не даў.

– Не трэба.

– Чаму?

– Святло кепска ўплывае на мяне.

– Выдумляй! – Яна дацягнулася рукою да сцяны, пстрыкнула выключальнікам. Лямпачка ўспыхнула, высвечваючы куткі па-за мэбляю, мерна захісталася пад столлю пачварным ценем.

– Ну, жывы?

– Жывы, – адмахнуўся Раман і зірнуў на ходзікі. Было дзевяць гадзін.

– Якія доўгія вечары. – Цётачка пазяхнула, шчыльней ухуталася ў коўдру. – А ты не спознішся, хлопец? Глядзі, каб у кутузку не трапіў.

Сапраўды, час быў адыходзіць.

Раман саскочыў з ложка, похапкам нацягнуў гімнасцёрку, штаны. Наталля таксама паднялася, падышла да яго, абхапіла ззаду дужымі, як у мужчыны, рукамі.

– Праўда святла баішся?

– Праўда.

– Чаму?

– Так, адну гісторыю напамінае. Асабліва калі знянацку ўспыхвае.

– Што за гісторыя?

– Была... у дзяцінстве. Не хочацца расказваць.

– Не хочацца – не трэба. – Яна прыхінулася тварам да ягонай патыліцы, паказытала губамі валасы. – А сюды часцей прыходзь, я страх хутка выганю.

Сапраўды, святла ён баяцца перастаў. Цётачка нібыта заваражыла яго. Ён добра спаў і еў, і кепскія ўспаміны, што не-не ды й давалі аб сабе знаць, калі знаходзіўся ў часці, тут жа некуды сплывалі, як толькі пераступаў парог яе хаты. Так працягвалася амаль два гады.

І вось – настаў час дэмбелю. Як то прымуць яго дома? Папраўдзе, і самому ніякавата. Наталля на дзесяць гадоў за яго старэйшая – што скажа Альбіна? Да таго ж там, у Дубраўцы, ёй чужое ўсё – ці зможа прывыкнуць? Зрэшты, не бяда, калі што якое, сюды, у Крайну, можна вярнуцца.

– Сюды! Ого, прыдумаў! Мне, значыць, выспятка, а сам да іншай, маладзейшай, пойдзеш.

– А што, калі так? – Раман засмяяўся. Але, убачыўшы зласлівы агеньчык у жончыных вачах, тут жа дадаў: – Нікуды я ад цябе не дзенуся.

Нехта ўвайшоў у сені, шкрабнуў пальцамі па дзвярах.

– Пэўна, мама. – Наталля падхапілася з канапы, падалася да парога.

Слава Васільеўна, бадзёрая, у падперазаным шырокаю дзягаю даўгаватым зялёным паліто, прытрымліваючы рукамі полы, ступіла ў хату, цырымонна прайшла на покуць.

– Усё ж такі ад'язджаеце? – сказала, сцягваючы з галавы на шыю хустку. – Добра – завядзёнка не перарываецца.

– Якая завядзёнка? – не зразумеў Раман.

– А я хіба не казала табе? – цешча здзіўлена глянула на яго. – Ужо колькі пакаленняў жанчыны з нашай сям'і тваю Дубраўку ашчасліўліваюць. Бабуля Натчына, і прабабуля, і прапрабабуля... Цяпер вось і сама туды едзе. Ну, паглядзім жа, што з таго атрымаецца. – Яна дастала з кішэні нейкі сшытак, падала дачцэ. – Тут – патрэбнае, пачытаеш пры нагодзе. І глядзі там, трымайся годна, не паддавайся. Мы не абы-хто. Дык і паводзіць сябе трэба адпаведна.

## 7

## 1976

# УСЕ

Вестка пра тое, што Ромка вярнуўся з войска не адзін, а з жонкаю, абляцела Дубраўку вокамгненна. Да хаты Старынскіх пацягнуліся людзі, і ўсе нібыта па патрэбе. Сама Альбіна ў гэты дзень была ў райцэнтры, вярнулася ўжо надвячоркам. Убачыла ў прыцемку сынаву абранніцу і ледзь не страціла прытомнасць. Такою старою падалася нявестка. Да таго ж ёй увесь час здавалася, нібыта яны знаёмыя.

Няяснае, хісткае падазрэнне перарасло ва ўпэўненасць, калі запалілі ў хаце святло.

– Наташа, вы такую жанчыну – Слава – не ведаеце?

– Гэта мамка мая. Яна тут у вас некалі працавала. А што, падобныя мы?

– Па... падобныя, – адчуваючы як дзеравянее язык, адказала Альбіна і без сіл апусцілася на канапу.

Раманава вяртанне адзначылі сціпла. Зарэзалі старую авечку, Мэська выпісаў на ферме з паўсотні кіло свініны. Альбіна з Люсяю нарабілі катлет, рознай салаты. У аўторак раніцой прыехаў Толік. Ён сёлета скончыў інстытут і працаваў у школе недалёка ад Дубраўкі.

Браты спаткаліся на панадворку. Толік, пасталелы, вельмі падобны з твару да нябожчыка Вітольдага, падаў брату руку, сеў на ганак.

Прыйшла Валька. Абдала хлопцаў воблакам таннае парфумы, уселася побач. За апошнія гады яна вельмі раздалася ўшыркі, таму выглядала старэй свайго ўзросту. Але, надзіва, паўнаты сваёй не саромелася, наадварот, выстаўляла напаказ. Знарок насіла сукенкі з пасамі ўпоперак і наогул усе тое, што падкрэслівала камлюкаватасць паставы. Каб добраю маткаю быць, неабавязкова выглядаць на дзяўчо – гэта былі яе словы. Яе Пецю было ўжо сем гадоў, і хто ягоны бацька, у Дубраўцы па-ранейшаму ніхто дакладна, апроч, канечне, самой Валькі, не ведаў.

І вось... Не, не можа таго быць. Чым пільней узіралася Валька ў здарожаны, падбелены пудраю твар Ромкавай каханкі, тым настойлівей узнімаўся з глыбіні памяці смутны, няпэўны ўспамін. Ці можа тое быць? Яна глянула на Альбіну. Тая сядзела, бы нежывая, насупраць малодшага сына. Што-што, а пакутлівую напружанасць Альбінінага твару Валька чытаць умела.

Пасля трэцяй чаркі браты выйшлі пакурыць. Зрабілі на панадворку па зацяжцы, затым, не згаворваючыся, падаліся да руінаў сядзібы. Месца, дзе калісьці былі пакоі, можна было пазнаць па нізкім плоце, якім яно было адгароджана ад кустоўя.

– Вось, аднаўляць будзем, – спыняючыся ля яго, сказаў Толік. – Спецыялісты цвердзяць, сядзіба надта ўнікальная, узор сядзібна-палацавай архітэктуры 16 стагоддзя. У даваеннай Польшчы ахоўвалася дзяржавай.

– І хто ўсё гэта раскапаў?

– Археолаг Вашкевіч.

– Той, што некалі Мамкова гарадзішча капаў? П’яніца?

– Ён ужо з дзесяць гадоў не п’е. І чалавек дасведчаны.

– Ну-ну. – Ромка і сам не разумеў, чаго злуецца. – І што ён мяркуе тут рабіць, твой Вашкевіч? Нанова пакоі ўзводзіць? Дзеля чаго?

– Дзеля чаго? Каб людзі маглі любавацца, вось дзеля чаго. Дарэчы, лямус тут адзін з самых адметных у наваколлі быў.

– Лямус? – Раманаў твар зусім спахмурнеў. – Яго таксама будуць узнаўляць? Яшчэ чаго не хапала!

Люся дагнала іх, прытрымліваючы рукамі ад ветру падол сукенкі, стала пасярэдзіне.

– Спрачаецеся? Вось табе на – толькі-толькі сустрэліся, і ўжо сварка.

– Не сварка, так, гутарым, – стараючыся перамагчы раздражнёнасць, што засела стрэмкаю ў горле, сказаў Толік. – Пра пакоі гаворым.

– Што гаварыць пра іх – рэстаўраваць трэба.

Раман адышоўся ўбок, гледзячы сабе пад ногі, усміхнуўся.

– Вас паслухаць, дык больш і клопату няма, як гэтыя разваліны, – сказаў зводдалеку і падкалупнуў носам туфля цагляны аскепак. – Быццам без іх не абыдземся.

– Не абыдземся! – горача запярэчыла Люся. – Гэта памяць наша!

– І твая? Няўжо?

– І мая! Я тут жыву.

– І яе, а як жа, – заступіўся за дзяўчыну Толік. – А ты... ты здзіўляеш мяне.

– Ідзіце вы ведаеце куды? – Раман, адчуваючы, што перавага не на ягоным баку, злосна плюнуў, не азіраючыся пакрочыў да хаты.

# ПОЛЬЦЯ
## (з магнітафоннага запісу дацэнта М. М. Дзямешкі)

*Я зразу, як тока яе ўвідзела, дагадалася. Вочы, бровы, губы – усё Стасіна. Асобенна, як загаворыць: нос то ўгору, то ўніз кулыг, бытта якая спрунжыніна ў ім. Кароценькі носік, во і спрунжыніць. І зубы тэж, як у маткі, дрэнь, вялікія і рудыя. Такая значыцца, іхная прырода.*

*Стася некалі дужа перажывала з-за зубоў. Бывала, перад вечарынай прыйдзець да мяне і будзець казаць: «Я, Польця, у той кут адыдуся, а ты на зубы мае зводдалеку глянь, ці дужа відацца, што благія.» Праўда, відалася, але я не казала ей. Скажаш, што рудыя, дык усердзіцца ды дзялку горшую дасць. І у гэтай гэдакія ж нядобрыя, зрудзеўшыя.*

*Альбіне неўпанараў нявестка. Адно – старэйшая за Ромку. Другое – Стасіна дачка. Абкруціла мальца, і што ты зробіш? Хочаш ня хочаш, прымеш. Так што пакасавурыцца Альбіна, паперажываець і адыйдзець. У яе сэрца адходлівае, доўга злавацца ня можаць. Людзі нагаворацца, канечне. Але што людзям? Во Альбіне дык неспадзеўка.*

*Ну, а вы тут як? Назбіралі троху нашых слоў? Усё ездзіце, ездзіце... На маей памяці вы трэція ўжо. Усё то словы, то песні збіраеце, а каб які толк з таго... Усё на зглум ідзець, а вы з песнямі. Ну, ня злуйцеся... Пакоі? Ат, хто іх тут будзець аднаўляць! Вырванай валасіны ня вернеш. Другая, можа, вырасцець, а той самай, што па першасці была, зновака не паявіцца. Ага.*

*Я на пасту бягу. Мой там адзін з каровамі, барані Бог загізуюць, не дасць рады. Да ракі пагонім. Трава ніякая, дык хоць пап'юць... А тады з пасты – сена варочаць. Учора ў амшарыне ўкасіў. Недзе касіць, і няможна, цішком косім. Хто дзе ўрвець, тое і ягонае. Начальства ездзіць, глядзіць. Як зловяць, штрафу дадуць. Дык і вы нікому не кажыце. Ну, паляцела я...*

***Гірон перанёс праз парог сваё хударлявае, размякчанае гарэлкаю цела, не распранаючыся кульнуўся на падасланы кажух. Неўзабаве ён заснуў. Пачуўшы бацькаў працяглы храп, Ромка выкараскаўся з сена, узлез на маціцу. Чыркнуў запалку, пачакаўшы, пакуль яна ўгарыцца, шпурнуў уніз, на кладню. Запалка перакулілася ў паветры, звалілася ў сена побач з Гіронам. Той, пачуўшы пах гарэлага, прыўзняўся, каб адсунуцца ўбок, але не даў сабе рады. Ахопленае полымем цела сутаргава тарганулася, зноў паваліласяна кажух...***

– Я плявузгаю? – п'яненькі Мэськаў голас узвіўся пад столь. – Плявузгаю? Было гэта!

– Што было? – выходзячы са спальні ў кухню, дзе сядзелі Мэська з Лёдзяю, Альбіна, Польця і Наталля, спытаў Раман, звяртаючыся да жонкі. Тая перасмыкнула вуснамі, адвяла позірк убок.

– Тое, што з Вітольдым ейная матка... – не здаваўся брыгадзір. – Гэта ўсе знаюць. А то корчыць з сябе...

– Что он плетёть, этот старый дурак! – падрабляючыся пад тутэйшую гаворку, піскнула Наталля і вопрамеццю кінулася ў сені.

Раман падышоў да Мэські, не цэлячыся ўдарыў наводмаш па пераноссі.

– Пакажу табе, шэрла дурны, – сказаў і накіраваўся ў сені супакойваць жонку.

Альбіна сцебанула каня пугаю, падцягнула лейцы. Конь фыркнуў, тужачыся, сяк-так ускараскаўся на гару. Ля першай, Пілецкіх, хаты, тоўпіліся людзі. Яна злезла з калёс, не зважаючы на дождж, падышла да іх.

– Што тут такое?

Натоўп моўчкі расступіўся, прапусціў яе ў сені.

У лепшым пакоі ляжаў на канапе акрываўлены Мэська і ціха стагнаў. Ля яго мітусіліся Лёдзя з дочкамі. На зэдліку збоч канапы стаяла мядніца з вадой, Света і Аля, дочкі, па чарзе акуналі ў яе анучку, абмывалі бацькавы твар і рукі. Старая Лёдзіна матка малілася ў куце.

Раптам Мэська стаў задыхацца. Жанчыны, жагнаючыся, паўкругам абступілі канапу.

– Свечку! Дайце свечку! – роспачліва загаласіла Лёдзя.

Адна з дачок кінулася да шафы, дастала жоўтую парафінавую свечку, падала матцы. І толькі Лёдзя паспела яе запаліць, як Мэська выпрастаў руку, перахапіў яе аслабелымі пальцамі. Цела ягонае тарганулася колькі разоў, грудзі ўздрыгнулі, па твары прабег шараваты цень.

– Моўце пацеры, – трымаючы мужа за руку, сказала Лёдзя і першая ўкленчыла.

Альбіна выйшла назад на панадворак. Людзі па-ранейшаму тоўпіліся ля весніц.

– Што тут здарылася? – не звяртаючыся ні да кога канкрэтна, спытала яна.

– З абрыву зваліўся, цётка, – адказаў нехта.

– Радоўку адбываў і во... Хоць бы ўжо палепшаў.

– Не палепшаець, – Альбіна выйшла з натоўпу, пасунулася да падводы. – Памёр Мэська.

Пра абставіны брыгадзіравай смерці гаварылі доўга. Адны сцвярджалі, што быў нападпітку і сам зваліўся з абрыву, другія – што, няйначай, нехта дапамог гэта зрабіць. Урачы, якія рабілі ўскрыццё, сказалі, што памёр ад асфіксіі ў выніку страсення лёгкіх.

Валька адна не паверыла ў няшчасны выпадак. Нібы знарок дражнячыся перад кім, хадзіла па Дубраўцы, заводзіла хітрую

www.kamunikat.org

размову аб тым, колькі зла ад гэтых прыезджых васталыг. І хоць далей намёкаў справа не ішла, усе разумелі, пра што яна гаворыць. Адгалоскі тых размоў даносіліся і да Наталлі. Але яна ўпарта рабіла выгляд, быццам нічога не разумее. Дурніцы абыходзіць, што ў яе забінтаваная рука? Дык мала што – можа, стыгматы з'явіліся.

Тым часам наблізілася пара касавіцы. Клопатаў ва ўсіх паболела, і пра недарэчную Мэськаву смерць хутка перасталі ўспамінаць.

***Страла маланкі прарэзала паветра, асляпляльна-яркаю стужкай забілася між сцен. Шпалера ўспыхнула, пырскаючы агнём, папаўзла ўніз, на падлогу – туды, дзе ляжаў раскінуўшы рукі Гірон. Ромка схапіў шпалерыну за адзін канец, паспрабаваў яе загасіць. Але, наадварот, стала яшчэ горш: сухая папера, раструшчыўшыся на дробныя аскепкі, паляцела на бацькаву галаву. Гірон закрычаў, вогненным катком пакаціўся па падлозе...***

Наталля злезла з ложка, блытаючыся ў прасціне, падышла да мужа. Той ляжаў дагары на падлозе і неўразуменна глядзеў на яе паўрасплюшчанымі вачыма. Твар ягоны блішчэў ад поту, вусны бязгучна варушыліся. Нарэшце ён апрытомнеў.

– Што... што гэта было?

– Не ведаю... Я ўключыла тэлевізар, ты скаціўся з ложка, закрычаў...

– Няўжо тое, ранейшае, вяртаецца?

– Крый Бог, каб вярнулася. Можа, з'ясі чаго? Ежа супакойвае.

Раман моўчкі падняўся, шлэпаючы босымі нагамі па прахалоднай падлозе, пайшоў у кухню. Наліў ў міску бялёнага супу, пачаў есці. Ёў і бачыў праз дзверы, як Наталля, седзячы перад люстэркам, заплятае касу з рэдкіх сваіх, з пашчапанымі канцамі валасоў.

– Во што я падумала. – Жончын голас прагучаў неяк па-старэчы сіпла. – Збіраюцца брыгадзіра выбіраць, дык, можа, табе паспрабаваць? І заробак лепшы, як у полі, і пасада... Не з віламі ў гнаі корпацца. Ну, як?

– Чорт яго ведае... Ці здолею я? Да таго ж не парцейны...

Яна рашуча хітанула галавой.

– Здолееш. Людзей ты знаеш. А калі з паперамі якія непярэлійкі – я памагу. У парцыю ўпішамся. Ідзі. Работа клопатная, затое сны дурныя адцягнець.

– Чорт яго ведаець... Можа, праўда, варта паспрабаваць.

Наталля каторы раз растрыбушыла касу, адкінула валасы на плечы.

– Яшчэ як варта, – сказала, падмалёўваючы алоўкам бровы. – Дарэчы, калі ты мне тое дрэўца, што абяцаў, пакажаш?

– Калі хочаш. Можна і зараз.

Яны выйшлі на панадворак, павольна рушылі прысадамі ў бок пакояў. Белая Наталліна кашуля ў месяцовым святле нагадвала строй маладухі.

Ля курціны з шыпшыннікам спыніліся.

– Здаецца, тут.

Раман расхінуў хмыз і, сапраўды, убачылі сярод яго невысокае дрэўца з вялікімі, як у шлібабона, кветкамі.

– Удог! – ледзь зірнуўшы на пакручастыя няроўныя галінкі, сказала Наталля.

– Дык ты знаеш яго? Адкуль?

– Так, з запісаў адной прашчуркі. Яна тут за настаўніцу калісьці была, сама і прывезла яго. Дрэўца гэтае незвычайнае. Ягад як паясі, дык абы-што будзеш рабіць. Пітво таксама можна гатаваць. Матка мне і рэцэпт паказвала, але я забылася. Ды навошта нам усё гэта. Хадзі лепш да мяне!

Яна пацягнула Рамана да сябе, прынікла вуснамі да ягоных вуснаў. Жаданне хваляю пракацілася ўнутры яго. Ён абхапіў Наталлю за стан, моцна прытуліў да сябе.

Яны прашпаравалі сярод хмызу да самага світання.

Альбіна апошні раз крутнула жорны, уздыхнула. З аднаго боку, тое, што сын з нявесткаю пераязджаюць у сваю хату, было няблага, з другога... Тут, пры ёй, усё, што ні рабілася, было навідавоку, а што будзе, як застануцца сам-насам? Ромка гэткі бязвольны, пусці паваЛюся, сама вяроўкі віць. І хоць яго, а не Наталлю абралі на сходзе брыгадзірам, ужо і зараз бачна, хто будзе камандаваць. Такая свайго не ўпусціць.

Гул трактара перабіў яе думкі. Альбіна выйшла з клеці і носам у нос сутыкнулася з нявесткаю. Наталля, чырванатварая, у новай ватоўцы, вывернулася з-за вугла, загарадзіла сабою праём.

– Як вы? – спытала Альбіна.

– Добра. – Наталля адказвала няспешна, быццам нехаця. – Брыгадзірым. Ён загадвает, я пішу. «Трелевка навоза до трёх километров»... – Яна хахатнула. – Вось, «Беларуса» з прычэпам узялі на переезд.

Старэнькі трактарок уз'ехаў на панадворак. Раман выскачыў з кабіны, унікаючы глядзець на маці, хуценька падаўся ў хату – па майно.

Як Альбіна і думала, усе брыгадзірскія справы вельмі хутка перайшлі да Наталлі. Нішто не рабілася без яе згоды, фактычна яна кіравала брыгадаю. Ініцыятыва памяняць назву вёскі на іншую, больш гучную, таксама належала ёй.

Навіна аб гэткім яе намеры абляцела Дубраўку імгненна. Большасці жыхароў яна прыйшлася недаспадобы. Мяняць назву? Навошта?

– Не гучыць, вось дзеля чаго! – раздражнёна адказала брыгадзірыха. – Дубраўка! Можна падумаць, тут суцэльныя зараснікі.

Памятаючы пра нелюбоў да хмызу яе маткі, людзі пацікавіліся, якою ж мае быць новая назва.

– Ці мала як можна назваць, – адказала яна. – Падкрайна, напрыклад.

Напрыканцы сакавіка сабраліся, каб абмеркаваць пытанне больш дэталёва. Амаль усе дубраўцы прагаласавалі супраць змены назвы. Праўда, знайшліся і такія, што падтрымалі Наталлю. Адзін з іх, Чэсік Каралевіч, былі вайсковец, а зараз трэнер калгаснай футбольнай каманды, прапанаваў нават тэрмінова падаць заяву ў выканкам. Але тут, пераадолеўшы сарамлівасць, нечакана ўзяла слова Альбіна і так пераканаўча выступіла, што ў выніку і тыя, хто яшчэ вагаўся, прагаласавалі супраць ягонай прапановы.

Наталля, якая не чакала ад свякровы гэткага запалу, нібы скамянела.

Раман увесь час, што маці гаварыла, сядзеў побач з жонкаю і глядзеў у падлогу. А калі ўзняў, нарэшце, вочы, каб зірнуць на Наталлю, убачыў на яе твары такую нянавісць, што сцяўся ад страху. Увечары гэтага дня ён пазычыў у Польці бутэльку гарэлкі і ўпершыню ў жыцці напіўся да парасячага віску.

На апошнім тыдні Вялікага посту прыехаў Толік. У школе пачаліся веснавыя канікулы, і ён вырашыў наведаць сваіх.

Браты спаткаліся ў маці. Альбіна клікала і Наталлю, але тая, спаслаўшыся на хатнія справы, адмовілася прыйсці. Апошнім часам у іх з Раманам з-за ягоных выпівак часцяком здараліся сутычкі, да таго ж яна ўсё ніяк не магла даравацъ свякрусе яе выступу на сходзе.

Як ні намагаўся Толік разгаварыць брата, размова не клеілася. Раман увесь час маўчаў, а як толькі апаражнілі бутэльку, спаслаўся на нейкую неадкладную справу і пайшоў.

– Што ўжо за справы? – калі ён выйшаў з хаты, спытаў Толік у маці. – З нажом у халяве.

– Кілуноў лягчыць унадзіўся, – уздыхаючы, адказала Альбіна. – Куды паклічуць, туды і ідзець – за гарэлку. І лягчыць, і колець, бываець. Днямі Свістуновым калоў. Нож усадзіў падсвінку ў грудзіну, ды сп'яну не пацэліў. Той ускочыў ды давай насіцца... Смех і грэх.

– А Наталля што?

– Наталля? Мы не сяброўкі з ёю. А ты яшчэ пагавары з братам, Толічак.

– Пагавару, – паабяцаў ён і накіраваўся ў сені.

***Гірон выхапіў з сынавых рук бутэльку, схаваў за пазуху. «Аддай!» – Ромка кінуўся да старога, пераадольваючы лекаценне ва ўсім целе, паспрабаваў адабраць пітво назад. Іскрынка ад ягонай папяросіны паволі апусцілася на абшлаг бацькавага кулька, акурат туды, дзе капнула гарэлка. Абшлаг закуродыміў, кукожачыся спрасаванаю воўнай, абдаў воблакам смуроду. Колькі часу яны моўчкі стаялі на месцы, быццам ацэньваючы ўласны шанц на перамогу, з нянавісцю глядзелі спадылба адно на аднаго.***

***Бацька першы адвёў пагляд, прытрымліваючы рукою пад абшлагам бутэльку, увайшоў у пуню. Наблізіўся да кладні, моўчкі цікуючы за Ромкам, апусціўся на ўлежанае сена. Але толькі ён паспеў улегчыся, як агонь перакінуўся з кулька на кладню і ўжо праз якую хвіліну запоўніў сабою усю будыніну. Гіронаў адчайны, жудасны крык скалануў падстрэшша...***

– Чаго ты? – Наталля, спусціўшы долу белыя, з таўставатымі лыткамі, ногі, непрыязна глядзела на Рамана. – Да паўсмерці напалохаў. Равеш, бы недарэзаны.

Ён паспрабаваў прыўзняцца, але не даў сабе рады: галава гэтак балела з перапою, што не было сіл варухнуць пальцам.

– Калі гэта скончыцца? Лячыся ідзі.

– Якое лячыся! – ледзь варочаючы языком, прамовіў Раман. – Не з гарэлкі гэта... бацька сасніўся.

– Больш пі, дык не такое сасніцца. – Наталля рашуча адкінула коўдру, прасунула руку яму пад трусы. – Во, слабее і слабее з кожным днём. Таксама бацька вінаваты?

– У кожнага мужыка гэтак з бадуна.

– Мне ад таго не лягчэй. – Яна зрабіла рукою шмар сюды-туды. – Лячыся.

– Не разумееш... іншае зусім.

Яна саскочыла на падлогу, шмарганула ўбок фіранку.

– Ад іншага сама знайду сродак. Вось толькі ў Крайну з'ездзіць, па сшытак.

– Па які сшытак?

– Па такі – з прапрапрабабуліным рэцэптам.

– Ат, глупства ўсё. – Раман сцягнуў коўдру, перавярнуўся на бок. – Кажаш, слабее ць? А гэта што?

Але яна ўжо не слухала. Што карысці гаварыць? Заўтра яна сядзе ў цягнік і праз двое сутак будзе ў маці.

Састаў прыйшоў у Крайну а восьмай гадзіне.

А праз паўгадзіны сядзелі з маткаю ў кухні, снедалі.

– Записи? – Слава Васільеўна, раздабрэлая, але ўсё яшчэ рухавая, наліла дачцэ і сабе, залпам выпіла. – Нету их. Ходила тут одна, будто бы из архива, собирала разный сор, я и отдала.

– Значит, в архиве придётся искать.

– Архив-от московский, дочка.

– Ничего, найдем. – Наталля выпіла, энергічна абмакнула ў падліву сухаватую, падобную да сухара, катлеціну.

Сшытак знайшоўся, але не ў архіве, а ў музеі. Дырэктарка музея ўласнаручна выняла яго з-пад шкла, адкрыла патрэбную старонку.

– Вы растениевод? – спытала, пабліскваючы шыкоўнымі замежнымі акулярамі. – Да?

– Да, – адказала Наталля і непрыкметна сунула ў кішэню тры аркушыкі, што гэтак жа непрыкметна хвіліну таму сама ж і вырвала са сшытка, калі дырэктарка загаварыла пра нешта з супрацоўніцай.

У Дубраўку яна вярнулася на Уздзвіжанне. Адразу дастала з чамадана прышмальцаваныя аркушы, узялася чытаць. Чытала амаль да раніцы: незнаёмая прашчурка пра нашчадкаў дбала не надта і пісала зусім неразборліва.

У чацвертай гадзіне Раман прачнуўся ад нейчага дотыку. Над ім стаяла Наталля і не вельмі далікатна тузала за падбароддзе.

– Сікстынская капліца – дзе?

– Здаецца, у Ватыкане, – адказаў ён, пазяхаючы. – Навошта яна табе?

– Пытаюся, значыць трэба.

– У ксяндза папытайся, ён дакладна знае.

– Папытаюся, анягож. – Яна зняла з сябе кашулю, легла побач. – Ого, сёння дык зусім іншая справа. Трэба мне часцей ад'язджаць з хаты.

Ксёндз не толькі расказаў усё пра капліцу, але і паабяцаў паказаць штосьці падобнае да яе. У адным з прыдзвінскіх гарадкоў на латышскім баку ёсць копія Сікстынскай. За пробашча ў касцёле, дзе яна знаходзіцца, ягоны аднакашнік па семінарыі Мураўскі, дык калі што якое, можна з ім спаткацца.

Вярнуўшыся ад ксяндза, Наталля колькі часу сядзела ў задуменні. Канечне, паехаць у Латвію было б нябла га. Вось толькі з пашпартам непярэліўкі: згубіла, вяртаючыся ад маці з Крайны. Здала дакументы на афармленне новага, а яны ўсё валыняць нешта. Можа, і не спатрэбіцца ў той Латвіі, ды ўсяк бывае...

Апоўдні яна села на рэйсавы аўтобус і паехала ў райцэнтр.

Начальнік пашпартнага стала Кірыла Ігнатавіч Козел, былы кэдэбовец, доўга моўчкі глядзеў на яе з-пад ссунутых броваў.

– Прыспешым ваш дакумент, – сказаў нарэшце, святлеючы з твару. – Ваша матка ў свой час шмат нам добрага зрабіла.

Цяпер, калі справа з атрыманнем пашпарта, здаецца, пасунулася, заставаўся яшчэ адзін клопат – грошы. Каб абярнуцца на аўтобусе туды і назад, патрабавалася даволі значная сума.

Частку наскрэблі, прадаўшы цішком па дзесятцы за кожны чатыры бункеры калгаснае пшаніцы. Рэштаю выручыла Альбіна.

Запасіўшыся сякім-такім правіянтам і лістом да Мураўскага, Наталля дзесятага кастрычніка выехала з дому.

Ксёндз Мураўскі быў хворы і даручыў апеку над госцяю маладой манашцы па імені Аўгустына. Якраз у гэтыя дні каталікі адзначалі нейкае сваё свята, і манашка павяла Наталлю ў плябанію глядзець па тэлевізары, як папа Рымскі прамаўляе ў Ватыкане з балкона. Ні сам пантыфік, ні выцвілы дыван з ягоным гербам яе не ўразілі.

Не ўразіла і капліца. Наадварот, тое, дзеля чаго давялося пераадолець гэтулькі вёрст, здзівіла шэрасцю і змрочнасцю. Але затое зараз, пасля падрабязных Аўгустыніных тлумачэнняў, што ды як, Наталля дакладна ведала: зрабіць усё, «як у Сікстынскай капліцы», як таго вымагала прапрапрабабуліна цыдулка, ёй упаўне па сілах.

Яна гэтак была занятая ўсе дні ў незнаёмым горадзе сваімі думкамі, што аднаго разу, шпацыруючы следам за манашкай пасля дажджу па вузкай брукаванцы, паслізнулася на мокрым камені і ледзь не паламала нагу. На шчасце, абышлося вывіхам.

Праводзіць яе ў зваротны шлях прыйшоў і ксёндз Мураўскі. Гэта быў сухенькі дзядок з маладжавым не па ўзросце тварам і дужымі, бы ў юнака, рукамі.

– Спадзяюся, вам у нас спадабалася, – сказаў ён, прэзентуючы зямлячцы на памяць кніжку з жыцця святой Клары.

– Спадабалася, а як жа, – адказала яна і адчула, як рука ў кішэні сама сабою склалася ў дулю.

Дубраўка сустрэла яе звыклымі клопатамі. Але апроч заўсёдных з'явіўся і новы: напярэдадні Толік з Люсяй аб'явілі, што збіраюцца запісацца. Наталлю гэткая навіна мала кранула. Іншае не ішло з галавы. Прагледзеўшы яшчэ раз прапрапрабабуліны запісы, яна зачынілася ў істопцы і, каб усё дакладна зрабіць, як ў той капліцы, загадала Раману замураваць уваход у яе цэглаю.

На два дні істопка ператрварылася ў сакрэтны засек. Два дні Наталля не ела і не піла, награвала на пліце, выварвала, астуджвала, зноў выварвала нейкае зелле. Дубраўцы, бачачы, як валіць з коміна брыгадзіравай хаты чорны дым, толькі разводзілі рукамі.

Нарэшце на трэці дзень дым пачаў святлець і неўзабаве зрабіўся зусім белы. Раман разабраў цэглу, і Наталля, з цёмнымі кругамі пад вачыма і са змеевіком у руках, выйшла з істопкі. «Гарэлку гнала!» – здагадаліся суседзі і з палёгкаю ўздыхнулі. Збіты з панталыку нечаканым з'яўленнем гаспадыні, кукарэкнуў і тут жа збянтэжана заціх зеленахвосты певень.

8

1976

# ВАР'ЯЦТВА

Вяселле прызначылі на Кастрычніцкія. Альбіна з Лявонам прывезлі з горада дзве скрыні гарэлкі і дзесяць бутэлек кафейнага лікёру. Для пэўнасці заставілі яшчэ дзве флягі брагі.

Ужо былі зладжаныя катлы і падрыхтавана сцюдзёная вада, як раптам Альбіне стала дрэнна: перахапіла дыханне, а ногі парабіліся нібы ватныя. Выклікалі «хуткую». Маладая ўсмешлівая медсястра агледзела хворую, зрабіла ўкол.

– Паляжыце пару дзён, і ўсё пройдзе, – сказала, складваючы прычындалы. – Пераматаміліся крыху, мабыць.

– Можа і так. Заўчора шаснаццаць качаноў за дзень сшаткавала.

Падмяніць Альбіну ля апарата ўзялася, прытым, надзіва, па сваёй ахвоце, Наталля. Рэшту дня і ўсю ноч, што свякрова адлежвалася, выконваючы загад лекаркі, яна шчыравала ў істопцы. Што і як яна там рабіла, зноў ніхто не бачыў.

Раман спрабаваў дапасці ў істопку, але яна не дазволіла. І толькі калі развіднела і замычэў на дварэ, брыдучы гразкаю вуліцай да збітага, вытаптанага за лета і восень выгана статак, адчыніла дзверы, гукнула яго да сябе.

– На, паспрабуй, – сказала, плюхнуўшы ў кубак сіваватай вадкасці.

Раман борзда, быццам баючыся, што яна перадумае, выпіў.

– Хто яе знаець, – сказаў, прагавіта пазіраючы на бутэльку. – Крыху нібыта пах... нейкі нязвыклы.

– То ад недапіву, – сказала яна і, пакінуўшы бутэльку на стале, пайшла з хаты. – Пі, я шчодрая сягоння.

Пераход да сынавай хаты даўся Альбіне цяжка. Прайшла колькі соцень метраў і так стамілася, што заняло дыханне.

Нехта сядзеў на панадворку, але хто, здалёку было не пазнаць. Раман, падумала яна і, пераадольваючы млявасць, прыбавіла кроку.

Сапраўды, ля хаты сядзеў Раман. Убачыўшы матку, ён штосьці мармытнуў сабе пад нос, паспрабаваў падняцца з месца.

Яна падышла бліжэй. Сын, безуладны, з расшпіленаю кятуркай, хістаючыся, стаяў ля сцяны і глядзеў на яе запалымі, цьмянымі, бы ў непрытомнага, вачамі.

– Куды гэта з нажом? – жахнулася яна.

Раман няўцямна хітануў галавой, не ўтрымаўшы раўнавагі, пахіліўся набок.

З хаты выйшла Наталля.

– У нас усё гатова, Вікенцеўна, – сказала, звяртаючыся да Альбіны. – Сёння скончыла гнаць. – Зіркнула на мужа, непрыязна скрывіўшы вусны, дадала: – Ужо намурзаўся, халерая цябе!

Яны ўзялі Рамана пад рукі, адна моўчкі, другая разлягаючыся праклёнамі, павялі ў хату.

***Ён падняўся з падлогі, стараючыся трымацца як найпрамей, зноў грукнуў кулаком у дзверы. На гэты раз нібыта недарэмна. У памяшканні пачуліся павольныя, сцішаныя крокі. Затым дзверы рэзка адчыніліся, і на парозе паказаўся Гірон. Ён быў у кульку і падкасаных картовых штанах. «Пахмяліцца хочаш?» – спытаў, падаючы сыну кубак з нейкім пітвом. Раман схапіў кубак, але апаражніць не паспеў: вадкасць успыхнула, поўнячы пакой хісткімі ценямі, перакінулася на бацьку...***

– Зноў? – Наталля стаяла над ім і не міргаючы глядзела на ягоны збялелы, спакутаваны твар. За тры гады сумеснага жыцця Раман упершыню бачыў яе такую – суровую, бязлітасную, як тая смага, што мучыла яго толькі што ў сне і працягвае мучыць зараз.

З кухні даносіліся сцішаныя галасы: нанятыя за гаспадынь Польця з Сінкевічавай Алінай завіхаліся ля пліты.

– Дай пахмяліцца.

Наталля дастала з шафэчкі бутэльку, наліла паўшклянкі, падала мужу. Той схапіў шклянку абедзвюма рукамі, прагна выпіў. Затым дастаў з-за люстэрка на сцяне лязо, правёў па ім далонню.

– Гэткім не тое што кілуна – мыш не вылегчыш. – Наталля выхапіла з Раманавых рук лязо, самога яго піхнула на ложак. – Праспіся лепш.

Увайшла Польця, трымаючы ў руцэ драўляную лыжку для варэння, заклапочана сказала:

– Цэглы трэба – націснуць рулеты. Дзе ўзяць?

– У павеці шмат было, – коратка адказала Наталля.

– У павеці дрэнная, з рэшткамі цэменту, няроўная.

Пачуўшы гаману, з лепшага пакоя выйшла Альбіна.

– Дошку пакладзіце, а наверх камянёў, – сказала аслабелым голасам. – Толькі як след націсніце.

Седзячы за сталом побач са старэйшым сынам, Альбіна задаволена ўсміхалася: вяселле атрымалася добрае, усяго хапала, усё было як след. І Наталля была ў гуморы, нават п'яны муж не раздражняў яе.

Ля сталоў паслугоўвалі гасцям дочкі кухарак Марыся і Галіна. Зрэдку і Аліна з Польцяй, абедзве пры андаляцыях, з'яўляліся ў зале, каб сабраць пусты посуд. Гарэлкаю распараджаўся Лявон. Адкаркоўваў бутэльку, заклапочана пазіраючы на жонку, ставіў на стол. Альбіна, пераадольваючы боль, усміхалася яму, рабіла выгляд, нібыта есць.

Маладыя цырымонна сядзелі на покуці, глядзелі адно на аднаго.

Застолле працягвалася да раніцы.

Чаго заўгодна чакала Альбіна, але толькі не гэтага. Перакуліла на другую палову дня, а людзі спалі як забітыя. Усе, апроч яе самой, Наталлі і маладых, уладкаваўшыся хто дзе, храплі так, быццам толькі што палеглі.

Па суседстве, у Мэськавым хляве, мычэла карова і бляялі авечкі. Тое самае чутно было і з другога панадворка, ад Польці. Альбіна абулася, памалу рушыла да хаты Свістуноў.

І самі Свістуны, і ўсе, хто трапіў да іх унаначкі, спалі. Адзін Янка, звесіўшы ўніз вялізныя, з пакручанымі пальцамі, ногі, сядзеў на ложку і трымаўся аберуч за галаву. Убачыўшы Альбіну, ён нешта мармытнуў сабе пад нос, споўз з ложка, хістаючыся ўбакі, паплёўся да дзвярэй. Альбіна памкнулася спыніць яго, але ён нават не варухнуў брывом. Няўцямна глянуў на яе спадылба, выйшаў у сені.

Яна паспрабавала разбудзіць Польцю, але тая толькі на хвіліну прыўзняла галаву і зноў паваліліся, як непрытомная, на падушку.

З вуліцы данесліся нейкія гукі. Альбіна кінулася туды.

Янка, расхрыстаны, з палаючымі вачыма, стаяў на трасотніку і крышыў бартаю прывезеную колькі год таму ад пакояў каляровую кафлю. Ён рабіў гэта з такою зацятасцю, што Альбіна спалохалася. Асцярожна, каб не трапіць Янку на вочы, яна пракралася збоч панадворка да зарасніку бэзу і схавалася за кустом.

Скончыўшы трушчыць кафлю, Янка заклаў барту за пояс штаноў, накіраваўся да пакояў.

Альбіна кінулася назад да сваёй хаты. Надзіва, там шмат хто з гасцей ужо паўставаў. Некалькі чалавек, пабраўшы хто тапор, хто грацоўку, хто лапату, высыпалі на вуліцу, папраставалі следам за Янкам да колішняй сядзібы.

Людзі дайшлі да сядзібы, не зважаючы адно на аднаго, пачалі навыперадкі руйнаваць узведзены нядаўна рэстаўратарамі падмурак пакояў. Нішчылі падрад усё, што траплялa пад рукі. Крыху пазней да іх далучыліся і тыя, што спалі па суседзях. Справа пайшла спарней, так спорна, што неўзабаве месца ператварылася на гладкі, бы падлога, пляц. Аднак разгарачаным невытлумачальнаю злосцю людзям і гэтага падалося мала. Убачыўшы, што ад падмурка нічога не засталося, яны рынуліся назад, у вёску. Па-звярынаму равучы, дабеглі да першай хаты, пакрышылі борці і калодзежны будан, прыняліся за сцены. Папeрадзе ўсіх, размахваючы тапаром, снаваў гаспадар падвор'я і падаваў каманды. Разбурыўшы хату дашчэнту, перабеглі на другой, затым да трэцяй. І толькі ля чацвертай натыкнуліся на супраціўленне. Казік Сяховіч, калгасны бібліятэкар, паспеў выскачыць на ганак і некалькі разоў пальнуць у паветра з ружжа. Натоўп сціх, зноў рушыў да пакояў. Але там крышыць ужо не было чаго. Тады зноў павярнулі назад, пабрылі да вёскі. Дапяўшы да ўдога, што сіратліва ўзвышаўся па-над зараснікам бэзу, пачалі асцервянела ірваць ягады. Плады валіліся долу, крывавымі плямамі трушчыліся пад нагамі. Абарваўшы ўсё знізу, узяліся згінаць вецце, каб дастаць і астатнія. Гэта, аднак, аказалася не пад сілу: моцныя галіны згінацца не хацелі. Двое маладзёнаў спрабавалі залезці на іх, але таксама безвынікова. Роўны, без адзінае шурпаціны, камель быў слізкі, ногі і рукі соўгаліся па ім, нібы па лёдзе. Не даўшы рады ўскараскацца на яго, вырашылі перапілаваць. Прынеслі пілу. Але толькі маладзёны пад гіканне астатніх паспелі паднесці яе да камля, як ад хаты Сяховічаў пачуўся гармідар. Наталля, раз'ятраная, страшная, са стрэльбаю ў руках бегла сюды, да дрэва, і без супынку штосьці крычала. Не дабегшы з паўсотні крокаў да людзей, яна спынілася, два разы запар выпаліла ў паветра.

– Не рушце яго, адыдзіцеся! – скамандавала і рашуча навяла ствол на натоўп.

Людзі змоўклі, бязгучна варушачы спэцканымі ў чырвонае вуснамі, адступілі назад.

– Хто гэта даўмеўся пілаваць? – зноў крыкнула яна і, не апускаючы ружжа, падышла бліжэй. – Ну?

У адказ не пачулася ні гуку.

– Каб ніводная лісціна не пацярпела больш! Чулі? – Наталля пальнула паверх галоў, не азіраючыся пакрочыла назад, да бібліятэкаравай хаты.

Натоўп, з палёгкаю ўздыхнуўшы, рушыў у процілеглы бок.

Зноў спыніліся ля пакояў. Тут, адчуўшы, што небяспека больш не пагражае, падпалілі шаху і да змяркання танцавалі наўкола пажарышча.

***Гірон стаяў збоч ганка, пагладжваючы адною рукою падстрыжаную пад «польку» галаву, указальным пальцам другой павабіў Рамана да сябе. Раман падняўся з бервяна, падышоў да бацькі. Хацеў парукацца, але той дэманстратыўна схаваў сваю руку за спіну, затым рэзка развярнуўся на месцы, хутка пакрочыў сцяжынаю да пакояў. Раман, стараючыся трапляць босымі нагамі ў ягоныя сляды, нехаця паплёўся за ім. Галава ў яго так моцна балела з перапою, што кожны крок аддаваўся ў ёй неймаверным болем.***

***На прысядзібным дзядзінцы мітусіліся людзі. Воддаль, ахопленая полымем, гарэла шаха.***

***Бацька счакаў, пакуль Раман яго дагоніць, не кажучы ні слова, рашуча ступіў у вогненна-крывавае воблака. Патрывожанае вогнішча незадаволена гайданулася, шугнула ўгору снопам іскраў...***

***Роспачлівае адчуванне, што Гірон адыходзіць назаўжды, падзесяцярыла Раманавы сілы. Ён закрыў твар далонямі, не зважаючы на гарачыню, ступіў за бацькам у агонь.***

9

1977

# ПЕРАМЕНЫ

– Полымя яго заўсёды вабіла. – Наталля змахнула з павека слязіну, самотна зіркнула на следчага. – Урэшце, здарылася тое, што павінна было здарыцца.

– Ён нападпітку быў?

– Канечне. Як і ўсе. Не дапіліся б да белай гарачкі, і ўсяго гэтага жаху не было б.

– Вы, кажуць, дрэва выратавалі…

– Выратавала, а як жа. Яго прашчурка мая пасадзіла, і мне шкада было...

– Зразумела. – Следчы спачувальна зірнуў Наталлі ў вочы. – Дзякуй, што дапамаглі следству. Дарэчы, перад вашым прыходам званіў Козел, прасіў, каб, як толькі вызваліцеся, зазірнулі да яго ў кабінет.

– Добра, я сама збіралася. – Наталля выйшла за дзверы, не зашпільваючы паліто, пашыбавала ў другі канец калідора.

Кірыла Ігнатавіч сустрэў яе прыязна, як добрую занёмую.

– Вельмі, вельмі вам спачуваю, – сказаў, пасадзіўшы ў фатэль насупраць сябе. – І жадаю як найхутчэй ачомацца. З родных застаўся хто-небудзь жывы?

– Мужаў брат з жонкаю. Яна цяжарная, раджаць хутка будзе.

– Ну, гэткія сваякі крэўных наўрад заменяць, – адгадваючы Наталліны думкі, працягваў Козел.

– Я ведаю. – Наталля на хвіліну сумелася. – Але... Мне адзін чалавек прапаноўвае выходзіць за яго.

– Вось што! І хто ён?

– Вы, пэўна, ведаеце яго. Каралевіч ягонае прозвішча, ён настаўнік фізкультуры.

– О, ведаю, канечне, наш чалавек.

Хвіліну памаўчалі.

– Я днямі на радзіму збіраюся, Кірыла Ігнатавіч, – працягвала Наталля. – А перад тым, прабачце ўжо за нахабства, падтрымкаю вашай хацела б заручыцца.

– А ў чым справа?

– Ды вы ў курсе – наконт назвы вёскі. Вельмі ж нябожчыку хацелася, каб на іншую яе памянящь. Дык, можа, паспрыялі б, Кірыла Ігнатавіч?

Рэакцыя Козела была больш чым прыхільнай.

– Канечне, паспрыяю, – сказаў ён і пазначыў штосьці на календары. – Пішыце ў выканкам заяву, а я прасачу, каб доўга не валакіцілі. Дарэчы, наконт абранніка вашага, Каралевіча, у нас ёсць сякія-такія пражэкты. На прадмет пераводу ў раён. Не хацеў дачасна гаварыць, ды калі ўжо зайшла пра яго размова... Словам, і ў гэтым плане рыхтуйцеся да перамен.

– Вы? – дырэктарка музея ажно адхіснулася ўбок ад нечаканасці. – А мы уже разыскивать вас собрались. Как вы могли на такое пойти? Ну, попросили бы разрешения снять ксерокопию, так нет – украли...

– Так надо было. – Наталля дастала з сумачкі лісткі, падала жанчыне. – Вот, все в целости и сохранности.

– Но почему вы решили их возвратить? – з твару дырэктаркі не сыходзіла здзіўленне.

– Может, еще кому понадобятся, – уміхнулася Наталля. – И точно понадобятся, не сейчас, так через сто лет, – дадала і таропка накіравалася да выхада.

Спяшалася: цягнік на Падкрайну адыходзіў а шостай вечара, а ў яе яшчэ не было білета.

# 10

# 1998

# ПОЛЬЦЯ

## (з магнітафоннага запісу прафесара М. М. Дзямешкі)

*Тое, гляджу, бытта ідзець нехта. Аж вы. Дык і добра, а то маркотна аднэй. А што дзярэўню паказаць, дык вы ня першыя просіце. Былі тожа неяк прыехаўшы, з горада. А я, як на тое, абы-як надзеўшыся, тока-тока з хлява. Схувалася, думала пойдуць. Не, асталіся. Дзве бабы, мужчына і малец-падулётак. Твары белыя ва ўсіх, як мукой абсыпаныя. Зразу відацца – гарадскія. Паказала ім усё. І вам пакажу, анягож.*

*Ну, так, значыцца, гэта мая хата. А гэна Бакевічава. Тамака воддаль – Старынскіх. Усе, кром маей, пустыя. Глянеш кароты раз, і ворах шыбанець. Жартачкі, як труны тыя хаты стаяць, нідзе нікагусенькі. Дажыліся.*

*Гэта во – дзерава. Як называецца, не знаю. Ці не паны яшчэ пасадзілі. Ягады благія: паясі і здурнееш. Я помню такі случай, былі падурнеўшы. Хто што пабралі ды давай усё крышыць. Маладым не наравіцца яно, кажуць, усе беды з тых ягад. Зрэзаць хацелі. Толік Старынскіх з мальцамі спілаваць магаваліся, але мы, старэйшыя, не далі. Сталі кругам і не пусцілі блізка. Толік упырысты. «Цяперака, – кажаць, – не ўдасца, пасля зрэжам. Не мы, дык унукі нашы. А расці яно тут ня будзець». Ат, што яны зробяць! Тут во ўперад адно было, а цяперака вун якія зараснікі. З насёна расцець. І ўсюдых так. Днямі сястры маей Фэлі дачка з-пад Гродны прыязджала. І там ужэ поўна гэтых дзераваў. Як наўмысля хто сеець.*

*Гэна вундзека, дзе пагурак, – пакоі панскія. Іх яшчэ цэлыя помню. Красівыя былі. Ніз цагляны, верх з дубу, страха – гонтавая. Кругом кветкі, дрэвы разныя, бэз, чаромуха, шыпшыннік. Вясной такі пах, аж галава кругам. Алеі ўсюдых, арэшнік. Усё панішчылі, нічога не асталося. Дрэвы, каторыя таўсцейшыя, папілавалі – на падушачкі для рэдаляў. Думалі, добрыя будуць, спілавалі, а яны пагніўшы ўсе.*

*Шкода, дрэвы спрытныя былі, высокія. Во тут, гэтым месцам, тофеліна таўстая стаяла. На ей бацяны пладзіліся. Але яе не пілавалі, сама завалілася, ад старасці. Бацянёнак адзін, зваліўшыся, крыло паламаў, дык лётаць ня мог. А тады патроху к восені акрэйбаў, паляцеў.*

*Пакоі самі парылі. Спярша печы, пасля і астальное. А ўжо страху як збурылі, дык і з канцом. А пасля шась – камісія прыехала. Так і так, сядзіба дужа важная, дык нада аднаўляць. Ну, нада дык і нада. Толік Старынскіх за настаўніка, вучоны, узяўся памагаць. І ўжо зробілі што-няшто, як напіліся, ды зноў куралесіць. Бытта Толікавага брата жонка, Натка, усё падробіла, падпаіла нечым. І мой быў здурнеўшы. Пасля адышоў, але жыў нядоўга, не даў клёку. Многія тады памёрлі. А тыя, што выжылі, выязджаць пачалі. Пасля Натка наконт назвы пачала дахаджваць, каб змяніць. Дахадзіла. Была Дубраўка, стала Падкрайна. А я ўсё роўна Дубраўкай заву. І Натцы пра тое казала. А яна: «Скажы, дзякуй, цётка, што Свісцёлкай не назвалі. Усе вы тут свістуны, сваё прасвісталі». Яно й праўда. Цяперака таго, што ўперад было, і блізка няма. Во хош гарод узяць. Даўней і грэцка табе, і проса, і лён. А сягоння бульба адна ды жыта. Усё звялося, во зямля і быдлеець, як той бабыль.*

*Што яшчэ вам паказаць, ня здумаю. Можа, магільнік? Хадзіце паглядзіце. Тут во Канстанцыя, паня, ляжыць. Некалі ўпобачкі склеп быў, ды збурылі. Шкода, паны дужа важныя былі людзі. Гэта во – Бакевічавы, Галіна з Петраком. Магілку Валька, дачка іхная, даглядаець. Яна па суседству ў дзярэўню зайшла, дык прыходзіць нараччас. Тут далей – мае. Бацькі абодва, мужык і сынок старэйшы, Казік. А тамака вун, за капліцай, – Старынскія, Вітольды, Гірон з Альбінай, Лявон і Ромка. Альбіна ягадамі атруцілася. Гірон і Ромка ў агні згарэлі ў адзін дзень. Лявон з раку нядаўна памёр. Натка, жонка Ромкава, скора па яго смерці ў райцэнтру пераехала з новым мужыком. Начальніцай па культуры, ці як яно там завецца, робіць. Мужыка кінула, трэці раз замуж зайшла, за нейкага Казла. Гэта нядаўна ўжо. Магілы Люся з Толікам даглядаюць. Тэж ужо пенсіянеры, унукаў гадуюць. Па-нашаму ўсе гавораць. І тут, на магілках, відзіце, па-беларуску напісана, Толік настояў. І мне тое самае раіў зробіць, але я пастыдалася. Якая там разніца, па-якому напісана, адзін чорт.*

*Капліцу ў складчыну ставілі. Падгніла ўжо, але на мой век досіць. Па вялікіх святах ксёндз прыязджаець, ладзіць імшу. З маладзейшых хто з суседніх дзеравень падляціць, памолімся. А так адна я тут,*

*адна... Але не наракаю. Пачнеш наракаць і на горшае што наўрэеш. Так і сяджу, чакаю, калі Бог злітуецца, возьмець да сябе. А вы што тутака? З цацкамі, гляджу, нейкімі? Запісываеце? Ну, запісывайце, калі інцярэсна... Хош які наедак са старой...*

www.kamunikat.org

# ГОЛАС

## 1

## 1980

## АЛІК

Косці былі доўгія, з вострымі зубцамі. Альфон звечара падвастрыў іх наждаком, і цяпер яны ажно зіхацелі на сонцы ў яговых спрытных, дужых руках. Стоячы ля вады, ён цярпліва высочваў пачырванелымі ад ветру вачыма чарговую ахвяру і, як толькі яна з'яўлялася ў полі зроку, тут жа апускаў прыладу ўніз. Затым рэзка выхопліваў восці назад, нетаропка счэпліваў здабычу, кідаў у вузкую, прывязаную да шыі торбу. Адзін раз ён прамахнуўся, і паранены шчупак, плёснуўшы на развітанне хвастом, знік у прыбярэжнай ціне. Хутка ён зноў выплыў – брухам угару – ды і завіс, недасяжны, пасярод віра ў рудаватай каламуці.

Алік з Лінаю як зачараваныя назіралі зводдалеку за кожным бацькавым рухам.

– Мя! Мя! – ледзь толькі восці з рыбінай вынырвалі на паверхню, падаваў голас нямок Алік.

Ліна, якая не горш, а можа нават лепш за саму маці разумела братава мычанне, клала ў рот чарговую сушаную – з прывезеных днямі з кірмашу – ягадзіну, асаджвала яго няўхвальным паглядам.

– Сціхні, рыбу распужаеш. Не мянтуз гэта.

Сапраўды, трапляліся адны шчупакі, ужо з дзесятак іх боўтаўся, звіваючыся знявечанымі тулавамі, у бацькавай торбе.

Алік хаваў глыбей у кішэні паліто ззяблыя рукі, моўчкі ўздыхаў. З усіх тутэйшых рыб яму найбольш падабаліся ментузы.

Ні аздобленыя па бакавінах чырвоным плоткі, ні фарсістыя акуні, ні таўсматыя язі не выклікалі ў ім такой цікавасці, як гэтае таемнае цьмяна-ільсністае стварэнне. Першы раз убачыў яго зблізку

www.kamunikat.org

мінулагодняй зімой, калі, коўзаючыся на рацэ, прыпаў тварам да лёду і неспадзеўкі ўгледзеў праз празрыстую тоўшчу на самым дне цёмны сілуэт. Бязмоўная, як і сам ён, істота самотна сноўдала між аблепленых водарасцямі камянёў – ці то шукала ежу, ці то грэлася ў стылай лютаўскай вадзе. Яе памеры ўвесь час мяняліся. Варта было аддаліць твар ад выслізганай люстраной гладзі, як яна тут жа пачынала выдавацъ ліліпутам і, наадварот, пры набліжэнні ператваралася ў страхавітага велікана. Тады Алік да змяркання прабавіўся на рацэ, назіраючы за рыбінай. Аж пакуль не прыйшоў бацька, тузаючы за рукаў, павёў заснежаным поплавам да хаты.

Тое было ўзімку. А зараз ваўсю шугала ў ручаях веснавая вада, і адбірала вочы сінь пралесак, і бацька, прытаіўшыся за кустом,засяроджана тыцкаў раз-пораз восцямі ў рачное прадонне.

Альфон каторы раз падняў восці зубцамі ўгору, чапляючыся вольнаю рукой за чэзлае з зімы кустоўе, падаўся берагам далей, на свежае месца. Ужо можна было выпраўляцца і дахаты, але сёння рыбацкае шчасце ўсміхалася, і ён вырашыў выкарыстаць удачу да канца. Заняты мроямі аб новых шчупаках, ён і не заўважыў, як дачка ўсхапілася з ліпавага камля, стрымгалоў кінулася ў лагчачок, дзе ён толькі што стаяў.

Азызлы, зрэзаны бацькавымі гумовікамі глыж выслізнуў з-пад ног нечакана. Адчайна б'ючы па вадзе рукамі, Ліна на хвіліну завісла на паверхні, пачала павольна, як намоклая ў малацэ скарынка, тануць. Выціснутыя вадою з кішэні, паўсплывалі адна за другой, загайдаліся побач з нанесеным з ручаёў друзам недаедзеныя ягады...

Алік мэкнуў, азірнуўся: бацькі паблізу не было.

Альфон стаяў скрай затокі, напружана ўзіраўся ў ваду. Алік падбег да яго ззаду, тузануў за крысо караткаватага, заляпанага лускою і водарасцямі ватніка. Бацька незадаволена цепануў плячом.

– Ну, што яшчэ?

Алік зайшоў наперад, сцінаючыся ад страху, пачаў паказваць на мігі ў той бок, дзе танула сястра.

Але і гэта было дарэмна: заняты справаю бацька не зважаў.

Тады ён схапіўся далонямі за мокрае цаўё, бязладна мэкаючы, пачаў вырываць яго з Альфонавых рук...

Калі яны, ламаючы ботамі хмыз, дапялі назад да віра, Ліна ўжо цалкам была пад вадой.

Альфон падцягнуў безуладнае цела восцямі да берага. Бачачы, што зрабіць нічога нельга, здзёр з шыі торбу, шпурнуў на сярэдзіну ракі. Затым гакнуў восці аб калена, кінуў аскепкі ў ваду, дзіка, як ашалелы, зароў.

Усе дні, што сястра ляжала ў труне, Алік прасядзеў у запечку. Чуйна ловячы кожны гук, што даносіўся з лепшае хаты, дзе стаяла дамавіна, з жахам чакаў выраку дарослых. Але людзі ўваходзілі, зноў выходзілі, а пра яго ніхто не згадваў. Толькі перад самым вынасам спахапіліся. Цётка Сальва, бацькава сястра, вывела яго са схову, прыхінаючы абедзвюма рукамі да мяккага свайго, з нявыпетраным пахам нафталіну паліто, павяла следам за працэсіяй да могільніка.

***Мянтуз лянiва сцебануў хвастом па жвіры, нырнуў пад камень. І тае ж хвіліны з глыбіні віра выплыла Ліна. Уся ў пене ад хуткага руху, яна імкліва паднялася ўгору, ударыла рукою аб лёд. Лёд не паддаўся. Тады яна ўперлася нагамі ў дно, спружынячы тулавам, паспрабавала прабіць яго галавой. Усё было дарэмна. Сястра апусцілася на дно, зняможана аддыхваючыся, легла дагары на камень. Вочы яе сустрэліся з Алікавымі. Яна зноў падхапілася, жэстыкулюючы, павабіла брата да сябе. Ён бліжэй прыпаў тварам да паверхні, стараючыся расхукаць лёд вуснамі, пачаў хутка-хутка дыхаць на яго. Затым упіўся ў памякчэлую тоўшчу пазногцямі, не зважаючы на боль у пальцах, рассунуў яе ўбакі. Вызваленая з-пад абрыдлага ледзянога покрыва вада весела гайданулася, шуганула наверх. Алік выпрастаў руку, каб дапамагчы сястры вылезці на лёд, але яе там ужо не было. Патрывожаны мянтуз, разварочваючы жвір, маланкаю вылецеў з-пад каменя і знік у прыбярэжным аеры.***

Праз два дні Алік загаварыў - няскладна, таропка, быццам жадаючы як найхутчэй пазбавіцца жудаснага ўспаміну аб здарэнні на рацэ .

– Гэта водзека... малец ці не крычыць, – прачнуўшыся, тоўхнуў жонку пад бок Альфон.

Бацькі паўскоквалі з ложкаў, замітусіліся ля яго.

– Скажы яшчэ што-небудзь, – прасіла маці. – Скажы, сынок.

А ён пазіраў то на аднаго, то на другога няўцямнымі вачыма, нібы праганяючы страхавітую здань, што ні з таго ні з сяго наведалася сярэдначы, аблізваў вусны сасмяглым языком.

Глена прынесла вару, кінула ў яго колькі ягадзін, дала сыну. Ён папіў, адхінуўся на нагрэтую ад нацепленага шчытка падушку і тут жа зноў заснуў.

Слова прачнулася ў ім, але яшчэ не паспела зрабіцца звыклаю паўсядзённасцю.

## 2

## 1994

# ПАДКРАЙНА

– Зрабіце што-небудзь яшчэ. Такое, ведаеце, каб зачапіла людзей, ускалыхнула. – Рэдактар Арол прыпаліў, запытальна зірнуў на Алеся.– Колькі у вас на сёння матэрыялаў?

– Шэсць.

– Вось, малавата... А практыка заканчваецца.

Алесь згодна хітануў галавой. Сапраўды, да канца практыкі ў раёнцы застаецца тыдзень, і зрабіць сёе-тое пад занавес для справаздачы ва універсітэце не зашкодзіла б.

– З’ездзіце ў Падкрайну,– бачачы, што ён вагаецца, працягваў націскаць Арол.– Там пакоі старасвецкія нібыта збіраюцца аднаўляць і наогул шмат цікавага. З людзьмі пагутарыце, можа, інтэрв’ю якое ўдасца скрапаць. Як, згода?

– Згода.

– Тады бярыце машыну і ў добры шлях. – Рэдактар зняў трубку, абсыпаючы бачыну попелам, крутнуў дыск. – Вася, на Падкрайну.

Алесь устаў.

– Кіроўца ўсё вам пакажа, – канчаткова развейваючы ягоныя сумненні, дадаў Арол. –І бібліятэкарка тамтэйшая, Марына, калі што якое, дапаможа.

Падкрайна – з паўтара дзесятка хат абапал абсаджанай вячыстымі ліпамі вулкі – спаткала прыезджых даждом. Унікаючы яго, Алесь

хуценька захінуўся пад страху крайняе пабудовы. Жанчына, што выйшла праз хвіліну на стук, падазрона глянула на ягоную амуніцыю.

– Ці не запісаваць знова? – сказала, запрашаючы ў хату. – Даўно не было ў нас з гэткімі цацкамі.

Ледзь паспелі ўваліцца ў хату, як з панадворка пачуліся крокі.

– Цётка Польця, чалавек у вас?

Сімпатычная дзяўчына ў празрыстай накідцы ўляцела ў хату, абдаўшы гаспадыню і госця фантанам пырскаў з парасона, з цікаўнасцю зірнула на Алеся.

– Вы з рэдакцыі? Я Марына, бібліятэкарка. Мяне папрасілі пабыць за экскурсавода. Дык хадземце.

І, не зважаючы на дождж і пярэчанні старой, павяла Алеся на двор.

– Не падабаецца? – Марына дагнала яго, трымаючы над галавой парасон, пайшла поруч. – Не?

– Папраўдзе, не надта, – асцярожна, быццам баючыся яе пакрыўдзіць, адказаў Алесь, і не схлусіў. Мінулі ўжо амаль усю вёску, а вока так ні за што і не зачапілася. Пахілыя платы, нізкія хлеўчукі з кучамі гною перад дзвярыма, несамавітыя, з паўразбуранымі дзенідзе комінамі хаты – такога і ў ягоным, суседнім, раёне, нямала.

– Тады пакажу папялішча.

Дзяўчына прыспешыла хаду, пакідаючы ботамі сляды ў глыбокай, напалову прысыпанай пяском і жвірам каляіне, накіравалася да нейкага дзірвання.

– Вось, пяць гадоў таму тут быва шаха. Ведаеце, што гэта такое?

–Ведаю – вялікая пуня.

– Правільна. – Яна спынілася. – Уяўляеце, людзі самі яе спалілі. І пакоі таксама.– Яна паказала ў той бок, дзе тырчалі з зямлі аскепкі цэглы.– Панапіваліся ды давай нішчыць. Мне мачаха расказвава, яна тут раней жыва. Кажуць, бытта з ягад усё тое вар'яцтва пайшво, але я не веру.

– З ягад? – Штосьці знаёмае варухнулася ў Алесевай памяці.– Я чуў пра такі выпадак.

Ягоную ўвагу прыцягнула паўструхлелая драўляная фігура збоч хмызу.

– Што гэта?

– Так, штукарства. Жыў тут адзін калісьці, выразаў рознае. Трэба будзе сказаць школьнікам, каб прыбралі.– Марына папраўіла парасон,

хутка пайшла напрасткі да дрэва, што ўзвышалася шатром на другім канцы пляца.

Дрэва было абгароджана штыкетнікам і зблізку нагадвала помнік.

– Вельмі рэдкая расліна.– Бібліятэкарка далікатна правяла далонню па камлі. – Дакраніцеся.

Алесь зрабіў, як яна прасіла.

Ад камля патыхала холадам.

– Называецца ўдог. Прыгожае, праўда? Хацелі падчас пажару співаваць, але мачаха не дава.

Нібыта пацвярджаючы яе словы, лісце ўверсе дробна зашамацела.

– Бачыце, як жывое.

– А чаму абгароджанае?

– А каб з півамі не лезлі. Поўна такіх рахманоў. Во і пільнуем. Уначы ўчастковы дзяжурыць. – Марына нахілілася, падняла з долу круглую, велічынёй з вішніну, ягадзіну.– Паспрабуйце, якія ягады.

Алесь надкусіў апаліну, павольна, каб як след раскаштаваць, праглынуў.

Кроў паводкаю завірыла па венах, шалеючы, штурхнула ў галаву.

***Ліна дастала з кішэні ягадзіну, няспешна атрэсла, паклала ў рот. Алік падставіў далонь, просячы, каб дала і яму, але было запозна: сястра ўжо сарвалася з месца, жвава падскокваючы, кінулася туды, дзе вісеў па-над вірам абтаптаны бацькавымі ботамі глыж. Хвіліну-другую яна стаяла тварам да вады, затым рэзка ўзмахнула рукамі, нібыта сілячыся ўзляцець, адштурхнулася нагамі ад глебы. Балоневая куртка шарыкам загайдалася пасярод віра, глыж, куляючыся ў паветры, ударыўся аб паверхню, воблакам друзу асеў на дно...***

– Вам блага? – Марына стаяла побач з ім і церабіла за плячо.– Што з вамі?

– Нічога, млосна крыху. – Ён сцепануўся, адштурхнуўся ад камля. У роце было суха, трымценне лістоты ўгары рэзкім болем аддавалася ўвушшу..

– Тады хадзем назад.

Бібліятэкарка ўзяла яго пад руку, трымаючы над галавой парасон, павяла да Польцінай сядзібы.

Нейкая маладзіца вывернулася з-за адной з хат, падбегла да іх.

– Вы, кажуць, з газеты? – спытала, аціраючы далонню мокры лоб.– Дык я пагаварыць хацела б.

– Зараз нельга, Пятроўна. – Марына рашуча стала між імі. – Бачыце, кепска чалавеку.

Маладзіца расчаравана ўздыхнула, хіснулася назад да хаты.

– Тады, можа, после – гукнула ўжо зводдалеку, ад брамкі. – Я забягу да цёткі.

# ПОЛЬЦЯ

## (з дыктафоннага запісу журналіста-практыканта А. А. Леўчыка)

*Дзярэўні гамон, данягож. Каб ня дзерава гэта, не знаю, як і жылі б. Во сваім у горад чатыры бутлі варэння перадала. Гарэлку тэж гонім з ягад, і сушым. Пілецкія, Лёдзя хвалілася, тры мяхі насушылі. Ёсці каму збіраць, і харашы. А я мусі ўзлезу гэдак высока? Шкода. Пад вясну на базары нарасхват сушаныя, тока давай. І плоцяць добра. Людчыкі панабіраліся. У вас няма такіх? Дык я дам на канпот. Лоўкі канпот, і гатаваць лёгка. Дзесятак сушаных укінуў, і гатова. Умалотныя – адна гусціня. Чужых не пушчаем, сукі ламаюць. Дзякуй Натцы, памагаець бараніць. Разраслося якое! Добра, што Старынскім тады не далі спілаваць.*

*З Валькай, відзела, гаварылі. Што яна хацела? Сюды прылятала. Так і так, цётка, дзе гэнан жарналісты? Нешта абходзіць ей, калі свет гэдакі праз дождж цягнулася са сваей Кукавячыны. Можа, пра Вітольдага што? У дзеўках радзіла, а хто бацька – па дзесь дзень невядома. Цяпер во лётаець.*

*Ягады бярыце, ня шкода. Панаравяцца – яшчэ праз Марыначку перадам.*

*О, нагаварылася. Той, што ўпярод запісаваў, старэйшы быў нібыта. У інсцітуце робіў. Тэж вучысся? Добрае дзела, вучонаму ўсюдых дарога...*

Рэдактар хмыкнуў, моршчачыся, пасунуў аркушы на край стала.

– Ну, як, Фларыян Пятровіч? Што скажаце?

– Што скажу? – Арол зморшчыўся яшчэ больш. – Папраўдзе, не надта. Пакоі, шаха – ці пра гэта трэба пісаць? Ды і назва вельмі ж песімістычная. «Бяспамяцтва”! З такім загалоўкам і непрыемнасці нядоўга нажыць. Даўся вам рэзрух! Напісалі б пра прыроду, пра тое ж дрэва.

Цяпер ужо Алесь зморшчыўся – ад прыкрага ўспаміну аб учарашнім прыступе млоснасці.

– Як бы гучала: «Дрэва жыцця”! – працягваў гнуць сваё рэдактар. – Памяркуйце, падумайце, часу яшчэ ёсць крыху да ад’езду.

Увайшла жанчына. Павіталася па чарзе з абаімі за руку, села ў крэсла насупраць рэдактара.

– Наталля Сяргееўна Козел, загадчыца аддзела культуры, – крыху бянтэжачыся, сказаў Арол. – А гэта практыкант наш з універсітэта, Алесь Леўчык. Можа, чулі?

– Чула, а як жа, – нечакана нізкім, як бы пракураным голасам адказала наведвальніца. – І чытала сёе-тое. Няблага пішаце. Хоць і прэтэнзію маю: занадта ж ужо шмат у вас негатыву. Каб весялей крыху...

– На гэты раз весялей атрымаецца, – сказаў рэдактар і патаварыску падміргнуў Алесю. – Яшчэ так спадабаецца вам, Наталля Сяргееўна, што і Марынку сваю аддасцё за нашага маладога журналіста.

– А што, якраз і неблагая была б пара.

Апошняе, хоць і было сказана паўжартам, і збянтэжыла Алеся, і ўзрадавала: Марына, нягледзячы на дэфект маўлення, яму падабалася.

– Марына казала мне, Валька Бакевічышка да вас далязала? – скорагаворкай, бы ццам між іншым, спытала загадчыца. – Што ёй трэба?

– А, жанчына, што падыходзіла на дварэ, – успомніў Алесь. – Мы не размаўлялі. Яна набівалася прыйсці да той цёткі, але мы раней з’ехалі.

– І добра, што з’ехалі. У іх, у Бакевічаў, заўжды паўтара людскога, – падымаючыся з крэсла, сказала Наталля Сяргееўна і ўжо ад дзвярэй дадала: – Сёння ў нас невялікі сямейны сабантуй, дык заходзьце ўдваіх на пасялынды. Чуеце, Фларыян Пятровіч, удваіх – я на вас спадзяюся.

## 3

2000

# ГОЛАС

Каталка зварухнулася з месца, парыпваючы коламі па квяцістым, з аттупыраным на стыках лінолеуме, пакацілася па калідоры. Аперацыйная была недалёка, на гэтым жа паверсе. Алесь і сам мог бы туды зайсці, але санітаркі не згадзіліся: такі парадак, парушаць яго нельга.

У аперацыйнай ужо чакалі. Двое ўрачоў, адзін пажылы, хударлявы, і другі, зусім маладзенькі, ці не практыкант, дапамаглі яму легчы на стол, прывязалі рукі рамянямі. Затым сястра зрабіла ўкол, і старэйшы ўзяўся намазваць Алесевы грудзі нечым чырвоным.

– Будзем пачынаць, – сказаў нягучна і ўключыў святло.

Невялічкі блішчасты дыск уверсе, ад якога разыходзіліся ўбакі атожылкі асвятляльніка, нагадваў люстэрка.

Алесь бачыў, як разрэзалі яму скуру над ключыцай, як вывернулася з-пад яе светла-ружовая плоць залозы Затым павярнуў галаву ўбок, пачаў думаць аб сваім.

Больш за ўсё ён баяўся, каб не страціць голасу. Яму, журналісту, гэта зусім недарэчы. А здараецца, і не так ужо рэдка. Чалавек, што выпісаўся два дні таму, так і пайшоў дадому сіпаты. Ці ўзновяцца тыя звязкі з часам – ніхто гарантыі не дае.

Ён незаўважна прыснуў і прачнуўся зноў ад болю, мусіць, перастала дзейнічаць замарозка.

– Як сябе адчуваеце? – спытаў урач.

– Баліць.

– Пацярпіце яшчэ крыху. – Урач нахіліўся над разрэзам, чыркнуў скальпелем. – Ну, як зараз? – спытаў праз хвіліну.

– Таксама, – варухнуў вуснамі Алесь і пахаладзеў ад жаху.

Голас прапаў, нібы яго ніколі і не было.

***Восці рэзка апусціліся, але не пацэлілі. Альфон шырэй расставіў ногі, тыцнуў жалязяку ў ваду другі раз. Вялізная шчупачыная галава на хвіліну паказалася над гладдзю, нібыта дражнячыся, зноў схавалася ў віры. АлІк скубнуў бацьку за крысо, але дарэмна. Той, заняты цалкам рыбінай, і брывом не***

***варухнуў. Шчупак зноў выплыў наверх, паблісккваючы луской, паважна прадэфіляваў уздоўж берага. Але варта было Альфону нацэліць на яго восці, як ён зноў знік у каламутных нетрах. Ды зноў з'явіўся, цяпер ужо правей, ля самай водмелі. Высунуў з вады страхавітую, з шыхтам густых белых іклаў пашчу, лянiва ўтаропіўся ў рыбака нерухомымі вачыма. Апярэджваючы бацьку, Алік схапіў першы, што трапіў пад руку, камель, шпурнуў у рыбіну. Шчупак ікнуў па-чалавечы, перавярнуўшыся два разы наўкола сябе, знік у віры.***

Калі ён прачнуўся, была ноч. У палаце гарэла святло, але ўсе навокал спалі. Санітарка падбегла да яго, замітусілася побач.

– Вутку, ці хочаце ўстаць? – спытала, дастаючы з-пад ложка пасудзіну.

– Устаць, – паказаў ён на мігі.

– Тады прытрымлівайце галаву рукамі.

Яна дапамагла Алесю падняцца, і ён, пераадольваючы млоснасць і чапляючыся рукамі за сцяну, пасунуўся ў прыбіральню. На шчасце, яна знаходзілася тут жа, у блоку.

Справіўшы патрэбу, ён сеў на вечка сядала, паспрабаваў пракашляцца. Кропелькі крыві, выбіўшыся з-пад павязкі, дробнаю марассю пырснулі на далонь.

Але голасу па-ранейшаму не было.

Урач адвёў позірк убок, вінавата ўсміхаючыся, паляпаў яго па плячы.

– Вельмі не хвалюйцеся, – сказаў, аддаючы паперкі для ўчастковай паліклінікі. – Месяц, ад сілы два, і голас узновіцца.

– А калі не? – прасіпеў Алесь.

– Такога не можа быць. Але трэба сабе і дапамагаць. У дыягнастычным цэнтры вопытныя фаніятры, звярніцеся да іх. Яны і бальнічны дадуць на гэты тэрмін. Усё будзе добра, не вы першы, не вы апошні.

Яны паціснулі адно аднаму рукі, пайшлі ў розныя канцы калідора. Доктар – у палату на агляд, Алесь у суправаджэнні сына – у накірунку прыёмнага пакоя па адзенне.

Жанчына апусціла лыжачку ў раствор, папраўіла акуляры.

– Думаю, хутка і сяпяваць зможаце, – сказала, падтыкаючы пад каўпак кароткія няроўныя валасы. – Зазор паміж звязкамі нашмат паменшаў. Яшчэ пару дзён, і ўсё прыйдзе ў норму.

– Хутчэй бы ўжо!

Фаніятарка спачувальна глянула на Алеся.

– Пасля такога доўгага чакання паўтыдня нічога не значыць. Працягвайце трэніравацца. Здаровую трэба раскачаць так, каб стала ўшчыльную да парэзанай. Словам, практыкуйцеся.

– Давядзецца, – ветліва, але без энтузіязму сказаў Алесь і махнуў рукой. Вось ужо амаль паўтара месяца ён толькі тое і робіць, што практыкуецца. Прамаўляе ўслых розныя скорагаворкі ды лічыць падчас хады да дваццаці.

Заўчора голас нарэшце прарэзаўся – няпэўны, усё яшчэ сіплаваты, як у старога ці заўзятага выпівохі. А к вечару зноў прапаў. Сёння зранку з'явіўся зноў, не сказаць каб чысты, але ўжо значна лепшы.

– Вам яшчэ пашанцавала , што не абедзве звязкі зачапілі, – сказала доктарка. – А то вунь як бывае.

– Я ведаю, як бывае, – падымаючыся з табурэта, сказаў ён. – Дзякуй за дапамогу.

– Не ахці як выразна. – Марынін голас гучаў насмешліва. Зрэшты, яна кожны раз з ім гэтак размаўляла з таго моманту, што яны раз'ехаліся. – Хоць з лярвамі менш будзеш баўбатаць.

– У цябе ўсе лярвы, – як мага спакайней адказаў Алесь. – Апоч цябе самой.

Страла акурат патрапіла ў цэль.

– Хам! – Жонка зайшлася абурэннем. – І пасля гэтага будзеш наракаць, што не наведава ў бальніцы! Дарэчы, па-беларуску «апрача", а не «апроч". Грамацей!

– Ты ці не моваю занявася, – перадражніваючы яе, зноў сыранізаваў Алесь. – Можа, у ТБМ падасіся?

– Чакай Пятра! – яна засмяялася. – Адзін раз у своўнік зазірнува, і даволі.

– Дзіўны нейкі слоўнік!

– Табе ўсё дзіўна... Сына б лепш глядзеў, штодня на мітынгі цягаецца. Пагаварыў бы з мальцам.

– Пагавару. Вярнуся з Падкрайны і пагавару.

– З Падкрайны? Што за справы там?

– Жанчына адна напісала, просіць прыехаць.

– Жанчына! – Марынін голас зноў зрабіўся з’едлівы, як напачатку размовы. – Ці не Валька зноў Бакевічавых?

– А вось гэта цябе не тычыцца, – задаволены, што апошняе слова засталося не за ёю, адказаў Алесь і паклаў трубку.

Размова з жонкаю яго не засмуціла. Неразуменне даўно перабегла сцяжыну іх сумеснага існавання. Неўпрыкмет прорва шырылася і вось, здаецца, дасягнула крайняй мяжы. Тое, што ён калісьці любіў у Марыне, зараз не выклікала нічога, апроч прыкрасці і раздражнення. Не мінала дня, каб яна не прыдумала чаго-небудзь, што магло б парушыць ягоны спакой, перашкодзіць засяродзіцца на самым для яго галоўным – творчасці. Зразумела, усё гэта непрыемна. Ды, зрэшты, ёсць рэчы больш важныя, чым людская прыхільнасць. Дзве кніжкі, якія ўдалося выдаць за апошнія пяць гадоў, даюць яму права не зважаць на дробязі.

Ён заклаў у карэтку чысты аркуш, раз-пораз адпіваючы з кубка астылую каву, узяўся перадрукоўваць набела ўступ распачатай непярэдадні ў бальніцы аповесці. Але працаваў нядоўга: замінаў засяродзіцца напамін пра сына. Можа, праўда, варта з ім пагаварыць? Хлопцу васемнаццаць, уцягнецца ў палітыку, і бывай тады і вучоба, і надзея на будучыню. Ды і ці мала што можа здарыцца падчас тых мітынгаў, вунь як апошнім часам рэбры трушчаць. Некалі і сам ён хадзіў на такія мерапрыемствы, і пісаў пра іх. Зараз не ходзіць і не піша. Не тое каб расчараваўся, хутчэй з абачлівасці. Прыдалася Арлова навука. Зрэшты, у дзяржаўнай газеце, каб і хацеў, надта не пасвавoліш – не дадуць. Вось і даводзіцца рабіць выгляд, быццам ні да чаго няма справы, і нават схлусіць часам. А што зробіш, калі гэткія часіны і трэба дбаць пра месца пад сонцам. Ды і хлусня сама па сабе – хіба найгоршы з грахоў?

Спачатку здалося – звоняць у дзверы. Алесь падхапіўся з-за стала, спакваля вяртаючыся да памяці пасля амаль двухгадзіннага сядзення над рукапісам, рынуўся ў прыхожую. І толькі зірнуўшы на сабаку, што звычайна, калі хто прыходзіў, ашалела кідаўся да дзвярэй, а зараз нерухома стаяў пасярод калідора і залівіста брахаў, зразумеў – зноў тэлефон.

Звaнiла Часлава, жончына сяброўка-настаўніца. Яна выкладала літаратуру ў турме для непаўналетніх і зрэдку званіла яму па старой памяці.

– Перашкодзіла, але не надта, – перапыняючы шматслоўны паток перапрашэнняў уперамешку з віншаваннямі з нагоды выздараўлення, сказаў ён роўным, знарок для гэткіх выпадкаў выпрацаваным голасам. – Ты што-небудзь хацела?

– Толькі нагадаць пра нашу дамову на заўтра наконт выступлення, і больш нічога. Спадзяюся, ты памятаеш...

– Памятаю, – сказаў ён і завагаўся. Выступленне адыме не менш як паўдня, а ён так спадзяваўся выкарыстаць абяцаныя фаніятаркай два тыдні бальнічнага для працы над рукапісам. – Памятаю, але не ўпэўнены, што атрымаецца... Голас, сама бачыш, яшчэ не акрэп.

– Голас як голас, – сказала яна. – А тут якраз трэніроўка. Зрэшты, глядзі сам.

Хвіліну абое маўчалі.

– Ладна, прыйду. Дзе спатыкаемся?

– Без чвэрці тры ля ўвахода, хутка, быццам баючыся, што ён перадумае, адказала Часлава. – Буду чакаць.

А шостай зноў пазваніла Марына. Яна ў адрозненне ад папярэдняга разу гаварыла коратка і без злосці.

– Свавік зойдзе па грошы, – сказала, ледзь пачуўшы ў слухаўцы ягонае дыханне. – Маеш?

– Трохі маю, – адказаў Алесь і міжволі зморшчыўся: дэфект маўлення ў жонкі з узростам рабіўся ўсё больш заўважны, і гэта яго злавала. – Тры тысячы магу даць.

– Тры дык тры. Я рыбы купіва, хочаш, перадам праз Свавіка.

– Ты ж ведаеш: я не ем рыбы.

– Тады ягад возьмеш. Наталля Сяргееўна абяцала пераслаць.

– Той труцізны?

– Не звуйся.

– Я не злуюся.

– Няпраўда, звуешся.

– Навошта было даваць дзіцяці імя, якое не вымаўляеш! – канчаткова выведзены з раўнавагі, груба сказаў ён, і на тым размова скончылася.

# 4

# 2000

www.kamunikat.org

# СВЯТА

Вядучы пакланіўся, падаючы знак, што канцэрт скончаны, пайшоў са сцэны. Наталля Сяргееўна пасунулася бліжэй да мужа, задаволена ўсміхнулася: свята ўдалося, дык будзе чым казырнуць на справаздачнай калегіі. Якая вёска ні вёска, а вунь колькі народу сабралася. І не толькі мясцовыя – з усяго наваколля папрыходзілі. Хай папікнуць зараз у вобласці, што пенсіянерка і не адпавядае патрабаванням часу!

Яна паднялася на сцэну, крыху хвалюючыся, падзякавала артыстам за адмысловае прадстаўленне.

– Аліку, як прыедзе, не забыцца даць інфармацыю для газеты, – сказала, зноў спусціўшыся са сцэны да мужа.

Кірыла Ігнатавіч няўхвальна хмыкнуў.

– Яшчэ чаго – Аліку! Сваіх пісак мала! У раёнку дамо.

– Раёнка – адно, – не пагадзілася Наталля Сяргееўна. – А ў абласной з'явіцца матэрыял – зусім другое.

– Алік гэны... Быццам не знаеш, дзеля чаго і да каго едзе.

– Ладна, супакойся. – Яна прысела побач, лагодна ўсміхнулася мужу. Іншы клопат не ішоў з галавы. Яшчэ падчас канцэрта адчула, быццам хтосьці сочыць за ёй і Кірылам. І ад таго нябачнага віжавання то зімна рабілася, як увосень, то абдавала гарачынёй.

Яна азірнулася. Людзей на лавах пад удогам значна паменела. Артысты, спакаваўшы свае прычындалы, праставалі следам за старшынёй калгаса да ракі, дзе мелася быць вячэра.

І тут яна і ўбачыла Вальку. Тая стаяла збоч натоўпу, раз-пораз ускідваючы ўгору рукі, зыркліва паглядала на Наталлю Сяргееўну з-пад абветранай далоні.

Яна падышла да жанчыны.

– Хіба з намі не пойдзеце, Пятроўна? – сказала, пераадольваючы непрыязнасць. – Пасядзім, пагамонім на прыродзе.

– Што ж, пагамонім. – Валька сарвала з дрэва ягадзіну, жуючы на хаду, пайшла следам за артыстамі да ракі.

– За ўсіх нас! – старшыня залпам выпіў, не закусваючы, падскочыў да Козелаў.

– Дазволіце, Наталля Сяргееўна?

Яна паднялася, пагойдваючыся ў такт музыцы, рушыла за кавалерам на сярэдзіну паляны.

І зноў, каторы ўжо раз, спаткалася з Вальчыным паглядам. Тая сядзела побач з Аношкавай Мілюняй, нецвярозым голасам падпявала акардэаністу.

Раптам яна ўскочыла, хістаючыся ўбакі, пасунулася да месца, дзе застаўся сядзець Кірыла Ігнатавіч.

Наталля Сяргееўна выйшла з круга, падалася туды.

– Вось, кажа Валянціна Пятроўна, усё пра цябе ведае, – у мужавым голасе чулася збянтэжанасць.

– І што, калі не сакрэт?

– Усё! – Валька абвяла стол злым паглядам. – Пра Мэську, да прыкладу... Як вы яго спіхнулі з роварам.

Наталля Сяргееўна гучна засмяялася.

– Я?

Жанчыны, што сядзелі побач, але размовы з-за музыкі дакладна, відаць, не чулі, абурана зашыкалі на Вальку.

– Пры людзёх чапляешся! – накінуліся дружна, тоўхаючы з усіх бакоў, выпхнулі з-за стала.

Валька адышлася воддаль, але як толькі жанчыны перасталі на яе зважаць, зноў вярнулася назад.

– Выведу на чыстую ваду, – гукнула, нахіляючыся да самага твару Наталлі Сяргееўны. – Скора журналісты ваш прыедзець, усё яму раскажу. – І пра матку вашу таксама...

– Матку не рушце! – успыхнула Наталля Сяргееўна, але тут жа прымірэнча дадала: – Лепей вып'ем, Пятроўна. – Дастала з сумкі нечапаную бутэльку, наліла жанчыне.

Валька похапкам выпіла, бачачы, як пагрозліва бліснулі Наталліны вочы, хуценька адбеглася ўбок.

– Усім, усім раскажу! – крыкнула, накіроўваючыся да абрыву.

– Вар'ятка. – Наталля Сяргееўна ўладкавалася побач з мужам, запытальна зірнула ў вочы. – Што будзем рабіць?

Кірыла Ігнатавіч падняўся з-за стала, прыпальваючы на хаду цыгарэціну, няспешна падаўся следам за Валькай да хмызняку.

– Дзе ж гэта вы былі? – Мілюня схапіла яго за рукаў, пацягнула на сярэдзіну пляцоўкі. – Тока хацела вас запрасіць, аж глядзь – ужо няма.

– Курылі з мужыкамі, – шукаючы вачыма жонку, адказаў .ён. – Дзе мая?

– Вунака, ля гарманістага.

Наталля Сяргееўна, сапраўды, стаяла побач з акардэаністам і аб нечым гутарыла са старшынёй. Убачыўшы мужа, хуценька падышла, страсянула далонню з ягонага пінжака камякі бруду.

– Як там?

– Як мае быць, – адказаў Кірыла Ігнатавіч і схіліўся ў паўпаклоне, запрашаючы на танец.

Яна ўдзячна тузанула яго за рукаў. Яны даўно, яшчэ тады, калі не былі жанатыя, разумелі адно аднаго з паўслова.

# ПОЛЬЦЯ
## (з дыктафоннага запісу журналіста А.А.Леўчыка)

*Дык мусі спомніш зразу. Ці не ў семдзесят пятым тое было. Ага, гэдак. Ромка Старынскіх з варміі Наталлю прывёз, здалеку аднекуль. А матка ейная, Стася, тут робіла посля вайны. Ды вы знаеце, пэўна. Мэська за брыгадзіра быў. Ну, падпіўшы і ляпнуў. Моў, матка твая, Стася, з Вітольдым нябожчыкам любілася. Наталлі не панаравілася. А каму б панаравілася? Скора Мэську пад абрывам знайшлі. П'яны з роварам зваліўся. Тады так і мінулася. А цяпер во Валька стала казаць, бытта відзела, хто спіхнуў Мэську. Бытта Наталліна работа. Аж і сама зляцела... А хто ж ведаець, як было. Маёўку спраўлялі ля ракі. Добра зробілі, усяго хватала, яшчэ і асталося. Арцістаў з раёна прывязлі, ансамбель ці як яго там. Пад дзеравам сцэну змастачылі, тамака пялі і танцавалі. Наталля ўсё пастаралася. Пасля выпівалі панадрэччу, разам арцісты і ўсе свае. Валька падпіла ды да цешчы вашай: так і так, усё пра вас знаю, дык сцеражыцеся. Мілюня Аношкавых прыструніла яе. «Стыду ты, – кажаць, – не маеш. Цябе запрасілі, як чалавека, а ты што вычвараеш? От узяць кадэль ды перацягнуць па хрыбеціне". Не панадабіўся кадэль, сама сабе рады дала. Пашла да абрыву і звалілася. Нядзіва, выпіўшы ды бабскім дзелам... Арцісты ўзбіліся, нашлі. Нежывую ўжо. Гвалту было! З пракаратуры прыехалі, а што яны памогуць? Наталля дужа перажывала, і Ігнатавіч тэж.*

*Вы, чула я, з Марынкай ня надта добра? Нічога, усяк бываець, на тое і сямейная жызня. Сягоння дрэнь, а заўтра, глядзіш, наладзілася. Дык бывайце здаровенькі!*

*Во йшчэ, звіняюся... Некаторыя тутака на Наталлю ды на мужыка ейнага думаюць, дык вы скажыце ей. А то мне нялоўка. Ну, бытта Вальку яна страбесавала. Я ня веру, а людзём языкі не завяжаш. Скажыце ей, каб знала, раптам што. Ну, шчасліvenька вам, дасвіданька. Прыязджайце, ня брэзгавайце.*

## 5

## 2000

# ЗНАЁМСТВА

Дзверы зачыніліся. Гучны рэзкі пошчак замка аддаўся ў Алеся ўвушшу і тут жа стаяў пад скляпеннямі будынка.

Дзяжурны з хвіліну пагартаў пашпарт, уважліва, як памежнік на мытні, паглядзеў на Алеся.

– Трэба выпісаць пропуск, – сказаў, праганяючы суровасць з шырокага, абветранага, бы ў селяніна, твару. – Ідзіце да начальніка.

Алесь з Чаславаю завярнулі ў калідорчык паперадзе КПП, пакрочылі на другі паверх.

Начальніка на месцы не было, пропускамі займаўся ягоны намеснік.

– Писатель? Какой? Белорусский? Интересно... Что говорить будете?

Ён упісаў Алесева прозвішча ў гатовы бланк, і яны зноў пайшлі калідорам на прапускны пункт.

– Хвалюешся? – ужо крочачы паўз плац да жылога корпуса, спытала Часлава. – Не трэба, усё будзе добра.

Алесь згодна матлянуў галавой: вядома, будзе. Ён гэтулькі гадоў аддаў журналістыцы, так што прымусіць слухаць сябе ўмее. Ды і словам валодае не горш за якога запіснога прамоўцу: дзе толькі не даводзілася выступаць. У турме, праўда, упершыню, ды вось сёння і будзе пачатак. Галоўнае – зрабіць эфектны ўступ. І ён зробіць, можна не сумнявацца. Слова змалку, ад тае хвіліны, як пачаў гаварыць, было

ягонай стыхіяй, і ўжо што-што, а скарыць яго капрызлівую няўлоўную глыбіню ён здолее ў любых абставінах.

У клубе іх чакалі. Чалавек сто асуджаных юнакоў, усе стрыжаныя, у аднолькавых шэрых робах, сядзелі на лавах і, як толькі яны з Чаславай у суправаджэнні дзяжурных увайшлі ў памяшканне, імгненна сціхлі.

– Гэта журналіст і пісьменнік Алесь Леўчык, – прывітаўшыся, сказала Часлава. – Мы запрасілі яго на сустрэчу з нагоды дня друку.

Хлопцы сядзелі нерухома і ўважліва сачылі за кожным ягоным рухам. Іх голыя галовы зводдалеку нагадвалі ўздзетыя на штыкетнік стаўбуны, цёмныя робы адцянялі гвалтоўную ненатуральнасць постацяў. Вачэй іхніх, як Алесь ні ўзіраўся, убачыць не змог: сфакусіраваць зрок ў гэткай аднастайнасці было вельмі цяжка. На хвіліну ён разгубіўся. Што рабіць, як пачынаць размову?

Рашэнне прыйшло неспадзеўкі.

– Маю стрыечную сястру дзесяць гадоў таму асудзілі за забойства. Яна забіла мужчыну, які спрабаваў яе згвалтаваць. Я ездзіў да яе на спатканне напярэдадні суда і тады зразумеў правільнасць выслоўя: ад турмы ды ад сумы не заракайся.

Уступ асуджаным прыйшоўся даспадобы. Алесь адчуў гэта хутчэй вушмі, чым зрокам, – па ледзь улоўным характэрным шавяленні ў зале. Хітрасць удалася, і гэта акрыліла яго. Ён пачаў апавядаць пра творчую кухню, пра тое, як будуе сюжэт, пра асобных герояў – словам, пра ўсё, чым жыў апошнія гады. Апавядаў упэўнена, добра пастаўленым голасам, зрэдку вяртаючыся да стала, нібыта каб падгледзець у падрыхтаваную загадзя кантычку, а на самой справе дзеля таго, каб надаць выступленню паболей артыстызму і раскаванасці. Не ў апошнюю чаргу рабіў гэта дзеля Чаславы, якая, вядома ж, перадасць усё бачанае жонцы. Так, на адным дыханні, і прагаварыў каля гадзіны. А калі скончыў, у зале пачуліся воплескі.

– Як ты іх ускалыхнуў, – кінулася да яго Часлава. – Дзіва!

Сапраўды, хлопцы выглядалі задаволенымі. Абступілі яго з усіх бакоў, пасыпаліся пытанні.

Юнак гадоў семнаццаці, канапаты, шыракатвары, прабіўся праз натоўп, стаў насупраць.

– Вы нам спадабаліся, – сказаў збянтэжаным, але разам з тым нібыта насмешлівым голасам. – Можна звярнуцца да вас з асабістым пытаннем?

– Можна.

– Праз два тыдні мой тэрмін канчаецца. Дык ці не дапаможаце з працай?

– Калі змагу, – збіраючы паперы ў папку, адказаў Алесь. – Звяжацеся са мной праз Чаславу Вацлаваўну.

– Ты прыроджаны выступоўца. – Часлава ўзяла яго пад руку, павяла да выхада. – Я ўсё яшчэ пад уражаннем ад тваёй прамовы.

– Не перабольшвай.

– Не перабольшваю. Цябе слухалі з раскрытымі ртамі. А тут жа поўна такіх, што маці родную не пашкадуюць. Днямі аднаго актывіста зацягнулі ў прыбіральню і там закалолі нажніцамі. Сорак ран нанеслі. Во такі кантынгент...

– Той хлопец, што падыходзіў да мяне – як ён?

– Валера? – Часлава ўздыхнула. – Здаецца, неблагі, а там чорт ведае. Сачыненні на пяць-шэсць лістоў піша. Усе на жаргоне шпарацъ, а ён – па-свойму. Новыя словы любіць выдумляць, а то фразу якую з размоўніка ўставіць. Днямі поп з епархіі прыязджаў малебен ладзіць, дык ён да дзяжурнага. – Яна дастала з сумачкі цыдулку, павольна, па складах прачытала: – «Дайбяо дахуй хуйі яо цзінь-сін цюн?”

– Ого! І што азначае гэтае «дайбяо”?

– «Калі канграэс пачынае работу?” Кажа, з кітайскай...

– Жартаўнік хлопец.

– Яшчэ які. А што гэта ён цябе так зацікавіў?

– Ды так. З працаю прасіў дапамагчы.

Часлава хвіліну памаўчала.

– З працаю? Ну, гэта сам глядзі. Адно параю: надта не давярай. Тут у іх свае законы, і калі што якое... Дарэчы, што гэта за сястра ў цябе ў турме? Ні ад цябе, ні ад Марыны я пра яе ніколі не чула.

– І не магла чуць, – адказаў ён весела і, нібыта перапрашаючы за нявінны падман, дадаў: – Так, прыдумаў дзеля эфектнасці.

– Гарэлка таксама няблага. – Часлава зняла туфлі, ускараскалася з нагамі на канапу. – Я жанчына савецкая, што ёсць, тое і вып’ю.

Алесь наліў чаркі. Ініцыятыва выпіць у яго на кватэры належала яму, але што ўсё акажацца гэтак проста, ён не думаў.

Праз паўгадзны яны ляжалі ўпобачкі, Часлава, разамлелая, мяккая ад нечаканай пяшчоты, засяроджана вадзіла далонню па шраме на ягонай шыі.

– Хутка і знаку не будзе, – казала павольным, як спрасоння, голасам. – І гаворыш добра. Пісьменнік! Мне б такога мужыка.

– Папрасі ў Марыны, хай саступіць, – пажартаваў Алесь.

– Ужо саступіла, – неахвотна падымаючыся з канапы, сказала яна. – Яна ж не дурная, разумее, што мужыку аднаму доўга нельга...

– Дык вы дамовіліся, ці што? – жахнуўся ён.

– Не хвалюйся, размова была больш чым агульная. – Часлава цмокнула яго ў шчаку. – І казаць ёй пра сённяшняе я не збіраюся.

Новая аповесць давалася цяжка. Творчы ўздым, што з’явіўся пасля ўдалага выступлення ў турме, ушчэнт разбіваўся аб паўсядзённыя непаразуменні.

Уначы раптам пацёк кран у ванным пакоі. Абяцалі прыслаць сантэхніка праз пару гадзін, а ўжо чацвертая, а яго ні слыху ні дыху. Добра, калі к вечару з’явіцца, і добра, калі цвярозы.

Зразумела, такі стан, калі ловіш кожны гук з пляцоўкі, працы не спрыяе.

Ды і запісаная ў Падкрайне гісторыя не ідзе з галавы.

Ён уключыў дыктафон, каторы раз уважліва праслухаў Польцін аповяд. Што рабіць з ім? Няблага б з кім параіцца. Можа, з намам галоўнага Будовічам? Ён чалавек мудры, ды і землякі як-ніяк.

У дзверы пазванілі. Чабурак, віхляючы хвастом-мяцёлкаю, кінуўся ў прыхожую.

Прыйшоў Славік. Павітаўшыся, ціха прайшоў у кухню, паставіў чайнік.

– Як справы ў інстытуце?

– Сумна. – Сын насыпаў у заварнік чаю, сеў на табурэт у чаканні, калі закіпіць вада. – Днямі марш, дарэчы.

– Марш? – Алесева галава міжволі тарганулася ўгару. – Пойдзеш? Глядзі, заграбуць, дык мала не здасца. А то яшчэ з інстытута выключаць.

– Камусьці ж трэба ісці. – Славік іранічна ўсміхнуўся. –Вы, старэйшыя, не надта разгоніцеся.

Сынаў папрок яму не спадабаўся.

– Я сваё адхадзіў, – Алесь зноў падсеў да машынкі, затарабаніў пальцамі па клавішах.

Размова прымала непрыемны накірунак, а гэта зараз было зусім недарэчы. Ды і сын-тэхнар валодаў логікай лепш за яго.

– Гісторыя цікавая. – Будовіч выключыў кававарку, задуменна ссунуўшы бровы на пераносся, вярнуўся да стала. – І што думаеш з ёю рабіць?

Алесь паціснуў плячыма.

– Нават не ведаю... Параілі б, Уладзімір Іванавіч.

Намеснік рэдактара няспешна разліў каву па кубках.

– Што б параіў... Напішы што-небудзь. Апавяданне якое ці, можа, аповесць.

– Я не пра тое. Справа такая... Можа, паспрабаваць яе разварушыць? Звярнуцца ў следчыя органы...

Будовіч усміхнуўся.

– Навошта гэта табе! – прамовіў іранічна і паправіў вольнаю рукой акуляры. – Сам жа разумееш: пачнецца капаніна, адно, другое... Сведкаў няма, дык нічога і не дакажаш. Толькі нервы папсуеш сабе ды рэпутацыю падмочыш. Ды і людзі яны, відаць, не такія простыя, каб лёгка дацца. Не заўважыш, як у дурнях застанешся. Трэба гэта табе?

– Можа, і так. – Алесь устаў, накіраваўся да дзвярэй.

Выйшаў у калідор, не заходзячы ў свой кабінет, папраставаў на вуліцу. У яго яшчэ быў бальнічны, і свяціцца на працы раней часу не хацелася.

Ды і паездка за мяжу, якую ўдружыў па старой памяці колішні сакурснік, а зараз рэдактар аднаго незалежнага выдання, хвалявала кроў. Як то ўжо будзе ў тым Берліне? І чым скончыцца гэтае паўпадпольнае халяўнае падарожжа? Сябрук запэўніў, што ніякім чынам адрабляць не давядзецца, а там хто ведае... Ды і тут як успрымуць, калі даведаюцца? Праца ў газеце па сённяшніх часах няпростая, ды дзе лепшую знойдзеш?

## 6

## 2000

# ВАЯЖ

– Спадзяюся, семінар даў вам сёе-тое. – Гер Пфальц падняў бакал, няспешна зрабіў колькі глыткоў. Шкада, што так хутка даводзіцца развітвацца. Ці не праўда, спадар Леўчык?

Алесь хітануў галавою ў знак згоды.

Сапраўды, ад’язджаць было шкада. Чатыры дні праляцелі як адзін, а Берлін так і застаўся неспазнаным. Дзве аўтобусныя экскурсіі, што гаспадары ўмудрыліся неяк уціснуць у праграму паміж заняткамі ды дыскусіямі на прафесійныя журналісцкія тэмы, і блізка не давалі таго ўяўлення аб тутэйшым жыцці, на якое кожны спадзяваўся ад’язджаючы з дому.

– Нават заапарк не паказалі, – прыбіраючы ўпотайкі са стала ў сумку прыгожую бутэльку з чырвоным віном, сказала злёгку ахмялелая Алесева суседка злева Лідзія і ў роспачы махнула рукой. Яна рабіла карэспандэнткай у адной з раёнак, гэта быў яе першы выезд за мяжу, і яна, хоць горад і расчараваў яе па першасці засіллем чорнага і шэрага колераў, як і ўсе ў групе, разлічвала на больш разнастайную праграму. – Жмінды!

Імпазантны гер Пфальц абвёў гасцей бадзёрым, з дамешкам непадробнага смутку, паглядам.

– Мяркую, зараз, калі вы маглі зведаць на практыцы прынцыпы нашай прафесіі ў вольным свеце, вы зробіце ўсё, каб ажыццяўляць іх у сябе на радзіме, – сказаў, падымаючыся з-за стала.

Вячэра скончылася, да ад’езду заставалася гадзіна.

Ля цягніка гучала музыка: гаспадары праводзілі дзяцей з Чарнобыльскай зоны.

Лідзія апошняя ўскараскалася ў вагон, цягнучы перад сабою валізу з рэчамі, уселася побач з Алесем.

На скорую руку зладзілі стол.

– Пакаштуйце нашай, гер Пфальц. – Лідзія пакорпалася ў валізе, дастала з-пад рыззя бутэльку «Цара” і мяшэчак з нейкімі сушанымі ягадамі.

Каардынатар прыцмокнуў языком, нібыта нечага засаромеўшыся, густа пачырванеў.

– Добры напой?

– У нас усе п’юць.

– Тады можна паспрабаваць. – Гер Пфальц выпіў, зморшчыўся, пацягнуўся рукою да вяндліны.

– Бач ты, выпіў, і хоць бы што, – нахіляючыся да Алеся зашаптала Лідзія. – А то – страўнік хворы, рэлігія на дазваляе. Ягадзінку вазьміце, гер Пфальц.

– Што за ягады?

– У нас растуць. У вас, пэўна, няма такіх.

Гер Пфальц узяў дзве ягадзіны, з перасцярогаю, быццам баючыся атруціцца, адправіў у рот.

– Смачна!

Лідзія зноў наліла – па поўнай мужчынам і палову сабе.

– За новыя сустрэчы!

Калі бутэльку апаражнілі, сусед пайшоў да сябе ў купэ, прынёс яшчэ адну, нейкую фірмовую. Дапівалі яе пад апошні званок.

Гер Пфальц выйшаў на платформу, пахістваючыся, прыпаў тварам да акна вагона.

– Шалік! Шалік жа забыўся! – гукнула Лідзія і кінулася адчыняць акно.

Цягнік тарганууся, сігналячы, асцярожна рушыў са станцыі.

– Вось і ўся музыка. – Лідзія ўзлезла з нагамі на паліцу, весела памахала геру Пфальцу.

Той ішоў па платформе, склаўшы крыжам на грудзях рукі, штосьці гаварыў ім услед.

Мужчына з суседняга купэ развітаўся, пайшоў да сябе. Алесь і Лідзія засталіся адны.

– А што, як па дарозе ніхто не падсядзе да нас? – сказала яна, адкідваючы галаву і агаляючы белыя, бы ў кіназоркі, зубы. – Не будзеш баяцца?

– Баяцца? Чаго?

– А што згвалчу. – Лідзія засмялася. – П’янай бабе мора па калена.

– Паглядзім. – Алесь падняўся, дастаў з сумкі пачак нямецкіх цыгарэт.

– Запалім?

– Можна. – Яна зірнула ў кно. – Ці не дождж пайшоў.

Алесь адхінуў убок фіранку.

Дождж, сапраўды, ішоў, і даволі спорны. Вада раўчукамі сплывала па шыбіне, зліваючыся ў адно, імкліва праставала паўз асфальт да вадаёма – ці то става, ці то азярка.

***Бацька асцярожна апусціў восці ў ваду, паспрабаваў зачапіцца зубцамі за Ліліну вопратку. Гэта яму ўдалося. Цела варухнулася, павольна падалося ўгору. Але як толькі галава з'явілася на паверхні, прадзіраўленая восцямі тканіна з трэскам разышлася па шве, і сястра зноў пачала тануць. Альфон азірнуўся, крыкнуў. З-за пагорка выйшаў гер Пфальц, штосьці гяргечучы па-свойму, рынуўся на дапамогу. Альфон нырнуў у вір, а гер Пфальц, трымаючыся адною рукою за ляшчыніну, другой падсунуў восці зубцамі да курткі тапеліцы. Бацька перахапіў цела далонямі, выштурхнуў разам з восцямі на паверхню. Але было позна. Гер Пфальц спачувальна міргнуў, знік за пагоркам.***

– А ты і крыкса яшчэ, – Лідзія сядзела побач з ім і шкуматала за рукаў кашулі. – Што з табой? Няўжо ўпіўся?

– Нічога, прыснуў, –памалу вяртаючыся да рэальнасці, адказаў ён.

Яна прыхінулася да яго бокам, рэзка абхапіла за шыю, упілася вуснамі ў вусны. Затым адарвалася, не зважаючы на незашчэпленыя дзверы, пачала распранацца.

– Ажыццявіш тут! – сказала, ужо стоячы перад ім зусім голая. – Я пра каардынатара.. пра ягоную прамову ў рэстаране, наконт прынцыпаў вольнай прэсы...

– Ну, калі вельмі пастарацца...

– Ага, глядзі пастараешся! Прыедзеш і будзеш сядзець ціха, каб ніхто і не ўведаў, дзе быў. – Яна дацягнулася рукою да засаўкі, не выключаючы святла, улеглася дагары на Алесеву паліцу. – Хадзі сюды.

7

2000

# ВАЛЕРА

(дзённік)

**3 чэрвеня.** Райтар не з фарсуноў, відаць. І гаворыць складна. Мне пра сястру больш за ўсё спадабалася. І пра забойцу з рамана, што пад мостам хаваўся. Не ведаю, як там напісана, а слухаць цікава. Вось бы пра нас што скрапаў. Пра Кіксу няблага магло б атрымацца. Яго ва ўбікацыі мачанулі. Туды і дарога. Усіх павучаў, а сам новенькіх ціхаю сапай у падсобцы петушыў. Зарэзалі, бы кабана. Я бачыў, праз шчыліну у клазеце. Па вялікай перад тым забег, а тут яго валакуць. Галавой аб падлогу і давай крэмсаць. Я не азваўся. Бо азваўся б, і самому каюк быў бы. Сведкаў не шкадуюць. Райтар, пэўна, пра такія жахі толькі з тэлека ведае. Жыве сабе прыпяваючы ды кніжкі кляпае. Багаты, відаць. А так дзядзька неблагі. Буду выходзіць адсюль – пазваню яму. Можа, з працаю паможа. Тэму якую падкіну, пра таго ж Кіксу. Хутчэй бы ўжо вызваліцца. Народу шмат тут, а пагаварыць няма з кім, гэтак адно аднаму апрыкралі. У спальні трыццаць ложкаў, і ўсе ўсутыч. Справа цела, злева – цела, міжволі сваё ненавідзець пачнеш. У райтара ажно пашчэнкі звяло, як тыя ложкі ўбачыў. Яны з Чаславай у спальню заходзілі паглядзець. Яна ўсё нахвальвала, маўляў, тут так добра, не ў кожнага дома гэтак ёсць. Можа, і так, але турма ёсць турма. Уначы ўсё хадуном ходзіць ад забавак, адно глядзі, каб каханкаю чыёй не зрабіцца.

**20 чэрвеня.** Светка адна была ў кватэры, як заявіўся. Спахмурнела ажно: хочаш не хочаш, а трэба цясніцца. Думаў, гэта адно, аж не. Я ў прыбіральню, а там – кент. Паголены, як і я, гадоў васемнаццаці. І голы. Я на ложак зірнуў, і ўсё ясна стала. Хацеў уляпіць дзявулі, але не паспеў. Брат прыйшоў са школы, і адразу за ім – маці. Нібыта ўзрадавалася. «Баба ў бальніцы, дык ты, Валерачка, з Сашам будзеш у ейным пакоі, а мы Светку да сябе возьмем”. Перахапілі што-нішто. Кармёжка так сабе – як заўсёды, з бабкамі праблема. Бацька ледзь-ледзь зірнуў. Прыцягнуўся п’яны і адразу на

ложак. Суцэльная спальня, а не кватэра. І вокны, як на злосць, усе на паўдзён. Гарачыня, не прадыхнуць, усе паўголыя. Матка пастарэла. Цела адрузлае, у пупырышкі.. Ледзь леглі – бацька прачнуўся, пачалася валтузня. Праз дзверы чувалася. Светка не вытрывала, да нас з Сашкам прыбегла. «Не магу там быць, сорамна!" Цнатліўка! Ці той лох кепска стараўся? Уранку бабе пазванілі ў бальніцу. «Жыць будзе," – сказалі ў ардынатарскай. Матка ажно здранцвела, такое пачуўшы. Выжыве – значыць, лішні рот.

К поўдню бліжэй Каса з Хмылам, датурэмныя дружбакі, прыцягнуліся. Клікалі на шухер – хату адну браць, але я адмовіўся. Улезеш во гэтак і зноў у цюрагу загрыміш. Пашыліся адны.

Надвячоркам у бібліятэку споўзаў. Райтарава кніжка – смеху вартая. Танюсенькая, мі:ж пальцаў губляецца. І лісты не разрэзаныя, нечытаная, відаць. Давялося пальцамі старонкі раздзіраць. Пра жыццё піша, але ўсё больш з вясковага – як бульбу капаюць, статак дагдядаюць. Пра любоў трохі дзе-нідзе пракінецца. Але ў любові слабак, падалося: аб тым, ці цэлка дзеўка, па вачах мяркуе. Шчырыя – значыць нечапаная, і наадварот...

Па дарозе з чытальні пазваніць яму хацеў, але аўтамата спраўнага не знайшоў. Папоўз дадому. Не надта карцела ў той гармідар, але ж начаваць трэба дзесьці. Заўтра з ранку пазваню яму, можа, падсобіць.

**22 чэрвеня.** Зноў райтару пазваніў. Дома быў, захаканы нейкі, як пасля кросу. «Мосі-мосі!»1 Абяцанку выканаў – надыбаў працу. Спаткацца пажадаў. Але не ў кватэры – мусіць, пабаяўся запрасіць, ля крамы сустрэчу прызначыў. Ля крамы дык ля крамы. Крыху не такі здаўся, як тады ў турме. Насцярожаны ўвесь, шчака адна, бы з упуду, таргаецца. Працу ў музеі знаўшоў, за вартаўніка буду. Не ахці што, але і за тое дзякуй. Прэзент яму паднёс: драўляны амулет, што ў турме зрабіў – заместа абярога. Гаварылі нядоўга. Хмыл з Касою перабаразнілі. Выпіць ім карцела, дык трэцяга шукалі. Не пайшоў. А то здарыцца, як першы раз. Прычэпяцца да каго, а ты без дай прычыны вінаваты застанешся. Ды яшчэ здуру ў бойку ўсунешся – п'янаму мора па калена. Я наогул біцца не люблю, ды ў .хаўрусе ўсяляк бывае. І загрыміш. Словам, без мяне пацягнуліся. А я ў музей вырашыў заскочыць.

Так сабе будыніна. У вахцёрскай разява нейкі, да райтара падобны. Можа, сваяк? Сказаў яму, што буду за зменшчыка. Праца,

відаць, няпыльная. З пяці вечара да васьмі раніцы, праз дзень. Заробак мізэрны, ды хоць нешта... У хаце ні баб'я. Матчынага ды бабінай пенсіі на два тыдні ледзь хапае. Дык хоць на кішэнныя расходы будзе. Усё-такі добра зрабіў, што з райтарам пазнаёміўся.

**1 ліпеня.** Другі тыдзень пайшоў, як дзяжуру. Праца няцяжкая, але нудота. Трынаццаць гадзін на адным месцы, і ні выйсці, сядзіш, бы прывязаны. Тэлефона таксама няма. Удзень ёсць, а к ночы знікае некуды. Ці не сумысля хаваюць. На выпадак чаго – сігнальная кнопка пад сталом. Ды хто тут пакваліцца на рыззё гэтае?

Зменшчык мой, сапраўды, сваяк райтараў – сынок. У інстытуце вучыцца на інжынера. Мы з ім не бачымся амаль, толькі па выхадных, калі і ўдзень дзяжурым. Ды яшчэ калі змены якія ў графіку. У яго то лекцыя, то семінар, вось тады і даводзіцца ламаць расклад. Хлапчанё лахаватае, папраўдзе, ён і расказаў няўзнак. Сястры няма, аказавецца, у райтара. Сядзела адна сваячка, але цётка. Пару мяхоў жыта ў калгасе сцібрыла, далі два гады. Але не турмы, а зоны ўсяго. Так што нахлусіў райтар. Ды халера з ім. Можа, папікну калі пры выпадку, а можа і не буду. Мне цяпер іншае ў галаве – утрымацца як-небудзь. А гэта ох няпроста. Хмыл з Касою дастаюць. Травою прыгандлёўваюць, дык хаўруснік ім патрэбен. З райтарам няблага б параіцца, але небяспечна. Гвалт уздыме, і нажывеш ворагаў. Ды і веры яму дай! Вунь як з сястрою аб'ягорыў. Не ўжо, лепш сваім розумам...

**8 ліпеня.** Ён на падлозе курчыўся, калі я прыйшоў. Галава ў крыві, з роту – свіст адно. Я адразу не здагадаўся, чыя работа, і толькі пасля, успомніўшы, што якраз у гэты час павінны былі прыйсці Хмыл з Касою, дапетрыў. Мы сустрэцца ля музея дамаўляліся, а тут нечакана дзяжурствам давялося мяняцца, і я забыўся іх папярэдзіць. Не ведаю, як яно ўсё было, але разумнік ледзьве дыхаў. Пазваніць хацеў у міліцыю – телефона няма. У бліжэйшую краму пабег, там дазволілі, пазваніў. Мянты прыехалі, за імі адразу «хуткая". Слаўку павезлі ў бальніцу, а мяне – дапытваць, як ды што. А што я меў сказаць? Можа, яны, Хмыл і Каса, а можа іншы хто? Змаўчаў. На дзяжурстве ні хвіліны не паспаў. А ўранку, ледзь у кватэру ўваліўся – званок. Ажно Каса. Так і так, маўляў, ведаеш усё? Ну, дык вось, маўчы, а то блага не здасца. Куда ты дзенешся – паабяцаў маўчаць. Дзень месца сабе не знаходзіў. А ўвечары зноў на дзяжурства, – у ягоную, Слаўкаву, змену.

Сяджу, думаю. Тут стук у дзверы. Адчыняю – райтар. Белы, нібы смерць сама. Убачыў яго і сам не ведаю, як словы з языка пакаціліся. Усё расказаў, што ад Касы ўведаў. Яшчэ і адрас даў, так, на ўсялякі выпадак. Калі ўжо заяўляць, падумаў, дык няхай ён сам зробіць. Цяпер во сяджу і думаю, чым скончыцца. Не нарабіў бы райтар чаго. Надта ўзрушаны ён быў. Пагляд як у непрытомнага, а кулакі... Так хутка пабег з музея, што я і развітацца не паспеў. Хоць бы не нарабіў чаго здуру. Заўтра раненька пазваніць, даведацца.

## 9

## 2000

# ПОМСТА

Перапоўнены аўтобус сунуўся так марудна, што, здавалася, вось-вось спыніцца наогул. Але гэта была яшчэ не апошняя непрыемнасць. На рагу Камсамольскай і Даватара рух зусім аказаўся спынены з-за нейкае аварыі.

Алесь выскачыў на запруджаны людзьмі ходнік, зірнуў на гадзіннік. Была палова шостай. Да бальніцы заставаліся два прыпынкі, але калі ісці пехатой напрасткі праз парк, можна скараціць шлях амаль удвая. Праўда, у лагчачку пасля дажджу, пэўна, вельмі гразка, ды што зробіш?

Ён збочыў улева, абмінуўшы з паўдзесятка шапікаў, спусціўся ўніз. І як толькі падняўся зноў на абсаджаны таполямі пагорак, убачыў здалёк доўгі, як калгасны свіран, корпус бальніцы. Ён прыспешыў хаду, не зважаючы на бруд пад нагамі, борзда пакрочыў да яго.

Сынава палата знаходзілася ў канцы калідора.

– Як ён?

Немаладая дзяжурная няпэўна пацiснула плячыма.

– Не ведаю, папытайцеся ў доктара.

Славік, безуладны, белы, ляжаў на ложку і глядзеў у столь пустымі адчужанымі вачыма. Побач на табурэце сядзела Марына.

– Тры нажавыя раненні, рука паваманая, – сказала з дакорам, быццам ён, Алесь, ва ўсім вінаваты. – Трэба быво табе звязвацца з гэтым рэцыдывістам.

Уваччу ў Алеся пацямнела.

– Дык гэта Валерава работа?

– Калі і не ягоная, дык без ягонага ўдзеву не абышвося. – Марына гучна ўсхліпнула. – Я добра чува, як сказаў апрытомнеўшы: Каса, Хмыў... Шчасце, што ў смерць не збілі. Вось твае выбрыкі, вечна раднішся невядома з кім. – Яна яшчэ нешта хацела сказаць, але ў пакой увайшоў доктар.

– Будзем рабіць пераліванне, – сказаў, пасоўваючы бліжэй да ложка кропельніцу. – Выйдзіце, калі ласка.

– Я нікуды не пайду! – запярэчыла Марына.

– Як хочаце. – Доктар паблажліва махнуў рукою.

Алесь памкнуўся да яго, каб распытаць пра сынаў стан больш падрабязна, але той, робячы выгляд, што вельмі заняты, незадаволена матлянуў галавою.

– Пагутарым, як міне крызіс, – сказаў коратка і падаў сястры знак, каб пачынала пераліванне.

– Крызіс? – Алесь на хвіліну быццам аслупянеў. Затым выскачыў з палаты ў калідор, не бачачы нічога перад сабою адчыніў уваходныя дзверы, выбег на двор.

Ён убачыў іх здалёк. Хлопцы прайшлі паўз сквер, раз-пораз агалошваючы наваколле брыдкаслоўем, пабрылі да свайго дома. Каса жыў у першым пад'ездзе, Хмыл у апошнім. Гэта Алесь ведаў дакладна – нездарма ж амаль суткі высочваў, падчэкваючы ў альтанцы. І цяпер чакаў ля апошняга з надзеяй, што другі не надумаецца праводзіць сябрука да дзвярэй. Дваім, хай сабе яны і нападпітку, як ні круці, наўрад дасі рады.

Сынавы крыўдзіцелі базарылі ў двары нядоўга, хвілін пяць. Затым развіталіся, і Хмыл пацягнуўся дахаты.

Алесь, трымаючы напагатове манціроўку, хіснуўся ў паўзмрок драўлянай, шчыльна абсаджанай язмінам альтанкі. Дома ён крыху выпіў дзеля смеласці, але галава была свежая, таму адчуваў сябе даволі ўпэўнена. Вось толькі як завабіць Хмыла ў альтанку?

Апошняе аказалася нескладана. Хмыл убачыў у альтанцы чалавека, тут жа папрасіў прыпаліць. Алесь левою рукой тыцнуў хлопцу пад нос газнічку, праваю выцяў манціроўкай па галаве. Хмыл асеў на падлогу, але тут жа зноў падняўся. Відаць, удар з-за таго, што была занятая адна рука, аказаўся недастаткова моцным. Як на тое, у акне

насупраць успыхнула святло. Стараючыся не зважаць на яго, Алесь падняў манціроўку другі раз і штосілы ўдарыў ёю Хмыла па цемені.

У ванным пакоі ён прабыў амаль гадзіну. Спачатку доўга шараваў рукі з мылам, затым зняў адзенне – паглядзець, ці не засталася дзе-небудзь кроў. Крыві не было. Гэта крыху супакоіла Алеся, але ненадоўга. Цяжар учыненага самасуду быў занадта гнятлівы, папраўдзе, ён такога і не чакаў. Надзіва, найбольш вярэдзіла душу лёгкасць, з якой усё здарылася.

А першай уначы пазваніла Марына. Яна толькі што з бальніцы, Слаўку вельмі кепска, дык ці не жадае ён заўтра наведаць сына?

– Канечне, – з цяжкасцю улоўліваючы сэнс жончыных слоў, адказаў ён, і, праглынуўшы некалькі таблетак клафеліну, кульнуўся на ложак.

***Ён мэкнуў раз, другі – Альфона не было. Восці, мокрыя, з ашмёткамі ціны на зубцах, стаялі воддаль прыслоненыя да куста. Алік схапіў іх за цёплае яшчэ ад бацькавых рук цаўё, апусціў шчупаку на галаву. Той страпянуўся, перавярнуўся на бруха, пачаў асядаць на дно. Але тут жа ўзмыў угору, рассякаючы пашчаю хвалі, паплыў да берага. Алік зноў падняў восці, штосілы выцяў рыбіну па хрыбціне. Шчупак закрычаў, захлынаючыся крывёю, знік у каламуці.***

Нехта званіў у дзверы – працягла, настойліва. Алесь падхапіўся з ложка, не апранаючыся, выбег у прыхожую.

– Хто там?

– Адчыніце. – Голас быў знаёмы. – Гэта Валера.

Алесь адшчапіў засаўку.

– Вам трэба хавацца, – ледзь ступіўшы ў прыхожую, сказаў Валера. – Едзьце куды-небудзь.

– Ехаць? Куды?

– Куды заўгодна. – Валера азірнуўся. – Абы падалей, – сказаў і выбег назад на пляцоўку. – Гэта ўсё.

– Але мне няма куды дзець сабаку, – зрываючыся на крык, гукнуў наўздагон хлопцу Алесь.

Дзверы звіbравалі, парыпваючы заржавелымі завесамі, павольна зачыніліся.

# 10

# 2000

# СВАЕ

Матка выйшла на панадворак, бокам (пасля інсульту яна кепска валодала леваю рукой) пасунулася да паветкі карміць курэй. Высыпала з гарнушка зерне, пастаяла хвіліну-другую ля загародкі, пайшла назад, да хаты. Не паспела яна ўскараскацца на высакаваты ганак, як з сяней выйшаў Альфон. Прапусціў жонку у праём дзвярэй, счакаўшы хвіліну, падаўся следам за ёю.

Гэтае іх маўклівае – без адзінага слова – сноўданне з хаты ў хату Алеся заўсёды і смяшыла, і азадачвала. Калі быў маладзейшы – часцей смяшыла, нагадваючы нейкую дзіцячую гульню. Зараз, калі пасталеў і сам стаў бацькам, усё больш наводзіла на сур’ёзныя думкі. У ягоных з Марынаю адносінах і блізка ніколі не было такой знітаванасці. Якраз наадварот. Няшчасце, праўда, нібыта крыху аб’яднала, ды ці надоўга-то?

З-за хлява, ад ракі пачулася авечае бляянне. Бацька высунуў главу ў расчыненае акно, пыхкаючы папяросінай, трывожна прыслухаўся да яго. Затым пстрыкнуў папяросу ў гарод, знік у пакоі.

Праз колькі хвілін дзверы зноў расчыніліся – на гэты раз рэзка, імкліва. Але выйшаў не бацька, а, як і першы раз, маці. Яна борзда, колькі дазваляла хворая нага, сышла з ганка, пашыбавала да ракі. Не паспела яна схавацца за кустоўем, як і бацька выйшаў. Пастаяў крыху на панадворку, падаўся следам за старой.

Альфон, смешна падскокваючы, шкандыбаў да хаты і ўголас сам з сабою размаўляў. Па ягоным усхваляваным, заклапочаным твары нават здалёк можна было здагадацца: нешта здарылася.

У хаце стары быў нядоўга. Неўзабаве ён зноў выйшаў на панадворак, зняў з падстрэшка палазкі, паныла паплёўся да ракі. Нягледзячы на спёку, ён быў у ботах, з левага, аттупырваючы халяву, вытыркалася ручка нажа.

Хвілін пятнаццаць было ціха. Нарэшце абое, бацька і маці, паказаліся з-за пагорка. Спачатку матчына галава загайдалася ў мроіве па-над пожняй, затым – бацькава. Потым сталі бачныя і палазкі. На іх ляжала, адкінуўшы назад галаву, чорная авечка. За санкамі крывавіў, прымінаючы долу траву, нешырокі чырвоны след.

Яны падвешалі авечку на перакладзіну, і Альфон дзе з дапамогаю нажа, а дзе проста кулакамі пачаў спускаць скуру ўніз, да шыі. Яна ішла лёгка і неўзабаве ляжала, пераліваючыся ільсніста-парцалянавым ісподам, на траве. Бацька разрэзаў брушыну,ываліў вантробы ў падстаўленую мядніцу. Глена тут жа, на месцы, узялася іх разбіраць.

– Сытая, халерая, вунь колькі тлушчу.

– Ага. – Матка аддзяліла спажыўнае ад непатрэбнага, выплюхнула апошняе пад куст. – Схадзіць Аліку пазваніць, хай бы прыехаў забраў.

Старыя адначасова прыўсталі, не гледзячы адно на аднаго, працягвалі аб нечым размаўляць.

Алесь выйшаў з беразняку, пайшоў пожняю да іх.

І тут жа спыніўся.

Слоў было ажно зашмат, але ён баяўся іх.

Ён развярнуўся, хаваючыся па-за хмызам, таропка папраставаў да ракі.

***Вада ўспенілася, нібыта імкнучыся выштурхнуць ахвяру на бераг, дробнымі хвалямі раскацілася ўбакі. Блакітны балоневы плашчык мячыкам надзьмуўся ў Ліны на жываце. Але як толькі яна схапіла яго аберуч, тут жа зноў ператварыўся ў слізкую анучыну. Ліна адчайна забіла рукамі па вадзе. Да часу прыхопленая непрамакальнаю тканінай вада, вызваліўшыся з палону, ручаём хлынула ёй на твар. Дзве хвалі, не жадаючы больш разлучацца, скаціліся ў адну, самкнуліся над целам.***

Ён выйшаў з вагона, хаваючы твар у каўнер плашча, падаўся да будынка вакзала.

Ля тэлефонаў побач з прыгараднай касай было цемнавата. Ён дастаў картку, углядаючыся ў лічбы дыска, набраў нумар.

– Свавіку лепш. – Марына гаварыла хутка, але без звыклай злаславасці. – Можа, праз тыдзень выпішуць. Зэка забралі.

– Якога зэка?

– Твайго. – Яна хвіліну памаўчала. – Што ў музеі рабіў. Дзе ты быў?

– У сваіх.

– Няпраўда, матка ўчора званіва, прасіва прыехаць па мяса. Авечку зарэзалі. Паедзеш ці не?

– Як-небудзь пасля, – адказаў ён, не развітваючыся, выняў картку з аўтамата.

Сыну палепшала, і гэта было для яго зараз самае галоўнае.

## 11
## 2000

# РОЎНЫЯ

– Адчыніце, следчы пракуратуры. – Голас за дзвярыма гучаў спакойна, але рэзка.

– Зараз. – Алесь адшчапіў засаўку.

– Вы Аляксандр Альфонсавіч Леўчык?

– Я.

– Я следчы раённай пракуратуры Асокін. – Вусаты мужчына ў цывільным тыцнуў Алесю пад нос пасведчанне і яшчэ нейкую паперу. – Вось дазвол на вобыск.

Трое мужчын і з імі паняты, Алесеў сусед па мянушцы Карпач, разбрыліся па пакоях.

Першы выйшаў той, што корпаўся ў спальні.

– Было ў кішэні курткі, – сказаў, трымаючы за рог акрываўленую насоўку.

Алесь успомніў, як, вяртаючыся ўначы ад альтанкі, трымаў акрываўленую руку ў кішэні, і пахаладзеў ад страху.

– Ваша?

– Мая.

– Чаму ў крыві?

Алесь моўчкі зірнуў на насоўку, і яго ледзь не званітавала.
– А жалязяка дзе?
– Закінуў у хмыз ля чыгункі.
– Пакажаце, дзе.
– Пакажу, – адказаў Алесь і падаўся ў суправаджэнні аднаго з прышлых у спальню апранацца.

Допыт у пракуратуры доўжыўся каля гадзіны. І, надзіва, адчування гнятлівасці не пакінуў. Сур'ёзны пажылы следчы паводзіў сябе ветліва, але галоўнае было тое, што з першых жа ягоных рэплік Алесь здагадаўся: Хмыл жывы. Гэта была добрая навіна, ва ўсялякім разе яна пазбаўляла неабходнасці лгаць.
– Як вы вылічылі мяне?
– А то вы не ведаеце, – суха сказаў следчы. – Затым нахіліўся да самага Алесевага твару, насмешліва паўтарыў: – Не?
Ён дастаў з шуфлядкі стала загорнуты ў цэлафаніну прадмет, паклаў яго на стол.
– Ваша рэч? – Гэта быў абярог – той самы, падораны Валерам! З трыма цёмнымі рыскамі на рабрыне і Алесевымі ініцыяламі.
Чаго-чаго, а гэтага ён не чакаў.
– Мая, – прызнаўся. – Як яна трапіла да вас?
– Вельмі проста. Вы згубілі яе на месцы злачынства, і нам толькі заставалася падняць. –
– Але ж людзей з такімі ініцыяламі нямала ў горадзе.
Следчы засмяяўся.
– З такімі нямала, праўда, – сказаў, кладучы амулет назад у шуфлядку. – Але ж мы на тое і пракуратура, каб знаходзіць патрэбную асобу. Дарэчы, я чуў, вы кніжкі пішаце. Гэта праўда?
– Праўда, дэтэктывы.
– Нябось, закручваеце сюжэты?
– Даводзіцца.
– Вось, а ў жыцці такое робіце...прымітыўнае. Манціроўкай па галаве... Маглі б і больш вытанчанае што прыдумаць. Маеце якія-небудзь пажаданні?
– Калі можна, хацеў бы папрасіць, каб дазволілі перадаць аловак і паперы для працы.
– Калі ласка. – Следчы паблажліва махнуў рукой. Маўляў, пішыце на здароўе, карысці з яе, вашай пісаніны.

Хмыл, сапраўды, выжыў. Адрабіўся страсеннем і зараз знаходзіўся ў бальніцы. Навіну прынесла Часлава. Сядзелі ў пакоі для спатканняў, размаўлялі пра розныя дробязі. Неўпрыкмет гаворка зайшла пра Алесева выступленне ў турме. – Ты дарэмна сказаў тады пра сястру, – папікнула Часлава. – Я ж казала: у турме свае законы, падману там... тут не даруюць.

– Пра падман ніхто, апроч нас з табой, не ведаў, – запярэчыў Алесь.

– Не? А Славік?

– Прычым тут Славік?

– Прытым... Валера спытаў у яго, а ён і прагаварыўся, што ні родных, ні тым больш стрыечных сясцёр у цябе няма.

– Значыць, гэта ён падгаварыў збіць Славіка?

– Няпраўда. Рашэнне адпомсціць прыйшло яму ў галаў, відаць, ужо пасля бойкі.

– Адкуль ты ўсё ведаеш?

– Я пагаварыла з Валерам. Знарок хадзіла дзеля гэтага да яго ў музей, і ён прызнаўся. Думаю, яму таксама свеціць сёе-тое нядобрае...

– Вось яно што. Тады ўсё правільна.

– Правільна? – Часлава здзіўлена ўскінула ўгору тонкія, злёгку падфарбаваныя вусны. – Што правільна?

– Усё, што адбылося, – адказаў ён і, похапкам развітаўшыся, бо канваір ужо двойчы падаваў знак, што спатканне скончана, пайшоў з пакоя.

***Цела гайданулася, схавалася пад вадой. Алік схапіў восці, апусціў іх цаўём у глыб віра. Дзве рукі вытыркнуліся з прадоння, упіліся пальцамі ў намоклую прыладу. Алік паспрабаваў падцягнуць восці да берага, але не здолеў, не хапіла сіл. Тады ён упёрся нагамі ў глыж, трымаючыся адною рукою за камель ляшчыніны, другой пачаў павольна, каб не параніць тапельца, падкіроўваць восці да водмелі. Паголеная галава выплыла на паверхню, рукі, якія дагэтуль адно трымаліся за цаўё, нечакана ірванулі яго да сябе – так моцна, што Алік стоць галавой паляцеў у вір. Глыж, перакуліўшыся колькі разоў у паветры, упаў пасярод віра побач з ім, дробнымі аскепкамі завіс у вадзе.***

У калідоры канваіры памяняліся. Таго, што вёў Алеся, некуды паклікалі, на яго месца стаў Сідаравіч, значна старэйшы,

перадпенсійнага веку чалавек. Ён хадзіў вельмі павольна, таму, пакуль сунуліся да камеры, Алесь нямала чаго паспеў перадумаць.

Размова з Чаславай калі не развеяла ягоных сумненняў, дык шмат што праясніла. Вось як, аказваецца, адгукнулася яму тая, па сутнасці, бяскрыўдная хітрасць падчас выступлення ў турме! Слова вярнулася і бумерангам ударыла па галаве. Што ж, мабыць, рана ці позна тое павінна было здарыцца. Неруш-слова толькі ўдае абыякавым да падману, на самой жа справе... Ён, Алесь, гэтак шмат разоў злоўжываў ім пасля таго, як перастаў быць нямком, што і не злічыць тых выпадкаў. Дадзена было, а як распарадзіўся? Ды, як кажуць, колькі вяровачцы ні віцца...

Хутка суд, знаёмыя, калегі прыйдуць паглядзець, паслухаць. Будуць, хто больш, хто менш шчыра, казаць словы падтрымкі, шкадавання. А ён, робячы выгляд, быццам удзячны за тое, – запэўніваць, што яму вельмі прыемна. І схлусіць чарговы раз. Але гэта ўжо не будзе тая, ранейшая хлусня. Сутнасць слова дарэшты адкрылася яму, і яна мацнейшая за любую, нават самую высакародную, няпраўду.

Ля камеры на хвіліну прыпыніліся. І ў гэты момант нехта ўвайшоў у калідор з супрацьлеглага боку, ад прыёмніка.

Алесь азірнуўся.

Чалавек, што ішоў паперадзе таго, другога канваіра, здаўся яму знаёмым.

Валера? Не можа быць!

Але калі тыя двое падышлі зусім блізка і ўжо збіраліся завярнуць у правы, перпендыкулярны да Алесевага, калідор, сумненні зніклі.

Гэта быў, сапраўды, Валера. Ён на хвіліну спыніўся, не адводзячы позірку, падняў руку ў знак прывітання.

Фамільярнасць ягонага жэсту не здалася Алесю крыўднай: зараз яны былі роўныя.

Ён саступіў убок, трымаючыся рукой за дзверыеу камеры, набраў у лёгкія паболей паветра. Усё-ткі ён скажа, мусіць сказаць...

У горле булькнула, слова-здань, не нарадзіўшыся, прывідна стаяла воблачкам пары ў паўзмроку калідора.

Голасу не было.

12

2000

# ПОЛЬЦЯ

## (з магнітафоннага запісу студэнта-філолага В. Марозькі)

*А што ж, ня дзіва! Вун адна нядаўна адчыніла ў суседняй дзярэўні – на трэція суткі нашлі, нежывую. Вочы залієць каторы і пашоў сабе рысаваць. Во й сядзім пазачыняўшыся. Цяперака страшна. Мала каму, а й вучоным няма веры. Нашай колішняй бібліятэкаркі Марынкі мужыка ўзяць... Чалавек як чалавек, здаецца, быў, а во наробіў дзялоў, сядзіць.*

*Бываець, і сам каторы сабе зробіць. У нас было, з гары п’яная гакнула, маей сваячкі дачушка. Ні з таго ні з сяго. На загадчыцу па культуры, Наталлю Сяргееўну, брахалі, бытта падпаіла нечым. І праўда, нешта былі нашоўшы ў бруху, а посля ўсё заціхла. Тэй, што сядзіць, Алесь, прыязджаў распытваць, і тожа нічым кончылася. Я відзела, як Натка падлівала, але змаўчала. Цяперака так: сядзі ціха і маўчы.*

*Паліцікуюць усе. У гарадох, кажуць, дужа агіціраваюць. А ў нас дык няма каму. Толік Старынскіх са сваей Люсяй пакаламуцяць, на тым і канец. А што агіціраваць! Як ёсці, так і добра. Бяз хлеба не сядзім. Сягоння во лаўка, вазьму крамнага.*

*Саду шкода, ябланы гібеюць. За зіму дзве паваліліся. Стары сад, нікчэмны. Панадрэччу догі гэты, ці як іх, апышкала, прынясла во, пасадзіла. Дык ягадзіна будзець. Па суседстве ў дзярэўні пітомнік, ці як яго там, зробілі, догі тэж гадуюць. Для бальшых людзей нібыта. Кажуць, каторы не прыедзець, не пад’есць ягад – начальнікам не паставяць. Во і лётаюць навыперадкі. Нас – не, не пушчаюць. Нічога, старому ці многа надабя?*

*Есці ані ня хочацца, праз сілу пхаеш. Але неяк будзець. Абы не банбілі. Вун праз радзіва чула, як у Ягаславіі, банбіць будуць. Страхаццё! Чарнобыль і тэй не так страшны. Так во, дзяцёнак. Хадзі, канпоту дам. Зрання зварыла, астыў ужо. Ну, пі.*

*Наш, дзякаваць Богу, глядзіць. Кажан дзень у целявізары, камандаваець. Гэнан знёмшчык блаж быў. Ранняк, ці як яго... Во тока-тока зрушыцца дзела, а ён наўпроць. Цяперака ў Амэрыцы бытта, дык пацішэла. Данягож, як ціха, дык і добра.*

*З драўмі цяжка. Даўней Юзючок прыйдзець нашчапаець за поліўку. Цяперака некаму. Гарадскія ня хочуць. У мяне яшчэ з залеташніх троху асталося. А як спалю, не знаю, што будзець. Хош сама заместа палена кладзіся.*

*Пі, дзяцёнак, пі. ягады добрыя. Ага, з дзерава.*

*Вучоным добра быць – у чыстым, у цёплым. Мой ня дужа меў ахвоту да навукі. Шоферам робіць у горадзе. Кажу і кажу, а ты каб слова. Посля? Ну, добра... Січас кіно будзець, дык уключу. Навіны якраз. Гэта жарналістка наравіцца мне. Красівая і надзяваецца добра. Спраўная дзеўка – вывучылася, інцелігентная, цэлы б дзень яе слухала. Во і кіно...*

www.kamunikat.org

# БОТЫ СІНЬЁРА ПАСКУАЛІНІ

Ужо мінулі некалькі калідораў, а канца сутарэнню не было бачна. Ад аднастайных, падобных да нораў пахавальных камер стракацела ў вачах, а ўсё новыя і новыя выплывалі з цямрэчы насустрач вандроўнікам. Экскурсавод, малады прыгожы ксёндз-францысканец, ідучы паперадзе, раз-пораз спыняўся ля чарговага саркафага з надпісам, папярэджваў, каб апошнія не адбіваліся ад групы: у дваццацікіламетровым, пракапаным у чатыры паверхі падземным могільніку лёгка заблудзіцца.

Элен, якая затрымалася на хвіліну ля адной з ніш, хуценька дагнала астатніх, пакрочыла побач з Паўлам.

– Вам не страшна тут? У мяне, прызнацца, ажно ворах па спіне, – сказала, узіраючыся ў постаці экскурсантаў, і занепакоена дадала: – А дзе ж мама?

– Пэўна, дзе-небудзь наперадзе, – неахвотна адказаў Павел. Ён ніколі не бачыў катакомбаў, таму ўсё, што адцягвала ўвагу ад незвычайнага відовішча, яго раздражняла. І Элен, якая, папраўдзе, ад першага дня яму падабалася, не з’яўлялася выключэннем.

Раптам крык прарэзаў цішыню. Ён быў тут, на гэтым бясконцым урачыстым могільніку, так недарэчы, што ўсе здрыгануліся ад нечаканасці. На крык чалавека, які заблудзіўся і гэткім чынам гукае на дапамогу, ён быў непадобны, і гэта толькі дадавала яму вусцішнасці.

– Мама! – Элен з выразам жаху на твары кінулася ў глыб калідора.

Ванда Кіслеўскі ляжала ў лабірынце недалёка ад крыпты Цэцыліі1, нібы баронячыся ад некага нябачнага, сутаргава грабала рукамі па сцяне. Вочы яе былі шырока раскрытыя, твар белы, як вата. Элен штосьці ціха сказала, паднесла да носа маці флакончык з нашатыром.

Экскурсанты навыперадкі кінуліся ёй дапамагаць, але яна жэстам спыніла іх.

– Не трэба нічога. Звычайны прыступ клаустрафобіі, зараз пройдзе.

Сапраўды, праз некалькі хвілін жанчына ачуняла. І ўжо да канца экскурсіі не адыходзілася ад дачкі і Паўла.

Калі праз паўтары гадзіны вярнуліся ў гатэль, непрыемнасць была так трывала забытая, што пра яе нават не ўспаміналі. Пані Ванда, жыццярадасная і гаманкая, выскачыла следам за моладдзю, падышла да Паўла.

– Ну, як вам сённяшняя вандроўка? – спытала ўсміхаючыся. – Зноў не спадабалася?

– Наадварот, спадабалася, – адказаў ён. – Нават вельмі.

– Вось, а я вам што казала. Такі горад, як Рым, похапкам не спазнаеш. Яго паступова трэба ў сябе ўбіраць, крок за крокам.

Жанчына паправіла рукою ззаду рэмень плецака, хутка пайшла дарожкаю да будынка. Яе блакітная кофта неўзабаве знікла з абсягу.

– Як горача! – расшпільваючы на грудзях чарговы, ці не перадапошні гузік кашулі, звярнуўся Павел да Элен. – У Чыкага гэтаксама спякотна?

– Не так, як тут. Але там гарачыня цяжэй пераносіцца, бо зашмат усюды шкла і бетону. Рым у параўнанні з некаторымі амерыканскімі гарадамі – аазіс. А ў вас як?

– У нас? – Павел сумеўся: як сказаць пра сваё, ды яшчэ чалавеку, які хутчэй за ўсё і ўяўлення не мае аб тым, пра што пытаецца. – У нас... добра. Я маю на ўвазе – клімат лагодны... А вы малайчына, гэтак рашуча паводзілі сябе ў катакомбах!

– І нічога звышнатуральнага! Я змалку ведаю пра маміну хваробу, так што мела час прызвычаіцца... Яна займела гэтае паскудства ў Асвенціме, пасля таго, як некалькі сутак прабыла ў адзіночнай камеры. І не дзіва. Уявіце: келля – ледзь стаць і то сагнуўшыся. А ёй шаснаццаць усяго.

На дзядзінцы юнак і дзяўчына, студэнты з Канады, абое таўставатыя, у аднолькавых майках з надпісам «Roma» гулялі ў бадмінтон. Элен падышла да іх, сказала нешта па-англійску. Маладыя людзі перапынілі гульню, з выразам ці то страху, ці то грэблівасці на тварах пачалі штосьці гаварыць дзяўчыне ў адказ.

– Заўтра маецца прыехаць з Таронта іх куратарка. Кажуць, вельмі злая кабеціна, – вяртаючыся да Паўла, патлумачыла Элен. – Дык выдумляюць, як ад яе пазбавіцца. Зрэшты, гэта не нашы праблемы. Раскажыце, як вы трапілі ў Рым? Купілі пуцёўку?

– Не. Я выйграў конкурс на лепшае... – ён на хвіліну прыпыніўся, падшукваючы адпаведнае польскае слова, – на лепшае асвятленне каталіцкага жыцця ў адным часопісе. Так што гэтае падарожжа – прэмія.

– Дык вы журналіст?

– Гісторык. Гісторык, які зрэдку займаецца журналістыкай. А наогул я працую ў тэхнікуме. Гэта такая спецыяльная сярэдняя ўстанова.

– Я, на жаль, нічога не ведаю пра вашу краіну, – зноў вяртаючыся да перарванай тэмы, сказала Элен. – Хоць маці мая, як вы, пэўна, здагадаліся самі па прозвішчы, паходзіць з суседняй Польшчы. Там яна жыла, пакуль не трапіла ў сорак трэцім у лагер. Пасля вайны яна нанялася за няньку ў адну амерыканскую сям'ю ў Чыкага. У Чыкага выйшла замуж і засталася назаўсёды. Там і я нарадзілася. Дарэчы, пра Польшчу я, хоць польскую мову і няблага, як бачыце, засвоіла, таксама няшмат ведаю – галоўным чынам з маміных апавядаў. Можа, калі збяруся з'ездзіць туды, паглядзець, як там жывуць людзі. Між іншым, айчым мой (ён памёр у пазамінулым годзе), як і вы, займаўся журналістыкай.

Ён прачнуўся ад адчування прахалоды ў нагах. Сонца было ўжо даволі высока, і па пакоі ваўсю мітусіліся сонечныя прамяні. За акном, не варушачыся, варажылі нешта сваё сосны, водар руж і магнолій раз-пораз урываўся ў памяшканне праз расчыненае акно. Нават паверыць спрасоння было цяжка, што побач – агромністы горад.

Павел падхапіўся з ложка, выглянуў на балкон. І адразу ж убачыў на лаве ў альтанцы Ванду Кіслеўскі. Жанчына сядзела, абхапіўшы аберуч калена, і аб нечым засяроджана думала. Яе ценькая для кабеты гэткага ўзросту пастава на фоне абрасялага гонкага бамбуку, які рос наўкола альтанкі, здавалася адзінокай і невыказна самотнай. Павел успомніў учарашняе здарэнне ў катакомбах Калікста, і пачуццё жалю да жанчыны агарнула яго. Ён ужо хацеў аклікнуць яе, каб павітацца, але не паспеў. На дзядзінец уз'ехала таксі, затармазіўшы, спынілася збоч летняга кафэ-тэрасы.

З машыны вылезла невысокага росту жанчына ў доўгай сукенцы, няўклюдна хілячыся тулавам набок, моўчкі застыла ля багажніка. Другі пасажыр, самавіты мужчына ў шэрым капелюшы, тым часам разлічыўся з таксістам. Затым яны абое: і вадзіцель, і пасажыр – таксама вылезлі з салона, падышлі да жанчыны. Пастава кабеты, хоць цяпер яна і старалася стаяць роўна, па-ранейшаму заставалася схіленай – выдавала нейкае калецтва. Мужчына штосьці напаўголаса сказаў ёй, затым дастаў з багажніка два новенькія чамаданы, павольна пакрочыў дарожкаю да дзвярэй гатэля. Аднак не паспелі ён і жанчына параўняцца з альтанкаю, як Ванда Кіслеўскі падхапілася з месца, з гучным воклічам кінулася ім насустрач.

– Фані! – гэта было адзінае, што зразумеў па-англійску Павел.

Жанчыны абняліся, пацалаваліся. І хоць прыезджая выглядала на дзесятак гадоў маладзей за тую, якая толькі што назвала яе па імені, не паверыць, што яны не сяброўкі, было немагчыма.

Мужчына ўвесь гэты час, пакуль яны вылівалі эмоцыі, цярпліва стаяў ўбаку. Затым падышоў да Ванды, схіліў галаву ў паўпаклоне.

– Радая з вамі пазнаёміцца, – сказала тая па-польску і тут жа, спахапіўшыся, штосьці дадала па-англійску.

– Не турбуйцеся, я добра ведаю польскую мову, – сказаў ён стрымана і падаў руку. – Тэд Рэйнальдс.

Ён хацеў яшчэ нешта сказаць, але не паспеў. На двор высыпала з гатэля купка студэнтаў, весела перагаворваючыся, накіравалася да альтанкі. Убачыўшы прыезджых, маладыя людзі вокамгненна змоўклі, разгублена заазіраліся па баках. І толькі праз колькі часу, крыху апамятаўшыся, відаць, ад спалоху, пачалі нясмела падыходзіць да жанчыны, каб прывітацца. «І сапраўды, баяцца яны яе, – здагадваючыся, што гэта, мусіць, і ёсць тая куратарка, пра якую казала напярэдадні Элен, падумаў Павел. – Хоць што ў ёй, апроч калецтва, незвычайнага?»

Калі ён праз пятнаццаць хвілін спусціўся ўніз, народу ў кафэ было няшмат. Але есці ніхто не браўся, чакалі пачатку сумеснае малітвы. Як правіла, яна кожны дзень прамаўлялася на іншай мове – па-англійску, па-польску, на лаціне. Павел адчуваў, што неўзабаве дойдзе і да яго чарга казаць па-беларуску, і крыху хваляваўся: барані Бог зробіць што не так! Яшчэ ён хваляваўся і таму, што ўвесь час свайго побыту тут, за мяжою, адчуваў у адносінах да сябе нейкую насцярожанасць уперамешку з цікаўнасцю. Дык як успрымуць ягонае

казанне? Дома, на Беларусі, ён наведваўся ў касцёл не так часта і прыкладным каталіком не быў. Ва ўсялякім разе малітвы перад ежаю не прамаўляў. Але зараз гэтага вымагалі абставіны, і ён з задавальненнем ім падпарадкаваўся.

Ксёндз Вацлаў, паляк з паходжання, які ўвесь гэты час апекаваўся групаю, нарэшце дзынкнуў лыжкаю аб графін, просячы цішыні.

– Dzisiaj modlmy sie po bialorusku, – сказаў, дакранаючыся да Паўлавага пляча. – Prosze pana1.

Павел устаў з-за стала, пераадольваючы хваляванне, сказаў першыя словы.

Усё атрымалася вельмі добра.

– Маеце цудоўную дыкцыю, – калі ён скончыў гаварыць, зазначыла Элен і, пасоўваючы бліжэй да яго талерку, жартам дадала: – Гэта ўзнагарода за мужнасць.

Узнагарода, папраўдзе, была дарэчы: ён ад першага дня пакутаваў недахопам хлеба.

Але не толькі Элен выказала падтрымку. Тэд Рэйнальдс, якому разам з жонкаю вызначылі месца праз адзін столік ад Паўлавага, ветліва кіўнуў яму здалёку. І потым, пакуль снедалі, Павел яшчэ двойчы лавіў на сабе ягоны праніклівы, прыязны пагляд. Жанчына, наадварот, ні на кога не зважала і ўся засяродзілася на стравах. У дадатак да вераду, які Павел заўважыў яшчэ з балкона, яна кепска валодала левай рукою. Студэнтаў, за столікамі якіх усе папярэднія дні панавалі тлум і гамана, амаль не было чуваць.

Канец сняданка, як заўсёды, зацягнуўся. Няспешна абменьваліся навінамі, цадзілі, смакуючы, каву, а хто-ніхто, нягледзячы, што было яшчэ зусім рана, і віно з вадою. Элен падалася ў свой пакой ладзіць шык перад шпацырам па крамах, Павел праводзіў яе да дзвярэй, затым вярнуўся да агульнага стала, каб наліць яшчэ кавы.

– Excuse me, may I speak to a countryman?1 – Тэд Рэйнальдс, адсвечваючы акулярамі, стаяў перад ім у пачцівым паўпаклоне.

– Я дрэнна гавару па-англійску, – каторы раз за апошнія дні дакараючы сябе за колішнюю ляноту ў вывучэнні моваў, адказаў Павел. – Ці не маглі б вы перайсці на польскую?

– Канечне, канечне, – мужчына зноў прыязна ўсміхнуўся. – Я гадаваўся ў Польшчы. Хоць, як і вы, з паходжання беларус. Мае бацькі нарадзіліся ў Вілейцы. Вельмі прыемна сустрэць тут земляка. Я ў Італіі другі раз, а такая прыемнасць здараецца ўпершыню. Мусіць,

вашы суайчыннікі няшмат падарожнічаюць. А вы з праўдзівых беларусаў, ці толькі паводле пашпарта?

– З праўдзівых.

– А вось маё прозвішча – Рэйнальдс – не сапраўднае. Мае бацькі былі Рамізнікевічы. Але для англасаксонцаў такое прозвішча цяжка вымаўляць, дык бацькі яго памянялі, каб унікнуць розных непаразуменняў. Я толькі пяць гадоў паспеў у Рамізнікевічах пахадзіць. Што да імя, дык яно ў мяне па-польску і па-беларуску гучыць, мабыць, аднолькава – Тадэвуш, Тадзік. А як вас завуць?

– Павел.

– Павел... Прыгожа. Па-англійску было б – Пол. Дарэчы, вы зусім добра гаворыце па-польску.

– У нас ва універсітэце быў факультатыў па польскай мове. Апроч таго, мая маці, як і вашы бацькі, родам з былой Заходняй Беларусі, і я змалку чуў у вёсцы ў бабулі польскую гаворку.

– Зразумела. Вы не будзеце супраць, калі я падсяду да вашага стала? Не? Тады я пайду папярэджу Фані.

Тэд Рэйнальдс накіраваўся да жонкі, побач з якою ўжо сядзела Ванда Кіслеўскі, нешта ёй сказаў. Жанчына азірнулася на Паўла, згодна хітанула галавой.

– Ну, вось, Фані пры справе, так што можна крыху расслабіцца. Ведаеце, два гады таму ў яе быў цяжкі інсульт. І зараз ціск не-не ды і падскочыць. А тут змена клімату. Словам, цяжкасці. На шчасце, знаёмыя неспадзявана знайшліся. Бачыце жанчыну побач з Фані?

– Я ведаю яе, гэта Ванда Кіслеўскі.

– Правільна. Дык вось, яны з Фані – даўнія прыяцелькі. Ванда і матка Фані разам былі ў Асвенціме. І пасля вайны Фані некалькі разоў ездзіла да іх у Чыкага. Я дагэтуль ні разу ні маткі, ні дачкі не бачыў, толькі на здымках. Бо ўсё жыццё, ведаеце, будаўніком рабіў, не да падарожжаў было. Затое зараз, калі выйшаў у адпачынак, шмат маю вольнага часу... Спадзяюся, мы з вамі будзем яшчэ мець магчымасць пагутарыць. – Тэд Рэйнальдс шчыра ўсміхнуўся. – Вы згодны?

– Вядома, згодзен.

Рэйнальдс дапіў каву, і перш чым Павел надумаўся, што сказаць, каб прадоўжыць размову, падняўся з месца, накіраваўся да свайго стала. Праз колькі хвілін ён з Фані, пабраўшыся, як маладзёны, за рукі, крочылі абсаджанаю ружамі дарожкаю да альтанкі.

– Пан Рудак, я бачыла, вы ўжо пазнаёміліся з Тэдам Рэйнальдсам! – ля стала стаяла Ванда – узбуджаная, нервовая – як наэлектрызаваная. – Ён вам спадабаўся?

– Не Рудак, а Рудніцкі, – паправіў яе Павел.

– О, даруйце! – жанчына на момант сумелася, не чакаючы адказу, працягвала сваю тыраду. – Вельмі добры, цудоўны чалавек! Фані гэтак з ім пашанцавала! Вось каб яшчэ і Пан Бог пра яе не забываўся...

У аўтобусе было нават крыху прахалодна. Пасля гарачыні, што ўвесь час даймала на вуліцы, гэта, відаць, не аднаму Паўлу ўяўлялася раскошаю. Ледзь паспяваў аўтобус стаць на прыпынку, як людзі імгненна запаўнялі салон, займалі зручнае месца між вокнамі, на скразняку.

Дзіўна, але за тыдзень, які ён прабыў у вечным горадзе, Паўлу толькі сёння ўпершыню ўспомнілася Беларусь. І справакавала ўспамін захаванне братоў Кірылы і Мяфодзія ў сутарэнні-могільніку царквы Сан Клементэ.

Шкада, па-беларуску няма ля той магілы ніякага надпісу. І што дзядзькі Андрэя няма побач, таксама шкада. Ён, Павел, шмат чым абавязаны старому. Адчуванне слова, пачуццё крэўнае зацікаўленасці ў яго захаванні, урэшце, любоў да гісторыі – усё гэта стала неад'емнаю часткаю ягонага жыцця найперш з дзядзькавай дапамагаю. Бадай, і школа ў гэтым сэнсе не дала яму гэтулькі, колькі даў Юстынавіч, дакладней – немудрагелістыя ягоныя ўрокі-аповяды. Нетаропкія, прасякнутыя ненавязліваю, але такою самавітаю павагаю да ўсяго роднага, яны назаўжды сталі Паўлавай і сутнасцю, і радасцю, і болем. Зрэшты, ён зразумеў гэта як след тут, у Рыме.

Тым часам пад'ехалі да гатэля. Гарачыня, на якую ўсе і забыліся, пакуль трэсліся ў аўтобусе, зноў бесцырымонна нагадала пра сябе, дыхнула ў твар пахам размяклага асфальту і гару.

Збоч увахода на тэрыторыю гатэля маленькі пажылы італьянец гандляваў, як і ўсе папярэднія дні, садавінаю. Ён тут усіх ведаў і зараз, убачыўшы здалёк Паўла, заўсміхаўся насустрач ветліваю, шчыраю ўсмешкай. Нягледзячы на спёку, мужчына быў у ботах. Другія, новенькія, нібы выстаўленыя на продаж разам з памідорамі, стаялі на адным з латкоў. Жанчына, якая толькі што купіла з паўкіло вішань, трымаючы іх воддаль у выцягнутай руцэ, штосьці энергічна

даводзіла гандляру. І толькі калі яна ўжо сабралася адыходзіць і павярнулася да Паўла тварам, ён пазнаў яе.

– А, вы! – Элен узяла яго пад руку, і яны пайшлі да брамы. – Дзе былі сёння? Што бачылі?

– Быў у царкве святога Клемента. Там пахаваны Кірыла і Мяфодзій, вынаходнікі нашага алфавіта.

– Цікава. А я вось вырашыла ягадамі паласавацца. І заадно пагутарыла з абарыгенам, як бачыце.

– Вы ведаеце італьянскую мову?

– Дастаткова, каб паразумецца з чалавекам.

– І што цікавага сказаў вам абарыген?

– Ну, расказаў пра сябе. Пра тое, што жыве ў вёсцы і штогод гандлюе вось на гэтым месцы. Што двое яго сыноў жывуць у Рыме, але наведваць яго тут удзень саромеюцца і прыязджаюць, каб забраць яго і палатку, калі сцямнее. Вы бачылі боты? Гэта ён купіў новыя, каб абуваць у дождж пасвіць козаў. У яго чатыры старыя казы і шэсць маладых. Вам даводзілася піць казінае малако?

– Не.

– Мне таксама не даводзілася. І наогул я не ведаю вёскі. Гэта нядобра. Бо, што там ні кажы, блізкасць да прыроды стымулюе творчасць. Я казала ўжо вам, што калі-нікалі малюю? Не? Дык цяпер ведайце, што малюю. На жаль, Чыкага не з тых мясцін, што могуць натхніць. Але, можа, Італія гэта зробіць? Дарэчы, мой бацька таксама быў мастак. Ён памёр, калі я была зусім малая. Ці спадабалася вам місіс Рэйнальдс?

– Не ведаю, што сказаць... Я толькі два разы яе бачыў.

– І я не нашмат больш. Яна дачка мамінай сяброўкі. Калі я мінулы раз, помніцца, казала вам пра куратарку з Канады, я ні сном, ні духам не магла ўявіць, што гэта будзе Фані. Мама таксама нічога не ведала, так што поўная неспадзянка і для яе, і для мяне. А містэр Рэйнальдс – такі абыходлівы чалавек, праўда? Фані расказвала маме, які ён быў з ёю цярплівы, калі яе паралізавала.

– Здаецца, неблагі чалавек, – сказаў Павел. – Да таго ж мой зямляк, беларус.

– Беларус? – Элен прыпыніла хаду ад здзіўлення. – Але ж прозвішча яго, здаецца, цалкам англійскае. І потым – што такое беларус? Вы мне нічога пра сваю краіну не расказалі, дык я ў мамы запыталася. Яна сказала, што раней ніякай Беларусі не было, а былі крэсы. Гэта праўда?

– Тэарэтычна – праўда.

– Дык тады, можа, і беларусаў ніякіх няма?

– Няма? А я хто?

– Вы? – дзяўчына сумелася. І праз хвіліну, падумаўшы крыху, паўжартам дадала: – Сімпатычны малады чалавек, вось хто. І... беларус, калі вам так хочацца.

Рэйнальдсы адпачывалі за столікам пад пальмамі. Фані гартала нейкі часопіс. Тэд карміў сабаку, які сіестнічаў тут жа, побач з людзьмі, вольна раскінуўшыся на траве ля сваёй агромністай, як і сам ён, будкі. Ён быў тут за вартаўніка шмат гадоў, але ніхто дагэтуль, калі верыць абслузе, ягонага брэху не чуў.

Тэд Рэйнальдс быў у шортах і лёгкай тэнісцы. Жонка яго, наадварот, была апранута зусім не па-летняму. На ёй былі цёплы ваўняны джэмпер з нейкім авангардысцкім малюнкам на грудзях і чорныя вельветавыя штаны. У такім адзенні яна выглядала побач з мужам на фоне экзатычнай паўднёвай раслiннасці крыху недарэчна. Асабліва псавала ўражанне стужка на галаве, якая ці то наўмысна была завязана абручам над самымі бровамі, ці то збілася неўпрыкмет, а гаспадыня ніяк не магла даўмецца яе паправіць. Убачыўшы Паўла, Рэйнальдсы ажывіліся.

– Дзень добры! – павітаўся ён. – Не перашкоджу вам?

– Не, што вы! – адказаў Тэд і паказаў на крэсла побач з сабою. – Наадварот, будзем радыя, калі да нас далучыцеся. – Вось, пазнаёмцеся, мая жонка Фані. Фані, гэты малады чалавек – мой зямляк. Памятаеш, я казаў табе? Яго завуць Павел.

Жанчына слаба, быццам праз сілу, усміхнулася, трымаючыся адною рукой за лоб, паднялася з месца.

– Вельмі прыемна, – сказала нейкім ціхмяным, як бы здушаным, голасам. – Прабачце, але мне надта ж баліць галава. Так што мушу, відаць, вас пакінуць адных. Прабачце.

– Я завяду цябе ў нумар. – Тэд таксама ўстаў. – А вы пачакаеце мяне тут, Павел?

– Пачакаю.

– Добра, я хутка.

Сапраўды, чакаць давялося нядоўга. Тэд вярнуўся літаральна праз некалькі хвілін.

– Не ведаю нават, што рабіць, – сказаў сумна, падаючы Паўлу бляшанку з півам. – Што ні дзень, то галаўныя болі. І лекі ніякія не

дапамагаюць. Прапанаваў вярнуцца назад, у Канаду, – катэгарычна адмаўляецца. Што будзе з усяго гэтага, не ўцямлю. – Тэд адкаркаваў сваё піва, адпіў некалькі глыткоў. – Дарэчы, каб не забыцца... Вось, хачу ў вас спытаць: што такое – недарэка? Матка мая на бацьку так казала, калі вельмі злавалася. Потым яна памерла, і так гэтае слова і засталося нявызнаным. І больш запытацца не было ў каго. Не-да-рэ-ка. Гэта па-беларуску?

– Па-беларуску. Недарэкам называюць няўмелага, някемлівага чалавека. Ці негаспадарлівага таксама.

– Вось што! Цяпер зразумела. Мой бацька заўсёды трапляў у нейкія несуразныя сітуацыі. Узяўся гандляваць гадзіннікамі – прагарэў. Пачаў гуляць на біржы – напаткала няўдача. Або вось яшчэ выпадак. Аднойчы, вяртаючыся ўначы з працы, падабраў на вуліцы старога яўрэя. У таго здарыўся сардэчны прыступ, і бацька выратаваў яму жыццё. Гэты Фельдман аказаўся нябедным чалавекам. Да таго ж ён быў адзінокі і праз год, паміраючы, адпісаў свайму выратавальніку рыбны магазінчык. Дык што вы думаеце? Бацька так захапіўся дабрачыннасцю, што не паспелі мы і азірнуцца, як магазіна таго не стала, Вось я і думаю: можа, і я гэткі самы... недарэка, як нябожчык тата? А наогул сярод беларусаў шмат такіх?

– Хапае, – Павел дапіў піва, шпурнуў парожнюю бляшанку ў сметніцу. – Але ж і дзіўныя ў вас клопаты, Тэд.

Дзень прайшоў неяк няўдала. На плошчы Навона Паўла нечакана заспеў дождж. Ды такі спорны, што ён і азірнуцца не паспеў у пошуку схову, як змок наскрозь. Затым, пакуль брыў незнаёмымі вулкамі да замка Сант'Анджэла, згубіў гадзіннік. І ўрэшце, ужо ў аўтобусе, пакуль валаводзіўся з кампосцерам, што як на злосць ніяк не жадаў уключацца, ажно на чатыры хвіліны перасягнуў тэрмін дзеяння білета і ледзь не быў аштрафаваны кантралёрам. На шчасце, даведаўшыся, што ён іншаземец («O, Russia!»), вусаты дзядок у форменным адзенні тут жа страціў да яго інтарэс і літасціва дазволіў даехаць да месца «зайцам».

Ля гатэля і ўнутры яго панавала звыклае для гэтага часу сутак ажыўленне. Людзі сядзелі купкамі ў альтанках ці проста на траве, абмяркоўвалі планы на наступны дзень. Да ад'езду заставалася трое сутак, і кожны імкнуўся запоўніць іх з найбольшаю карысцю.

Рэйнальдсы, на гэты раз у аднолькавых шэрых лёгкіх касцюмах, прагульваліся па двары. Тэд трымаў жонку пад руку, так што яе

вераду было амаль не відно. Убачыўшы Паўла, яны павольна пайшлі яму насустрач. У гэты ж момант з дзвярэй гатэля выбегла Ванда Кіслеўскі. Яна была адна і нешта не ў гуморы. Ва ўсялякім разе, калі Павел з ёю павітаўся, яна толькі ледзь-ледзь хітанула ў адказ галавою. Але самае дзіўнае было тое, што Рэйнальдсаў яна наогул праігнаравала. Прайшла міма і нават не зірнула ў той бок, быццам не заўважыла. Павел бачыў, як змянілася з твару пры яе з'яўленні Фані, як нешта ціха сказала мужу. Затым кінула яго аднаго на сцежцы, хуценька пакрочыла да дзвярэй кафэ.

Павел падышоў да Тэда.

– Вось, зусім мая раскісла, – сказаў той ціхмяным, як не сваім, голасам. – Разнервавалася, месца не знаходзіць...

– Якая-небудзь непрыемнасць?

– Ну, вядома ж, не на пустым месцы ўсё. Што ні кажы, а жанчыны ёсць жанчыны, – Тэд дасадліва махнуў рукою. – Ніколі не ведаеш, што ад іх чакаць... Усё добра было, і раптам на табе – не падзялілі нейкую трасцу. І трэба нам было тут сустрэць гэтых Кіслеўскі... Так недарэчы гэтая звада!

– Дык паміраццa! – паспрабаваў супакоіць старэйшага таварыша Павел. – Ці варта гэтак сур'ёзна ўспрымаць звычайнае непаразуменне.

– Каб жа звычайнае! Вы не ведаеце, якая мая Фані заюшлівая. Ды і Ванда, відаць па ўсім, не лепшая. А тут справа не абы-якая, можна сказаць, сямейны дабрабыт на кон пастаўлены.

– Сямейны дабрабыт?

– А вы што думалі? Я з-за драбязы гэтак хваляваўся б? Не, тут сур'ёзная справа. Вы правільна напачатку выказаліся – непрыемнасць. Бачыце, Ванда, яна... Карацей кажучы... бацька Элен – ён сапраўды мастак, толькі ў іншым сэнсе. Ён кілер, забойца. Не вылазіць з турмаў. Аднак Элен пра тое нічога не ведае. І ніхто не ведае, апроч самой Ванды, нас з Фані ды маёй цешчы. І вось зараз Фані пагражае, што раскажа дзяўчыне праўду. Уяўляеце, чым усё можа скончыцца? – Тэд уздыхнуў. – Жанчыны такія непрадказальныя істоты! Вы жанаты, Павел?

– Пакуль не. Але сталую сяброўку маю.

– Вось, сяброўка стане жонкаю, тады і згадаеце мае словы. Дарэчы, вы не хацелі б прагуляцца на свежым паветры? Кажуць, тут недалёка валяецца пахавальны саркафаг Нерона. Нібыта гараджане знарок

выкінулі яго за рысу горада, каб не паскудзіў памяці... Дык, можа, прашпацыруем да яго?

– Я чуў, гэта недаказаная версія. Да таго ж і месца тое далекавата, наўрад мы да вячэры паспеем туды і назад.

– Ну, тады проста давайце выйдзем за браму. Усё ж лепей, чым тут, на гэтым пятачку, вар'яцець.

Аднак, выйшаўшы за браму, трапілі не ў лепшую вар'ятню. Аўто на вуліцы было так шмат, што здавалася, паток іх ніколі не скончыцца.

Палатка сіньёра Паскуаліні, што, відаць, не зважаў ні на машыны, ні на несціханы гул ды гар, якім яны атручвалі ўсё наўкола, паранейшаму стаяла на сваім месцы. Новыя боты, якія дагэтуль красаваліся на самым відным латку, цяпер туліліся ўнізе, збоч скрынь з садавінаю. Малады чалавек гадоў дваццаці пяці, дужы, мускулісты, лёгка падымаў скрыні адну за адною ў кузаў невялікага, размаляванага рэкламнымі надпісамі фургончыка. Сам сіньёр Паскуаліні увесь той час, пакуль маладзец завіхаўся ля скрынь, стаяў ззаду машыны і з абыякавым выглядам падаваў кароткія каманды. І толькі калі дайшла чарга да ботаў і хлопец выпрастаў рукі, каб узяць іх, імгненна ажыў, схапіў гумовікі абедзвюма рукамі, асцярожна, бы найвялікшую каштоўнасць, паклаў у свой пляцак.

Згрузіўшы скрыні ў фургон, маладзейшы закурыў, узяўся разбіраць палатку. Сіньёр Паскуаліні тым часам падаўся да калонкі – папіць.

– Puoi piu velocemente, padre? – аклікнуў яго хлопец. – Ta sai, sono in tretta.1

– Tu hai vergogno dime, vado a Robert.2 – адказаў гандляр і, выціраючы на хаду з вуснаў кроплі вады, няспешна пашкандыбаў да аўтобуснага прыпынку.

Сын завёў матор фургона, не дачакаўшыся, пакуль несамавітая бацькава постава знікне за паваротам, газануў з месца.

Павел і Тэд абмінулі калонку, падаліся тратуарчыкам улева, туды, дзе бачна было, дамы неўзабаве канчаліся і пачыналася ці то поле, ці то нейкая пустка.

– Дзіўны гэты Паскуаліні, – каб прадоўжыць перарваную размову, сказаў Павел. – Не давярае, мабыць, нікому.

– Тут надта і не надавяраешся. Толькі спусці вока з чаго – адразу ўкрадуць. Нават у касцёле на хвіліну нельга нічога без нагляду пакінуць.– Тэд Рэйнальдс гаварыў не гучна, але разважліва і ўпэўнена.

«Як мой бацька», – падумаў Павел. Тэд, які кожны раз неўпрыкмет выяўляў новыя беларускія рысы, падабаўся яму ўсё больш і больш.

Адзінае, што па-ранейшаму яго крыху бянтэжыла і насцярожвала, быў пагляд канадца. Наогул шчыры і даволі адкрыты, ён часам рабіўся нейкі занадта ўжо дапытлівы.

За апошнім будынкам, сапраўды, пачыналася поле. Справа ад яго, там, дзе буяў расліннасцю лог, тулілася нейкая невялічкая забудова накшталт хлеўчука. Да яе вяла вузкая, ледзь бачная ў чэзлай траве сцяжына. Туды яны не згаворваючыся і падаліся. Але не паспелі прайсці і дзесятак метраў, як раптам пайшоў дождж. Ён пачаўся літаральна з нічога – з невялічкай зусім аблачыны, што нават не здолела як след засланіць сабою сонца. Хоць, як і ўчора на плошчы Навона, кроплі былі наўздзіў буйныя і спорныя. Ва ўсялякім разе зямля пад нагамі вандроўнікаў імгненна зрабілася вязкай.

– Прашпацыравалі! – сасморгваючы аб край бардзюра гліну з падэшвы, незадаволена сказаў Тэд. – І вось паглядзіце, зараз і скончыцца.

І сапраўды, ледзь паспеў ён тое сказаць, як дождж стаў слабець і неўзабаве, брызнуўшы яшчэ колькі разоў дзеля прыліку, зусім перастаў.

– Дык, можа, далей пройдзем, – няўпэўнена прапанаваў Павел. – Неба вунь якое яснае.

– Ага, вер ты яму, – Тэд са шкадаваннем глядзеў на размяклыя туфлі. – Узляціць зноў хмурына няўрокам, і боўтайся тады сярод твані. Ды і вячэраць час. І з заўтрашняю экскурсіяй трэба вызначыцца. Вы куды збіраецеся?

– Напэўна, у Асізі. А вы?

– Я на Монтэ-Касіна хацеў бы. Ды высакавата, ведаеце, Фані можа кепска стаць ад перападу ціску. А ў Асізі мы два разы ўжо былі. Так што давядзецца, відаць, у гасцініцы кукаваць.

Праз чвэрць гадзіны былі ў гатэлі. Фані, узрушаная, з бліскучымі вачыма, сустрэла мужа ля ўвахода, штосьці нашэптваючы на вуха, павяла ў свой пакой.

Раніца наступнага дня выдалася ціхая і ясная. Седзячы ў паўпустым салоне аўтобуса, Павел бачыў, як выходзілі адзін за адным з кафэ экскурсанты, рассаджваліся па сваіх месцах. Рэйнальдсаў сярод іх не было. Затое ў апошнюю хвіліну прыбегла Ванда Кіслеўскі – пажадаць шчаслівай дарогі дачцэ, якая ўжо сядзела ў аўтобусе ззаду за Паўлам.

У другім канцы дзядзінца стаяў яшчэ адзін аўтобус – на Монтэ-Касіна. У ім народу было яшчэ менш, як у асізскім, але зараз амаль усе, што выходзілі са сталоўкі, накіроўваліся туды. Сярод іх быў і Тэд Рэйнальдс. Ён шпарка перасек пляцоўку перад альтанкаю, даядаючы на хаду бутэрброд, увайшоў у салон. Выглядаў ён кепска, як з бяссоннае ночы: твар белы, вочы запалыя, з чырванню наўкола зрэнак. Убачыўшы Паўла, ён рэзка змяніў накірунак хады, увайшоў у аўтобус.

– Усё-такі вырашылі ехаць? – прывітаўшыся, сказаў Павел. – А як жонка? Лепш ёй?

– Не сказаць каб лепш, але і не горш. Але галоўнае – з Вандаю памірылася. Так што ў выпадку чаго будзе каму за ёй прыглядзець. Шкада, што не разам едзем, а то б дарога ў размове хутчэй праляцела. Ну, шчасліва вам!

Вадзіцель зачыніў дзверы, асцярожна, каб не паламаць зараснікі бамбуку, выруліў з цеснага дворыка на праезную частку, збоч якой ужо гандляваў, нягледзячы на гэткі ранні час, маленькі сіньёр Паскуаліні.

Асізі аказаліся невялічкім гарадком, аднак агледзіны яго расцягнуліся амаль на цэлы дзень. Спачатку павольна падымаліся ўгору да Ніжняга касцёла, затым нечага доўга чакалі на шматлюднай, запруджанай турыстамі тэрасе. І калі, нарэшце, група сабралася перад уваходам у базіліку святога Францішка, было ўжо тры гадзіны.

Прабегшы збольшага вачамі па знакамітых фрэсках, Павел у ліку першых выскачыў на вуліцу. Вельмі хацелася піць, але да кавярні, якую нагледзеў па дарозе сюды, было далекавата. Прыйшлося чакаць, пакуль выйдуць з касцёла астатнія.

Элен, на гэты раз нейкая стомленая і крыху бышцам панылая, падышла да яго, узяла пад руку.

– Ну, як вам Джота? – спытала і, не чакаючы адказу, дадала: – Занадта ўсяго, ці не праўда? А гарадок сам нішто сабе, даволі прыемны. Якраз такі, як мне мама апавядала.

– Чаму яна не паехала з намі?

– Пабаялася. Бачыце, якое тут усё маленькае, цеснае. Вунь якія дворыкі – да клетак падобныя. Гэта нагадвала б ёй камеры і, напэўна, справакавала б абвастрэнне хваробы. Дык мы і вырашылі не рызыкаваць. Да таго ж яны з Фані памірыліся, дык калі што якое, дапамогуць адна адной. Наогул, не разумею, што яны не падзялілі.

Такія ж былі прыяцелькі ўвесь час... Думаю, перш за ўсё Фані вінаватая. Бо ў мамы такі характар, што з ёю немагчыма пасварыцца. А Фані... Нездарма яе студэнты не любяць. Вы заўважылі гэта? Не ўяўляю, як Тэд з ёю жыве. – Элен энергічна трасянула галавою, не адпускаючы Паўлавай рукі, накіравалася да дзвярэй бліжэйшае кавярні. – Пакуль усе нас дагоняць, якраз па марожаным паспеем з'есці. Я, сорам прызнацца, дагэтуль з ківі не пакаштавала.

Гэтым разам аўтобус у двор не паехаў. Высадзіўшы пасажыраў ля брамы, вадзіцель хуценька развярнуўся і праз хвіліну-другую выруліў назад, на праезную частку.

Сіньёр Паскуаліні, як заўсёды, быў на месцы. Ягоныя вялікія вочы, звычайна ясныя і лагодныя, глядзелі на свет з нямым дакорам. Ён ледзь прывітаўся з маладымі людзьмі, а калі Элен спытала яго штосьці па-італьянску, адказаў коратка, адным сказам.

– Укралі боты! – дагнаўшы Паўла ўжо ля альтанкі, з абурэннем сказала дзяўчына. – І каму магла спатрэбіцца такая драбяза!

Ужо пайшла дзесятая гадзіна, а жанчын усё не было. Тэд, аўтобус якога вярнуўся з экскурсіі значна раней за Паўлаў, падняўся з-за стала.

– Яны тут недзе, недалёка, – сказаў рашуча, кіруючыся да выхада. – Ці не саставіце мне кампанію ў пошуках, Павел?

– Канечне, – Павел згодна хітануў галавою. Ён быў вольны, як птушка, і сядзець у адзіноце на тэрасе ў гэты перадапошні рымскі вечар зусім не хацелася. Да таго ж з паўгадзіны таму скончылася навальніца, і на дварэ ў параўнанні з душным памяшканнем дыхалася куды лягчэй.

За брамаю сіньёр Паскуаліні, не зважаючы на позні час, усё яшчэ гандляваў садавінаю. Зрэшты, тое наўрад можна было назваць гандлем. Стары проста сядзеў на скрыні збоч палаткі і курыў цыгарэту. Убачыўшы Тэда і Паўла, ён падхапіўся з месца, жэстыкулюючы, адхінуў убок цырату, якою быў запяты ніз прылаўка.

Боты, нядаўна новыя і чыстыя, выглядалі так, быццам у іх прайшлі па суцэльнай гліне добры дзесятак вёрст. Сіньёр Паскуаліні асцярожна ўзяў іх за халявы, падняў угору.

– Што, знайшлася згуба? – голас Элен, якую тут ніхто не чакаў, гучаў усхвалявана. – Gli stessi?1

– Gli stessi.

– Дзіўна, – Элен заклапочана пераводзіла погляд з аднаго мужчыны на другога. – Але я вельмі хвалююся за маму і цёцю Фані. Дзе яны могуць быць? Студэнты кажуць, чулі, нібыта яны зноў пасварыліся. Гэта ўсё так трывожна і непрыемна. – І яна зноў сказала штосьці па-італьянску гандляру.

Той прыклаў палец да скроні, нібы ўспамінаючы нешта, затым энергічна затрос галавою: «Si, si, signora!»

З ягоных слоў, якія Элен тут жа збольшага перакладала Тэду і Паўлу, вынікала... Ён не ўпэўнены, але гадзіны дзве таму ці болей, яшчэ да навальніцы, бачыў дзвюх жанчын. Адна з іх кульгала. Яны абмінулі ягоную палатку і скіравалі ўлева, да калонкі. У яго было шмат пакупнікоў, таму ён больш нічога не заўважыў... Во каб ён ведаў загадзя, што ўсё гэта спатрэбіцца! Не, яны не сварыліся, наадварот, паводзілі сябе вельмі рахмана! Праўда, тая, што накульгвала, выглядала зусім хворай і ўвесь час трымалася за лоб. Так, гадзіны дзве-тры мінула, як яны тут былі. Ён добра памятае, бо акурат пад'ехаў Раберта, каб запытацца, у колькі яго забраць. Раберта не тое, што Марыо, ён бацькам не грэбуе. Было каля паловы сёмай, а можа, і сем, дакладна сказаць не можа. Потым пайшоў дождж. А калі ён скончыўся, боты стаялі – о, дзіва! – там, дзе стаялі да таго, як іх укралі!

– Трэба паглядзець у тым хлеўчуку. – Тэд махнуў рукою ў бок поля, не чакаючы згоды маладых людзей, шпарка пакрочыў наперад. Павел і Элен пайшлі следам за ім.

– Слухайце, куды вы нас ведзяце? – калі ўжо ўвайшлі ладны кавалак адлегласці, раптам запратэставала дзяўчына. – Збіраецеся тут іх шукаць, на пустцы? Што яны тут забыліся?

– Але ж гэты Паскуаліні сказаў... – спрабаваў супакоіць яе Павел.

Нясмелая ягоная спроба, аднак, не дала выніку. Не паспеў ён і фразу скончыць, як Элен ужо крочыла назад, да магістралі.

– Хай ідзе, не чапайце, – сказаў стомлена Тэд. – Абыдземся без яе.

Жанчыны нібы спалі. Калі Павел следам за Рэйнальдсам зазірнуў у адзінае акно (дзверы былі зачыненыя), то ўбачыў іх упобачкі на нейкіх дошках. Абедзве ляжалі галовамі да ўвахода і ў паўзмроку памяшкання былі так падобныя адна на адну, што разабраць знадворку, праз брудную шыбу, дзе каторая, было немагчыма.

Тэд штурхнуў дзверы, яны не адчыніліся – замок трымаў надзейна.

– Давядзецца лезці праз акно, – Тэдаў голас гучаў усхвалявана.

– Можа, паліцыю варта выклікаць, – няўпэўнена азваўся Павел.
– Спачатку самі паглядзім.

Тэд адагнуў ключамі цвічкі на шкле, і праз хвіліну ягонае надзіва гнуткае для чалавека гэткага ўзросту цела знікла ў вызваленым ад шыбы ваконным праёме.

Павел, не раздумваючы, нырнуў следам за ім.

Тая з жанчын, што ляжала бліжэй да акна, была Ванда. Яна ўвесь час хрыпела, і калі мужчыны наблізіліся да яе, толькі ледзь-ледзь прыадкрыла вочы і прыўзняла белы, як снег, твар. Затым нечакана ўскочыла з месца, не выпускаючы з рук жалязяку, якая быццам прыліпла да яе параненых далоняў, кінулася да дзвярэй, забілася ў істэрыцы.

Фані, наадварот, здавалася, і не думала падымацца. Тэд некалькі разоў аклікнуў яе, але яна нават не варухнулася ў адказ. Тады ён апусціўся побач з жонкаю на калені, прасунуў уніз руку, пачаў мацаць пульс.

– Здаецца, няма, – сказаў, палатнеючы з твару.

Трое з паліцыі – адзін, як здагадаўся па гаворцы Павел, быў камісар, пратрымалі іх у хлеўчуку амаль гадзіну. Спачатку ўважліва ўсё аглядалі, затым, параіўшыся, узяліся даследаваць дзверы. Замок, які яны адчынілі пры ўваходзе з дапамогаю адмычкі, быў аўтаматычны. Гэта давала падставу меркаваць, што жанчыны хутчэй за ўсё апынуліся ў пастцы выпадкова.

Затым пачалося дазнанне. Тэдавых ведаў італьянскай мовы для таго, каб паразумецца, аказалася недастаткова, і камісар выклікаў па рацыі перакладчыка. Сын сіньёра Паскуаліні Раберта, якога прывезлі у якасці сведкі, увесь час, пакуль чакалі перакладчыка, нецярпліва пазіраў на гадзіннік: стары гандляр адчуваў сябе не вельмі добра і прасіў сына вярнуцца як мага раней. Праз дваццаць хвілін з'явіўся перакладчык. Гэта быў кволы нязграбны мужчына гадоў сарака, з няпэўнаю, як з пахмелля, паходкаю і доўгім вострым носам.

Камісар задаваў пытанні, а Тэд адказваў – за сябе і калі-нікалі,ператлумачваючы, за Паўла. Апошняе камісару не надта спадабалася. Выказаўшы незадаволенасць, што не папярэдзілі, каб замовіць перакладчыка з польскай, ён, аднак, неўзабаве супакоіўся. Тэд адказваў дакладна, без залішніх эмоцый, таму справа рухалася даволі хутка.

І Ванда Кіслеўскі, ледзь толькі апынулася на паветры, адразу ачуняла і ужо сама магла даваць паказанні. Ва ўсялякім разе, калі камісар з дапамогаю перакладчыка звярнуўся да жанчыны з пытаннем, яна тут жа, не раздумваючы, адказала...

Яны з Фані тут паблізу гулялі, і калі ўзляцела віхура з дажджом, рашылі схавацца ў хлеўчуку. Увайшлі ў памяшканне і ўбачылі ў дальнім куце два сілуэты. Фані, хоць увесь час і наракала на дрэнны зрок, адразу пазнала ў іх сваіх студэнтаў. Напалоханыя нечаканым з'яўленнем настаўніцы, маладыя людзі апрометцю кінуліся да дзвярэй і, уцякаючы, гэтак моцна бразнулі імі, што спрацаваў замок. У Фані, якой і дагэтуль было нядобра, ад хвалявання ціск падскочыў яшчэ больш. Яна глытнула дзве таблеткі, але гэта не дапамагло. Ёй стала так кепска, што яна павалілася на падлогу. Усё, што было далей, яна, Ванда, памятае вельмі дрэнна, як скрозь сон. Адно, што выразна ўелася ў памяць, – адчуванне панікі ў той момант, калі гэта здарылася з Фані... Астатняе яны ведаюць.

– Таблеткі? – камісар асцярожна расчыніў сумачку нябожчыцы, дастаў пудэлак з лекамі. – Гэтыя?

– Можа, дакладна сказаць не магу, бо не бачыла... Але, здаецца, Фані выцягнула іх прама з кішэні.

Урачы, якія ўвесь гэты час, што цягнуліся роспыты, даследавалі цела, склалі свае прычындалы, накіраваліся да дзвярэй.

Праз чвэрць гадзіны картэж з чатырох паліцэйскіх машын вырушыў у накірунку цэнтра.

Павел дарэмна чакаў Тэда Рэйнальдса. Ванда, якая вярнулася з допыту на таксі а першай гадзіне ночы, паведаміла, што ён застанецца ва ўчастку да раніцы. Паводле заключэння медэкспертаў, Фані памерла ад інсульту. Але даследаванні працягваюцца, таму крэміраваць яе можна будзе не раней як праз суткі.

Адразу пасля сняданку прыехалі людзі ад камісара, каб завезці на допыт хлопца і дзеўку, якіх жанчыны заспелі ў хлеўчуку. Назад іх прывезлі хутка, і амаль следам за імі вярнуўся і Тэд. Выглядаў ён так сабе.

– Калі вы не супраць, я хацеў бы ля вас пабыць, – сказаў, звяртаючыся да Паўла. – Мне вельмі дрэнна зараз, а мы як-ніяк землякі з вамі, амаль свае. Калі вы ад'язджаеце?

– Заўтра а адзінаццатай.

– Тады яшчэ крыху ёсць часу, каб пагаварыць. Ведаеце, гэтая трагедыя зусім выбіла мяне з каляіны. І людзям непрыемнасці... Ванда гэтулькі перажыла. І гэтыя студэнты... У Фані быў талент нажываць ворагаў. Таму ўсе трапілі пад падазрэнне. Ды, на шчасце, усё высветлілася. Звычайны інсульт. Я казаў вам, здаецца, што два гады таму ў яе быў адзін... І я нездарма баяўся гэтых перападаў тэмпературы, бо ведаў, як яны небяспечныя. Але ёй так хацелася ў Італію! А тут... Недарэчнасць: замест таблетак для паніжэння ціску прыняць тыя, што яго павышаюць...

– Ваша жонка пераблытала лекі?

– Ну, не свядома, канечне. Бачыце, ціск у яе ўвесь час «скакаў»: то занадта высокі, то, наадварот, нізкаваты. А калі які – без танометра вызначыць не так проста. Таму з лекамі трэба быць асцярожным. Але тут, відаць, спрэчка з Вандаю паўплывала – як-ніяк нервы... Ды і тое, што мяне побач не было, таксама ж адбілася. Словам, збег акалічнасцей. Калі б яшчэ не гэтыя дзверы, можа, Ванда магла б што дапамагчы... А так... – Тэд махнуў рукою, вусны яго задрыжэлі. Цяпер, з пакамечаным ад бяссоння тварам і вялымі, крыху запаволенымі рухамі, ён зноў нагадаў Паўлу нябожчыка бацьку. Гэткі ж ціхмяны, пакорлівы, безабаронны – сапраўдны беларус. Адно – больш самавіты з выгляду ды вытанчаны ў абыходжанні. – А так вось давядзецца аднаму вяртацца ў Таронта. Яна сама, у выпадку, калі што якое – тут, на месцы, завяшчала крэміраваць. Так што турбот шмат наперадзе.

– Я магу вам чым-небудзь дапамагчы?

– Не-не, нічога не трэба. Тут усё зробяць, абы грошы. А я чалавек не бедны. Не хопіць таго, што маю пры сабе,– пазваню сынам дадому. – Тэд крыху памаўчаў. – Іх двое у мяне. Адзін – мой ад першага шлюбу. Другі – сумесны з Фані. Добрыя хлопцы. Старэйшы менеджэрам працуе ў адной фірме. Малодшы – паліцэйскі. А ў вашай сям'і ёсць паліцэйскія?

– Прафесійных няма, але адзін дзядзька займаецца крыміналістыкай. Раскрывае злачынствы з дапамогаю аналізу дыялектных асаблівасцей маўлення людзей...

– Дыялектных? Як гэта?

– Дыялект – мова пэўнай мясцовасці. Іначай – гаворка.

– О, цяпер зразумела, – на стомленым, заімглёным водсветам скрухі твары Тэда Рэйнальдса мільганула штосьці накшталт усмешкі.– Якраз напярэдадні ад'езду сюды, у Італію, я глядзеў па тэлевізары

тэлеканал «Палонія». Дык там акурат пра варшаўскі дыялект ішла размова. «Заба» замест «жаба», «у наш» замест «у нас», «фраер». Цікава. А вы, відаць па ўсім, да сышчыцкага занятку не маеце цягі?

– Мусіць, не, – чамусьці няўпэўнена, быццам не даючы веры ўласным словам, адказаў Павел.

Нешта было не тое.

Павел памацаў сумку, затым – машынальна – кішэньчык кашулі. Вось яно што: пасеяў акуляры! Адразу ўсплыла ў памяці каса аддзела, у якім пяць хвілін таму выбіраў для дзядзькі Юстынавіча гальштук. Пасля магазіна ён нікуды не заходзіў, так што, найхутчэй, там забыўся. Дарыць каму-небудзь так, за нішто, дарагія, да таго ж Жаннін прэзент да дня нараджэння, акуляры, не хацелася.

Ён выйшаў з аўтобуса, у якім ужо сядзеў разам з іншымі пасажырамі ў чаканні, пакуль з'явіцца вадзіцель, хутка пакрочыў збоч буцікаў да ўвахода ў магазін.

Малады італьянец, убачыўшы яго, тут жа дастаў акуляры з-пад прылаўка.

– Ecco, prego![1]

– Gracie![2]

Павел паклаў акуляры ў кішэню, хуценька, каб не замінаць пакупнікам, адышоўся ў глыб залы.

І тут убачыў Тэда. Дакладней нават, не ўбачыў, а адчуў. Тэд стаяў ля вітрыны з абуткам і засяроджана глядзеў у адну кропку. Роўная шарэнга туфляў і чаравікаў, здавалася, зусім яго не цікавіла. Ён так быў заняты нейкімі патаемнымі думкамі, што калі Павел наблізіўся да яго і напаўголаса аклікнуў, не схамянуўся, не павёў брывом. Не варухнуўся ён і тады, калі Павел стаў побач з ім, і пастава ягоная адбілася ў шкле насупраць. Але як толькі хлопец падумаў, што, можа, лепш не перашкаджаць, і павярнуўся, каб адысці прэч, Тэд імгненна ажыў.

– Я бачу вас, не уцякайце. – Ён прагнаў з твару здранцвенне, павабіў Паўла за сабою да выхада.

Хоць раён і быў незнаёмы, вырашылі прагуляцца пехам – у накірунку руху аўтобуса.

– Я важнае, вельмі важнае хачу вам сказаць, – Тэдаў голас гучаў усхвалявана. – Ведаеце, я сёння ўвесь дзень думаю... Як усё недарэчна! Недарэчна і недарэчы. Хоць, з другога боку, для мяне палёгка. Фані такая была... я вам казаў пра тое... Такога цяжкога

характару пашукаць! Да таго ж, хочаце верце, хочаце – не, у мяне... ёсць другая жанчына.

– Другая жанчана? У вас?

– У мяне. – Вусны Тэда кранула вінаватая ўсмешка. – Але не падумайце, што гэта прыхамаць... Маўляў, з глузду з'ехаў чалавек пад старасць. Не, гэта сур'ёзна. Мы з Эні назнаёміліся да таго, як Фані разбіў паляруш. Сустракаліся ўпотай. Фані мы нічога не казалі, бо шкадавалі яе... Бог сведка, я быў цярплівы ўвесь гэты час, але ж колькі можна цярпець!

– Вы?.. Дык гэта вы усё зрабілі? – агаломшаны нечаканым прызнаннем Тэда, выгукнуў Павел. – А як жа экспертыза?

– Экспертыза? – Тэд хвіліну памаўчаў. – Якая вам экспертыза можа даказаць НАМЕР? Так, не здзіўляйцеся; усё адбылося, як я хацеў, але – само сабою. Я дзесяткі, сотні разоў планаваў, як тое зрабіць. І ўсё не рашаўся. А тут... Яна не магла без таблетак, і я штодня спадзяваўся, што ўрэшце пераблытае. Але падрабіць знарок, наўмысна, каб пераблытала, – не хапала характару. Відаць, я, як і бацька мой, з гэтых... з недарэк. Вось так. Вы верыце мне? – Тэд зноў ненадоўга змоўк. Вочы яго блішчэлі, на ілбе выступілі дробныя кропелькі поту. – Верце, але не дарэшты...

– Не дарэшты? Чаму?

– Бо я перад вамі таксама вінаваты. Бачыце, вы мне найперш у якасці патэнцыяльнага сведкі майго алібі былі патрэбныя, вось я і рыхтаваў вас да гэткай ролі. І тады, калі падаграваў гісторыю з бацькам Элен. І тады, калі падаграваў ваш інтарэс да звады між Фані і Вандаю. І нават тады, калі выклікаў на шчырасць... Ужо даруйце мне гэтую подласць. Я хітраваў, бо планаваў забойства, а на вас як на зручнага сведку разлічваў. Але так толькі напачатку было. Ведаеце, можа, вам гэта занадта сентыментальным падасца, але я з часам... прывык да вас. Вы як родны мне сталі. А забойства... Не, я не здзяйсняў яго! І даволі пра тое. Вунь аўтобус, хадзем.

Сіньёр Паскуаліні усё стаяў на тым самым месцы.

– Не здзіўлюся, калі, прыехаўшы сюды гадоў праз пяць, убачу яго зноў. – Тэд спыніўся ля палаткі, шукаючы нечага вачыма, нахіліўся над прылаўкам.

– Вы боты гледзіцё? Дарэмна, яны вам больш наўрад спатрэбяцца. – Голас Паўла прагучаў так адчужана, быццам і не яму належаў, а нейкаму зусім іншаму – старонняму чалавеку.

– Вы...– вусны Тэда Рэйнальдса застылі на паўслове. – Што вы маеце на ўвазе?

– Тое, што вы іх абувалі.

– Але як вы здагадаліся?

– Здагадаўся, – не адводзячы пагляду ад твару суразмоўцы, адказаў Павел. – Вы казалі, я не маю сышчыцкага імпэту. Уявіце сабе: ён, здаецца, прачынаецца. Хочаце ведаць, як я здагадаўся пра боты? Вельмі проста. Занадта ужо вы абуткам апошні час цікавіцеся. Там, у магазіне, зараз тут... Быццам якая навязлівая ідэя вам не дае спакою. Падазрона, праўда?

– Можа, і так, але пры чым тут боты?

– Пры тым, што вы іх абувалі вярнуўшыся з Монтэ-Касіна. І, згадзіцеся, не з тою толькі мэтаю, каб следам за жанчынамі дзеля ўласнага задавальнення прашпацыраваць. Больш сур'ёзная мелася ў вас задума – зрабіць нарэшце НАМЕР яваю. Ды выпадак выбавіў вас ад неабходнасці дзейнічаць актыўна. Сапраўды, усё нібыта само сабою зрабілася. Ды толькі ці так гэта?

– Вы хочаце сказаць, гэта я забіў?

– Зусім не. Але ж вы выдатна ведаеце, што пры жаданні маглі б дапамагчы пазбегнуць лятальнага зыходу, калі б паруліліся выклікаць медыцынскую дапамогу. Але вы не зрабілі гэтага, бо іншае мелі наўме. Здагадаўшыся, што да чаго, вы хуценька вярнуліся назад, да палаткі, падкінулі гандляру боты і ўпотай прабраліся ў гатэль. Гэтага часу якраз хапіла, каб здарылася трагедыя. Дык ці забойца вы? І ці дзіва, што зараз заснуць не можаце?

– Не кажыце больш нічога, не трэба! – Тэд абшчаперыў галаву рукамі, памалу, як сляпы, накіраваўся да брамы.

Павел прапусціў яго наперад, азірнуўся. Маленькі сіньёр Паскуаліні, склаўшы веерам старую газету, ратаваўся з яе дапамогаю ад ліпеньскае спёкі.

# ЧАЛАВЕК З АРМЯНСКІМ ПРОЗВІШЧАМ

Цемра і позні час Валянціна Гілyравіча ніколі не бянтэжылі. Ён часцяком, асабліва калі, як сёння, не было дома жонкі, бегаў у начную краму то па адно, то па другое. Гэта магло быць і ў дзесяць вечара, і ў дванаццаць, і ў тры раніцы. На час ён не зважаў – можа, таму, што за сорак дзевяць гадоў ніводнага разу не нарваўся на непрыемнасці. Вось і зараз, заняты думкамі аб хуткай паездцы за мяжу, рашуча перайшоў скверык у двары, ступіў на вулку, што вяла ад царквы да будынка нейкага ЖЭУ. Але не паспеў узысці на тратуар, як раптам пачуў ззаду, у некалькіх метрах ад сябе, шоргат колаў па асфальце. Ён азірнуўся: сапраўды, следам за ім ішло аўто, штосьці накшталт «Мерседэса». Ні колеру, ні нумара машыны вызначыць было немагчыма – яна сунулася – менавіта, сунулася – з выключанымі фарамі. Валянцін Гіляравіч падумаў, што гэта ўсё яму, мабыць, здаецца – звычайны прыступ неўрастэніі, якую ён нажыў два гады таму, калі ўпершыню трапіў за хуліганства ў міліцыю яго 15-гадовы сын Эдзік.

Ён сцішыў хаду, машына таксама прыпынілася. Гэта развеяла сумненні, але рызыкі не дадало. Да крамы заставалася далекавата, а наўкола, як на тое, ні душы. Канечне, у выпадку чаго ён будзе бараніцца. Але колькі іх там, у аўто? Можа, лепш за ўсё хіснуцца ў каторы пад'езд і там паклікаць на дапамогу? Але ж другая гадзіна – хто адчыніць?

Валянцін Гіляравіч зноў прыспешыў крокі, рэзка павярнуў улева, пакрочыў паўз бардзюр у накірунку суседняга дома. Ад пляцоўкі між дамамі, на якой жыхары звычайна выгульвалі сабак, напрасткі да крамы было ўжо не так далёка. Аўто таксама памкнулася пераскочыць праз бардзюр, але не здолела. Адкацілася назад, па-

ранейшаму не ўключаючы святла, штомоцы ірванула наперад, да прасвету, куды бег Валянцін Гіляравіч. Там яно спынілася, і ён выразна ўбачыў у салоне праз зацемненае шкло тры сілуэты. Трое на аднаго, мільгнула думка, а ён жа далёка не спартсмен. Ён спыніўся, робячы выгляд, што нічога не падазрае, пасунуўся бліжэй да будынка. Надзіва, з машыны вылазіць не спяшаліся.

Тады ён развярнуўся і, крыху супакоены, пакрочыў назад. Машына тут жа рушыла з месца, праімчалася ўздоўж тратуара, стала на супрацьлеглым баку двара. Цяпер ужо ў Валянціна Гіляравіча сумненняў не заставалася: яго ловяць. Але чаму? І чаму менавіта зараз, напярэдадні ад'езду ў Францыю? Можа, даведаліся пра тое і вырашылі абрабаваць, мяркуючы, што мае грошы? Дадуць па галаве, ключ забяруць і... Як недарэчна ўсё, як па-дурному... Собіла яму захацець гэтай мінералкі. Можа, закрычаць, паклікаць не дапамогу? Усё ж хто-небудзь высунецца з акна, можа, хоць нумар машыны запомніць. Не, наўрад, фараў жа не ўключаюць – знарок. У дзецюкоў сур'ёзныя, па ўсім відаць, намеры.

Дзверы аўто тым часам прыадчыніліся. Валянцін Гіляравіч адступіў да сцяны дома, затым, не разбіраючы дарогі, адчайна, як паранены звер, кінуўся назад, у супрацьлеглы ад перасьлнікаў бок.

І тут – ён нават не паверыў уласным вачам – дзверы аднаго з пад'ездаў адчыніліся. Прыблізна аднаго з Валянцінам Гіляравічам узросту жанчына, трымаючы на повадзе «баксёра», выйшла ў дворык, пакрочыла яму насустрач.

Гэта было выратаванне. Не паспеў ён і словам перамовіцца з незнаёмкаю, як аўто, даўшы газу, вокамгненна знікла ў цемры.

* * *

Патрэбны, дзевяноста трэці, квадрат знайсці аказалася не так проста. Добра-такі памучыўшыся над картаю, ён урэшце разабраўся, што да чаго, і рашуча накіраваўся па галоўнай алеі да патрэбнага месца. Прадчуванне хуткае сустрэчы з месцам захавання куміра маладосці на нейкі час адсунула прэч усё астатняе. Але толькі на нейкі час.

Што нехта нібыта суправаджае яго на гэтым вялізным чужым могільніку, ён здагадаўся адразу, як толькі сюды ўвайшоў. Паліцыянт-ахоўнік машынальна падаў яму з будана карту, і тут Валянцін Гіляравіч і адчуў патыліцаю ўпершыню чыйсці цяжкі, гнятлівы

пагляд. Ён азірнуўся – нікога. Паліцыянт, заўважыўшы, відаць, ягоную збянтэжанасць, спагадліва ўсміхнуўся, схаваўся ў будане.

Надзіва, магілку ён адшукаў у сектары адразу: зялёнае ўкрыжаванне на пастаменце міжволі прыцягвала ўвагу. Але прозвішча – Гасіён1 – усё-ткі напачатку збіла яго з панталыку. Ва ўсялякім разе толькі прачытаўшы ўвесь надпіс другі раз, ён упэўніўся канчаткова: трапіў туды, куды хацеў.

Ішла дзесятая гадзіна, і на могільніку, апроч яго, людзей было зусім мала. Валянцін Гіляравіч падумаў, што няблага было б тут, ля магілкі, сфатаграфавацца. Як на злосць, паблізу нікога не аказалася, толькі тая самая дзяўчына-полька, з якою перамовіўся словам-другім пры ўваходзе, блукала ў іншым сектары ў пошуку свайго Шапэна. На жаль, да яе было далекавата.

Зноў пачуўся нейкі шоргат – цяпер ужо справа, ад Сцяны камунараў. Валянцін Гіляравіч рэзка абярнуўся. Нікога. Успомніўся той вечар дома, калі трое ў машыне ганяліся за ім па двары. Халадок прадзёр шыю, прабег па спіне.

Ён хуценька выбраўся з сектара на алею, штохвіліны азіраючыся, пашыбаваў назад, у накірунку крэматорыя. Але ўцякаць вось так, нічога як след не пабачыўшы, не хацелася. Ці ж для таго сюды ішоў? Таму, абмінуўшы крэматорый, ён, нягледзячы на сполах, хіснуўся-такі ў бліжэйшы завулак. І не пашкадаваў. Праз колькі дзесяткаў велічна-непрыступных пастаментаў якраз набрыў на магілу Бальзака.

Але зноў, як і ля магілы спявачкі, радасць сустрэчы трывала нядоўга. Гук на гэты раз быў больш выразны, Валянціну Гіляравічу нават здалося, што кінулі каменем. Ён азірнуўся. Нехта быццам мільгнуў між пастаментаў. Праклятая блізарукасць! Ён зняў акуляры, стараючыся ісці пасярэдзіне дарожкі, шпарка пакрочыў да выхаду.

Паліцыянт, які, відаць, памятаў яго, здзіўлена зірнуў, сказаў нешта па-французску.

Валянцін Гіляравіч літаральна выбег за браму, накіраваўся да Пірынейскай. І толькі хвілін праз дваццаць, калі ўбачыў нарэшце будынак супермаркета, ад якога да гатэля было ўжо рукою падаць, адчай і страх адпусцілі яго.

Да ад'езду з Парыжа заставалася крыху больш як паўтары гадзіны.

* * *

Калі Павел вярнуўся ў аўтобус, усе ўжо былі на месцы.

– Ад'язджаем. – Вадзіцель Аляксей рашуча завёў матор. Новенькая шафёрская безрукаўка, якую ён купіў яшчэ тыдзень таму ў адным з буцікаў на тэрыторыі Польшчы і якую ўвесь гэты час не здымаў з сябе, бо жанчыны сказалі, што яна яму вельмі пасуе, ляжала побач з месцам сцюарда.

Сам сцюард, невысокі каржакаваты хлопец гадоў дваццаці трох, у канцы салона лічыў пасажыраў. Цяпер гэта было даволі складана: частка гродзенцаў, каб не цягнуцца дадому праз Мінск, выйшла яшчэ ў Варшаве, восем чалавек – у Брэсце і чацвёра, у тым ліку другі вадзіцель, – у Оршы. Тыя ж, што засталіся да Віцебска, скарыстаўшы магчымасць зручней уладкавацца, тут жа паперасаджваліся хто як хацеў, па адным.

– Здаецца, аднаго ўсё-такі не хапае. – Сцюард падышоў да Аляксея, сеў побач. – Апроч нас, з Оршы выехала васьмёра, а зараз – сямёра. Дык каго ж няма?

– А ці не майго суседа, – прыўзняўшыся па-над спінкамі сядзенняў, азвалася жанчына ў сярэдзіне салона. – Ён яшчэ ў Брэсце перасеў назад, а цяпер штосьці не бачна яго.

– А, таго армяніна? – падхапіў сцюард. – Каняна?

– Якяна,– паправіла яго жанчына. – І ён зусім не армянін.

– Хто б ні быў. – Хлопец нахмурыў бровы. – Больш як чвэрць гадзіны тут стаім, а чалавека няма. Вы ўпэўнены, што ён дзе-небудзь раней не выйшаў?

– Упэўнена.

– Ён тут недзе, – падала голас другая жанчына. – Я бачыла, як ён, калі толькі сталі, за парасонам вяртаўся. Яшчэ пажартаваў: маўляў, як дождж змочыць, тады плех на галаве стане бачны...

– Значыць, заблудзіўся ў цемры, – незадаволенасць на сцюардавым твары перайшла ў паныласць. – Пайсці яго пашукаць усім кагалам, ці што?

– Такою залевай сама шукаць! – сказаў вадзіцель. – Яшчэ чаго!

Халодны восеньскі вецер, поўнячы вусцішнасцю усё навокал, уварваўся ў салон, дрогкаю хваляю прабег па нагах пасажыраў.

Сцюард падняўся са свайго месца, пазяхаючы, накіраваўся да выхада. Ягоная шыракаватая, з мускулістымі плячыма спіна на момант засланіла экран тэлевізара.

– Няхай, сапраўды, мужчыны выйдуць паглядзяць, – нібы справакаваны нязручнасцю, – сядзі тут і чакай – узляцеў у паветра гучны, рэзкі голас яшчэ адной кабеты.

Уладальніцу голаса звалі Музаю Васільеўнай. За ўвесь час вандроўкі не мінула дня, каб яна не ўзняла яго на сцюарда і вадзіцеляў з-за кепскага абслугоўвання. І тое, што яна на гэты раз не пачала шукаць вінаватых, усіх вельмі здзівіла.

Чацвёра мужчын, у іх ліку і Павел Рудніцкі, выйшлі з аўтобуса, праклінаючы надвор'е, разбрыліся па наваколлі. Хвілін праз пятнаццаць усе пачулі свіст. Свістаў Аляксей. Мужчыны падаліся да яго і неўзабаве натыкнуліся ў беразнячку на ўзбочыне на таго, каго шукалі. Якян ляжаў дагары на прысыпанай лісцем зямлі і нібы спаў. Цела было цёплае, і вызначыць у цемры, жывы чалавек ці не, было няпроста. Аляксей успомніў, што бачыў у кагосьці з жанчын ліхтарык, пабег па яго ў аўтобус.

Пачуўшы навіну, жанчыны таксама павыскоквалі з салона, не зважаючы на дождж, рушылі следам за вадзіцелем да месца здарэння. Стаматолаг Гера памацаў у Якяна пульс.

– Няма, – сказаў сіплым голасам і борздзенька, ледзь не падскокам пашыбаваў назад, да аўтобуса. Ён яшчэ ў Празе, каб акупіць паездку, прыдбаў надта дарагую люстру і зараз увесь час баяўся, каб яе не ўкралі.

– Як гэта – няма? – Аляксей накіраваў святло ліхтарыка на галаву Якяна, і ўсе ўбачылі вакол яе кроў. Твар і шыя няшчаснага таксама былі ў крыві: кроплі дажджу, трапляючы на рану, распырсквалі яе навокал. І адзенне знізу ўжо было чырвонае. І нават калашына штаноў зачырванела, нягледзячы на тое, што ногі знаходзіліся вышэй за само цела.

– Ой, не магу! – ахнула кабета, што сядзела да Брэста побач з нябожчыкам, і страціла прытомнасць.

Недзе праз гадзіну дождж скончыўся. І акурат у той жа момант дзве міліцэйскія машыны з'явіліся на дарозе, міргаючы фарамі, спыніліся на ўзбочыне.

Урач, які доўга варажыў над нябожчыкам, аглядаючы цела так і гэтак, падышоў, нарэшце, да чалавека, што ўвесь час падаваў каманды, напаўголаса – мусіць, каб ніхто больш не пачуў – нешта сказаў. Начальнік хвіліну памаўчаў, затым, ні на кога не гледзячы, строга прамовіў:

– Гэтак? Што ж, тады давядзецца ўсіх затрымаць.

Вестка пра тое, што аўтобус затрымліваецца, нікому не прыйшлася даспадобы. Перспектыва яшчэ невядома колькі часу марна прабавіць

у аўтобусе толькі, бадай, аднаго чалавека не засмуціла – стаматолагаву суседку. Немаладая бландзінка, ні ад кога таго не хаваючы, ад першага дня закахалася ў Геру і нечаканую затрымку ўспрыняла як падарунак лёсу. І яна сама, і Гера – абодва былі жанатыя, але жанчыну тое не бянтэжыла.

Агляд месца здарэння працягваўся недзе з гадзіну. І к моманту яго заканчэння ўсе, нават тыя, хто баяўся высунуць на вуліцу нос, ведалі: Якяна забілі. Міліцэйскія чыны вымушаны былі гэта сказаць, каб апраўдаць затрымку аўтобуса.

Аўтобус разам з пасажырамі перагналі ў абласны цэнтр, прыпаркавалі ля будынка раённай пракуратуры. А ўжо праз якія паўгадзіны людзей пачалі па чарзе выклікаць на дазнанне. Паўлу гэткі гонар выпаў аднаму з першых. Пытанні, што задаваў яму следчы па прозвішчы Красько, у асноўным тычыліся асобы забітага.

– Вы добра ведалі яго?

– Мы жылі ў адным пакоі.

– Колькі часу? – пакамечаны, заспаны (ішла трэцяя гадзіна ночы) твар следчага не выяўляў нічога, апроч заклапочанасці.

– Усе дні, што былі ў Парыжы.

– Які ён быў?

– Які? – Павел задумаўся. – Маўклівы занадта... Гаварыў няшмат. Па прафесіі настаўнік, але працаваў не ў школе, а ў нейкім вылічальным цэнтры. Сям'я такая: жонка, два сыны. Старэйшы сын у Расіі, на Поўначы, жыве, гэта ён даў грошы на падарожжа. З маладзейшым, ведаю, нейкія непаладкі – непуцёвы хлопец. Яшчэ Гіляравіч даволі палахлівы быў. Яму ўсё здавалася, нібыта за ім сочаць.

– Ён казаў вам пра тое? – твар следчага на хвіліну ажыў. – Казаў?

– Казаў – напярэдадні ад'езду. Ён у той дзень на могілкі хадзіў. Вярнуўся нейкі ўсхваляваны, як сам не свой. Сказаў, нібыта хтось сачыў там за ім... Я падумаў – глупства, каму ён патрэбны ў Парыжы. Пазней я паспрабаваў вярнуцца да таго эпізода, але няўдала. Адмахнуўся: маўляў, глупства, прыступ неўрастэніі.

– Якян быў неўрастэнікам?

– Нібыта стаў, пасля непрыемнасці з сынам.

– Зразумела. – Следчы змоўк. Затым, нібыта раздумваючы, ці працягваць размову далей, неяк нерашуча падняўся з месца. – Ну, а якія ў яго былі адносіны з іншымі турыстамі?

– Я ж казаў ужо вам: ён некампанейскі быў чалавек.

– Не злуйцеся, памятаю. Пакіньце ваш адрас на ўсялякі выпадак. І чакайце ў аўтобусе. Скончу апытанне – развязем усіх па месцах жыхарства.

Павел выйшаў з памяшкання. У вузкім бруднаватым калідоры сядзела сцюцюрыўшыся ад холаду ў чаканні свае чаргі Муза Васільеўна.

Яшчэ праз гадзіну допыт быў скончаны. Усе з палёгкаю ўздыхнулі, збіліся ў пачатку салона. Рэй у размове павяла Муза Васільеўна. І не паспелі ад'ехаць і колькі сот метраў ад пракуратуры, як усе ўжо ведалі, што яна сказала следчаму. Адзінае, што засталося ў Паўла ў галаве з яе аповяда, было тое, што яна нібыта бачыла перад тым, як знайшлі труп Якяна, нейкую машыну.

– Збоку ад шашы, па дарозе ў лес.

– Што ж дзіўнага, прыгарадная зона, – сказаў Павел.

– А следчага гэта зацікавіла, – з дакорам у голасе прамовіла жанчына і дала яму яблык.

Яны ўжо з паўгадзіны прачакалі ў калідоры, а следчага ўсё не было. Нарэшце ўнізе, на першым паверсе, ляпнулі дзверы, пачуліся таропкія крокі.

Красько, высокі, у даўгаватым, як і папярэдні раз, цёмным плашчы, жвава наблізіўся да дзвярэй кабінета, няўважліва зірнуў на наведвальнікаў.

– Даўно чакаеце? – спытаў, звяртаючыся да Паўла. – Прабачце, што затрымаўся.

– Нічога. – Павел увайшоў следам за гаспадаром у памяшканне. – Ведаеце, я не адзін. Гэта мой дзядзька, Андрэй Юстынавіч...

– Дзядзька? – на вузкім хударлявым твары службоўца з'явілася здзіўленне. – Пры чым тут дзядзька? Ён што – юрыст?

– Не, не юрыст. Але ён ужо шмат гадоў займаецца расследаваннем розных спраў. Прыватны дэтэктыў, так сказаць.

– І як жа прозвішча дэтэктыва?

– Кавальчук.

– Кавальчук! – па-ранейшаму са здзіўленнем гледзячы на нязграбную таўсмаватую постаць чалавека ў капелюшы, паўтарыў следчы і голасам, у якім прабілася-такі пагарда, дадаў: – Не ведаю такога. Не чуў.

– А вы і не маглі чуць. – Юстынавіч пераступіў праз парог, зачыніў за сабою дзверы. – Я далекавата адсюль жыву, у вёсцы.

– Вось што – у вёсцы! – Красько ўсміхнуўся. – І колькі ж спраў вы раскрылі?

– Пяць.

– Ого! – паблажліва ўсміхаючыся, працягваў следчы. – І як вы іх раскрывалі? Маеце сваю метаду?

Юстынавіч уважліва акінуў паглядам кабінет.

– Маю, а як жа, – сказаў, падсаджваючыся да стала. – Дыялекталогію, ведаеце, выкарыстоўваю.

– Дыялекталогію? Ну, тут, у горадзе, гэта нам наўрад падыдзе. А вы што, знарок, каб мне дапамагчы, з вёскі прыехалі?

– Не, я на абследаванне ў бальніцу прыехаў. А тут якраз во пляменнік з вандроўкі вярнуўся ды расказвае такую гісторыю... Ну, я і падумаў, ці не магу быць карысны.

– На жаль, наўрад! – следчы развёў рукі ўбакі. – Так што вяртайцеся дадому ды там шукайце сабе злачынцаў. А цяпер прабачце, я хацеў бы сам-насам з вашым пляменнікам пагутарыць.

Апошнія словы былі ўжо сказаны пад грукат дзвярэй.

– Гэткі няўклюдны, здавалася б, чалавек, а гэтак жвава рухаецца, – ледзь зачыніліся за дзядзькам дзверы, сказаў Красько. – Але вернемся да нашай справы. Вы мінулы раз казалі пра тое, што Якян нечага баяўся. Той эпізод узяць на могільніку... А ці не казаў ён вам штонебудзь пра аналагічны выпадак тут, у Віцебску?

– Пачакайце, здаецца, згадваў. – Павел сцяўся ў намаганні ўспомніць размову з нябожчыкам. – Ага, было... у той самы дзень, калі ад’язджалі. Я быў у нумары. Тут ён вярнуўся з Пер-Лашэз.1 Расказаў мне ўсё, а потым яшчэ кажа – нібыта між іншым... як, маўляў, абрыдла ўсё дома, а зараз вось тут, у Парыжы... Але я тады не звярнуў на тыя словы ўвагі. Ды і ён так блытана гаварыў, што цяжка было зразумець.

– Шкада. – У голасе следчага прагучаў дакор. – Ну, ладна. Скажыце, а гэты Якян пры грашах быў?

– Пры грашах? Не думаю. На мяжы прадэклараваў 80 даляраў. У Дыснейленд, як і многія з групы, не ездзіў. Французскія цэны ўвесь час на нашы грошы пераводзіў, наракаў, што дорага ўсё. Харчаваўся, як і ўсе, тым, што з сабою прывёз.

Красько закурыў, дастаў з кішэні аўтаручку, грамзануў штосьці на перакідным календары.

– А вось такое да вас пытанне, – сказаў, прыплюскваючы правае вока. – Што вы, як сведка, мяркуеце пра ўсю гэтую гісторыю?

– Я не ведаю, – разгубіўся Павел. – Вось дзядзька дык, пэўна, мог бы...

– Ну, з дзядзькам у вас яшчэ будзе час пагаварыць. – Следчы ўсміхнуўся. – А ў нас тут сур'ёзная, знаеце, установа.

З пракуратуры выйшлі апоўдні. На дварэ па-ранейшаму было слотна: імжэў дробны дождж, хлюпота пад нагамі ажно вязла ўвушшу.

– Вы, гэта, не зважайце на яго, – каб падтрымаць неяк старога, сказаў Павел.

– Было б на каго зважаць. – Юстынавіч махнуў рукою. – Адна назва, што следчы. Ты заўважыў: на кніжнай паліцы ніводнае кніжкі па дыялекталогіі? – І, крыху памаўчаўшы, дадаў: – Дарэчы, я чуў, у педуніверсітэце неблагія спецыялісты ў гэтай галіне. Зойдзем?

Выкладчыца дыялекталогіі, жанчына пажылога веку ў просценькім адзенні без прэтэнзій на элеганцкасць, даведаўшыся, што да чаго, расчаравана ўсміхнулася.

– Вось яно што! А я думала – замена мне з'явілася.

– Вы не жадаеце займацца дыялекталогіяй? – здзівіўся Юстынавіч. – Як гэта можа быць?

– Сам прадмет мне вельмі падабаецца, – сказала яна, нібы апраўдваючыся. – Але як падумаю, што зноў надыдзе лета і давядзецца ехаць са студэнтамі на практыку – рукі апускаюцца. Тут, у інстытуце, за год гэтак не стомішся, як там за два тыдні. Ні сну табе, ні адпачынку. Бясконцыя вечарыны... Уначы мясцовыя лезуць праз вокны... Вось і падумваю, як бы пазбавіцца.

– І куды далёка даводзіцца ездзіць?

– Летась у Круках, на самай мяжы з Латвіяй, былі.

– О, там у некаторых мясцінах якасная рэдукцыя ў вымаўленні галосных вельмі моцная, – ажывіўся Юстынавіч. – Вы заўважылі?

– Заўважыла. А вы адкуль ведаеце?

– Я там жыву недалёка, ля Буслова.

– І ўсур'ёз займаецеся дыялекталогіяй? То ішлі б да нас на кафедру. Валянціна Іванаўна, возьмеце чалавека?

Валянціна Іванаўна, мяркуючы па ўсім, – загадчыца, засмяялася, згодна хітанула галавой.

– Дзякую за прапанову. Але мяне зараз больш анамастыка1 цікавіць. Хто тут па ёй спецыяліст?

– Я – па сумяшчальніцтву, – сказала выкладчыца дыялекталогіі. – І што канкрэтна вас цікавіць?

– Так, драбяза – некаторыя прозвішчы. Вам падчас практыкі не сустракаліся беларускія прозвішчы армянскага ўзору? Такія, як Палуян, да прыкладу?

– Чаму ж не? Сустракаліся. Дабрыян – у Гродзенскай вобласці, у нашай, на Пастаўшчыне – Крэскіян, ці не ў Юнькаўскім сельсавеце, калі не памыляюся.

– А Якян?

– Якян? Таксама, здаецца, там жа, на Пастаўшчыне. Чакайце, зараз запісы свае пагляджу.

Жанчына дастала са стала важкі агульны сшытак, узялася яго гартаць.

– Ага, вось... Якян. Лынтупскі сельсавет. Што яшчэ?

– Больш нічога, дзякую.

– Дык як, пойдзеце да нас на кафедру?

– Пайду, як добра запросіце. Але спачатку з'езджу дахаты – жонку папярэдзіць, а то хваляваццa будзе. Чамярыцу ля Буслова чулі? Дык прыязджайце са сваімі студэнтамі. Поўнага дысімілятыўнага акання1 не абяцаю, а частковае – гарантую.

Тое, што дзядзька Андрэй усур'ёз збіраецца заняцца забойствам, Паўла не здзівіла. Такі ўжо чалавек, не можа без занятку. Вось толькі ці не марная на гэты раз справа? Што ён там зможа ў сваёй Чамярыцы? Ды і здароўе так сабе: каторы год стэнакардыя прыцiскае. Ну, з'ездзіць на радзіму гэтага Якяна, і што далей? Справа, відаць адразу, не простая. І гэты следчы яшчэ, як на тое, упірысты трапіўся. Пыхі – болей, чым у Пуаро. Ну, пагаварыў бы з чалавекам, паслухаў бы, дык не ж. Яго, Паўла, ужо двойчы пасля дзядзькавага ад'езду выклікаў. Там, у пракуратуры, ён і Якянаву жонку ўпершыню ўбачыў. Разам Красько ў калідоры чакалі. Яна вельмі неахвотна размаўляла. На сына скардзілася: маўляў, п'е і паводзіць сябе пагана, яе ўжо два разы на пасяджэнне камісіі на справах непаўналетніх выклікалі. Іронія лёсу: бацька некалі сам гэткімі займаўся, калі ў школе працаваў. Знарок не прыдумаеш. Яшчэ пра тое, як у Парыжы было, пыталася. Расказаў ёй збольшага. Больш захоча даведацца – здымкі з таго, што нябожчык наздымаў, зробіць. Пра выпадак на Пер-Лашэз не расказваў, бо Красько пра тое прасіў. Нельга – значыць, нельга.

За дзвярыма пакоя пачуўся званок. Павел выйшаў у нешырокі, на тры кватэры, калідор, зняў слухаўку. Званіла Жанна. Ёй далі, нарэшце, адгулы, таму яны маглі б з'ездзіць на пару дзён у вёску. Гэтая маласямейка так ёй надакучыла, што і хвіліны лішняй быць у ёй не хочацца. Тым больш цётка Анеля даўно запрашала: сёлета шмат яблыкаў, і пакуль зноў не сапсавалася надвор'е, трэба даваць ім нейкую раду. Дык ці зможа ён паехаць з ёю, ці не? Ёй трэба ведаць загадзя, каб папярэдзіць начальства.

Павел задумаўся. Набліжаюцца выхадныя – што тут сядзець, у горадзе. Красько ён наўрад хутка спатрэбіцца. Ды і жонка ў такім стане – шосты месяц цяжарнасці – адну не выправіш у дарогу.

– Я паеду таксама.

– Выдатна. – У Жанніным голасе выразна чулася ўдзячнасць. – Тады я пазваню ў Чамярыцу, папярэджу.

Павел вярнуўся ў пакой, але і хвіліны не паспеў пабыць сам-насам, як зноў мусіў ісці да тэлефона. На гэты раз званіў Юстынавіч. Ён толькі што гаварыў з Жаннаю, яе званок аказаўся як нельга больш дарэчы. Ён ужо і сам збіраўся пазваніць, але яна апярэдзіла. У яго навін ніякіх няма, але ён хацеў бы, каб Павел удакладніў спіс турыстычнай групы. У тым, які ён незнарок («прабач, пляменнік!») сунуў у кішэню, калі разглядалі сувеніры, і які зараз знаходзіцца ў яго,– 26 чалавек. Але ж, мусіць, не ўнесены прозвішчы сцюарда і вадзіцеляў. Самому званіць Красько яму нельга, дык ці не мог бы ён, Павел, як-небудзь даведацца іншым спосабам?

– Я пазваню ў турфірму і спытаю. А яшчэ лепш – схаджу туды.

– Вось-вось, схадзі. Ды ненавязліва так папытайся, бы між іншым. А то пачнуцца розныя... здагадкі.

– Не хвалюйся, усё будзе як след, – сказаў Павел, пераступаючы з нагі на нагу на сцюдзёнай падлозе: на вуліцы было халаднавата, а ацяпляльны сезон яшчэ не пачаўся.

Малайчына дзядзька! Вадзіцель гэны, Аляксей, такі ўжо жвавы хлапчына, аж залішне. Тым больш, што яго даўжэй за ўсё і не было ў той вечар у аўтобусе.

– І здымкі ж прывязі, не забудзься! Хоць гэтак з цёткаю на Парыж паглядзім.

Яблыкаў, сапраўды, у гэтую восень было шмат. Адны асыпаліся – выспявалі другія. Кошыкі, начоўкі, цабэркі – усё было занятае налівамі, ранетамі, чырванабокімі сакавітымі штрыфелямі. Увечары

рэзалі іх карове, таўклі свінням, а к раніцы трава наўкола дрэваў зноў была ўсеяная імі.

– Такога ўраджаю даўно не было. – Юстынавіч зябка цепануў плячом, падаўся да хаты. – З таго году, бадай, як Малашку забілі.

– От мода ў цябе, бацька, – з’явіўшыся нечакана з-за вугла, сказала незадаволена Анеля. – Пра што б ні зайшла размова, усё на нейкія непрыемныя здарэнні скіроўваеш.

– А што тут такога, – запярэчыў ён і, каб перавесці гаворку на іншае, дадаў, звяртаючыся да Паўла: – Дзякую за прозвішчы.

– Няма за што! Ці прыдаліся ж хоць?

– Яшчэ як!

Анеля, палагаднелая, моўчкі накіравалася назад, за вугал, дзе ўдзвюх з Жаннаю перабіралі п’яніцы.

– Яшчэ як прыдаліся! Хочаш у тым упэўніцца – паехалі заўтра разам у Лынтупы.

– У Лынтупы? – Павел на хвіліну разгубіўся. – Але ж мне на працу паслязаўтра.

– Дык што? Прама з Лынтупаў цягнікам і паедзеш. Тое на тое выходзіць.

– А да Лынтупаў тых як дабярэмся? Вы ж казалі – семдзесят вёрст.

– Ёсць у мяне адзін надзейны сябрук, падкіне. – Юстынавіч падміргнуў, ляпнуў пляменніка далонню па плячы. – Не хвалюйся, пешкі не давядзецца клыпаць.

З Чамярыцы выехалі а восьмай. Павел развітаўся з цёткаю і Жаннай (яна заставалася да наступных выхадных), уладкаваўся побач з вадзіцелем. І ўвесь час, пакуль немалады «Жыгулёнак» адмерваў вёрсты па не надта гладкай гравейцы, слухаў размову спадарожнікаў. Дакладней, гэта быў маналог: гаварыў дзядзька Андрэй, вадзіцель жа толькі згодна хітаў галавой, устаўляючы зрэдку слова-другое. Яго звалі Мацеем, і з дзядзькавых рэплік Павел даведаўся, што ён не так даўно яшчэ працаваў у Буслове следчым.

Лынтупы сустрэлі іх звыклым для ранішняе вёскі ажыўленнем. Перагаварыўшы аб нечым сам-насам з Юстынавічам, дзядзькаў хаўруснік неўзабаве ад’ехаў па справах у райцэнтр.

– Ну, а мы ў школу. – Стары відавочна быў у гуморы. – Вунь яна.

У школе толькі што пачаліся заняткі.

– А, зноў вы! Дзень добры! – Дырэктарка, не старая яшчэ, строгая жанчына ў густоўным джэмперы павяла іх стандартным,

www.kamunikat.org

размаляваным нейкімі ўсходнімі ўзорамі калідорам да свайго кабінета. – Няйначай, яшчэ што-небудзь хочаце запытацца, – сказала, запрашаючы сесці. – Прабачце, але пра Якяна нельга!

– Чаму нельга? – здзівіўся Юстынавіч.

– Таму што быў прыехаўшы следчы... – яна зазірнула ў паперку, – следчы Красько і, даведаўшыся, што вы тут былі да яго, сказаў, пакуль вядзецца следства, гаварыць з кім бы то ні было пра нябожчыка забаронена. Я паабяцала, што не буду. Дарэчы, ён і падпіску з мяне ўзяў, во яна!

– Нельга дык нельга, – пагадзіўся Юстынавіч. – Тады пра іншага каго пагаворым.

– Пра іншага? – Жанчына ўскінула ўгору бровы. – Пра каго ж гэта?

– Пра Жвірблю, напрыклад. Знаёмае вам такое прозвішча?

Калі Мацей Рокша вярнууся ў Лынтупы, пачынала шарэць. Тут усе трое ўспомнілі, што яшчэ не елі. Павел пабег у краму па хлеб, а старыя дружбакі, зачыніўшыся ў машыне, узяліся абменьвацца ўражаннямі. Мяркуючы па тым, як задаволена абое выглядалі, калі ён вярнууся з магазіна, можна было зразумець: паездка дала плён.

Спехам перахапіўшы Анелінай вяндліны, накіраваліся на чыгуначную станцыю: да адыходу цягніка на Віцебск заставалася менш як паўгадзіны. Ужо ля самага вагона, развітваючыся, Павел не вытрымаў, запытаў у дзядзькі:

– Гэты Жвірбля... Як вы здагадаліся, што ён тутэйшы?

– Вельмі проста, – усміхаючыся, адказаў той. – Прозвішча літоўскага паходжання,– значыць, і шукай тут недзе, на памежжы. Дырэктарка таксама мясцовая. Чуў, як сказала – «быў прыехаўшы»? Так толькі ў гэтым рэгіёне гавораць: быў узяўшы, быў сказаўшы. – І, ужо крочачы следам за саставам, крыкнуў наўздагон:

– Зараз шмат кніг па дыялекталогіі ды анамастыцы, не лянуйся, пагартай каторыя.

Следчы Красько таксама, відаць было па ўсім, часу не губляў. Калі Павел прыехаў уранку наступнага дня дадому, яго чакала ў скрыні позва за ягоным подпісам. Цягнік прыбыў у абласны цэнтр а сёмай гадзіне, таму, каб не спазніцца к дзевяці да следчага ў кабінет, Паўлу давялося рабіць усё ледзь не подбегам. Збольшага, абы-як пагаліўшыся, ён схапіў партфель (а дванаццатай трэба было быць яшчэ і ў тэхнікуме), падаўся да трамвайнага прыпынку.

Красько быў у добрым настроі і прыняў яго адразу, не чакаючы прызначанага часу.

– Раскажыце пра вадзіцеля Піваварава, – сказаў нецярпліва, закурваючы цыгарэту. – Усё, што можаце.

– Пра Аляксея? – няўпэўнена (па прозвішчы вадзіцеляў падчас вандроўкі ніхто не зваў) перапытаў Павел. – Я не прыглядаўся да яго.

– Ну, што-небудзь жа вы пра яго ведаеце. Напрыклад, які ў яго характар?

– Характар? Звычайны. Ну, можа, крыху няроўны...

– Вось бачыце, а кажаце – нічога не заўважылі.

– Я сказаў: не прыглядаўся.

– Усё роўна. А гэта праўда, што ў яго з Якянам сутычка была?

– Якая там сутычка – драбяза, непаразуменне. Сядзець у крэсле ўвесь час нязручна, як ты ні старайся – не заснеш. У мяне паўбутэлькі «Белавежскай» было, выпілі з Гіляравічам патроху на паўдарозе ад Прагі да Парыжа. Тут яго сон змарыў. А сцюард у тую ноч чамусьці не клаўся, і месца на задніх сядзеннях, дзе ён спаў звычайна, вольнае было. Ну, сусед мой і кульнуўся там. А на вешаку побач Аляксеевы рэчы – кашулі, плашч і яшчэ нешта – віселі. Усё гэта Гіляравіч у сне паскідаў нагамі з вешака – незнарок, канечне. А раніцай з-за гэтага і разгарэўся сыр-бор.

– І што?

– Нічога. Аляксей чалавек настрою, пакрычаў, паабураўся – і супакоіўся. І ўся гісторыя. Праўда, адносіны на некаторы час сапсаваліся між імі.

– Сапсаваліся-такі?

– Ну, вядома. Яны нават, здаецца, пачалі пазбягаць адзін аднаго.

– Вось бачыце! Можа, яшчэ вы што заўважылі?

– Не ведаю нават. – Павел на хвіліну завагаўся: ці не зашкодзіць тое, што мае сказаць, дзядзькаваму расследванню. – Хіба што ля Эйфелевай вежы выпадак. Мы туды гадзін у адзінаццаць пад'ехалі. Аўтобус спыніўся збоч пляцоўкі на процілеглым беразе Сены, усе павыскоквалі з яго, пачалі фатаграфаваць. Я таксама выйшаў... Тут Гера падбег, папрасіў паздымаць яго на камеру. Затым я яму свой фотаапарат даў, ён мяне шчоўкнуў. І тут... Тут я ўбачыў Гіляравіча. Ён так выглядаў, быццам... змяю ўбачыў ці што іншае жудаснае.

Красько імгненна насцярожыўся, бліснуў вачыма.

– І на каго ён глядзеў у гэты час?

– Ён здымаў.

– Здымаў? Каго?

– Нікога, агульны выгляд вежы. А ў накірунку яе шмат людзей таўклося.

– Аляксей Піваварaў сярод іх быў?

– Не памятаю. Усё вельмі хутка адбылося... Нас зноў пасадзілі ў аўтобус і павезлі далей, у Ля Дэфанс.1

– Здымкі тыя, ад вежы, ёсць у вас?

– Ёсць, але кепскаватыя. Не вельмі выразныя.

– Усё роўна прынясіце мне. Сёння зможаце?

– Змагу, пасля працы толькі.

– Дамовіліся. – Красько задаволена крахтануў, закурыў. – Я буду чакаць.

– Я хачу спытаць. – Павел ужо падняўся з месца, але адыходзіць не спяшаўся. – Наконт Піваварава... Няўжо вы думаеце...

– А чаму б і не думаць? – з ходу, нібы чакаў такога пытання, адказаў следчы. – Чалавечая злапамятнасць не такая бяскрыўдная рэч, як здаецца. Дзіўна, што вы, педагог, гэтага не разумееце.

Ён яшчэ з калідора пачуў: нехта звоніць.

– Вас, – убачыўшы яго ў дзвярах, сказала суседка і саступіла месца пры століку.

Званіла Жанна. Пагаварыўшы з ёю колькі хвілін, Павел папрасіў паклікаць Юстынавіча. Той, падобна, сам чакаў чаргі, каб пачуць ад пляменніка навіны. Даведаўшыся, што Паўла зноў выклікаў на допыт Красько, ён тут жа папрасіў збольшага пераказаць змест размовы.

З усяго, што Павел яму паведаміў, старога зацікавіла толькі адно – выпадак ля Эйфелевай вежы. І ён тут жа, амаль слова ў слова паўтарыўшы фразу следчага, папрасіў даслаць яму здымак.

– Даслаць вам? Але я ўжо абяцаў Красько.

– Тады апішы, што там на ім. Толькі ўважліва глядзі. На задні план звярні ўвагу. Словам, падыдзі да справы адказна.

– Я так і ведаў, – невялікія, аблямаваныя светлымі рэдкімі вейкамі вочы Красько заіскрыліся радасцю. – Вось ён, Піваварaў.

– Але ж ён не адзін тут, – паспрабаваў запярэчыць Павел, але дарэмна.

– Так я і ведаў, – зноў і зноў узіраючыся ў здымак, працягваў паўтараць следчы. – Ён стаіць зусім побач з Якянам, значыць... Значыць, мая версія была правільная. Яны сутыкнуліся з

Піваваравым паглядамі і... Вось адкуль той выраз жуды на твары нябожчыка.

– Але ж яны не глядзяць адзін на аднаго!

– Мала што! Адвярнуліся! Падумаеш – не глядзяць!

Зазваніў тэлефон. Красько зняў трубку. І чым далей доўжылася размова, тым больш пахмурнеў, рабіўся злосным ягоны пагляд.

– Што? Які яшчэ Жвірбля? – Ён пасунуў да сябе спіс групы, хуценька прабег яго вачыма. – Ну, ёсць такі, дык што? Так? А вы часам не перабольшваеце свае здольнасці? І хто вам дазволіў лезці ў справу? – Следчы хацеў яшчэ нешта сказаць, але чалавек на тым канцы провада, відаць, зняважаны апошнімі ягонымі словамі, паклаў трубку.

– Навошта вы яму ўсё расказалі, таму старому! – твар Красько пабялеў, затым зрабіўся чырвоны. – Я ж прасіў, здаецца... Ён, бачыце, падказвае мне (апошняе слова было вымаўлена з асаблівым націскам), як весці следства. Раіць звярнуць увагу на другога вадзіцеля. Піваварaў, хам гэты, значыцца невінаваты, а памацайце Жвірблю. Маўляў, ён з тых самых мясцін паходзіць, што і Якян. Фантасмагорыя нейкая! Мала таго, што лезе, куды не просяць, дык яшчэ і павучае! Ён што, заўсёды ў вас такі?

– Вы дарэмна злуяцеся. – Павел стараўся гаварыць як мага спакайней. – Дзядзька Андрэй зусім няблага раскрывае справы.

– Ага, з дапамогаю дыялекталогіі! Смеху варта! Ды апроч таго, яшчэ ананістыку нейкую прыплятае!

– Анамастыку, – паправіў Павел.

– Хай анамастыку. – Красько супакоіўся гэтаксама нечакана, як і ўзарваўся. – Але што зробіш: ёсць сігнал – трэба правяраць. – І дадаў – нечакана неяк зусім па-вясковаму: – І жук, і жаба, і чорт, і баба – кожны ў юрысты пнецца.

Юстынавіч прыехаў праз два дні, у чацвер. І адразу ж з чыгункі, каб не марнаваць часу на пераезды з аднаго канца горада ў другі, накіраваўся да Красько. У палове дзесятай ён пазваніў з кабінета следчага Паўлу на працу, папрасіў за ім заехаць. Калі Павел прыехаў у пракуратуру, абое сядзелі ў кабінеце, ціхамірна гутарылі. І хоць асноўная – па справе – частка размовы была ўжо, відаць, скончана, не-не ды раз-пораз да яе вярталіся. Тут, мяркуючы па тоне асобных рэплік, згоды па-ранейшаму не было.

– Усё роўна я вашых довадаў не разумею, – упарціўся следчы. – Ну, навошта было гэтаму Жвірблю ісці на такое?

– Як гэта навошта. – Твар Юстынавіча ажно пачырванеў ад напружання. – Гэта ж самая элементарная помства – што тут разумець. Вы хіба не ведаеце, як блізняты бываюць прывязаныя адзін да аднаго. А тут такая магчымасць пакvітацца.

– Праз пятнаццаць гадоў?

– І што, што праз пятнаццаць! Уявіце, што гэта вашага брата адправілі за краты, а там калекам зрабілі... Ці даруеце калі такое?

– Гледзячы за што адправілі... – голас Красько прагучаў менш упэўнена, як напачатку.

– За звычайнае хуліганства. Як па сённяшнім часе, дык і зусім бяскрыўднае. Ініцыятаркай тадышняя дырэктар школы была: хлопец сваімі паводзінамі ёй паказчыкі па школе псаваў. Ну, і вырашыла пазбавіцца. Падгаварыла класную падаць заяву на камісію па справах непаўналетніх. А калі закруцілася справа, на пасяджэнне Якяна выправілі. Ён арганізатарам па выхаваўчай рабоце працаваў, малады яшчэ быў, нявопытны, вось і пхнулі яго. Ён і сказаў там – з чужых слоў. Падлетак загрымеў у выніку... А ў гэтых выхаваўчых установах вядома як... Мала таго што збілі на горкі яблык, дык яшчэ і згвалцілі. А вы – праз пятнаццаць гадоў! Пра такое і праз пяцьдзесят не забудзешся. – Юстынавіч змоўк на хвіліну. – А калі наконт таго, як яны, Жвірбля з Якянам, сустрэліся, гаварыць, дык тут таксама даволі проста ўсё – звычайнае супадзенне. Якян па пуцёўку зайшоў у турфірму – вось вам і сустрэча-неспадзяванка. Жвірбля пазнаў яго, пачаў высочваць. Калі ж не атрымалася на месцы звесці рахунак, папрасіўся ў тую самую паездку. За мяжою папраследаваў, але забіваць не стаў: чужая тэрыторыя, і невядома, як усё павернецца.

– Ну, хай будзе па-вашаму. Але ж Жвірбля ў Оршы выйшаў, а Якяна ля самага горада знайшлі. Як вы гэта растлумачыце?

– Ён упаўне мог дагнаць аўтобус на машыне.

– А гэта яшчэ даказаць трэба.

– Вось і даказвайце. – Юстынавіч падняўся з-за стала, у вачах яго, толькі што спакойных і лагодных, блiснула злосць. – Дзейнічайце, на тое вы і следчы. А мне... Я і так ужо даволі вам падказаў. Да пабачэння!

Яны выйшлі з будынка пракуратуры, не згаворваючыся, пасунуліся ўздоўж трамвайнай лініі да бліжэйшага прыпынку. Абодва маўчалі, хоць зразумела было, маўчанне працягнецца нядоўга.

– Гэтак вы лоўка яго абрэзалі напрыканцы, – ледзь уціснуліся ў трамвай, першы парушыў паўзу Павел. – Яму і запярэчыць не было чаго.

– Хай ведае. – Юстынавіч махнуў рукою. – Не, каб падзякаваць – у рожкі бярэцца. Другім разам больш абачлівы будзе. Зрэшты, як бы ні было, справа закончана.

– Гэты Жвірбля... Вы яго сапраўды па прозвішчы вылічылі?

– Сапраўды. Гэта вельмі, вельмі рэдкі выпадак, можа, адзін з мільёна. Да таго ж напачатку і ўхапіцца не было за што. Добра, дырэктарка тая ў школе сёе-тое падказала. Мацей таксама пэўныя звесткі пра абставіны той даўняй гісторыі ў райцэнтры выявіў.

– Дык вось куды ён у той дзень з Лынтупаў ездзіў.

– А ты думаў! Старыя валы, як кажуць, баразны не псуюць. – Юстынавіч змоўк на хвіліну, заўважыўшы, што людзі наўкола прыслухоўваюцца да іх размовы, працягваў шэптам: – І ты малайчына. Відаць, на карысць пайшло табе тое здарэнне з Рэйнальдсам... Дзякаваць Богу, цяпер і ў мяне пераемнік ёсць. Сыны не хінуцца да крыміналістыкі, дык хоць пляменнік у выпадку чаго падхопіць эстафету.

Трамвай тарганууся, стаў.

– А мне шкада гэтага Якяна, – сказаў Павел і накіраваўся да выхада.

– А мне, думаеш, не шкада? – энергічна працуючы локцямі следам за пляменнікам і выклікаючы тым самым абурэнне іншых пасажыраў, падхапіў Юстынавіч. – Саграшыў аднойчы, а пакараны два разы аказаўся чалавек.

– Як – два?

– Ну, калі згубіць сына – не пакаранне, тады не ведаю, што сказаць.

Да адыходу аўтобуса заставалася ўжо меней як паўтары гадзіны, і Павел прыкметна хваляваўся: час выпраўляцца на трамвай, а дзядзька ніяк не скончыць галіцца. Нарэшце дзверы з ваннага пакоя адчыніліся, і Юстынавіч, чырвонатвары, вачавідкі нейкі памаладзелы, выйшаў у калідор.

Зазваніў тэлефон. Павел памкнуўся да апарата, але стары апярэдзіў яго.

Званіў Красько.

– Можаце павіншаваць, сёння мы ўзялі яго, – сказаў, нібы знарок не называючы прозвішча злачынцы. – Без сучка і задорынкі правялі аперацыю. Нават не рыпнуўся і крылцамі не махнуў, дарма што птушка. Вы спадзяюся, ведаеце, шаноўны вучоны, што ў перакладзе з літоўскай zvirblis верабей азначае?

– А піяф з французскай – верабейка, – сказаў Юстынавіч і, задаволены сабою, паважна дадаў: – А вы сцвярджаеце, што супадзенняў не бывае.

www.kamunikat.org

# ВЫПАДАК НА ЗГОНЕ ЗІМЫ

Гэтая гісторыя шмат нарабіла ў Чамярыцы пярэпалаху. Здарылася яна не так даўно, і дасюль ніхто не ведае, чым жа скончылася следства. Бо яшчэ не было суда і калі ён будзе – невядома. Нам не дакладваюць, а гэты недарэка Юстынавіч маўчыць, нібыта вады ў рот набраўшы. Ходзіць з загадкавым выглядам і ўсё нешта насвіствае сабе пад нос. Два разы прыязджаў з раёна следчы. Апытаў некалькі чалавек, пахмыкаў у пальчатку – і драла назад, у горад, падалей ад слоты і сцюжы.

А пачалося ўсё паўгода таму. Стаяла восень, кастрычнік быў на дварэ – самая непагадзь. То дождж ліе без супынку, то мокры сняжок з ночы зацярушыць. У вёсцы сумна ў такую пару, панылa. На гадзіну-другую ажываць наваколле, вяртаючыся са школы, дзеці, і зноў усё аціхне да наступнага дня.

І вось у адзін з гэткіх дзён і з'явілася ў Чамярыцы Людміла Сцяпанаўна. Звалілася, як снег на галаву. Сышла апоўдні з аўтобуса – і прама да Савошкавай хаты. Ды так ладна, так годна прайшла па вуліцы, што ажно сабакі паразяўлялі ад здзіўлення пашчы.

Ды, скажу вам, мелі сабакі рацыю. Кабета, хоць і была, як кажуць, у веку, выглядала надта фацэтна: футра, чырвоныя штонікі, завушніцы да плячэй. Валасы кароценькія, белыя, але не сівыя, як у нашых жанок, а з блішчастым адлівам – пафарбаваныя. Словам, гарадская, гэткую з кошыкам на гародзе ці ля статку ў хляве добра не напружыўшыся не ўявіш.

Савошка якраз у той дзень лазню паліў. Дык яна абышла панадворак і нацянькі туды, на дымок, пашыбавала. Як яны там сустрэліся – ніхто не ведае, але назаўтра па сяле разнеслася чутка, што да Казіка Савошкі прыехала з Ленінграда стрыечная сястра.

З добры тыдзень у нашай Чамярыцы толькі і гаворкі было, што пра прыезджую. Бабы дык знарок пільнавалі на дварэ, каб зблізку пабачыць. Збяруцца дзе-небудзь побач з Савошкавай хатай і ну ж мянціць языкамі. Балбочуць і ўсё пазіраюць спадцішка на Казікавы

вокны, цікуюць. Ды дарэмна: пра госцю ні слыху, ні дыху. Мільгне зрэдзьчас на панадворку, падражніць сваімі чырвонымі штонікамі і знікне, як скрозь зямлю праваліцца.

А нашым яшчэ больш карціць даведацца, хто ды што. Папаўзлі розныя чуткі. Маўляў, ніякая яна Савошку не сястра – так, збоку прыпёку, а хутчэй за ўсё – палюбоўніца. Знюхаліся, калі ён служыў у войску, а цяпер вось, як стала ў горадзе цяжка жыць, і ўспомніла пра яго, заявілася. Абярэ да ніткі і ўцячэ назад, у свой Ленінград. Па чалавеку ж бачна, прыстойная жанчына белым валасы пэцкаць не будзе.

Але тут нехта са старэйшых успомніў, што, сапраўды, у Савошкі нібыта была стрыечная цётка, якая выйшла перад самай вайной за рускага афіцэра і засталася з ім у Ленінградзе. Кінуліся шукаць фотаздымкі. І што вы думаеце – адшукалі. Дзевяностагадовая цётка Анця ажно два знайшла ў куфры: на адным матка Людмілы Сцяпанаўны на полі разам з дзяўчатамі, на другім – матка і бацька, яна з дзіцем на руках сядзіць у крэсле, ён побач стаіць у вайсковай апратцы. Ну, нібыта ўсе і супакоіліся.

І вось не паверыце – не мінулася і месяца, як гэта самая Людміла Сцяпанаўна стала ў вёсцы сваёй. Пакрысе, пакрысе пачала паказвацца на людзях – і як прываражыла нашых жанок. Адна яе кёй нясе на сняданак, другая свежыны, трэцяя малака... Людачцы ўсё, Людачцы, яна ж, бедненькая, тут зусім адна, нікога ў яе няма, апроч Казіка... Далей – болей, бачым, ужо і апошнюю кашулю гатовы спрытнюзе аддаць.

А таго не разумеюць дурніцы, што Людачка гэтая толькі народ разбэшчвае сваім выглядам ды раздоры ў сем'ях сее. Ведаю, што кажу. Вунь у лазні мужыкі як збяруцца, дык толькі і размоў, што пра чырвоныя штонікі.

Тут неўпрыкмет зіма ўсталявалася. Ды дзіўная нейкая: то маразы ціснуць пад трыццаць, то на наступны дзень адліга. Нездаровае надвор'е, небяспечнае, асабліва для немаладога чалавека. І клопату болей з ім: з вечара збярэшся на кані ў лес, раніцой глядзь у вакно – а на двары твань.

Словам, бяда, асабліва Савошку. Бо вада ў нас з калонкі нядобрая цячэ, рудая, дык ён палонкаю апякуецца. Праб'е па першым лёдзе дзірку і ажно да самае вясны яе даглядае. Ды як даглядае! Адно зірнуць на тую палонку – дык зойме. Кругленькая, ладненькая, не раўнуючы студня, толькі меншых памераў. Зверху шалашык на

дошках, накшталт зруба, адкінуў яго і набірай вадзіцу, колькі табе трэба. А калі надта сур'ёзныя маразы нахопяцца і лёд патаўсцее, тады Казік наўскос сходзенькі ладныя ў ім выдзяўбае, каб латвей было вядро даставаць. Так і шчыруе да самай вясны: тут падправіць, там паддзяўбае. І ўсё сам. Нікога не падпусціць, нібыта баіцца, што хто-небудзь папсуе ягонае дзецішча. У адліжныя дні і зусім як сам не свой робіцца: а раптам сходні распаўзуцца і які недарэка ў ваду каўзнецца.

А карыстаюцца Савошкавай палонкай усе на нашай вуліцы. У восем гадзін бразнулі вёдры – ведай, Вэрця Андрушонкава падалася да ракі. За ёю мая цяцера паўзе. Следам Мар'я – удава. Апошні, пад дзевяць ужо, сам Казік са сваёй нары выпаўзае. Ідзе – нібы той Майсей да бога на Сінаеву гару: урачыста, паважна, самавіта. Зачэрпне вядром, паспытае вадзіцу на палец, праверыць, ці не напаскудзіў хто ля святога месца, падправіць што трэба – і дахаты. А надвечар зноў да палонкі – дзяўбаць.

Адзіны, каго рэдка ўгледзіш ля Савошкавай палонкі, – Банадзя Лісоўскі. Той дасвеццем ходзіць, калі ўсе яшчэ спяць. Такі ўжо чалавек, лішне гадзіну не падрэмле. Ёсць работа, няма – усё роўна будзе соўгацца, як здань, шукаць сабе справы. І ўсё паціху, усё маўчком.

Ну, у вёсцы вядома як: з дня ў дзень адно і тое ж – праца, плёткі, дробязныя, нецікавыя староннямy чалавеку навіны. Пакрысе і прыезд Людмілы Сцяпанаўны перастаў займаць: прыцярпеліся, звыкліся, перасталі зважаць. Праўду сказаць, яна і сама перамянілася, стала больш гаваркая, таварыская. Работы і ўвогуле не цуралася. Нашы кабеты ідуць бульбу перабіраць – і яна туды ж з кошыкам, збярэцца талака ў лес па дровы – і яна з усімі. Нават гаварыць збольшага па-нашаму навучылася, хоць і не надта гэта ў яе атрымлівалася. Адным словам, прынялі Людмілу Сцяпанаўну ў вёсцы за сваю.

Так яно і цягнулася да самае вясны, аж пакуль не здарыўся гэты дзікі выпадак на рацэ.

Было гэта на Язэпа, толькі-толькі перакуліла на другую палову сакавіка. Дзень ужо значна падаўжэў, але халады яшчэ трымаліся па начах. Удзень – капеж, а ўначы сцюжа. Іншы раз так усходзіцца мароз – ажно бярвенне трашчыць па сценах. І знаў Савошку клопат. Бо к вечару заплыве палонка падталым снегам, а к раніцы глядзь – уся ў камяністым лёдзе, адно паспявай прабіваць ломікам. Тут яшчэ, як на злосць, грыпа ўсхадзілася. Скруціла і Казіка. Ляжыць увесь

мокры, тэмпература пад сорак. Выклікалі ўрача. Тая паслухала і загадала збірацца ў бальніцу. «Якая бальніца! – затросся. – Гаспадарка ў мяне. Што вы, з глузду з'ехалі?»

Але тут Людміла Сцяпанаўна ўрачысе пасобіла. «Што ты, – кажа, – Казя, турбуешся? Дагледжу я тваю гаспадарку. І палонку таксама. Усё зраблю як след, не хвалюйся... Едзь лячыся». Ну, дзецца некуды – выправіўся наш Савошка ў райцэнтр...

А ленінградка і сапраўды хвацкая аказалася кабета. Думалі: ну ўсё, занядбае хату. Аж не. І ў хляве ў яе парадак, і ля палонкі паспявае пазавіхацца. Яшчэ цёмненька, а яна ўжо на рацэ: дзёўб, дзёўб, дзёўб. Дзівіліся ўсе: гарадская, а гэтак у яе ўсё спраўна атрымліваецца.

Тыдзень прайшоў. І вось неяк аднаго разу прачынаемся мы з Надзяю ад несусветнага гвалту. Злякаліся спрасоння: ці не пажар? Выбег я на вуліцу, прыслухаўся: нікога. Толькі ўскараскаўся назад на ганак – зноў лямант, ад рэчкі. Ды такі прарэзлівы мужчынскі голас! —Ну, – кажу сваёй, – моў пацеры, нехта тоне на рацэ». Грукнуў Петраку, суседу, у аканіцу, ды подбегам удваіх на крык.

І што вы думаеце? Светануў сусед ліхтарыкам, і ўбачылі мы... Не паверыце: сядзіць наша Сцяпанаўна вярхом на Банадзю і штосілы тыцкае ягонай галавой у палонку. Тыцкае і штосьці прыгаворвае, тыцкае і прыгаворвае. Аклікнулі – каб табе схамянулася, нібы аглухла. Тыцкае акрываўленымі рукамі Банадзеву галаву ў палонку ды паводзіць дзіка вачамі ўбакі, нібы звар'яцелая. А той дрыгае штосілы нагамі ды хапае ротам паветра. А яна ўсё тыцкае... Ачомаліся мы з Петраком, кінуліся Банадзю на падмогу. Учапіліся за Людміліны рукі-ногі, давай адцягваць. Дзе там! Трымаецца за Банадзеў гарляк, хоць ты яе абцугамі аддзірай. Урэшце далі неяк рады, адцягнулі Банадзю, паднялі, павялі да хаты. Хоць якое там павялі – лічы ўнеслі ў дзверы. Распранулі, паклалі на ложак... Пачалі распытваць, што і як, – маўчыць. Вачыма лыпае, паветра хапае ротам, як рыбіна на беразе, і маўчыць. К паўдню стала яму зусім кепска, выклікалі «хуткую». Выправілі ў бальніцу, а самі – да Савошкі, зірнуць на Людмілу Сцяпанаўну.

Адчынілі асцярожненька дзверы, і ў хату. А яна... баба бабаю. Сядзіць на лаве ля сцяны, падпёршы кулаком шчаку, і хістаецца сабе ўправа-ўлева, як непрытомная. Шварка на ёй Савошкава, боты – гумовікі, штаны нейкія картовыя, як даўней мужыкі насілі. Валасы русыя, у пучок на патыліцы сабраныя. Словам, не пазнаць Сцяпанаўну.

Тут жанкі пачалі збірацца. Балбочуць, рукі заломваюць: а што гэта ты, маўляў, Людачка, нарабіла, а як жа такое сталася? А яна зірнула на ўсіх спадылба ды як зарагоча. Ці паверыце, у мяне ажно мурашы па спіне пабеглі ад таго смеху. А ёй хоць бы што. Апрытомнела і давай усіх да стала запрашаць. Калі ласка, маўляў, госцейкі дарагія, зараз гарбаты вам згатую, пачастуецеся... Тут з сяней тупат пачуўся, увальваюцца ўчастковы і з ім гэты вучоны боўдзіла Юстынавіч. «Вы грамадзянка Аніськовіч?» – «Я». – «Пойдзем у сельсавет». – «Што ж, трэба, то пойдзем, – разводзіць яна рукамі ў наш бок, няйначай просіць прабачэння, што не ўдалося як след пачаставаць. – Толькі пераапрануся».

І ідзе ў спальню. Неўзабаве вяртаецца – але ці ж Людміла гэта Сцяпанаўна, якую толькі што, хвіліну перад тым, бачылі? Ну, я разумею, футрачка там, чырвоныя штонікі – гэта дробязь. А вось як можна валасы гэтак хутка перамяніць? Бо былі ж русыя, а тут белыя-белыя зрабіліся, як вата, ажно вочы адбірае. Усе ахнулі, а яна зрэнкамі бліс ды да маёй. «Вось табе, – кажа, – Надзечка, ключы ад усяго, даглядай статак, пакуль Казік не вернецца. Бо ён жа будзе непакоіцца, а мне невядома ці дасць Бог сюды вярнуцца».

І пайшла. І болей мы Людмілу Сцяпанаўну не бачылі. Нібыта сядзіць у Буслове пад следствам, чакаюць, пакуль Банадзя (у яго запаленне) з хваробы выкараскаецца.

І вось жа людзі ў нас, скажу я вам. Замест таго каб асудзіць нягодніцу, шкадуюць яе. Вохкаюць, спачуваюць, нібыта не Банадзя ад яе, а яна ад яго пацярпела. Мая ўжо два разы лётала ў горад, вазіла перадачы. І іншыя ездзяць. І дэтэктыў гэты, Юстынавіч, добрая цаца. Намедні, чую, кажа ў краме: «Ат, якая там віна. Што зарабіў чалавек, тое і атрымаў». – «Як гэта зарабіў? – пытаюся. – Нешта вы не туды, Юстынавіч, заварочваеце». – «Акурат туды, куды трэба», – адказвае. І апавядае гісторыю. Маўляў, пад час хапуна, ужо пасля вайны, Банадзя (яму тады надарылася быць у Ленінградзе) накляпаў на Людмілінага бацьку. Таго і засадзілі на восем гадоў. А на допытах, каб хутчэй прызнаўся, тыцкалі тварам у ледзяную ваду. Вось яна і надумалася адпомсціць.

Але ж калі тое было! І ці было яшчэ? А калі бацька гэткі быў зацяты, як дачка, дык, можа, і варта было накляпаць...

Ну, пабачым, чым скончыцца. Урэшце і я, калі што якое, рукі склаўшы сядзець не буду. Маюцца з даўніх часоў у раёне сякія-такія сувязі, буду ў Буслове – шапяну каму трэба.

# ЛЯ СХОВУ

Ён начаваў тут пятыя суткі, а здавалася часам – мінула не менш месяца. Па-першае, даймалі перапады тэмпературы. Удзень – горача, як у лазні, уначы, наадварот, хоць кажух апранай. Па-другое,– і гэта найбольш было непрыемна – не давала ні на хвіліну спакою казяра. Дробная, няўлоўная, яна жывасілам лезла пад вопратку, казытала ўвушшу, метадычна і нахабна атакавала найбольш далікатныя часткі цела.

Апроч таго, увесь час хацелася есці. Харчоў, што ён прыхапіў з сабою, адыходзячы з дому, ледзь-ледзь хапіла на тры дні. І калі б не гаспадыня, яму, напэўна, прыйшлося б зусім кепска.

Яна прыходзіла звычайна шарачком. Моўчкі клала ля драбін пакунак з ежаю, моўчкі жагналася, моўчкі зачыняла за сабою рыпучыя, пахапкам збітыя з негабляваных дошак дзверы. Людзі, што прывялі сюды Крыжэвіча, гэтак настрашылі яе і гаспадара магчымымі непрыемнасцямі, што яны абое зараз і зірнуць баяліся ў той бок, дзе ён хаваўся.

Вокны ж суседскае хаты, як знарок, выходзілі на схоў. Добра яшчэ, нехта здагадаўся калісьці пасадзіць уздоўж сажалкі, што раздзяляла дзядзінец між падвор'ямі на дзве часткі, радок арэхавых кустоў.

Наогул, саміх суседзяў на двары можна было ўбачыць рэдка – толькі, калі завіхаліся па гаспадарцы. Затое дачка іх, камлюкаватае смяшлівае дзяўчо гадоў шаснаццаці, не стыкалася ў хаце. То ўладкуецца з самае раніцы загараць пад кустом, то ўдумае лавіць вудаю ў сажалцы зіхатлівых карасёў.

Заўчора, як на злосць, з'явілася яшчэ адна асоба – хударлявы цёмнавалосы мужчына гадоў трыццаці. Па ягоных рэпліках ды па прычындалах, якія ён прывёз з сабою на ровары, Крыжэвіч здагадаўся: электраманцёр. Аказалася, сапраўды, – манцёр, прыехаў рамантаваць праводку. Але працы ён не надта пільнаваўся, больш зважаў на дзеўку. Увечары першага дня ўжо сядзелі ўдваіх пад арэшынай, і ён нешта горача шаптаў ёй у вуха. А па змярканні, калі добра ўцямнела, нечакана прыцягнуў дурніцу ў чужую пуню. Папраўдзе, яна не надта адбівалася, ва ўсялякім разе прыкмет барацьбы чутно не было.

На другі дзень абаіх доўга не было відаць – ці не адсыпаліся. Нарэшце бліжэй к абеду з'явіліся. Спачатку ён выпаўз. Пакурваючы, доўга сядзеў на лаве, глядзеў, як клююць размяклыя кавалкі хлеба ў стаўку гуллівыя карасі. Пасля і яна выйшла, села побач, прыхілілася грудзьмі да ягонага моцнага мускулістага пляча. Ён выглядаў задаволеным, але і яна таксама на няшчасную не выдавала, дарма што была зусім маладая, амаль дзіця.

На двары нехта як быццам прайшоў. Але так ціха і асцярожна, што крокі з кладні ледзь-ледзь можна было пачуць. «Ці не гаспадыня», – падумаў Крыжэвіч. І памыліўся – прыйшоў гаспадар. Адклаўшы засаўку, ён няспешна перанёс цераз парог хворую нагу, стаў збоч драбін.

– Падсілкавацца табе хазяйка прыслала, – сказаў ціха, амаль шэптам. – На, чалавеча.

Крыжэвіч узяў каструлю, паставіў яе на прыпарушаную сенам маціцу.

– Дзякую.

Стары паважна пратэпаў назад, да паўрасчыненых дзвярэй. Але выходзіць не спяшаўся. Стаяў і ўсё ўзіраўся моўчкі ў Крыжэвічаў твар, быццам хацеў зразумець нешта незразумелае.

– Ты гэта... не з міцянгоўшчыкаў часам будзеш? – спытаў нарэшце, ледзь варушачы абветранымі тонкімі вуснамі. – Толькі што па тэлевізары пра іх казалі. Як яны міцінгуюць ды ўласцям працаваць перашкаджаюць.

– Усё гэта прапаганда, бацька, – захоплены знянацку запытаннем, сказаў няўпэўнена Крыжэвіч. – Хлусня, словам...

– Ага, напэўна, прапаганда, – пагадзіўся стары. – Хлусня і больш нічога. Ну, дык я пайду. Калі што якое – падавай сігнал, як умовіліся.

Ён выйшаў з пуні, акуратна зачыніў за сабою дзверы. Бразнула засаўка.

«Але ж во разабрала яго», – падумаў Крыжэвіч, праводзячы старога паглядам ажно да хаты.

Дзяцюк і суседка па-ранейшаму сядзелі на лаве. Убачыўшы старога, дзеўка адсунулася ад кавалера ўбок, пачала абыякава вадзіць пальцамі босае нагі па траве. Яна ўвесь час хадзіла басанож, і Крыжэвіч каторы раз пазайздросціў ёй. Калі-то ўжо яму давядзецца паспытаць такога шчасця? Першыя дні хоць уначы можна было выйсці, пашпацыраваць па сцяжыне ўздоўж хмызняку. Цяпер жа, з прыездам манцёра, і гэта стала небяспечна. Халера яго ведае, калі ім

узбрыдзе ў голаў заявіцца ў пуню? Адна застаецца надзея – на ягоны хуткі ад'езд. А што, калі наогул нікуды не паедзе? Возьме дый застанецца тут у прымах? Але наўрад. Кілун, відаць, біты. Сап'е слодыч ды дасць лататы, толькі яго і бачылі.

На гэты раз першая выйшла дзяўчына. Няспешна падышла да лавы, села. І амаль тае ж хвіліны аднекуль з-за вугла вынырнуў манцёр, пасвістваючы, наблізіўся да яе. Яны колькі часу аб нечым ціха гаманілі, затым падняліся абое, накіраваліся сцяжынаю ўздоўж плота да ракі. «Ну, дзякуй Богу, у іншае месца пацягнуліся», – падумаў узрадавана Крыжэвіч. Аднак радасць яго была заўчасная. Недзе праз чвэрць гадзіны ля пуні пачуўся прыглушаны смех. Затым рыпнулі дзверы, і дзве постаці праціснуліся ў памяшканне, застылі ля драбін.

– Можа, на кладню сёння ўзлезем? – стрымліваючы хваляванне, спытаў мужчына.

– Не-не, – дзеўка адхіснулася ўбок, быццам супраціўляючыся таму, чаму вось-вось наканавана здарыцца, ухапілася абедзвюма рукамі за драбіны.

– Ну, дык хадзі сюды.

Яны паваліліся на складзеную збоч катуха шырокім пластом канюшыну. У гэты ж момант з вуліцы пачуўся кашаль. Нехта ішоў, падсвечваючы ліхтаром, да хаты.

– Ты, Марылька? – азваліся з панадворка. – Позна ходзіш. Што-небудзь трэба, ці так?

– Ды запалак прыйшла пазычыць. Газ няма чым запаліць.

– А-а, ну, хадзем, у мяне шмат гэтага дабра.

Галасы сціхлі, але ненадоўга. Кабеты зноў выйшлі на двор, сталі збоч ганка.

– Манцёр ваш тутака яшчэ?

– Тутака. Заўтра нібыта ад'язджае. З Раяй на вечарыну падаліся.

– На вечарыну? І не баішся пускаць дзеўку са староннім мужчынам?

– А чаго мне баяцца? Рая дзяўчына сур'ёзная, не пустальга якая-небудзь. Я за яе, як за сябе, спакойная.

– Ну, і добра, калі так.

Госця развіталася, высока, амаль на ўзроўні грудзей, трымаючы ліхтарык, пасунулася дахаты.

– Бачыш, як хваліць цябе, – ледзь яна адышлася, пачуўся манцёраў шэпт. – Сур'ёзная, кажа. Яно і праўда, са мною несур'ёзная не пойдзе. Сур'ёзная ты, скажы? Да мяне шмат з кім...

– Адчапіся, смала... З двума ўсяго. Ды і то не тут, у горадзе.

Затым галасы сціхлі...

Увесь гэты час, пакуль яны валтузіліся, Крыжэвіч, баючыся варухнуцца, ляжаў на месцы, дарэмна стараўся калі не заснуць, дык хоць бы засяродзіцца на чым-небудзь. Аднак нічога з таго не атрымалася. Шэпты, войканне, стогны, што даносіліся з процілеглага кута, самахоць лезлі ў вушы, казыталі нервы, пазбаўлялі раўнавагі. І толькі недзе ўжо далёка за поўнач, калі двое тыя, стомленыя адно адным, нарэшце сціхлі, і ён праваліўся ў цяжкі, трывожны, бы салдацкі прывал у перапынку між баямі, сон.

І прачнуўся ён таксама не без іхняе дапамогі – ад неасцярожнага, быццам выклік каму нябачнаму, грукату дзвярэй. Уставаць не хацелася, ды мусіў: дзверы насцеж, ці мала хто можа неспадзеўкі ўзбіцца. Асцярожна спусціўся па драбінах уніз. З цемры прыемна пацягвала свежым, з пахам вільготнае травы, халадком.

Захацелася выйсці. Ён пераступіў парог, прайшоў колькі крокаў уздоўж сцяны. Раптам у суседзяў запалілі святло. Бляклa-жоўтая паласа разанула цемру, легла роўным снопам ад акна амаль да дзвярэй пуні. «Вярнуліся з вечарыны», – падумаў весела Крыжэвіч, падаючыся бокам бліжэй да сажалкі. Па-за фіранкамі мільганула і тае ж хвіліны знікла Райчына постаць. Святло пагасла. Зорная летняя ноч запанавала над зямлёй.

Спачатку прайшоў міма гаспадар. Яго Крыжэвіч адразу пазнаў па гучным, крыху сухаватым кашлі. Бразнула даёнка, тугі, спорны струмень забіўся аб дно. Крыжэвіч уявіў пену, што ўтварылася, напэўна, на сценах вядра, і млоснасць імгненна падступіла да горла. Гарадскі чалавек, ён так і не прывык і ўжо, відаць, не прывыкне ніколі да сырадою.

Неўзабаве і гаспадыня выйшла з хаты, прытрымліваючы аберуч даўгаваты падол спадніцы, борзда накіравалася да хлява. Крыжэвіча гэта крыху здзівіла: звычайна карову старыя даілі па чарзе, і калі адзін гэта рабіў, другі не ўмешваўся. Сёння ж, падобна, усё было наадварот.

Жанчына нешта сказала мужу, цягнучы раз-пораз на сябе ланцуг, вывела на двор авечку, прыспешкам пакіравала да ракі. Двое белагаловых ягнят, жвава падскокваючы, пабеглі следам за маткаю.

Калі яна праз чвэрць гадзіны вярнулася, стары якраз выводзіў карову. Ён толькі што скончыў даенне і ад доўгага сядзення на кукішках адчуваў сябе не вельмі добра: хада была няўпэўненая, пагляд – як быццам замглёны.

– Скажу яму, хай ведае.

– Скажы. – Гаспадар згодна хітнуў галавой.

Старая адчыніла дзверы пуні, стала ў праёме.

– Гэта, чалавеча, чуеш мяне?

– Чую. – Крыжэвіч вытыркнуў з-за маціцы галаву, схіліўся ўніз. – Што здарылася, цётка?

– Вось што. Сёння зяць наш прыязджае, дык хочам, каб ты ведаў... Ён у нас цікаўны чалавек. Усюды зазірне, так што будзь гатовы. Калі што якое – хавайся.

– Добра, дзякую вам. Але ж вы не кажыце яму...

– Ведаем, што нельга казаць, а як жа. Таварышы вашыя прасілі, памятаем.

Яна падала Крыжэвічу харч, зачыніла дзверы, пайшла – нетаропка, паважна, як і належыць гаспадыні. Гаспадар падхапіў даёнку, патэпаў следам за ёю.

І тае ж хвіліны аднекуль збоку, з-за прысадаў, вынырнуў блакітны «Жыгуль», папраставаў абкошаным роўным узмежкам напрамік да хаты. Крыжэвіч прыхінуўся тварам да шчыліны, не міргаючы, пачаў назіраць, што будзе далей.

Старыя, крыху збянтэжана ўсміхаючыся, рушылі насустрач машыне. Сярэдняга росту дзяцюк у новенькім гарнітуры, круглагаловы, з паблажлівай усмешкай на чыста паголеным твары, няспешна вылез з аўто, па чарзе прывітаўся з абаімі. Пастаяўшы колькі хвілін ля «Жыгуля», усе трое накіраваліся ў хату.

Калі яны зноў выйшлі на панадворак, было добра за поўдзень. Першы выскачыў госць. Ён на гэты раз быў у рудым спартыўным касцюме і жоўтым, дзірававатым па краях капелюшы. Шырока стаўляючы ногі, ён падхапіў старога пад руку, павёў да хлява. Абое былі на добрым падпітку, і гаспадыня, якая ішла следам, няўхвальна хітала галавой. Ля пуні яны спыніліся. Стары адшчапіў засаўку, расчыніў дзверы.

– Павінна хапіць, – сказаў, паказваючы далонню на кладню.– Праўда, гарышча сёлета не закладзена, але ж затое і статку будзе менш. Авец не будзем ужо трымаць. Зноў жа, буракоў сёлета болей, дасць Бог ураджаю...

– На ўраджай няма чаго спадзявацца,– перабіла яго старая.– Падкасіць яшчэ трэба, вось што. Вунь пожні наўкола некранутыя стаяць. А то чакай з мора пагоды.

– Дык падкосім, мамка, – азваўся госць. – Сапраўды, малавата нібыта супраць леташняга.

Стары памкнуўся зачыніць дзверы, але маладзец рухам рукі запыніў яго.

– Не трэба, бацька. Вось паглядзім у хляве, і я здрамну гадзіну-другую. Люблю на сене пакачацца, вы ж ведаеце.

– Авохці мне, на сене! – запярэчыла жанчына. – Што за радасць гэткая – горача, ды і машкары столькі. Кладзіся ў хаце, дык хоць спачнеш па-людску.

– Ну, што за шчасце – у хаце? У хаце і дома можна... аж абрыдне.

Перайшлі да хлява. Агледзеўшы там усё дасканала, колькі часу гаманілі. Затым старая пайшла ў хату па падушку і коўдру, а мужчыны пасунуліся краем гародчыка далей – аглядаць соткі.

Крыжэвіч, які дагэтуль цішком сядзеў на адным месцы, спусціўся па драбінах уніз, выглянуў з дзвярэй на вуліцу. Як на злосць, ля суседняе хаты таўклася, бы знарок напрошаная, Райка. Корпаючыся – хутчэй для прыліку, чым з ахвоты – у кветніку, яна раз-пораз выпроствалася, кідала цікаўны позірк паўз сажалку на чужы панадворак. Відаць было, што новы чалавек яе зацікавіў.

Канечне, выходзіць зараз было небяспечна. Але ж і марудзіць не выпадала: з хвіліны на хвіліну маглі вярнуцца гаспадар з зяцем.

Быццам адчуўшы ягоную трывогу і разгубленасць, з хаты выйшла старая, шпарка пакрочыла да пуні. Пераступіла цераз парог, кінула на драбіны выцвілую коўдру без падкоўдраніка і падушку.

– Ты тут яшчэ? – сказала, звяртаючыся да Крыжэвіча. – Ой, не марудзь, ідзі перасядзі дзе-небудзь ля ракі ці ў кустах, пакуль ён адаспіцца. А потым вернешся. Ну, што стаў бы ўкапаны?

– Дзеўка там, – паказаў жэстам Крыжэвіч.

– Ой, ліха, сапраўды... Тады вось што зробім: я пайду забаўлю яе, а ты тым часам як-небудзь выслізні адсюль неўпрыкмет.

Яна выцерла аб фартух рукі, не чакаючы ягонага адказу, рашуча накіравалася да суседняе хаты. Параўняўшыся з кветнікам, зайшла так, каб дзяўчына апынулася да яго спінаю, пачала нешта казаць.

У гэты ж момант пачуліся галасы з-за пуні. То вярталіся з агледзін сотак мужчыны.

Крыжэвіч хуценька, як толькі мог, выскачыў за парог, пабег міма гнаявішча да кустоў. І толькі дапяў да іх, як дзяўчына азірнулася.

Але ён, апанаваны радасцю са страхам напалову, таго не бачыў.

Ужо мінула некалькі гадзін, як ён пакінуў схоў, а выгнанню, здавалася, не будзе канца. Сядзець бязмэтна пад кустом на беразе ракі вельмі хутка надакучыла. Хацелася назад, у схоў. Гэта і самому было неяк дзіўна – гэтак жа нядаўна яшчэ прагнулася волі, паветра, прасторы, што ажно ненавідзеў тую пуню. Зараз жа, наадварот, яна здавалася ледзь не райскім куточкам. Можа, плюнуць на ўсё ды выйсці? Ну, схопяць – і няхай; людзі не такое цярпяць. Можа, зусім і не такі страшны чорт, як яго малююць. Можа, наогул ніхто яго не шукае і ўсе страхі – пустое. І ён ужо памкнуўся выйсці з-за куста, як убачыў ля пуні прыезджага. Той стаяў збоч дзвярэй, соладка пазяхаючы, дзівіўся на наваколле заспанымі, з прыпухлымі павекамі вачыма. Затым пацягнуўся, ляпнуўшы сябе рукою па клубу, палез назад, на кладню – ці не набірацца моцы перад касьбою.

Пад вечар, недзе каля сямі, да ракі прыйшла гаспадыня, ніякавата пасміхаючыся, паведаміла, што заяц надумаўся і начаваць у пуні. Таму яму, Крыжэвічу, давядзецца, маўляў, ісці ўнаначкі ў лазню. Лазня нічыя і знаходзіцца ў кустах, таму там даволі бяспечна. Там ёсць сёе-тое з лахаў, хопіць і падаслаць, і накрыцца. Пра ежу яна загадзя паклапацілася: ладны пакунак перайшоў у Крыжэвічавы рукі.

– Тут дранікі, пара яек, хлеб. Але адразу ў лазню не ідзі. Там сыра, напэўна, дый цемнавата.

Ён моўчкі хітнуў галавою, не чакаючы, пакуль яна знікне за плотам, падаўся ўправа, да бліжэйшай сухастоіны. Уладкаваўшыся пад ёй, разгарнуў газету з правіянтам і ледзь не ахнуў ад нечаканасці.

Уся першая паласа была прысвечана падзеям 30 чэрвеня: здымкі, тлумачэнні, цытаты з выказванняў. Адна з апошніх асабліва ўразіла Крыжэвіча. Скрапаная з няўцямна-асуджальных сказаў, яна належала ягонаму колішняму вучню і аднадумцу Андрэю Маркевічу. Маркевіч, супрацоўнік аднаго з ведамасных прэс-цэнтраў, нібыта

даводзіў такім чынам да грамадскасці погляд на падзеі свайго кіраўніцтва. І хоць ён, у адрозненне ад іншых, да адкрытай расправы над арганізатарамі акцыі не заклікаў, ад адмоўных характарыстык не ўстрымаўся. Гэта было тым больш дзіўна, што напярэдадні Крыжэвічавых уцёкаў яны сустрэліся выпадкова на вуліцы, і малады чалавек выказваў ідэі, зусім процілеглыя пададзеным у цытаце.

Паеўшы, ён загарнуў рэшту хлеба і бульбіны ў газету, пасунуўся хмызам у накірунку лазні – туды, дзе ледзь-ледзь вытыркалася па-над алешнікам чорная руберойдная страха. І пакуль ішоў, чуў за спінаю нейкі незразумелы сухі трэск, як бы хто ўпотайкі краўся следам.

Лазня, стараватая маленькая пабудова з падгнілымі ніжнімі вянцамі, сустрэла прахалодаю і спакоем. Абкружаная з трох бакоў высокім алешнікам, яна цэлы дзень стаяла ў цяні, і гэта надавала ёй уражанне нейкае хмурнасці і нават таямнічасці. На дзвярах замест замка была ўторкнута ў прабой звычайная трэска. Крыжэвіч выцягнуў яе, узяўся за клямку. І ў гэты ж момант пачуў ззаду, з алешніку, старонні гук. Ён рэзка азірнуўся.

Між тонкіх ствалоў стаяла Райка, вінавата ўсміхаючыся, скубла пальцамі абкарнаны рамонак.

– Дзень добры, – сказала, прыкладаючы далонь да вуснаў. – Не бойцеся, я вам кепскага не зраблю.

– Канечне, вы ж, напэўна, не дужэйшая за мяне.

– Той, хто хаваецца, заўсёды слабейшы.

– Адкуль вы ведаеце, што я хаваюся?

– Бачыла, як з пуні ўцякалі. І раней яшчэ бачыла – на кладні. Вы так моцна заснулі, што ажно пачалі задаваць храпака. – Яна пачырванела, адвяла позірк убок.

– Што вам трэба ад мяне?

– Проста цікава. Вы на здымку якраз такі, як у сапраўднасці.

– На якім здымку?

– На тым, што ў газеце.

– І пра газету вы ведаеце! А адкуль яна ўзялася, не скажаце?

– Скажу. Вадзім, бабін Галінін зяць, з горада прывёз.

– Вось яно што. – Ён колькі часу памаўчаў. – І што вы далей збіраецеся рабіць?

– Далей – нічога. Пайду дадому.

– Ці не зноў на вечарыну збіраецца?

– А калі і на вечарыну, то што? Праціўны вы... Ды ўсё роўна мяне не бойцеся – не прадам.

– І нават мамцы з таткам не скажаце?

– Мамка з таткам далёка. Я тут у цёткі гасцюю, пляменніца.

– А-а...

Дзяўчына перакінула нагу праз пахілую алешыну, усміхаючыся нечага сама сабе, знікла ў гушчары.

«Напэўна не ўдасць», – супакоіў сябе Крыжэвіч і ступіў у прылазнік. Спёрты, застарэлы пах воглага веніка шыбануў у нос.

Пад раніцу адолеў холад. Ён падняўся з палка, прайшоў колькі разоў дзеля сугрэву сюды-туды па вузенькім, самому з сабой ледзь размінуцца, памяшканні. Ноч на свежым сене, якую яшчэ ўчора гэтак зацята праклінаў з-за казяры, тут, у лазні, здавалася недасяжнай мараю. Успомнілася зяцева абяцанка падкасіць. Зірнуў на гадзіннік: палова шостай. Калі маладзец не дабавіў звечара, акурат зараз мог быць на сенажаці.

Ён зашчапіў на трэску дзверы, расхінаючы палкаю мокрую траву паперадзе сябе, падаўся да ўскрайку кустояў.

Дзверы пуні аказаліся зачыненыя знутры. Даволі моцны смех даносіўся з кладні – нехта быў там і пачуваўся даволі вольна. Крыжэвіч хіснуўся ўбок, стаіўся за перагародкай, што аддзяляла пуню ад хлява. Галасы ўсё мацнелі. Нарэшце дзверы адчыніліся, і з іх высунулася кудлатая, уся ў пацярусе, галава Вадзіма. Ён зыркнуў у адзін бок, у другі чырвонымі, як з перапою, вачыма, падаў некаму знак рукой. З-за ягонай спіны ўзялася аднекуль Райка, папраўляючы на хаду сукенку, выскачыла з пуні, пашыбавала напрасткі да сваёй хаты.

Дзяцюк тым часам дастаў з падстрэшка касу, паспрабаваў пальцам вастрыё, падаўся за хлеў – ці не касіць.

Праз хвіліну Крыжэвіч быў на кладні. І добра зрабіў, бо амаль у той жа момант з-за свайго хлява выйшла суседка з кароваю на повадзе, накіравалася да сажалкі. Аднекуль з-за плота выплыла паважная постаць бабы Галіны, пасунулася ёй насустрач.

– Здароў, Марыля. Што сама сёння з кароваю? Ці не паехала твая памочніца?

– Не, не паехала. Спіць на сене. А будзіць шкада, самі былі маладыя, ведаем, яе хочацца ўранку паспаць.

Жанчыны перакінуліся яшчэ словам-другім і разышліся.

Дзень прайшоў больш-менш удала, без нечаканасцей. Стары з зяцем цэлы дзень прабавілія на пожні, і Крыжэвіч не толькі паспеў як след адаспацца, але і нават занудзіцца адзінотаю. Надвечар, калі сонца пачало схіляцца да вершалін дрэваў, зазірнула Райка: яна раніцой забылася на кладні штосьці з адзення. Крыжэвічава прысутнасць ні на каліва яе не збянтэжыла, наадварот, падалося яму,– узрадавала. На ейнае запытанне, дзе ён сёння збіраецца начаваць, ён адказаў, што яшчэ не ведае. Тады яна параіла нікуды не ісці, а заставацца тут, на кладні.

– Вадзіма не бойцеся. Ён усё зробіць, як я скажу.

– А калі не?

– Тады размова будзе іншая. Мне ёсць што сказаць ягонай цешчы. Але гэта так, да слова. Так што заставайцеся. Ці, можа, і мне вы таксама не верыце?

– Я пра вас нічога амаль не ведаю. Вы Вадзіму пра мяне што-небудзь казалі?

– Не.

– Што ж, дзякуй.

– Няма за што. А што будзе з вамі, калі вас зловяць? Пасадзяць у турму?

– Магчыма.

– Гэта праўда, што вы прызывалі людзей да кровапраліцця?

– Хто вам сказаў?

– Так у газеце напісана.

– Няпраўда. Мы толькі выйтлі, каб абарашць сваю годнасць.

– А, годнасць, вось яно што, – яна расчаравана ўсміхнулася, накіравалася да дзвярэй.

– А па-вашаму, чалавечая годнасць не вартая нават, каб яе абараняць? – сказаў ён запальчыва, загароджваючы ёй дарогу. – А, не вартая? Скажыце?

– Па мне дык...

– Па вас! А вы ведаеце, колькі народу ператаўклі ў той дзень? Некаторых маіх сяброў схапілі і па сёння трымаюць у невядомасці. – Голас ягоны прагучаў так рэзка, што яна нават адхіснулася.

– Цішэй вы! Пачуе хто.

Ён імгненна сцяўся. Яна схавала за пазуху адшуканую рэч, не развітаўшыся, выскачыла з пуні.

– Дык што мне рабіць? – крыкнуў ён услед.

– Заставайцеся тут, – адказала яна і махнула рукой: маўляў, сядзі ціха, і ўсё абыдзецца.

Ён так і зрабіў. Зашыўся як мага глыбей у сена і так і праляжаў у нерухомасці яшчэ паўдня. Побач хадзілі людзі, гаманілі, сварыліся, але яму не было да іх справы. На змену ўзбуджэнню прыйшла страшэнная абыякавасць. Напэўна, калі б зараз па яго прыйшлі, ён і тады не крануўся б з месца, нават не варухнуў бы пальцам, каб неяк уратавацца. Які сэнс, думалася, нешта рабіць дзеля людзей, калі ім гэта, аказваецца, непатрэбна. Калі адзінае, што можа іх неяк ускалыхнуць, дык гэта фота знаёмага чалавека ў газеце.

А праз колькі часу гэтак жа неспадзявана, як толькі што абыякавасць, адолела трывога. Дзеўка гэтая – што ў яе наўме? Ці не дарэмна гэтак перад ёю агаліўся, гэтак шмат сказаў? Бо адна справа, калі б з газеты ведала, і зусім іншая – калі сам сказаў. Паспрабуй адкруціся пасля ў выпадку чаго. Да таго ж, зяцёк – што ён за птушка? Што, як ляпне каму ў горадзе? Яна сцвярджае, што нічога яму не сказала, але ці праўда тое? Адно добра: старыя, здаецца, надзейныя людзі. Што гаспадар, што гаспадыня. Працавітыя, рахманыя, спагадлівыя. Такія не прададуць.

З-за пуні, ад гародаў, пачуліся галасы. Адзін мужчынскі, другі – незадаволены – жаночы. Крыжэвіч прыслухаўся: гаманілі старая з Вадзімам.

– Толькі прыехаў і ўжо ад'язджаць? – даводзіла кабета. – А абяцаў жа дапамагчы падкасіцца. Ну, і работа твая, Вадзя...

– Дык што ж рабіць, калі непярэліўкі, – апраўдваўся той. – Ніхто мне працоўныя дні за прыгожыя вочы не залічыць. Служба ёсць служба. Паеду, а праз тыдзень вернемся – з Лідаю.

– Праз тыдзень, можа, касіць не будзе чаго, – не здавалася жанчына.

– Знойдзецца, не турбуйцеся.

«Аднак жа спяшаецца чалавек», – падумаў Крыжэвіч і прынік тварам да дзіркі. Зяць, увесь мокры ад поту, у кашулі наросхрыст, заклапочана-нецярпліва пазіраў то на гадзіннік, то на цешчу. Ён відавочна адчуваў сябе няёмка, і, здавалася, яшчэ слова, самы нязначны наступ з яе боку – і ён не вытрымае, здасца, зробіць так, як хоча яна. Але старая маўчала. Маўчаў і стары, што сядзеў на бервяне збоч плота. Ён наогул, відаць, быў чалавек негаваркі – з тых, што больш слухаюць, а паслухаўшы, не зважаючы ні на што, зробяць па-

свойму. Абрысы ягонага твару, асабліва ўпарты высокі лоб і валявы падбародак, пацвярджалі гэта. Нягледзячы на гарачыню, гаспадар быў у тоўстай фланелевай кашулі і ў ботах, што зусім не перашкаджала яму яшчэ і пацепвацца ад холаду.

Зяць, наадварот, быў басаног. Туфлі ягоныя сохлі ўсторкнутыя на штыкеціны побач са слоікамі і шматлікімі жбанамі. Ён акуратна паздымаў іх і падаўся да сажалкі – мыць ногі.

– Можа, сказаць яму? – калі ён адышоўся добра воддаль, вымавіла напаўголаса жанчына. – Як ты думаеш?

– Мне ўсё роўна,– адмахнуўся стары, захінаючы шчыльней на шыі каўнер кашулі. – Што ён табе паможа.

– Як гэта – што? Можа, параіць што.

– Ат, як сабе хочаш.

Той, пра каго гаманілі, тым часам скончыў мыццё, стоячы на кладцы, па чарзе выціраў ногі шкарпэткай. Затым абуў набоса туфлі, старанна абыходзячы каравякі, паплёўся дзядзінцам назад, да хаты. Старыя пачакалі, пакуль ён падыдзе бліжэй, не згаворваючыся, падняліся з лавы.

– Ну, дык падмацавацца ж трэба крыху на дарожку, – сказала жанчына прымірэнча. – Хадзем.

Недзе праз паўгадзіны Вадзім пайшоў. Пазіраючы скоса на Райку, што сядзела нерухома на лаве ля сваёй хаты, павольна перасек садок, уладкаваўся за рулём, пусціў матор. Увесь гэты час старыя моўчкі стаялі на панадворку, пакорліва глядзелі, як аддаляецца яго шырокая, з папярэчнымі складкамі на кашулі, спіна.

Аўто фыркнула, пацягнулася да дарогі.

Жанчына скрушліва развяла рукі ўбакі, нешта ціха сказала гаспадару. Той паплёўся ў хату, але неўзабаве зноў выйшаў – з каромыслам на плячах.

– Колькі судоў прынесці? – спытаў, чыкільгаючы ў накірунку хмызняку.

– Чацвёра, пэўна, хопіць, – быў адказ. – Трое ў дзяжу вылі, астатнія так, у вёдрах, пакінь. Ды пачакай, – яна сцішыла голас. – Чым улегцы ісці, брагу занёс бы. А я дроў набяру тым часам сушэйшых.

«Ці не гарэлку збіраюцца гнаць», – падумаў Крыжэвіч. Падумаў – і на сэрцы адразу паспакайнела: гэткую справу, чакаючы староннніх, хіба распачынаюць?

Цяпер паддавала сумневу толькі Райка. І чым больш ён прыглядаўся здаля да дзяўчыны, тым больш падазронымі ўяўляліся яму яе паводзіны. Па-першае, пазбягае сустрэчы, а яшчэ ж учора была гэткая таварыская. Па-другое, цэлы дзень сядзіць на адным месцы, як знарок пільнуе... Ясна, Вадзіму пра яго расказала. Зноў жа, цётцы з дзядзькам магла... І яны толькі прыкідваюцца, быццам нічога пра яго не ведаюць, на самой жа справе... Можа, толькі і чакаюць зручнага моманту, каб паведаміць куды след. А там... Нават уявіць цяжка, што чакае яго, калі зловяць. Аднойчы ўжо паспытаў арыштанцкага хлеба, трапіўшы тры гады таму ў аддзел з нейкае маніфестацыі. І галоўнае – жонцы перажыванні, а яна ж якраз другім цяжарная, ёй наогул нельга нервавацца.

– Прачынайцеся! Уставайце? – голас трывожным сапрана працяў свядомасць, прымусіў расплюшчыць вочы. Перад ім сядзела на кукішках Райка, штомоцы трэсла рукою за плячо. – Уставайце ж! Апранайцеся хутчэй ды ўцякайце. Хутка тут будуць міліцыянеры.

– А? Што ты кажаш? – марна імкнучыся патрапіць спрасоння нагой у калашыну, паўтараў Крыжэвіч. – Якія міліцыянеры? Што здарылася?

– На вас навялі. – Дзеўка ступіла ўбок, падалася да драбін: – Праўду кажу, верце мне.

– Хто навёў?

– Якая вам розніца – хто? Збірайцеся хутчэй ды давайце дзёру.– Яна выслізнула з пуні, пашыбавала расяным цалікам да свае хаты. Крыжэвіч, нарэшце, апрануўся, выскачыў на двор. Было даволі відна, але ранішняя шэрань яшчэ хавалася сям-там па лагчаках. Уначы прайшоў дождж, вада, што не паспела ўвабрацца ў зямлю, цярпліва чакала першых сонечных промняў.

Крыжэвіч падумаў, што трэба было б папярэдзіць гаспадароў аб адыходзе, падышоў да хаты. Пакратаў клямку – не падалася. Але будзіць старых не наважыўся. «Дзверы ўбачаць адчыненыя – самі ўсё зразумеюць»,– падумаў і накіраваўся да кустоўя. Пазаўчора, выбіраючыся з лазні, прыкмеціў уздоўж ракі вузенькую сцяжыну, да яе чамусьці адразу і пацягнула. І хоць і не ведаў нават прыблізна, куды яна можа яго прывесці, гэта ў любым выпадку здавалася лепш, чым трапіць па-дурному ў рукі міліцыянераў дзе-небудзь на прасёлачнай дарозе.

І толькі гэтак падумаў, як раптам ажно скалануўся ад нечаканкі. З хмызняку выйшлі, трымаючы напагатове зброю, трое ў міліцэйскай форме, пайшлі яму насустрач. Наблізіўшыся, моўчкі паказалі жэстам, каб ішоў назад, да хаты.

Старыя, абое нерухомыя, збялелыя, стаялі на панадворку, глядзелі на нязвыклую працэсію.

– Хто яго папярэдзіў пра наш прыход? – пагрозліва звярнуўся да іх адзін з канваіраў? – Каторы з вас?

– Мы не папярэджвалі, – хуценька, скорагаворкай адказала жанчына. – Навошта нам папярэджваць. Было б каго... – Яна павярнулася тварам да Крыжэвіча. – У-у, адшчапенец! Мала вам надавалі па карку. Адно й ведаеце, што паскудствы рабіць ды добрым людзём у працы замінаць.

Яна так і сказала – людзём, – і ад маўлення гэтага на Крыжэвіча павеяла блізкім і дарагім. Акурат гэтак гаварыў некалі ягоны нябожчык дзед.

– Як вы даведаліся, што ён з гэтых, як вы кажаце, адшчапенцаў?

– Ды зяць тутака ў нас быў, газету з сабою прывёз. Я спачатку без уніманія, харчы ў яе загарнула... А ўчора глядзь у лазні – ён! Во, зірніце самі. – Яна дастала з кішэні ватоўкі скамечаную паласу, падала міліцыянеру. – Тут усё, як ёсць, сказана. Уся праўда, у газеце абы-што не напішуць.

Яна паражагналася, унікаючы Крыжэвічавага пагляду, падалася з вядром у руцэ да хлява – даіць карову.

# МАНАГРАФІЯ

Надзіва, на дварэ ў гэтае ранне нават марозна. Прыбіты ўчарашняю аблівахаю снег за ноч закалянеў, зрабіўся шорсткі і сітаваты, як зваранае малодзіва. Пад нагамі суха. Пасля такое даўжэзнае адлігі гэта нязвыкла, і вочы міжволі апускаюцца долу ў пошуках рытвіны з падталым снегам. Рытвін шмат, але ўсе яны парожнія і толькі зрэдку дзе-нідзе – з вочкамі льду пасярэдзіне.

Сцежкі, што збягаюцца з усіх канцоў мікрараёна да трамвайнага прыпынку, увесь час, пакуль трывала адліга, шчодра пасыпаліся пяском і зараз нагадваюць бегавыя дарожкі на стадыёне. Тая, па якой я крочу, пралягае паўз лагчынку з каналізацыйнымі люкамі. Як заўсёды, у ёй поўна бадзяжных сабак. Яны з'явіліся тут з першымі прымаразкамі і з таго часу нясуць наўкола люкаў несупынную вахту, грэюцца ў клубах пары.

Галоўны ў зграі – чорны калматы пудзель-мешанец. У яго злыя зняверaныя вочкі-гузікі і віхлясты, выстрыжаны ўшчэнт лішаём азадак. Варта каму з прахожых наблізіцца да лежбішча, як ён ускоквае з месца, кідаецца няпрошанаму госцю пад ногі. Астатнія тым часам сядзяць, напружыўшыся, паўкругам і апантана брэшуць. Сабакі вельмі худыя, у многіх на баках застарэлыя раны. Сядзяць яны строга па ранжыру. Кожны дакладна ведае сваё месца і на чужое, хай і больш прывабнае, не прэтэндуе. Час ад часу каторы з дужэйшых старажылаў, злітаваўшыся над якім-небудзь нямоглым небаракам, пасоўваецца ўбок, дае магчымасць уладкавацца побач з сабою на цёплым.

Параўняўшыся з люкамі, я сцішваю хаду. Гэта якраз дарэчы: чорны завадатар ужо вышчарыў зубы і вось-вось кінецца мне наперарэз. Мая хітрасць збівае яго з панталыку, і зараз ён не ведае, што рабіць – ці то імчацца наперад, ці то заставацца са зграяй. Урэшце інстынкт ахоўніка перамагае. Пудзель, заходзячыся брэхам, кідаецца мне насустрач. Зграя падхоплівае ягоны парыў, але застаецца на месцы – быццам чакае каманды.

– Вось гэта згода, – абыходзячы зводдаль мясціну, кажа нейкая кабета ў футры. – З намі, людзьмі, хіба параўнаеш! Во ўчора на

хвіліну адвярнулася ў аўтобусе з суседкаю пагаварыць, тут жа сумку сцібрылі. А казаць стала – на смех паднялі.

У вачах у жанчыны – крыўда напалову з дакорам...

Каржакаватую Генадзеву постаць я пазнаю не адразу. Яшчэ цемнавата, і тут, у натоўпе на трамвайным прыпынку, угледзець знаёмы твар не так проста. Тым больш, што сёння першы па-сапраўднаму сцюдзёны дзень, і ўсе ў зімовым адзенні.

Я даю «дзень добры», і тае ж хвіліны з-за павароту вынырвае трамвай. Генадзь мармыча мне штосьці ў адказ, хуценька, як толькі гэта можна на выслізганым асфальце, шыбуе да дзвярэй першага вагона. Я, канечне, кіруюся ў другі. Так ужо месяца з паўтара ездзім у адно і тое ж месца, але ў розных вагонах.

У трамваі тлумна, горача. То ў адным, то ў другім яго канцы раз-пораз успыхвае сварка. Па дарозе яшчэ два інстытуцкія інтэрнаты, так што к канцу падарожжа ў вагоне не прадыхнуць.

Выйшаўшы, а дакладней – выпхнуўшыся на прыпынку, я колькі часу стаю нерухома на месцы ў чаканні, пакуль схлыне натоўп. Генадзь таксама выходзіць са свайго вагона, спыняецца побач.

– Тое, што вы ўчора мне сказалі, – праўда? – кажа раптам, папраўляючы абедзвюма рукамі чорную вушанку са штучнага футра.– Вы не перабольшваеце?

У вачах ягоных, некалі блакітных, а зараз выцвілых і невыразных – засяроджанасць і недавер. Мне гэта непрыемна, але што зробіш? Затое цяпер я дакладна ведаю: светам кіруюць не толькі любоў і грошы.

Я абмінаю яго, з жахам адчуваючы, як зноў расце ў грудзях, узнімаецца хваляю ўгору, пад самае горла, нянавісць, прастую да інстытуцкага дзядзінца.

Гэтая гісторыя пачалася каля двух гадоў таму, пасля смерці Алены. У той дзень, калі яна памерла, дождж не пераставаў з самай раніцы. Як цяпер памятаю яго і ўсё, што з ім звязана, – панылую шэрань у праёмах між будынкамі, нізкае неба, хлюпоту пад нагамі. Ён быў нібы працягам таго бясконцага лабірынту няпэўнасці і адчаю, што вось ужо колькі месяцаў, пакуль жонка хварэла, суправаджаў мяне паўсюдна: дома, на працы, у бальнічным калідоры. Я да такой ступені прызвычаіўся да яго, што, здавалася, варта яму скончыцца, як

здарыцца непапраўнае. Так і сталася. Дождж перастаў ісці – і Алена памерла.

Першым, хто наведаў нас з сынам пасля пахавання, быў ён, Генадзь Галанюк, мой колішні універсітэцкі дружбак. Ён жыў у суседнім квартале і, вяртаючыся з працы, заскочыў на хвіліну – адведаць. Мы доўга сядзелі ў той вечар, пілі гарэлку, што засталася з хаўтураў, гаманілі пра розныя будзённыя справы. Пры развітанні я запрасіў Генадзя заходзіць і надалей. Ён адразу ж згадзіўся – відаць, адзінота халасцяцкага жыцця, пра перавагі якога ён так любіў некалі гаварыць, яму надакучыла. Такім чынам амаль сямігадовы перапынак у нашым сяброўстве, звязаны з маёю жаніцьбай, быў скончаны.

За першаю сустрэчаю адбылася другая, затым яшчэ, яшчэ.

У сярэдзіне жніўня я выправіў Юліка да цешчы. Яна жыла адна ў райцэнтры і ад самага пачатку, як толькі памерла Алена, вырашыла, што ўнук павінен выхоўвацца ў яе.

Застаўшыся без сына, я неяк вельмі хутка занудзіўся адзінотаю. І, каб пазбыцца яе, нечакана для сябе самога вярнуўся да справы, якою некалі займаўся па маладосці і якую апошнія гады зусім закінуў,– да манаграфіі. Занятак гэты заўсёды мяне прыцягваў і цяпер, са смерцю жонкі, уяўляўся адзіным паратункам ад невясёлых думак.

Генадзь ухваліў мой намер. Ён быў сведкам маіх першых навуковых практыкаванняў і аднойчы, даўно-даўно, нават напісаў пра іх у абласную газету невялікі артыкул. Артыкульчык той быў прысвечаны маёй першай публікацыі ў рэспубліканскім навукова-папулярным часопісе і зрабіў наша сяброўства непарушным. Вось чаму зараз, калі я вырашыў вярнуцца да пісання, мне так важная была менавіта ягоная падтрымка. Я яе атрымаў.

Мінула крыху больш за два месяцы. У школе пачаліся канікулы. Вольнага часу ў мяне паболела, і я грунтоўна засеў за працу. Справа адразу пайшла так імкліва, што к канцу лета манаграфія была амаль гатова. Васемнаццатага жніўня, акурат у апошні дзень адпачынку, я скончыў друкаваць яе набела, але перш чым адправіць у рэдакцыю часопіса, даў прачытаць Генадзю. Ён пахваліў стыль і, зрабіўшы сякія-такія заўвагі адносна мовы, параіў з адсылкаю надта не зацягваць. Ягоную параду я з удзячнасцю прыняў.

Неўзабаве пачаўся чарговы навучальны год, а з ім – заўсёдны дэфіцыт часу. Цяпер аб сур'ёзных навуковых даследаваннях можна было толькі марыць. Я паскардзіўся на тое Генадзю. Праз тры дні

пасля размовы ён прыйшоў да мяне з навіною: на кафедры ў інстытуце, дзе ён працаваў, вызвалілася пасада выкладчыка. Нагрузка там была значна меншая, чым у школе, і я вырашыў падаць заяву на замяшчэнне. На наступны дзень Генадзь звёў мяне з загадчыцай кафедры, і пытанне паспяхова вырашылася. «Вось, паходзіш пару гадоў у асістэнтах, а там, глядзіш, і старшага дадуць, – сказаў Генадзь. – Будзеш дзякаваць мне».

Аднак старшым мяне прызначылі адразу – загадам, да аб'яўлення конкурсу. Сябру майму такі паварот справы чамусьці не спадабаўся. Ведаючы, як нялёгка далося яму самому ў свой час гэтае старшынства, я вырашыў не звяртаць на тое ўвагі.

Недзе праз месяц пасля пераходу у інстытут я пазваніў у рэдакцыю часопіса. Загадчык аддзела сказаў, што мая манаграфія прынята да друку. Усхваляваны, я адразу ж пабег падзяліцца навіною з Генадзем. Ён успрыняў маё паведамленне стрымана. Неяк пахапкам, бы між іншым, павіншаваў і, дадаўшы штосьці пра нейкіх «многіх, якіх шмат было і раней, а дзе яны зараз?», тут жа перавёў гаворку на іншае.

Але дружба наша з таго моманту стала слабець. Генадзь пачаў пазбягаць мяне і ўсё часцей і часцей, аказаўшыся выпадкова побач, імкнуўся тут жа адысці ўбок. Спачатку гэта мяне бянтэжыла. Я доўга не разумеў, у чым справа, і ўсяляк намагаўся вярнуць ранейшую прыязнасць. Але ўсё было марна. Я натыкнуўся на такую непранікальную сцяну адчужанасці, што само жаданне гаварыць знікла назаўсёды. І вось тады, нібы падсвядома пацвярджаючы меркаванне, што гісторыя чалавечых узаемаадносін – гэта найперш гісторыя барацьбы самалюбстваў, я і сам пачаў няўзнак адчужацца. Гэта было жахліва! Асабліва тады, калі адчужанасць пачала перарастаць у нядобразычлівасць. Мы і азірнуцца не паспелі, як яна ператварыла ўсё добрае, што было калісьці між намі, у суцэльныя руіны.

Вядома, мы не сустракаліся больш, а спаткаўшыся дзе-небудзь выпадкова ў перапынку між занядкамі, тут жа стараліся разбегчыся ў розныя бакі. Усё часцей і часцей я лавіў сябе на думцы, што жадаю быламу сябруку кепскага. Не сумняваюся, увесь гэты час ён адчуваў да мяне тое самае. Як на тое, прыкрасць гэтая – не адзінае, што здарылася са мною апошнім часам.

Неўзабаве пасля пераходу на працу ў інстытут я панаёміўся з Жаннаю. На той час яна жыла пасля разводу з мужам адна і рабіла на

абутковай фабрыцы. Я меў самыя сур'ёзныя намеры наконт жаніцьбы і спадзяваўся, што жанчына гэтая ўрэшце ўнясе нейкую гармонію ў мой побыт. Ды спадзяванні так і засталіся спадзяваннямі. Сумеснае жыццё не зладзілася, і, памучыўшыся разам два месяцы, мы вырашылі разысціся. За два тыдні да развітання Жанна з'ездзіла ў камандзіроўку ў Венгрыю, а вярнуўшыся, паведаміла тое, што надоўга азмрочыла мне існаванне. Учора, выпіўшы з гора ў самоце цэлую бутэльку настойкі, я выйшаў увечары на вуліцу прашпацыраваць і выпадкова сустрэў Генадзя. Як заўсёды, ён хацеў унікнуць размовы, але я затрымаў яго і, размякчаны спіртным і дрэнным настроем, расказаў яму пра ўсе свае непрыемнасці. Што ён адчуваў падчас маёй споведзі – не ведаю. Хутчэй за ўсё не даў веры. А калі і даў, то наўрад прасякнуўся да мяне спачуваннем.

Вузкі, загрувашчаны нейкаю старою мэбляю калідор палікінікі сустракае мяне скразнякамі і пахам ёду. Людзей і няшмат, і крокі медсясцёр (усе як адна чамусьці на высокіх абцасах) рэхам разносяцца ад дзвярэй да дзвярэй. Ля лабараторыі, дзе робяць аналізы крыві, наогул няма чаргі, і я адразу ўваходжу ў памяшканне.

– А, вы! – медсястра пасоўвае да сябе стос паперак, запытальна глядзіць мне ў вочы.– Нагадайце ваша прозвішча.

Я называюся, пераадольваючы спазм у горле, са страхам сачу за тонкімі, з наманікюранымі пазногцямі, пальцамі жанчыны.

– Вось... Што тут у нас? Ага, адмоўная, – яна ўсміхаецца. – Так што дарэмна баяліся. Другі раз, перш чым знаёміцца, добра прыгледзьцеся да чалавека.

Аднак недаверу пазбыцца не так проста.

– Як – адмоўная? Яна сама мне сказала, што ў яе СНІД. А мы ж...

– Значыць, падманула вас ваша сяброўка, – голас сястры гучыць цвёрда. – І не дурыце мне галавы. Сказана вам: рэакцыя адмоўная. Ідзіце дадому і там разбірайцеся са сваімі палюбоўніцамі.

Я выходжу на вуліцу, усё яшчэ не верачы таму, што адбылося, крочу да трамвая.

На дварэ па-ранейшаму марозна, але і сонца прыгравае. Снег не шорсткі, як уранні, а вязкаваты, а на сугрэвах – і добра падталы. Гэта замаруджвае хаду, робіць яе павольнай і няўпэўненай. Чалавек, які крочыць следам за мною, хоча мяне дагнаць, але беспаспяхова. Яшчэ выходзячы з палікінікі, я краем вока заўважыў яго на тратуары, ды

пасля ранішняга ягонага, да вусцішнасці афіцыйнага – на «вы» – запытання ў мяне няма ніякага жадання з ім гаварыць.

І яшчэ адна, другая за дзень, удача: у паштовай скрыні злодзеі, падобна, пагаспадарыць не паспелі. Я адмыкаю яе, дастаю газеты, сярод якіх бялее, выклікаючы прадчуванне нечага нядобрага, канверт.

Ліст – з рэдакцыі часопіса, і я ледзь паспяваю дачытаць яго да канца, як настрой мой псуецца канчаткова. «Надрукаваць вашу працу не можам, фінансавыя цяжкасці...»

А пятай звоніць цешча. Юлік сумуе па бацьку, і яна збіраецца прывезці яго на колькі дзён дадому. Даведаўшыся, што ў нас з Жаннаю ўсё скончана, яна з палёгкаю ўздыхае, кладзе трубку. Я яшчэ трымаю сваю ля вуха, як раптам бачу праз акно ўдалечыні знаёмую паставу. Чалавек ідзе, асцярожна намацваючы падэшвамі сцяжыну, ад трамвайнага прыпынку да бліжэйшага праёма між дамамі. Заўважыўшы сабак, ён хоча абмінуць лагчыну, але гэта яму не ўдаецца. Падталы цалік, куды ён скіроўвае, тут жа правальваецца пад ягонымі нагамі, ператвараецца ў твань. Быццам падбадзёраны бездапаможнасцю чалавека, пудзель кідаецца яму наперарэз. Увесь сабачы хаўрус як па камандзе ашчэрваецца, пачынае раз'ятрана брахаць.

Бедны Генадзь (гэта ён) колькі часу стаіць у разгубленасці сярод усяго гэтага гармідару. Затым рэзка разварочваецца, подбегам вяртаецца назад, на прыпынак, шпарка крочыць вакольным шляхам да свайго двара і, перш чым задаволеныя перамогаю сабакі паспяваюць супакоіцца, знікае за бліжэйшаю шматпавярхоўкай...

Званок – працяглы, нейкі як быццам нервовы, заспявае мяне знянацку.

За дзвярыма – Генадзь. Шапка на ягонай галаве збілася набакір, дыханне няроўнае. Мы некалькі хвілін моўчкі глядзім адно на аднаго.

– Гэтая твая хвароба... – кажа ён нарэшце. – Мне вельмі шкада.

– Хваробы няма, – апамятаўшыся ад разгубленасці, кажу я. – Памылка закралася, усё добра.

– Вось што. – Твар майго госця ніякавае. – Ну... тады прабач, што патурбаваў.

– Але сёння я атрымаў ліст з рэдакцыі, – быццам не жадаючы пакідаць яго сам-насам з расчараваннем ці баючыся, каб ён не

пайшоў, нечакана для самога сябе працягваю я. – Паведамляюць, што публікацыі не будзе. Розныя прычыны, маўляў...

– Прычыны! – Генадзеў пагляд зноў лагаднее. Ён весялее, пераступае праз парог, прыгасіўшы збольшага радасны бляск у вачах, падае мне руку.

– Дык, можа, я магу чым дапамагчы? Там падтрымаць... Скажы, мы ж гэтак даўно знаёмыя...

Прымірэнне? Уся мая істота пратэстуе супраць яго. Але хай... Хай будзе прымірэнне. Усё роўна яно наўрад ці надоўга. Урэшце, ці мала на свеце часопісаў...

www.kamunikat.org

# ШАНЦ

Цяпер адзіная надзея заставалася ў Жэнечкі – на сына. Каб жа неяк удалося задуманае! А там... Ягонае радасці ім на дваіх хопіць з каптуром, абы толькі паступіў ён у гэты інстытут.

Самой ёй не надта шанцавала ў жыцці. Бацька, як і ўсе тут, у пасёлку, працаваў на льнозаводзе. Як і ўсе, шмат піў, а ўпіўшыся да паўсмерці, выганяў іх з маці на вуліцу – «набірацца розуму». Калі Жэнечцы споўнілася пятнаццаць, адзін з ягоных хаўруснікаў спрабаваў згвалціць яе. Гэта адбылося ў логу ля самага завода. Ён нечакана выскачыў з-за куста, схапіў яе за плечы, паваліў на кулі, якіх тут шмат валялася наўкола. Ёй удалося ўцячы, але без вераду не абышлося: боўдзіла зачапіў, калі яна вырывалася, абцасам бота за пазваночнік. З таго часу Жэнечку і стала хіліць, ці, як тут казалі, – «нахінаць» уперад. Так яна займела мянушку Нахінатка. Маці, якая і сама ўжо тады ледзь ліпела, павазіла яе па дактарах і шаптунах, але дарэмна. Хвароба аказалася невылечнай.

Напалоханая тым здарэннем у логу, Жэнечка пачала пазбягаць людзей. Улюбёным яе сховам стаў беразняк на беразе возера. Там яна магла сядзець гадзінамі, аж пакуль не заварочваў туды вецер і не прыносіў з завода пах пакулля і кастры. Тады яна падхоплівалася і ішла дадому. У хаце ненавісны пах, хоць і там яго хапала, здавалася ёй, адчуваўся не так востра.

Неўзабаве маці памерла, і Жэнечка засталася за гаспадыню. Гэта было няпроста. Аўдавеўшы, бацька зусім распіўся, нават пачаў выносіць з хаты на продаж рэчы. Скончылася тым, што аднойчы яго знайшлі нежывога на дарозе недалёка ад крамы.

Праз год пасля ягонай смерці Жэнечка скончыла школу і, не чакаючы, пакуль споўніцца васемнаццаць, пайшла прыбіральшчыцай на льнозаводскі склад. Работа была нецікавая і няўдзячная, людзі навокал – хцівыя, жулікаватыя. Усе пілі і яе імкнуліся ўцягнуць у гэтую справу. Але яна ўпарта адмаўлялася. Тады начальніца аднаго з цэхаў, заўважыўшы і ацаніўшы гэткую яе стойкасць, вырашыла пазнаёміць дзяўчыну са сваім сынам. Сын той, статны, але шалапутлівы маладзец па імені Вадзім, ніяк не мог «ачалавечыцца». Ён спадабаўся Жэнечцы, і яны пачалі сустракацца.

Праз год у Жэнечкі «знайшоўся» хлапчук. Але аказалася – не толькі ў яе. Адна з дзяўчат, што рабіла тут жа, на заводзе, таксама нарадзіла і таксама, як сама яна сцвярджала, ад Вадзіма. У выніку Вадзім ажаніўся з тою, другой, а Жэнечцы дастаўся гарохавы вянок. Якраз у гэты момант пайшла на пенсію загадчыца склада. І Вадзімава матка, жанчына рашучая і ўплывовая, каб хоць неяк, відаць, загладзіць віну перад сіратою, уладкавала Жэнечку на яе месца.

Жыццё Жэнечкі адразу змянілася да лепшага. З ёю пачалі лічыцца, незаўважна, неяк неўпрыкмет з'явілася шмат сяброў, сяброваk. Ніхто больш не называў яе Нахінаткаю, нечакана для сябе яна зрабілася Іванаўнай. І пачала яна пакрысе забывацца пра тое благое, з чым сутыкнулася раней.

Але і добрае цягнулася нядоўга. На заводзе памянялася начальства, і пасада Жэнечкі спатрэбілася некаму іншаму. Яе перавялі назад, у прыбіральшчыцы.

Зноў жыццё яе зыначылася – цяпер, вядома да горшага. Нядаўнюю пашану як карова злізала. Сябры пазнікалі. Праўда, не ўсе, сёй-той застаўся. Напрыклад, Фаіна, тоўстая, неахайная маладзіца з прапахлымі наскрозь ільном недагледжанымі валасамі. Як і Жэнечка, яна была маці-адзіночка. Фаіна добра выпівала, памалу і Жэнечку прыахвоціла-такі да алкаголю.

Пілі звычайна ў Жэнечкі на кухні. Бралі некалькі паўлітровак віна і гаманілі, гаманілі да раніцы. Фаіна зрэдку прыводзіла якога-небудзь кавалера, гэткага ж, як і сама, бруднага, прапахлага заводам. Да Жэнечкі ніхто не заляцаўся – напэўна, з-за паставы, што з кожным годам усё больш і больш хілілася наперад.

Адзінаю яе ўцехаю быў сын.

Вася рос кемлівым і разумным хлапчуком. У школе ўсе яго хвалілі і прадказвалі яму добрую будучыню. Асабліва цікавілі хлопца замежныя мовы. У выпускным класе ён ужо дакладна ведаў, кім хоча быць.

– Бач ты – перакладчыкам! – перастарэкнула неяк юнака нецвярозая Фаіна. – Ці не занадта гэта будзе для цябе!

Жэнечцы сяброўчына пацвельванне з сына не спадабалася, яна кінулася яго абараняць.

– Не трэба, мама, – сказаў ён і дакорліва ўсміхнуўся. – Да мяне брыда не прыстане, а вось табе...

Ён не дагаварыў, што меў і што даўно, відаць, хацеў ёй сказаць.

Масла ў агонь падліла ягоная класная, Валянціна Мікалаеўна. Спаткаўшы неяк Жэнечку ля магазіна, яна адазвала яе ўбок, сказала ціха, каб не пачуў хто староннi:

– Сын у вас такі харошы, Яўгенія Іванаўна. Дык не ганьбіце ж вы яго, вазьміце сябе ў рукі. Вы ж маці, няўжо не разумееце: яму падтрымка ваша патрэбная.

Простыя тыя, шчырыя словы настаўніцы стрэмкаю заселі ў Жэнеччынай галаве. Сапраўды, на каго, як не на яе, спадзявацца яе сыну? І яна вырашыла змяніць жыццё. Гэта было цяжка, але яна пераадолела сябе. Кінула піць, пакрысе парвала з кампаніямі.

Вася, акрылены нечаканаю такою пераменай у матчыных паводзінах, узяўся за вучобу з яшчэ большым імпэтам.

І вось настаў час адʼязджаць на ўступныя экзамены. Жэнечка сабрала сына ў дарогу, цвёрда наказаўшы паведамляць ёй тэлеграмаю пра кожную адзнаку, праводзіла на станцыю.

Першы іспыт Вася здаў на пяцёрку, другі – таксама. Але трывога не пакідала Жэнечку. Што, як на трэцім напаткае няўдача? Не зладзіцца што – і бывай тады надзея на лепшае. Як на тое, гартаючы ўвечары стары часопіс, яна з жахам убачыла сярод ягоных старонак лісткі з матэрыяламі да апошняга іспыта. Сын меўся ўзяць іх з сабою, але, мусіць, у спешцы забыўся. І цяпер невядома, як усё будзе. Што, як вельмі патрэбныя яму гэтыя лісткі і без іх ён не зможа як след падрыхтавацца да экзамена? А значыць – і не збудзецца яе запаветная мара. Не, трэба штосьці прыдумаць!

Тут яна, растузаная непрыемнасцю і нядобрымі прадчуваннямі, і ўспомніла пра Фаіну. Можа, тая што-небудзь параіць?

Колішняя сяброўка сустрэла Жэнечку без залішніх сантыментаў. І яна сама, і яе госць, нервовы даўгалыгі маладзец гадоў трыццаці, былі ўжо на добрым падпітку і, як толькі Жэнечка ўвайшла ў кватэру, навыперадкі кінуліся яе частаваць. Жэнечка, каб не пакрыўдзіць гаспадыню, выпіла і адразу ж пачала расказваць пра свае сумненні.

Фаіна, доўга не раздумваючы, параіла ёй ехаць у горад.

– Паперы завязеш – раз. Другое, там такіх, як твой Васька, мора. Зарэжуць і вокам не міргнуць. А будзеш сама побач, можа, і ўгаворыш якога прафесара.

– Будуць яны мяне слухаць, тыя прафесары! – запярэчыла Жэнечка.

Аднак уявіла сына на заводзе, сярод кулёў і кастры, і нерашучасць яе як рукою зняло. Канечне, яна паедзе. Папросіць суседку, каб тая прыгледзела за хатаю, і паімчыцца дапамагаць свайму Васю. Ён жа такі ў яе...

– Вось і добра, і вырашылася дзела. – Фаіна наліла яшчэ. – Дык вып'ем за тое.

Жэнечка спрабавала адмаўляцца, але дарэмна. І неўзабаве, зламаная настойліваю гасціннасцю гаспадыні, і не заўважыла, як зусім захмялела.

Калі яна дабралася, нарэшце, з чыгункі да інстытута, экзамен ужо ішоў ваўсю. Пажылая вахцёрка, даведаўшыся, што да чаго, пасадзіла Жэнечку на канапу, якая стаяла тут жа, пры акне, дала чаю.

– А туды, дзе экзамен, староннім нельга, такі парадак, – сказала і заўсміхалася насустрач пажылому чалавеку, што, шоргаючы абуткам па каляным лінолеўме, сунуўся да іх калідорам.

Мужчына, не дайшоўшы да вахты колькі крокаў, збочыў управа, відаць, да свайго кабінета.

– Дацэнт Міхалёў, – патлумачыла Жэнечцы вахцёрка. – Цудоўны чалавек.

– Міхалёў? Гэта ці не ён старшыня камісіі? – сказала Жэнечка. – Я на сынавым выкліку ягонае прозвішча бачыла.

– Ага, ён, – вахцёрцы відавочна падабалася тлумачыць. – Валянцін Сцяпанавіч, прабачце, калі ласка, ці можна запытацца ў вас? Тут во жанчына здалёку прыехала, з сынам ёй трэба тэрмінова пабачыцца. А ён наверсе там, на экзамене. Дык, можа, дазволіце ёй падняцца на хвілінку?

– Падняцца? Што ж, можна. – Чалавек ветліва ўсміхнуўся жанчынам, знік за дзвярамі кабінета.

Жэнечка не марудзячы кінулася да сходаў, хуценька паднялася на другі паверх.

Вася сядзеў разам з іншымі абітурыентамі ля акна ў канцы калідора. Убачыўшы маці, падхапіўся з месца, кінуўся насустрач.

– Ты прыехала? Вось не чакаў!

– Прыехала, – пераадольваючы здрадлівую сухасць у роце ад выпітага напярэдадні, сказала яна. – Знайшла твае запісы, падумала, можа, спатрэбяцца. – Яна шнарыла і шнарыла ў сумцы, але ўсё ніяк не магла адшукаць патрэбнае. І тут толькі ўспомніла: учора,

вярнуўшыся апоўначы ад Фаіны, каб не забыцца ўранку за мітуснёю, паклала ліскі на стол у прыхожай. А раніцаю, устаўшы з ложка, гэтак доўга не магла з-за галаўнога болю дайсці да сябе, што і забылася зусім на тое, дзеля чаго выпраўлялася ў дарогу.

– Дзе ж яны, запісы? – Вася прысунуўся бліжэй, неўпрыкмет, каб не заўважылі астатнія хлопцы і дзяўчаты, што па чарзе ўваходзілі ў аўдыторыю і выходзілі з яе, уцягваў у сябе паветра. – Ну, мама, пах ад цябе гэткі...

– Што ты, сынок? – толькі і змагла яна сказаць і ў роспачы вывернула змесціва сумкі на падваконнік.

Ліскоў не было.

– Едзь дамоў, што ўжо цяпер бедаваць. – Васеў голас гучаў роўна, але, падалося ёй, адчужана. – Папраўдзе, мне яны не надта і патрэбныя, тыя запісы. Не наеўся, дык не наліжашся.

Жэнечка сабрала назад, у сумку, рэчы, хістаючыся, нібы ўсё яшчэ была п’яная, убакі, павольна пайшла да сходаў.

– Што? Ужо? – Яна ачнулася ад цяжкага одуму, падхапілася з канапы, хіснулася наперад.

Але то быў не Вася. Па прыступках, весела пасвістваючы, спускаўся ўніз хлопец гадоў семнаццаці ў модным доўгім джэмперы і зграбных, наваксаваных да бляску, туфлях.

– Вось, павіншуйце мяне, Казіміраўна, – сказаў, звяртаючыся да вахцёркі. – Я амаль студэнт ужо.

– Вельмі радая за вас. А то баяліся, казалі – нічога не ведаеце.

Хлопец задзірыста пстрыкнуў замест адказу пальцамі, накіраваўся да дзвярэй, за якімі знік нядаўна дацэнт.

– Валянціна Сцяпанавіча ўнук, – сказала вахцёрка. – Выліты дзед, што з твару, што з паставы. Я яго змалку ведаю.

І толькі яна тое сказала, як на верхняй пляцоўцы з’явіўся Вася. Ледзь толькі зірнуўшы на ягоны спахмурнелы, нежывы твар, Жэнечка зразумела: нядобра.

– Што, сынок? – кінулася яна распытваць.

– Ай, тройка, – махнуў ён рукою і адвёў пагляд убок. – Цяпер, мабыць, балаў не хопіць.

– Не хопіць! – яна роспачліва замітусілася па калідоры. – Дык, можа, пагаварыць з кім... Параіцца!

– Пагаварыце з Валянцінам Сцяпанавічам, – сказала вахцёрка. – Як-ніяк старшыня камісіі. Пачакайце, пакуль скончыцца экзамен, і пагаварыце.

Дацэнт праглядаў нейкія карткі. Убачыўшы Жэнечку, ён зноў ветліва ўсміхнуўся ёй, запрасіў сесці.

– Ведаеце, сын у мяне, – пачала яна нерашуча. – Вось, балаў нібыта не хапае. Дык як тут будзе?

– Балаў не хапае – гэта кепска. – Ён спачувальна глядзеў на Жэнечку, на яе няроўную, нахіленую наперад постаць. – А льготы ў вас ёсць якія-небудзь? Ну, можа, ваш сын стаж мае ці калецтва якое?

– Не, такога няма. Вось толькі ведаеце – адзін ён у мяне. Дык шкада будзе, як не паступіць. Так хацелася яму...

– Гэта зразумела ўсё. Але ж правілы ёсць правілы. І тут я нічым вам не дапамагу. Зрэшты, можа, дарэмна вы так хвалюецеся, яшчэ ж нічога дакладна невядома.

Вася не паступіў. Гэта яны з Жэнечкаю адразу зразумелі, як толькі атрымалі канверт з дакументамі – тоўсты, няўклюдны. Ад яго так і патыхала нядобрасцю і расчараваннем.

Сын, хоць, вядома, і перажываў, прыняў няўдачу спакойна. А вось Жэнечка, як ні старалася трымацца, не дала сабе рады. Заходзячыся ад адчаю, што гэта з-за яе ўсё так атрымалася, пазваніла Фаіне, папрасіла прыйсці. Тая прывалакла дзве паўлітроўкі, і доўга, да раніцы, сядзелі, пілі за прымірэнне і вечнае сяброўства.

Налілі і Васю, і ён упершыню за свае семнаццаць не адмовіўся.

Мінулі тры гады. Вася, які год таму адслужыў у войску, як і ўсе ў пасёлку, працаваў на заводзе. Ён па-ранейшаму быў ціхмяны і разумны, але піў ужо шмат, не менш за маці. Кампанія ў іх была адна і тая ж, і часам Жэнечка, расчуліўшыся ад выпітага, казала якому-небудзь новаму Фаінінаму кавалеру:

– Гэта малец мой, Вася... У інстытут паступаў на перакладчыка. Б... буду, калі няпраўду кажу. Пацвердзі, сяброўка!

Фаіна пацвярджала сказанае, але ніхто ім не верыў.

Тады Жэнечка адчыняла насцеж акно, захлынаючыся пахам пацяробкаў, што даносіўся з завода, істэрычна крычала ў цемру некаму нябачнаму:

– Праўду кажу, паступаў! Праўду кажу!..

# ПІКЕТ

*Веры і Рэгіне Кадушкам*

Міхась Юр'евіч Чарнявец, настаўнік літаратуры ў старэйшых класах, падняўся з першага паверха на трэці, спыніўся ў калідоры ля акна – адпачыць. Апошнім часам ён вельмі памажнеў, і яго, асабліва ў такія во перагружаныя ўрокамі дні, як сёння, даймала дыхавіца. Да таго ж і ціск усё часцей падскокваў, што не дзіўна было пры гэткіх умовах працы: дзяцей у класах шмат, пад сорак чалавек, паветра цяжкае, не прадыхнуць, гвалт, гармідар. А яшчэ ж сшыткі, планы, класнае кіраўніцтва, размовы з бацькамі вучняў, бясконцыя чароды правяральшчыкаў... Ды і кепскае, спехам, харчаванне: чай або кава ўранку, перасмажаная катлеціна ў школьнай сталоўцы на абед, тлустая, усухамятку, вячэра – здароўя не дадавала.

Пастаяўшы хвіліну-другую ў калідоры, Чарнявец адчыніў дзверы настаўніцкай. Там быў толькі Васіль Пятровіч, дырэктар. Ён стаяў ля стэнда з раскладам і нешта выпісваў сабе ў нататнік. Толькі Чарнявец раскрыў рот, каб паскардзіцца яму на невыносны шум у школе падчас перапынкаў, як у памяшканне бадзёрым крокам увайшла матэматычка Святлана Аляксееўна. Павітаўшыся, яна села ў крэсла, прыязна ўсміхнулася Міхасю Юр'евічу.

Сэрца ягонае забілася хутчэй, і невыпадкова: памяркоўная, заўсёды ветлівая матэматычка яму падабалася. Яна была не замужам, а ён, стомлены адзінотаю і неўладкаванасцю халасцяцкага побыту, якраз планаваў жаніцца. І лепшай кандыдатуры, чым Святлана Аляксееўна, для ажыццяўлення гэткага намеру не бачыў. І яна, здаецца, была не супраць, каб пабрацца – калегі ўжо неаднойчы яму на тое намякалі. Канечне, прадметы яны розныя выкладаюць, але хіба гэта можа быць перашкодаю для ўзаемаразумення ды сумеснага жыцця?

– Ну, як там нашы дзесяцікласнікі? – звяртаючыся да Чарняўца, спытаў дырэктар. – Што зараз праходзяць па літаратуры?

– Сёння чэхаўскага «Чалавека ў футарале» разбіралі, – адказаў ён.

– Ого! І як прайшло?

– Так сабе, – не вельмі ахвотна сказаў Міхась Юр’евіч і зняў акуляры. – Уявіце, найбольш эмоцый выклікала ў іх вата ў вушах у Белікава.

Калегі пераглянуліся, дружна, бы па камандзе, заўсміхаліся. Але, бачачы, што яму не да смеху, тут жа зноў зрабілі сур’ёзныя міны.

– Яны ж дзеці, Міхась Юр’евіч, – голасам, у якім адначасова чуліся і дакор, і перапрашэнне за недарэчную весялосць, сказала Святлана Аляксееўна і дакранулася да ягонай рукі. – І вам не след гэтак рэагаваць на іхнія паводзіны.

– Не след? – чырванеючы, прамовіў ён і падняўся з-за стала. І ўжо сабраўся з духам, каб запярэчыць больш грунтоўна, як празвінеў званок на ўрок.

Святлана Аляксееўна падхапіла пад паху стос сшыткаў, пагойдваючыся на абцасах, накіравалася ў калідор. Чарнявец са шкадаваннем праводзіў яе паглядам: усё ў матэматычцы, ад шпаркае, рашучае хады да вабнай, крыху знарок неахайнай высокай прычоскі, выклікала ў ім у гэты дзень пяшчоту і замілаванасць.

– Ой, не вароньце, шаноўны, – заўважыўшы, мусіць, ягоны лірычны настрой, сказаў Васіль Пятровіч. – А то і памраце халасцяком. Чацвёрты дзесятак, як-ніяк, варта падумаць...

Чарнявец склаў у партфель рэчы, таксама падаўся да дзвярэй. Урокаў у яго больш не было, але і размаўляць на тэму, якую зачапіў дырэктар, не хацелася. Да таго ж ён сёння яшчэ збіраўся наведаць фізрука Амбразёнка, да якога даўно ўжо абяцаў забегчы ў госці, але ўсё неяк не выпадала.

У калідоры на гэты раз было ціха. Ён зайшоў у самы дальні, цёмны, кут, азірнуўшыся, ці не бачыць хто старонні, дастаў з кішэні шматок ваты. Раздзяліў яго на дзве часткі, засунуў па чарзе з дапамогаю запалкі адну ў адно, другую ў другое вуха. І тае ж хвіліны зноў успомніў смех у класе, калі чыталі пра звычку Белікава хадзіць з ватаю ў вушах. Успомніў і сцяўся ад здагадкі: ці не з яго гэта яны рагаталі? Вядома ж, з яго! На душы зрабілася так прыкра, быццам хто прылюдна плюнуў у твар. Прыкрасць вельмі хутка перарасла ў крыўду. Як можна кпіць і смяяцца з хворага чалавека! Ён месяц таму перахварэў на атыт, і зараз яму, каб пазбегнуць рэцыдываў, трэба вельмі, вельмі берагчыся.

На двары, нягледзячы на пачатак красавіка, было даволі сцюдзёна. Сонца не выглядвала каторыя суткі, пранізлівы сухі вецер, злосна гойсаючы між будынкаў, шпурляў у твар пыл і смецце, працінаў да

касцей. Чарнявец наставіў каўнер плашча, пацепваючыся ад холаду, пашыбаваў да прыпынку.

Амбразёнак адчыніў яму сам. Сказаўшы штосьці на вуха жонцы, узяў Міхася Юр'евіча пад руку, павёў у свой пакой. І там доўга, ледзь не гадзіну, гаварыў, стараючыся разгаварыць і госця. Але дарэмна. Чарнявец сядзеў моўчкі і ўважліва, быццам што выглядваючы, сачыў з-пад акуляраў за таварышам – так уважліва, што той урэшце сумеўся. На шчасце, у пакой увайшла гаспадыня.

– Калі ласка да стала, – сказала, запрашаючы ў кухню.

– Не-не! – Міхась Юр'евіч рашуча замахаў рукою. – Мне ісці трэба... Мяне чакаюць.

– Чакаюць? Ці не Святлана Аляксееўна? – соладка ўсміхнулася Амбразёнчыха.

– Якая Святлана Аляксееўна? – нібыта не разумеючы, што яна кажа, адказаў ён і выскачыў у прыхожую, адтуль, апранаючы на хаду плашч, – на пляцоўку.

Хацелася есці. Гэта Чарнявец адразу зразумеў, як толькі трапіў з цяпла на вуліцу, у халадэчу. І пашкадаваў ужо, што не застаўся ў Амбразёнкаў. Не так ужо конча яму было адыходзіць. З другога боку... Пагасцюеш во гэтак, а потым хоцькі-няхоцькі да сябе кліч. А там ці мала што вызырацъ, панясуць па ваколіцы. Зноў жа, выдаткі. Словам, не гэтулькі наедку, колькі клопатаў. Тым больш, што дадому – рукой падаць, пяць-сем хвілін хады.

Ля падземнага перахода побач з ягоным домам таўклася купка людзей. Пяцёра мужчын і дзве жанчыны, прымасціўшы ўстыч газетнага кіёска дачны столік, нешта горача даводзілі прахожым. Тыя падыходзілі да стала, чыталі нейкую паперку, прачытаўшы, ставілі подпіс ці, наадварот, абураныя адыходзілі прэч.

Чарнявец падышоў бліжэй.

– Што гэта тут? – спытаў у кабеты, што гандлявала побач штучнымі кветкамі. – Мітынг, ці што?

– Пікет нейкі, – адказала тая і махнула рукой: маўляў, рабіць людзям няма чаго, вось і займаюцца глупствам.

Міхась Юр'евіч хацеў ісці далей, ды ці то цікаўнасць перамагла, ці то агульны настрой перадаўся, але ён незаўважна неяк для самога сябе апынуўся ля стала. Якое ж было ягонае здзіўленне, калі, падняўшы вочы, ён пазнаў у адной з пікетчыц... Святлану Аляксееўну.

Некалькі хвілін ён не мог вымавіць ні слова. У вачах у яго пацямнела, а сэрца затахкала так моцна, нібыта збіралася разарвацца на кавалкі.

– Вы... у кіпеце? – блытаючыся ад разгубленасці ў складах, вымавіў ён нарэшце.

– Я, – весела сказала жанчына і засмяялася. – Мы ўжо трэці дзень тут стаім. Далучайцеся і вы да нас.

– Трэці дзень?! – жахнуўся ён.

– Дык далучыцеся ці не? – працягвала дапытвацца Святлана Аляксееўна.

– Я... мне не выпадае, – адступаючы ад стала да ходніка, прамармытаў Чарнявец і роспачліва азірнуўся.

На ягонае шчасце, да пікетчыкаў падышла адразу вялікая група людзей, і ён, выкарыстаўшы гэта, апрометцю сігануў у пераход.

І потым увесь час, падымаючыся з перахода на вуліцу, і пасля, ідучы паўз стадыён да свайго двара, і ў кватэры, ладзячы немудрагелісты халасцяцкі абед, ён думаў пра матэматычку. Яна – у пікеце? Хто б мог падумаць! Вось табе і лагодная! А ўсе – жаніся, жаніся... Ажэнішся, а яна будзе во гэтак па пікетах шастаць? А ад пікетаў і да палітыкі недалёка. І самі пікеты розныя бываюць. Вось і гэты – добра, як дазволены, а як не?

Ён ведаў з газет, што дазволамі на правядзенне пікетаў займаецца гарадская адміністрацыя. Зазірнуў у тэлефонны даведнік, набраў патрэбны нумар.

– Які пікет? – жаночы голас на тым канцы провада прагучаў няўхвальна. – Хто пікетуе?

І тут толькі Міхась Юр'евіч успомніў, што ў спешцы не паглядзеў нават, які там, ля перахода, быў пікет. Гэта ўскладняла справу, і ён, каб не дадаць сабе яшчэ якую непрыемнасць, хуценька паклаў трубку на месца.

Рэшту дня ён правёў кепска. Настрой быў ніякі, ў галаву ўвесь час лезлі думкі пра Святлану Аляксееўну. Яна, настаўніца, займаецца гэткімі справамі? Як яна можа?

Яшчэ горш было ўначы. Сніліся сны, і кожны быў страшнейшы за папярэдні. То Святлана Аляксееўна, мроілася, распаўсюджвае нейкія ўлёткі. То трызнілася, што па яе прыйшлі з міліцыі. То ўяўлялася, што яны бягуць удваіх па вуліцы, а за імі гоняцца на чорным варанку дзядзькі ў форме. Напрыканцы саснілася, што ён, Чарнявец, памёр, і ягоныя калегі, вяртаючыся з могілак, кажуць, якое гэта было

задавальненне – яго хаваць. А Святлана Аляксееўна, стоячы ў пікеце, збірае подпісы супраць ягонага ўваскрашэння.

Ачнуўся ён а шостай гадзіне. Доўга абмацваў сябе сяк і так, нарэшце, упэўніўшыся, што жывы, падняўся з ложка, пайшоў пад душ. Пасля душа папіў халоднага чаю, апрануўся, пасунуўся на трамвайны прыпынак.

У школе, як заўсёды, было тлумна. Унікаючы найбольш шматлюдных месцаў, Міхась Юр'евіч паныла перасёк калідор, увайшоў у настаўніцкую.

Святлана Аляксееўна, пунцовая ад хады (яна штодзень дабіралася на працу пешкі), стаяла перад люстэркам і папраўляла разбэрсаныя ветрам валасы.

– А, вы! – сказала, убачыўшы яго ў люстэрку, і дакорліва ўсміхнулася. – Што ж вы збеглі ўчора? Пікет быў такі ўдалы, мы чатырыста подпісаў сабралі за будаўніцтва ў мікрараёне новай лазні.

– Я... спяшаўся, – зманіў ён, гледзячы з непрыязнасцю на яе пахіленую набок і, як падалося яму, падобную да сарочынага гнязда, прычоску. Хацеў дзеля прыліку яшчэ што дадаць, але не здолеў. Быццам нешта абарвалася ў ім пасля ўбачанага напярэдадні ля перахода, і пераадолець сябе, як бы таго ні жадалася, ён не мог.

– Вельмі шкада.

– Мне таксама, – уздыхнуўшы з палёгкаю, што размова нарэшце скончылася, сказаў Чарнявец і борзда накіраваўся да дзвярэй.

З хвіліны на хвіліну меўся празвінець званок, а яму яшчэ трэба было падрыхтаваць на дошцы сякія-такія запісы да чарговага ўрока аб «футаральным жыцці».

# МЕТАМАРФОЗА

Цела па-ранейшаму было адрузлае, нейкага няўцямна-сінюшнага колеру. «Як у курыцы перад скананнем», – сказала мінулым разам жонка Сымона Апанасавіча Надзя і нават прыкрыла рукою рот, робячы выгляд, што яе вось-вось званітуе. Ён тады вельмі ўзлаваўся на яе, але змоўчаў: што карысці заводзіцца? І з яшчэ большым імпэтам налёг на лекі. Але мінулі два месяцы, а прапісаная прафесарам Разуменкам мікстура так і не дала жаданага выніку.

Асабліва трывожылі Сымона Апанасавіча плечы. Замест таго, каб шырэць, яны, наадварот, з кожным днём усё вузелі, рабіліся наўздзіў нязграбныя і касцістыя. Не радавалі і шыя, і ногі. А найбольш засмучаў жывот – вялікі, з непраніцальнаю тлушчавай пракладкай, такой тоўстай, што пуп дарэшты патанаў у ёй.

А як-то ззаду?

Сымон Апанасавіч зняў з цвічка люстэрка, накіраваўся ў ванны пакой, дзе вісела на паўсцяны другое, большае. Стаўшы спінаю да яго, пачаў з дапамогаю таго, што ў руках, дэталёва вывучаць патыліцу, карк, паясніцу.

Нішто не цешыла вока. Толькі вось рукі ў перадплеччах, падалося, крыху нібыта наліліся, зрабіліся больш тугія. Узбадзёраны такім назіраннем, Сымон Апанасавіч выскачыў з ваннага пакоя, хіснуўся праз калідор у спальню.

– Зірні, Надзя! – гукнуў усхвалявана, звяртаючыся да жонкі. – Ці не пачынаюць дзейнічаць прафесаравы лекі. – Ну, глянь жа!

– Адчапіся, смала! – адказала незадаволена тая. – Больш вер гэтаму свайму Дурненку, дык, можа, зусім змарнееш.

– Ай, заўсёды ў цябе неадэкватная рэакцыя, абы панаругацца, – пакрыўдзіўся ён і выйшаў са спальні. Надзя і наогул яго ніколі не разумела, цяпер жа, калі ён так грунтоўна заняўся сабою, зусім перастала ўважаць за нармальнага чалавека. Ды хай сабе – не вялікая страта. Галоўнае зараз – каб удалося тое, што задумана. А задума ягоная грандыёзная.

Пачалося ж усё паўгода таму. Неяк аднаго разу, мыючыся ў лазні з найлепшым сваім сябрам, прафесарам медыцыны Разуменкам, Сымон Апанасавіч расказаў таму, якія мае планы наконт далейшага

жыцця, калі выйдзе на адпачынак. Слова за слова – завязалася шчырая размова. Сымон Апанасавіч, які ўсё жыццё займаў высокія пасады ў кіраўніцтве раёна, а пасля і вобласці, ужо даўно нудзіўся атмасфераю няшчырасці і падсуклечвання, што панавала там ад веку. Між іншым, даверыў доктару і ўласную таямніцу: аднойчы, стаўшы вольным чалавекам, ён выступіць з гэткім рашучым асуджэннем вышэйназванай брыдоты, што і чарцям зробіцца млосна. Тым больш і трыбуна маецца: рэдактар гарадской газеты Сцяпан Барысавіч Шусцік ужо колькі разоў запрашаў да супрацоўніцтва.

– І не пабаішся сказаць, што думаеш? – пагладжваючы задуменна бліскучы ад поту лоб, сказаў Разуменка.

– Што пенсіянеру баяцца, – цепануў зухавата плячом Сымон Апанасавіч. – Сам падумай.

– Ой, глядзі, – буркнуў прафесар і пахітаў галавою. – Глядзі, каб не зламаў сабе шыю.

І параіў Сымону Апанасавічу лекі ўласнага вынаходніцтва для ўмацавання цела. Маўляў, пап'еш і адразу і падужаеш – а дужаму ніякая трасца не страшная. Сымон Апанасавіч, які заўсёды, колькі памятае сябе, употайкі пакутваў з-за неадпаведнасці ўласнага аблічча прозвішчу – Магутны, – ахвотна пагадзіўся на прапанову і вось ужо больш двух месяцаў глытаў то адно зелле, то другое.

Спачатку ўсё ішло някепска, але недзе праз тры тыдні падскочыў угору ціск, з'явіліся млявасць, сэрцабіццё. Напалоханы, ён пабег да Разуменкі па параду, што рабіць далей. Той паслухаў яго праз фанендаскоп, парэкамендаваў знізіць дозу лекаў. Нядобрыя сімптомы зніклі. Але ж і жаданага выніку не было. Як ні ўзіраўся Сымон Апанасавіч ва ўласнае цела, усё было марна – ані прабліску, ані знаку да лепшага.

І вось, нарэшце, як кажуць, – першая ластаўка!

Ён зноў вярнуўся ў ванны пакой, трымаючы люстэрка на ўзроўні грудзей, пачаў пільна ўглядацца ў чырванаватыя, парослыя негустым валасіннем перадплеччы. Ну, так і ёсць: пашырэлі!

І ўсё яшчэ не верачы ўласным вачам, Сымон Апанасавіч выскачыў назад прыхожую, гучна, колькі хапіла моцы, заспяваў.

Памылкі не было – спадзяванні спраўдзіліся. Праз тры дні перадплеччы выраслі амаль удвая. Следам за імі і самі плечы пачалі дужэць і ўсё цела налівацца моцаю. Нават колер яго змяніўся: звычайна белавата-шэрае, яно пачало спакваля рудзець, набываць

тое бронзавае здаровае адценне, што характэрна для спартсменаў і проста загартаваных людзей. Жывот, нядаўна зусім яшчэ трыбухаваты і шырокі, пачаў незаўважна ўціскацца, зрабіўся роўны і мускулісты, бы ў дваццацігадовага хлопца. Не расчаравалі і ногі. Грудзіна ж, раней упалая, плясcкатая, як недапечаны блін, вачавідкі зрабілася тугая.

Цяпер, пасля гэткіх зменаў, самы час быў усесціся за напісанне артыкула. Сымон Апанасавіч засяроджана крутнуў дыск тэлефона, прыклаў да вуха слухаўку.

– Сцяпан Барысавіч, добры дзень! – сказаў, пазнаючы па голасе рэдактара. – Гэта Магутны. Вось, надумаўся матэрыял для вашай газеты скрапаць, раблю накіды.

– Дык цудоўна, Сымон Апанасавіч, даражэнькі, буду вельмі рады з вамі супрацоўнічаць, – азваўся той. – Як скончыце, так адразу і прыносьце ваш матэрыял. Гарантую: ніякіх праблем з публікацыяй не ўзнікне.

Сымону Апанасавічу Магутнаму ў жыцці шанцавала. Скончыўшы сямігодку, ён адразу ж паступіў у тэхнікум, а пасля – дарэчы, з першага заходу – у інстытут. Ягоны непітушчы (што і па тых часах было ўжо вялікай рэдкасцю) бацька, які працаваў у батанічным садзе, параіў сыну спецыялізавацца па аграноміі. І меў рацыю. Ва ўсялякім разе, у пасляваенныя гады, на якія прыпаў пачатак Сымонавай працоўнай дзейнасці, іх сям'я ніколі не галадала. Неўзабаве яго прызначылі на пасаду старшыні калгаса, а праз пяць гадоў прапанавалі месца спачатку ў раённай, а потым у абласной адміністрацыі. Так пачаўся чарговы і, можа, самы складаны этап ягонага жыцця. Бо шмат што з таго, чаму нідзе: ні ў школе, ні ў тэхнікуме, ні ў інстытуце – не вучылі і без чаго ў такой высокай установе надоўга не асталюешся, давялося спасцігаць самавукам. І перш за ўсё складанасці тыя тычыліся ўзаемаадносін з калегамі і асабліва з начальствам. Тут гэта была цэлая навука, цэлы, як той казаў, акадэміёзус. Спасцігнуўшы яе аднойчы, чалавек пасля ўжо пры любых абставінах адчувае сябе як рыба ў вадзе. Сымону гэта ўдалося неяк хутка, і праз пару месяцаў ён быў на новым месцы калі не шчупаком, дык язём – дакладна. Праўда, не абыходзілася і без страт – найчасцей маральных. Па-першае, зашмат даводзілася дагаджаць. Па-другое (і да гэтага Сымон Апанасавіч так ніколі і не прывык), – увесь час наступаць на гарляк не толькі іншым, але і сабе. Гэта

заўсёды выклікала ў ягоным сэрцы нязгоду, нават пратэст, хоць да адкрытага, безагляднага канфлікту справа ніколі не даходзіла. За гады працы на высокай пасадзе Сымон Апанасавіч навучыўся быць абачлівым. Але тое было раней. Цяпер жа, калі ён амаль пенсіянер, а значыць – вольны чалавек, ды цела ў дадатак мае дваццацігадовага малайца, можна ўрэшце і ўзбунтавацца. Свабода – адзіная каштоўнасць на свеце, і кожны хоць аднойчы, хоць на схіле жыцця, мусіць яе пакаштаваць.

Першае, што ён зробіць, – гэта апіша падрабязна, з усімі дэталямі, акалічнасці выбараў, у выніку якіх крэсла старшыні аблвыканкама дасталася спачатку гэтаму ганарыстаму пеўню Апяцёнку, затым, праз чатыры няпоўныя гады, ягонаму сябруку – Крывашэю. Затым паводзіны некаторых начальнікаў у жніўні 91-га, падчас путчу. Потым... Божа, ды ці мала можна ўсялякага набраць, што і не такі зацвіллены горад, як іхні, ускалыхнула б. Толькі пастарацца, толькі зрабіць як найкрасамоўней!

Сымон Апанасавіч падняўся з-за стала, падышоў да люстэрка. Зірнуў на сваё адлюстраванне і ажно сцепануўся ад узруху: няўжо гэта ён? Не пазнаць чалавека. Адно слова – Магутны!

З кухні выглянула Надзя, падазрона зыркнула ў ягоны бок. Апошнім часам яна відавочна яго раўнавала, хоць ніколі у тым не прызнавалася. І няхай. Ён хацеў сказаць жонцы што-небудзь такое, каб пацвеліцца, але перадумаў: навошта злаваць. Яна і сама ўжо, мабыць, зразумела, як подла з ім раней абыходзілася.

Погляд ягоны слізгануў па Надзіным твары, затрымаўся на календары. Цікава, колькі там да афіцыйнага дня сканчэння ягонай службы? Дваццаць дзён? Цудоўна! Дваццаць дзён – і ён вольны чалавек.

Ён вярнуўся да стала, зняў трубку тэлефона, набраў нумар.

– Алё, Сцяпан Барысавіч? Магутны вас турбуе.

– А-а, вы, Сымон Апанасавіч! – узрадаваўся рэдактар. – Дзень добры! Як наш артыкул?

– Амаль гатовы. На наступным тыдні перадам у рэдакцыю.

– Ну, нарэшце, нарэшце, Сымон Апанасавіч. – У голасе Шусціка была шчырасць, шмат шчырасці. – Перадавайце і як хутчэй. А мы тут адразу, не марудзячы – у друк.

Праводзіны былі сціплыя. Для чалавека гэткага рангу, як Сымон Апанасавіч, можа, нават і залішне. Ні доўгіх прамоў, ні спічаў. Усё

проста, ціха, без звыклай для такіх падзей урачыстасці. Праўда, з невялікім фуршэтам, падчас якога ўсе крыху ажывіліся, павесялелі. Гледзячы на расчырванелыя твары саслужыўцаў, цяпер ужо былых, Сымон Апанасавіч пакутліва думаў: як-то ўспрымуць яны ягоную нечаканую споведзь у газеце? Вядома, знойдуцца і такія, што асудзяць, але... Але няхай сабе.

– Зоя, можна вас на хвілінку? – ён падышоў да сакратаркі, узяў яе пад руку. – Апошняе даручэнне, калі дазволіце. Вось тут папка, трэба яе перадаць заўтра ў гарадскую газету, асабіста Шусціку. Зробіце?

– Для вас – што заўгодна, Сымон Апанасавіч, – засмяялася жанчына і моцна, як добраму сябру, паціснула далонь. – З раніцы занясу, не турбуйцеся. А вы адыходзіце ўжо?

– Пайду, нешта галава разбалелася, – апранаючы плашч, зманіў ён. – Развітаюся з усімі і пайду. А вы не спяшайцеся, пабудзьце яшчэ, і ўсе няхай пабудуць. Калегі! Вельмі вам усім удзячны за падтрымку, за чуласць. Але, на жаль, мушу вас пакінуць. Да пабачэння.

Сымон Апанасавіч абдарыў прысутных усмешкаю, іграючы мускуламі плячэй, пругка, па-маладому пакрочыў у двор, да машыны.

Ён бадзёра ўзбег па прыступках на другі паверх, расчыніў дзверы прыёмнай. Маладзенькая сакратарка адарвалася ад папер, запытальна глянула на Сымона Апанасавіча.

– Вам каго, малады чалавек?

– Мне галоўны патрэбен, – адказаў ён.

– Вы аўтар? Як ваша прозвішча?

– Магутны.

– Добра, зараз папярэджу Сцяпана Барысавіча.

Яна знікла за дзвярамі, але праз хвіліну, неяк натужліва, як нехаця ўсміхаючыся, вярнулася на сваё месца. Следам за ёю, выціраючы насоўкаю твар, выйшаў у прыёмную Шусцік. Ён няўважна, нібы не пазнаў, глянуў на Сымона Апанасавіча, паціснуў плячамі.

– Дзе ж Магутны? – сказаў незадаволена, звяртаючыся да дзяўчыны.

– Дык ... я Магутны, – збіты з панталыку тым, што яго не пазнаюць, сказаў Сымон Апанасавіч і разгублена дадаў: – Сцяпан Барысавіч, гэта я!

– Не сляпіце мне вочы. Я Магутнага ў твар ведаю, – адказаў рэдактар і направіўся да дзвярэй кабінета. – Сорамна: людзі

працуюць, а вы замінаеце. Малады, здаровы, знайшлі б які іншы занятак.

Уваччу ў Сымона Апанасавіча пацямнела. Ён выйшаў з памяшкання, трымаючыся рукою за сэрца, падаўся калідорам на вуліцу.

Дзве зграбныя, густоўна апранутыя маладзіцы, што курылі на ганку, перасталі гаманіць, з цікаўнасцю паглядзелі на яго. А з-за шчыльнае фіранкі рэдактарскага акна пазіраў на яго Шусцік і, заходзячыся смехам, гаварыў з некім па тэлефоне.

www.kamunikat.org

# ГОСЦЯ

## 1

Прага кахання спала гэтаксама хутка, як і нахапілася. Ледзьве паспеў Весік адгукнуцца на апошні яе, самы слодычны, покліч, як цела адразу паслабела і ўсё навокал зрабілася абыякавым і неістотным. Ён разамкнуў рукі, унікаючы глядзець на жанчыну, якая ляжала побач, саскочыў з ложка.

– Усё? Хутка ж ты сёння. – Нінка дакранулася пальцамі да ягонай рукі. – Пабыў бы яшчэ.

– Глядзі, набудзешся, – адказаў ён. – Твой як заявіцца, тады хутка не здасца.

– Не заявіцца, не бойся.

Аднак Весік ужо не слухаў: прыгажосць, што нядаўна зусім уяўлялася гэткаю жаданаю і прывабнай, не толькі не хвалявала яго, наадварот, выклікала нейкую незразумелую агіду. Наогул, у тым нічога дзіўнага і не было. З абедзвюма другімі каханкамі, якія былі ў яго да Нінкі, ён у выніку прыйшоў да таго ж самага.

Першая, вясёлая ўсмешлівая маскоўка, з якою сышліся, калі яму толькі-толькі споўнілася шаснаццаць, зараз жыла з мужам недзе пад Смаленскам. Другая, што доўга даймала яго прапановамі ажаніцца, а калі ён амаль згадзіўся, выскачыла нечакана за аўдавелага калгаснага агранома, рабіла загадчыцай клуба ў суседняй вёсцы. І маскоўка, і загадчыца, і цяпер вось Нінка – усе трое былі старэйшыя за яго і з усімі траімі ён развітаўся без асаблівага шкадавання. Праўда, з Нінкаю сувязь яшчэ не скончылася. Але і трываць ёй заставалася нядоўга: днямі Весік ад'язджаў на вучобу ў тэхнікум.

Апрануўшыся, ён спехам усторкнуў на ногі красоўкі, выйшаў на вуліцу. На душы было слотна, быццам праглынуў жабу. І зусім ужо зрабілася няўсцерп, калі ўбачыў здалёку ля прысадаў панылую худую постаць Валодзькі, Нінчынага мужа. Той ішоў ад аўтобуснага прыпынку і штосьці ціха насвістваў сабе пад нос.

Весік закурыў, стаў у разгубленасці пасярод вуліцы. Што рабіць? Загаварыць ці не падаць выгляду, што заўважыў? Збочыў за арэшнік,

не зважаючы на Валодзькаў вокліч, шпарка пакрочыў да хаты. Раптам захацелася спаць – ды так, што аж ногі падкасіліся.

За тры падвор'і ад сваёй хаты ён спыніўся – даць прыкурыць суседу. Той, відаць, даўно ўжо пільнаваў якога стрэчнага, бо нават рукі ў яго трымцелі ад нецярпення.

– Дай, браток, хутчэй... О, дзякуй!

За фіранкаю мільгнула, прапала і зноў з'явілася тонкая дзявочая постаць. Сон Весікаў як рукой зняло, а сэрца забілася хутчэй.

– Ці не ўнучка прыехала, Антонавіч? Нешта ж позна, лета на зыходзе.

– На пару дзён прыкаціла, – зацягваючыся дымам, адказаў той. – Пакуль школа не пачалася. А ты калі ад'язджаеш?

– Трыццатага, – адказаў Весік і накіраваўся да сваёй хаты.

Ён прачнуўся позна. Ва ўсялякім разе, калі расплюшчыў вочы, сонечныя блікі ваўсю мітусіліся па пакоі, а з кухні не даносілася ні гуку. Гэта значыла – дома нікога няма, і можна качацца ў ложку колькі захочаш. Такая раскоша Весіку не часта выпадала, і тым прыемней яна была напярэдадні ад'езду.

Успомнілася Нінка, гарачыя яе, патроеныя блізкаю разлукай пацалункі. Сабіла яму паступіць у той тэхнікум! Едзь немаведама куды, ды яшчэ ці падасца вучоба. З другога боку, тут, у Канахах, не надта цікава гібець. Вёска на вачах пусцее, маладыя ўцякаюць хто куды – якая тут перспектыва? Так што хочаш не хочаш – трэба збірацца.

Весік усхапіўся з ложка, распрануўся дагала, стаў перад люстэркам. Ён любіў так пастаяць сам-насам перад уласным адлюстраваннем, пайграць мускуламі, гледзячы, як напружваецца ад нясціплых думак мужчынская няўрымслівая плоць, акунуцца ў свет, дзе адно спакой і насалода.

З вуліцы, ад кветніка данёсся слабы жаночы смех. Весік падышоў да акна, вызірнуў на двор. Суседава ўнучка Рыта, пра якую ўвечары гаварылі з Антонавічам, стаяла ля куста вяргіні і поркала прутом кацяня, што ніяк не жадала вылазіць са схова. Дзяўчына была ў просценькай паркалёвай сукенцы са шнуроўкаю на грудзях, шыю ўпрыгожвалі жоўтыя бурштынавыя каралі.

Ладнасць яе фігуры Весік заўважыў яшчэ летась. Але спробы зблізіцца не рабіў: дзяўчыне ледзь-ледзь споўнілася пятнаццаць. Ды само ўрэшце неяк атрымалася. Аднаго разу, гуляючы на школьным

стадыёне ў валейбол, сутыкнуліся ілбамі, паваліліся і тады ўпершыню адчулі адно аднаго. Затым была вечарына ў суседняй вёсцы, і так выйшла, што вярталіся з яе разам, удваіх. Хоць ён і адчуваў, што неабыякавы Рыце, нічога між імі не было. Нават тады, калі пераносіў яе на спіне праз раку, не дазволіў сабе лішняга. Пасля знарок, каб панаругацца, узяўся ўхлёстваць за Нінкай. Неўзабаве Рыта з'ехала назад, у горад, а ён так пры Нінцы і застаўся.

Цяпер Рыта стала зусім дарослай. Плечы, грудзі акругліліся, у паставе з'явілася штосьці таемнае і разам з тым незвычайна вабнае.

Яна, мусіць, таксама прыкмеціла Весіка – усміхнулася, нібыта хаваючы разгубленасць, абшчаперыла шчокі далонямі.

Ён расчыніў акно.

– Прывітанне, Рыта, – сказаў, нацягваючы на плечы майку. – А я гляджу, хто тут нібыта знаёмы ля клумбы. Аж ты. Як справы?

– Добра ўсё. – Дзяўчына выцягнула нарэшце з-пад куста кацяня, падхапіла яго на рукі. Падол сукенкі яе пры гэтым ускінуўся ад рэзкага руху, так што дазвання агаліў дужыя, з чырвонымі плямамі на каленях, ногі.

– Надоўга ў Канахі?

– Да нядзелі. Ужо ў школу збірацца.

– Ага, у школу, – падтакнуў Весік. – Мне таксама ў нядзелю ад'язджаць. У тэхнікум, ведаеш, паступіў.

– Ведаю, дзед казаў. – У голасе дзяўчыны мільгнула пачцівасць. – А мне яшчэ год у школе мучыцца.

– Нічога, год хутка праляціць, і азірнуцца не паспееш. А на сённяшні вечар якія маеш планы?

– Можа, на танцы падамся.

– О, дык магу праводзіць, – голасам, як бы прыйшлося тое так, да слова, прамовіў Весік. – Як, згода?

– Хай будзе згода, – пагадзілася Рыта і, убачыўшы здалёк школьнага фізрука Сяргея Віктаравіча, які набліжаўся да хаты Корсакаў, раптам падхапілася, засаромеўшыся, хуценька знікла на дзедавым панадворку.

Ужо добра-такі сцямнела, а Весік усё сядзеў на лаве пад акном, чакаў Рыту. Недзе пад адзінаццаць зноў прыцягнуўся фізрук. Пабліскваючы запалымі, бы ў сухотніка, вачыма, курыў, расказваў гісторыі з настаўніцкай практыкі. Увесну яму споўнілася трыццаць, але ён любіў пагаманіць і з маладзейшымі, пажартаваць, а пры

нагодзе і кульнуць чарку-другую. Жонцы яго, матэматычцы Валянціне Аляксееўне, заўсёды занятай дзіцем і іншымі хатнімі клопатамі жанчыне, тое, падобна, не надта абыходзіла. Хоць напачатку сумеснага жыцця, хадзілі чуткі, ён неаднойчы ёй здраджваў і яны ледзь не разышліся.

Нарэшце Рыта выйшла на ганак. Весік, якому настаўнік ужо паспеў добра надакучыць, падняўся з лавы, пайшоў ёй насустрач.

– Добры вечар, Сяргей Віктаравіч, – прывіталася яна з фізруком і неяк бачком, быццам баючыся асуджэння, падалася на весніц.

«Ну дзіця горкае, – даганяючы дзяўчыну, падумаў Весік. – І звычкі шкалярскія».

У самы разгар вечарыны нечакана пагасла святло. Музыка сціхла, але пары не разыходзіліся, працягвалі таўчыся пасярод пляцоўкі. Весік, які незадоўга перад тым паспеў апаражніць з сябрукамі паўтарачку гарэлкі, паўжартам прыхінуўся да Рыты, паклаў руку ніжэй паясніцы. Надзіва, яна не адштурхнула яго, толькі напружылася ўсім целам, падалася назад.

На шчасце, ці то наадварот, святло неўзабаве зноў загарэлася. І першае, што Весік убачыў, ледзь яно з'явілася, – Рыціны вочы. Абыякавыя. Пустыя. Нейкія няўцямныя.

– Я не хачу больш танцаваць.

Ён узяў дзяўчыну пад руку, павёў да клуба, туды, дзе неўгамонны Федзька-дурніца гандляваў танным віном. Папрасіў два стаканы, адзін выпіў сам. Другі прапанаваў Рыце. Яна не адмаўлялася, таксама выпіла, праўда, не ўсё – на дзве чвэрці, астатняе выліла на траву.

Затым пайшлі далей, але не дадому, а наўкола гародаў – за вёску, туды, дзе рудзела пад месяцовым святлом свежае іржышча. Параўняўшыся з Нінчынай хатаю, на хвіліну прыпыніліся, каб пацалавацца, і Весіку здалося, быццам нехта за імі назірае з-за фіранкі.

Абмінуўшы апошнюю хату, не згаворваючыся, пайшлі да стога. Што будзе далей? Дзяўчына і вабіла Весіка, і разам з тым палохала: як-ніяк школьніца.

Але ўсё аказалася куды прасцей. Яна сама распранулася і яшчэ і яму дапамагла.

– Ты... усё ведаеш. Адкуль?

– Настаўнік быў добры.

– Хто ён?

– Я ж сказала – настаўнік.

– Хм, настаўнік! Ці мала настаўнікаў на свеце. Фізрук, можа? – так, наўгад, сказаў ён. – Сяргей Віктаравіч?

– Нарэшце, дайшло.

Прачнуліся рана – ледзь-ледзь пасвятлела.

– Божачка, віднее ўжо! – Рыта падхапілася з месца, пачала хуценька апранацца. Усцягнула на голае цела кофту, спадніцу, зашпіліла басаножкі. І калі Весік нарэшце трапіў азяблымі нагамі ў перакручаныя калашыны, яна ўжо спаўзала са стога ўніз.

– Пойдзем па адным, урозь, – сказала, не гледзячы ў ягоны бок. – Я сцежкаю, а ты полем, збоч кустоўя, прастуй.

– Але ж полем мокра, – запярэчыў ён. – Вунь якая раса.

– А ты басанож, дык і не змокнеш.

Яна адышлася воддаль, не азіраючыся, шпарка пакрочыла ў накірунку вёскі.

Больш Весік яе не бачыў. Перад ад'ездам у горад заходзіў развітацца, але Антонавіч сказаў, што яе няма дома, маўляў, пайшла ў суседнія Новікі наведаць хворую цётку. А яшчэ праз месяц маці напісала яму, што Рыта памерла – выпіла атруты з-за нейкага хлопца.

## 2

Дачка інжынера Корсака Каця выходзіла замуж. Вяселле вырашылі спраўляць дома, па чарзе – спачатку ў Корсакаў, затым у бацькоў маладога. Народу мелася быць няшмат, толькі самыя блізкія. За два тыдні да шлюбнай цырымоніі жонка Вячаслава Іванавіча Тамара знарок ездзіла ў мужаву вёску, каб запрасіць на ўрачыстасць каго-небудзь з колішніх суседзяў. З васьмярых канахоўцаў выказала жаданне пабыць на вяселлі толькі Нінка Краўцова, удава-пенсіянерка. Даведаўшыся пра тое, Вячаслаў Іванавіч спачатку захваляваўся, але потым, добра падумаўшы, супакоіўся: гэтулькі гадоў мінула, наўрад яна асмеліцца варашыць даўняе.

У суботу зранку маладыя разам з шаферамі і Кірылавымі бацькамі паехалі ў ЗАГС, а старэйшыя Корсакі засталіся дома – сустракаць гасцей.

Першымі, надзіва, заявіліся госці найдалейшыя – Нінка з дзесяцігадовай дачкой Юляй. Распрануўшыся ў прыхожай, жанчына па чарзе пацалавалася з гаспадарамі, падалася ў кухню –

распакоўваць гасцінцы. І неўзабаве ўвесь стол аказаўся застаўлены вясковымі прысмакамі: каўбасою, салам, фасоляй, гуркамі, яблыкамі і нават тонкімі прадаўгаватымі пладамі барбарысу, якога заўжды, колькі памятаў Вячаслаў Іванавіч, шмат расло ў Канахах на месцы панскай сядзібы.

– А гэта навошта? – убачыўшы тыя ягады, усплёснула рукамі Тамара. – Што рабіць з імі?

– Кампот зварыш, – падміргваючы Вячаславу Іванавічу, адказала Нінка. – Смачна. З языком госці праглынуць.

Яна адышлася ад стала, трымаючыся праваю рукою за бок, цельпукавата пратэпала ў застаўленую сталамі залу. – Добра жывяце, Весічак.

– Ды не скардзімся, – сказаў ён і сеў збоч аднаго са сталоў. – Вы ж як маецеся?

Жанчына правяла пальцамі па чырвонай, запаленай вятрыскамі і клопатамі, шчацэ, усміхнулася.

– Добра, дзякаваць Богу.

«Але ж як яна змянілася, – падумаў Вячаслаў Іванавіч. – На вуліцы дзе-небудзь спаткаўшы, нізашто не пазнаў бы... Выглядае гэтак... нямолада, побач з дачкою як бабуля ўсё роўна.

У прыхожай раздаўся званок, яшчэ нехта прыйшоў. Вячаслаў Іванавіч падняўся з месца, хуценька, каб апярэдзіць жонку, пакрочыў адчыняць.

Вечар удаўся на зайздрасць. Спачатку доўга сядзелі за сталом, віншавалі маладых, спявалі. Пасля наладзілі танцы пад акардэон.

І неяк так сталася, што Нінка, якая дагэтуль сціпла сядзела ў куце побач з Тамараю, няўзнак зрабілася галоўнаю іх дзейнаю асобай. Расчырванелая, вачавідкі павесялелая ад выпітага, яна схапіла за рукаў бацьку маладога, пацягнула на сярэдзіну пакоя.

– Што ты сядзіш, як нежывы! – засмяялася, гарэзліва адкідваючы назад маленькую, з астраўкамі сівізны, галаву. – Як на хаўтурах.

Танцавала яна нязграбна, неяк ураскачку, тулавам, і таўставатыя яе, у нямодных панчохах ногі ўвесь час спазняліся ад астатняга на паўтакта. Але гэта яе не вельмі бянтэжыла. Разгарачаная музыкай і цікаўнасцю людзей, што раз-пораз кідалі на яе пагляды, яна весялілася ваўсю, і здавалася, весялосці гэтай не будзе канца. Гледзячы на яе, Вячаслаў Іванавіч адно дзівіўся: вось дык

метамарфоза, як падмянілі чалавека. Заявілася гэткая шэранькая, прыгнечаная, і – на табе. Сам ён таксама захапіўся – але не танцамі.

Сватава жонка прывяла з сабою сяброўку, сярэдніх гадоў асобу ў карацюсенькай, куды вышэй калена, сукенцы і з вялізнай чырвонай стужкай у валасах. Не надта каб густоўная, маладзіца, аднак, адразу неяк прыцягнула гаспадарову ўвагу своеасаблівай усмешлівай мяккасцю, невыказнай, але бясспрэчнай падатлівасцю, якая – ягоны вопыт неаднойчы тое пацвярджаў – несумненна гарантуе мужчыну поспех. Апранутая як школьніца, жанчына нібыта і сама разумела недарэчнасць сваёй прэтэнзіі на маладосць і ўвесь час як бы шукала вачыма таго, хто калі не зразумее яе, дык хаця б не асудзіць. Вячаслаў Іванавіч не асудзіў. Ва ўсялякім разе, калі яна, хістаючыся не неймаверна высокіх абцасах, накіравалася ў кухню пакурыць, ён не вагаючыся рушыў следам за ёю.

Яна дастала з сумачкі цыгарэту, трымаючы яе між указальным і вялікім пальцамі, села на рог стала. Вячаслаў Іванавіч падаў ёй запалку.

– Як вам у нас падабаецца? – спытаў і тут толькі ўспомніў, што за мітуснёю зусім забыўся яе імя. – Не сумна?

– Не сумна, – адказала яна, усміхаючыся. – А вам?

– Ларыса, дзе ты? – пачуўся з прыхожай голас сваццi. – А, тут? Ну, ладна, пакуры сабе.

Вячаслаў Іванавіч, узрадаваны, што гэтак добра ўсё ўладкавалася з імем і не прыйдзецца перапытваць, падышоў да стала, стаў так, што Ларысіна нага аказалася паміж ягонымі. Яна не адсунулася, не запратэставала, толькі крыху сцепанулася ад нечаканасці.

– А вы гуляка, відаць па ўсім, – сказала і адхінулася плячом да сцяны. Шлейка сукенкі яе пры гэтым з'ехала з пляча, а грудзі напалову агаліліся. – І не сорамна?

– Чаму ж мне павінна быць сорамна? – гледзячы ёй у вочы, адказаў ён. – Я не такі стары яшчэ, здаецца...

– Ну-ну. – Ларыса перасела на другі клуб, са смакам зацягнулася цыгарэтаю. – А што жонка ваша сказала б, каб убачыла, як вы сябе паводзіце? Вы заўсёды гэтакі... няверны?

Апошнім словам яна нібыта знарок падштурхоўвала яго да далейшага дыялогу, і Вячаслаў Іванавіч, не марудзячы лішне, адразу ж запісаў сабе тое ў актыў.

– Залежыць ад абставін, – сказаў, датыкаючыся рукою да яе калена. – Хочаце, нешта накажу вам?

– Хачу.

– Тады наце ключ і ідзіце ў кватэру насупраць.

– У чужую кватэру? Як гэта?

– Гэта не чужая кватэра, а наша. Мы абмянялі на яе з даплатаю пакой у трохпакаёўцы, каб маладым было дзе жыць. Так што не бойцеся, ідзіце.

Яна выслізнула з прыхожай, павольна, як самнамбула, пакрочыла да дзвярэй аднапакаёўкі.

Вячаслаў Іванавіч вярнуўся ў залу да гасцей. Выпіў пад тост разам з усімі яшчэ адну чарку, нібыта ўспомніўшы нешта, ляснуў сябе далонню па ілбе.

– Халера, ці не забыўся гараж прымкнуць. Трэба цягнуцца зачыніць, а то вынесуць усё дарэшты.

– Заўсёды ў цябе нейкія непярэліўкі, – сказала незадаволена Тамара. – Каб хоць раз без сюрпрызаў абышлося.

Вячаслаў Іванавіч вылез з-за стала, робячы выгляд, што няма для яго зараз найгарчэйшай пакуты, як паўзці да таго гаража, выйшаў на пляцоўку.

Дзверы ў дзевяноста пятую стаялі адчыненыя. Ён азірнуўся, ці не бачыць хто староннí, слізгануў у праём.

Ларыса сядзела на канапе, закінуўшы нага за нагу, працягвала курыць. Убачыўшы Вячаслава Іванавіча, яна не выказала ні здзіўлення, ні пратэсту, толькі няпэўна перасмыкнула плечуком.

Ён пераждаргнуў праз нейкую сумку, што стаяла каля самага ўвахода ў пакой, наблізіўся да жанчыны. Яна ўціснула цыгарэту запаленым канцом у гаршчок з кактусам, адкінула рукі за спіну, заплюшчыла вочы. Вячаслаў Іванавіч кінуўся да яе, пачаў распранаць.

Раптам нехта быццам тузануў ручку дзвярэй – раз, другі, трэці. Глуха бразнуў ключ у замку.

Вячаслаў Іванавіч саскочыў з канапы, похапкам накінуў на сябе кашулю, штаны.

– Апранайся хутчэй! – загадаў Ларысе і падаўся на дыбачках у прыхожую.

За дзвярыма ўсё яшчэ валаводзіліся з ключом. У Вячаслава Іванавіча крыху адпусціла ад сэрца: Тамара гэтак доўга з замком не марудзіць. Але ж хто там тады, калі не яны? «Можа, з суседзяў хто памыліўся дзвярамі?» – мільгнула недарэчная думка.

Нарэшце дзверы адчыніліся, і першае, што ён убачыў, была няскладная, з непамерна маленькаю галавой і вузкімі грудзьмі постаць Нінкі.

– Адкуль… адкуль у цябе ключ? – выгукнуў ён здзіўлена, загароджваючы сабою праход у пакой.

– Тамара мне дала – сумку ўзяць, вось адкуль,– сказала жанчына і адхінула яго ўбок. Убачыла Ларысу на канапе, падазрона глянула на яго. Затым войкнула, схапіла плашч, што вісеў на цвіку побач з люстэркам, трымаючы аберуч перад сабою, апрометцю кінулася назад у прыхожую…

Нінка ад'язджала на наступны дзень. Тамара ўгаворвала яе пабыць яшчэ, але яна адмовілася. Маўляў, не да гуляў: працы шмат, ды і суседзям, што згадзіліся даглядаць статак, абяцала не затрымлівацца.

Вячаслаў Іванавіч праводзіў гасцей да станцыі. За ўсю дарогу не прамовілі адзін да аднаго ні слова. Толькі калі ўжо развітваліся ля цягніка, Нінка, хаваючыся, каб не пачула дачка, не вытрымала, сказала:

– А ты ані не змяніўся. Як быў кот, так і застаўся.

І, ужо ўскараскаўшыся на прыступак у тамбур, дадала:

– Рытку Салаўёву, што атруцілася, памятаеш? Твая работа.

Што яна гародзіць?

Вячаслаў Іванавіч так сумеўся ад нечаканасці, што ажно ўтрапянеў. Але тое працягвалася нядоўга. Цягнік крануўся, і ён, нібы баючыся, што яна вось так і паедзе ў свае Канахі з упэўненасцю, быццам ён вінаваты, сказаў гучна пад грукат колаў:

– Вярзеш абы-што, дурная. Я больш за цябе ведаю.

– Ну што ты ведаеш? – яна, трымаючыся рукамі за поручні, з цікавасцю ў вачах нахілілася над сходамі. – Што?

– Іншым разам скажу, – любуючыся міжволі яе загарэлымі грудзямі, што напалову агаліліся ў той момант, калі яна падалася наперад, адказаў ён.

Затым рэзка развярнуўся на абцасах, не азіраючыся, хутка пакрочыў назад, да станцыі.

# ПРЫГОДА ІНЖЫНЕРА ДЗІВАКА

## Фестывальная гісторыя

Горад чысцілі каторы тыдзень запар. З ранку да вечара раўлі на вуліцах смеццеўборшчыкі, сіпелі брандспойты, завіхаліся ля шэрых занядбаных сцен тынкоўшчыкі і маляры. З узыходам сонца прысадзістыя таўсматыя цёткі ў рудым спецадзенні пэцкалі белаю фарбаю ржавыя слупы і бардзюры. Радыё, тэлебачанне, абласная газета наўсхліп даводзілі абывацелям праграму фестывалю. Чвэрцьмільённы горад на вачах ажыў, расквеціўся, зашумеў, як растрывожаны вулей. Свята набліжалася...

Васіль Сцяпанавіч Дзівак, сціплы, непрыкметны інжынер аднаго з будаўнічых трэстаў, у дзень адкрыцця фестывалю вяртаўся са змены дадому. Седзячы ля акна ў пярэднім вагоне трамвая, з асалодаю думаў скрозь дрымоту пра тое, як уваліцца, нарэшце, у кватэру, павячэрае, перакінуўшыся з жонкаю словам-другім, уключыць тэлевізар або разгорне газету. Чалавек ціхмяны і крыху сентыментальны, ён больш за ўсё на свеце любіў спакой і сямейную ўтульнасць, любіў сваю ветлую, гаспадарлівую жонку Зіну і шчабятуху дачку і заўсёды радаваўся, калі яны сустракалі яго пасля змены на балконе ці на лавачцы каля пад'езда.

Тым часам трамвай уз'ехаў на мост. Васіль Сцяпанавіч заўсёды беспамылкова пазнаваў гэта месца па своеасаблівым гулкім, крыху натужлівым трымценні колаў. Ён ачнуўся, расплюшчыў вочы. Сапраўды, наперадзе, адліваючы шызавата-серабрыстай пенаю ўздоўж берагоў, велічнай бліскучай стужкаю вілася ўдалячынь рака. Вось праехалі палову моста, вось, неўзабаве, і бераг... Інжынер

памкнуўся наперад, каб загадзя праціснуцца да дзвярэй, як раптам заўважыў, што ўсе пасажыры ў вагоне пазіраюць кудысьці ўніз, у бок пляжа. Ён таксама глянуў уніз і знерухомеў ад здзіўлення: на пяску ля самай вады, раскінуўшы ўбакі рукі, ляжаў чалавек. Зверху, з амаль саракаметровай вышыні, ён, праўда, больш нагадваў бервяно, і ўсё-такі гэта быў чалавек. Яго цёмны, расшпілены на жываце касцюм выразна вызначаўся лініямі на жоўтым пяску, твар прыкрывала летняя шапка – ці то кепачка, ці то ярмолка. Побач з ім стаяў, уткнуўшы нос у рукаў гаспадара, белы пудзель. Секаную дробны дожджык: мужчына на пяску нібыта варухнуўся, падняў угору руку, трасянуў ёю, але ўставаць не спяшаўся. Не крануўся з месца і пудзель: соладка пацягнуўшыся са два разы, гаўкнуў і зноў застыў пад касымі, па-восеньску сцюдзёнымі кроплямі.

– Мо' кепска чалавеку? – занепакоена сказаў хтосьці ў сярэдзіне вагона.

– Ат, п'янюга нейкі, – перасмыкнула плячыма кабета, што гойдалася на сядзенні побач з Дзіваком. – Ці мала іх?

* * *

Ні жонка, ні дачка на гэты раз Васіля Сцяпанавіча не сустрэлі. Абедзве сядзелі ў гасцінай ля тэлевізара, глядзелі адкрыццё фестывалю.

– Добры вечар вам! – павітаўся ўзрушана інжынер. – Вось і я.

Жонка адарвалася на хвіліну ад тэлевізара, штосьці буркнула, зноў упілася вачамі ў экран.

– Пад мостам на пляжы чалавек ляжыць, – ужо не так упэўнена, як напачатку, працягваў Васіль Сцяпанавіч. – Так, дзіўна, ведаеш...

– Што? Які чалавек? – няўцямна азвалася Зіна. – Ай, не дуры галавы. Еш ды кладзіся спаць.

– Ну, тата, не перашкаджай жа, – выказала незадаволенасць Рытачка. – Які ты!

Васіль Сцяпанавіч выпіў у адзіноце чаю, перагартаў збольшага газеты і лёг спаць.

* * *

Ён ужо і забыўся пра чалавека на пляжы, як раптам, вяртаючыся на наступны дзень з работы, зноў убачыў яго з акна трамвая. Мужчына ў цёмным касцюме, раскінуўшы ўбакі рукі, ляжаў на тым самым месцы, што і ўчора. Той жа самы белы пудзель, паклаўшы

галаву на плячо гаспадара, чуйна вартаваў ягоную адзіноту. Двое падлеткаў з імпэтам шпурлялі зверху ў незнаёмца каменьчыкі.

– Вока выб'юць чалавеку! – абурылася адна з пасажырак. Але голасу яе ніхто, апроч інжынера, не пачуў: усе абмяркоўвалі ўчарашні канцэрт.

* * *

– Зноў той самы дзівак на беразе, – ледзь уваліўшыся ў прыхожую, узбуджана выгукнуў Васіль Сцяпанавіч. – Ой, Зінуля!

– Але ж ты і цвіль, бацька, – непамысна грубым голасам адрэзала жонка. – Ну якая ж мне, скажы ты, справа да незнаёмага чалавека? Сваіх клопатаў хапае: ва універмагу калготкі выкінулі, у «Алесі» вунь спадніцы даюць.

І яна выйшла з пакоя.

– А ў кафетэрый марожанае прывезлі! Шакаладнае! – выгукнула Рытачка, выбягаючы ўслед за маці.

Васіль Сцяпанавіч павячэраў, дастаў з паліцы кнігу. Але чытаць не змог: штосьці перашкаджала. Тады ён выключыў святло, выйшаў на вуліцу, уцягнуўшы галаву ў каўнер, асцярожна, як злодзей, рушыў дварамі да моста.

* * *

Чалавека на пяску не было. Сляды таксама не пракідаліся. Адзінае, што засталося ад незнаёмца, – з паўдзесятка раструшчаных акуркаў у вадзе ля самага берага ды дзіравая пакамечаная ярмолка, якая валялася на ўзвышку побач з лазняком. Васіль Сцяпанавіч пастаяў ля яе колькі хвілін у задуменні, дакараючы сябе за змарнаваны дарэмна час, накіраваўся да сцяжыны. Раптам у кустах штосьці шаснула. Лазняк паблізу расхінуўся, і з яго вылез сярэдняга росту мужчына ў чорным святочным касцюме, пры гальштуку. Ён па-драпежніцку ўтаропіўся ў інжынера калючымі сваімі, вузенькімі, як у азіята, вочкамі.

– Ці не мяне вы шукаеце? – запытаўся насмешліва, атрасаючы з рукавоў смецце. – Няйначай, зверху заўважылі?

– Ага, з моста, – знарок не зважаючы на першую частку пытання, адказаў Васіль Сцяпанавіч. – Што гэта, думаю, за дзівак такі песціцца пад дажджом на пустым пляжы?

– Значыць, з цікавасці? – Вочы незнаёмца непрыязна бліснулі. – А я падумаў, ці не ратаваць мяне надумаліся. Аж во як. Чуў, Вурка?

Зачуўшы сваё імя, з кустоў выбег пудзель, жвава замітусіўся вакол гаспадара.

– А вы што – хворы? – спытаў іранічна Васіль Сцяпанавіч. Ледзь улоўны цень расчаравання, які прабег па твары мужчыны, чамусьці ўзбадзёрыў яго. – Ці, можа, паміраць надумаліся пад мостам?

– Доўга чалавеку памерці? – Твар мужчыны яшчэ больш спахмурнеў, зрабіўся вялы і безабаронны, як у малога дзіцяці, калі яно збіраецца заплакаць. – Ды што вы круціце яе ў руках, апраніце на плех ды і хадзіце сабе, разумнік!

Ён выхапіў у Васіля Сцяпанавіча з рук ярмолку, не прымерваючыся, спрытна, дакладным, як у фокусніка, жэстам ускінуў яе інжынеру на галаву. Затым пацягнуў дзеля надзейнасці ўніз, крутнуўся на месцы і знік у лазняку.

«Вось і зрабі ты добрую справу, – падумаў з прыкрасцю Васіль Сцяпанавіч. – Свіння няўдзячная». Ён шпурнуў ярмолку на пясок, паволі падаўся сцяжынаю ўгору, да моста. Але далёка адысці не паспеў: на процілеглым беразе вынырнуў з-за дрэваў трамвай, бразгаючы коламі па рэйках, уз’ехаў на мост.

Неспадзяваная, як гром узімку, шалёная думка працяла мозг Васіля Сцяпанавіча. Ён борздзенька вярнуўся на пляж, ускінуў на галаву ярмолку, пераадольваючы непрыемнае – ці то ад сцюжы, ці то ад узруху – лекаценне ў нагах, рынуўся ніцма на пясок. «Што гэта са мною? Вось будзе сораму, як збяруцца людзі», – мільганула ў галаве – і... дарэмна. Трамвай дзелавіта прапоўз па мосце, мерна пагойдваючыся, знік за дрэвамі. Ніхто не заўважыў Васіля Сцяпанавіча, ніхто не падаў яму жаднага знаку. Ён перавярнуўся на спіну, хацеў ужо ўставаць, як на мост узышоў, лязгаючы коламі, другі трамвай, затым яшчэ адзін, і яшчэ... І зноў ніхто не пацікавіўся інжынерам. «Вось яно што», – падумаў ён разгублена, згадваючы размову з незнаёмцам, яго спахмурнелы, з непрыхаванаю тугою ў вачах, твар.

Невядомае трывожнае адчуванне ад усяго, што дзеецца навокал, ахапіла раптам Васіля Сцяпанавіча. А што, калі б сапраўды, як кпіў таму незнаёмцу, давялося зараз памерці? Колькі часу праляжаў бы вось гэтак на сцюдзёным пяску, пакуль не спахапіліся б блізкія? І ўжо не проста трывога – адчай сціснуў абручом сэрца. Прэч, прэч хутчэй з гэтага страшнага, бязлюднага берага!

Ён усхапіўся з месца так імкліва, што ажно хруснулі ва ўсім целе суставы. Не зважаючы на рэзкі, шалёны боль у паясніцы, здзёр з

галавы ярмолку, шпурнуў у ваду, подбегам кінуўся ўгору, да трамвайнай лініі.

Толькі зліўшыся на прыпынку з людскім натоўпам, ён крыху нібыта ачуняў, нават кінуў позірк уніз. Пляж, з хвіліну яшчэ назад жудасны ў сваёй няўтульнасці, весела зіхацеў жаўцізною пад перадвечаровым сонцам.

* * *

Зіны і дачкі дома не было. Васіль Сцяпанавіч пасядзеў колькі хвілін у адзіноце ля тэлевізара, выйшаў на балкон.

– Маіх не бачылі, Авяр'янаўна? – спытаў у суседкі, якая перабірала ў міску гарох.

– Не, не бачыла, – адказала тая. – Пэўна, у горадзе дзе-небудзь. Свята ж...

Васіль Сцяпанавіч вярнуўся у пакой, пазяхаючы, зноў стаў уладкоўвацца ля тэлевізара. Хацеў паглядзець прамую трансляцыю з фестывалю, але хутка яго змарыў сон. Ён выключыў тэлевізар ды так і задрамаў на канапе, падклаўшы пад шчаку далонь замест падушкі...

Прачнуўся ён ад гаманы ў кухні. Зіна і Рытачка пілі чай, быў і яшчэ хтосьці з імі трэці. Васіль Сцяпанавіч прыслухаўся і пазнаў па голасе жончыну сяброўку Валянціну. Жанчыны нешта горача абмяркоўвалі, хоць і было ўжо пазнавата, галасы іх гучалі бадзёра і ўзбуджана. «Бач ты, разгялдэкаліся, – падумаў з непрыязнасцю інжынер. – І Валька... Звычайна засынае на хаду, а тут...»

– Твой дзе? Спіць ужо? – нібыта ўчуўшы на адлегласці яго думкі, спытала госця.

– Чорт яго ведае. – Абыякавы жончын голас балюча разануў слых Васіля Сцяпанавіча відавочнай непачцівасцю. – Пайсці зірнуць, ці што?

Інжынер намацаў на табурэце сурвэтку, хацеў прыкрыць ёю твар, але не паспеў: дзверы адчыніліся і ў праёме ўзнікла невысокая зграбная Зініна постаць. Жанчына глянула на крэсла перад тэлевізарам, павольна, як сонная, перавяла позірк на канапу.

– Няма!

Васіль Сцяпанавіч, які ўжо намерыўся быў азвацца, знерухомеў ад нечаканасці. Што гэта? Няўжо не заўважыла яго?

Ён выпрастаў рукі, ірвануўся з канапы... І страціў прытомнасць.

* * *

Зіна збіралася на службу.

– Ты дзе гэта бадзяўся ўсю ноч? – спытала, убачыўшы ў люстэрку мужаву постаць.

Васіль Сцяпанавіч перасмыкнуў вуснамі, вяла правёў рукою па няголеным, з густым шчаціннем, падбародку.

– Як дзе? Спаў.

– Ага, расказвай байкі, так я табе і паверу. У люстэрка зірні на сябе: твар азызлы, вочы чырвоныя, як у труса. Спаў ён...

Зінін недавер канчаткова збянтэжыў Васіля Сцяпанавіча.

– Ды праўда спаў. Што гэта ты?!

На шчасце, зазваніў тэлефон. Зіна кінулася ў прыхожую, схапіла трубку. Званіла Валянціна, гэта Васіль Сцяпанавіч адразу зразумеў па вымушаных паўзах, якія жонка заўсёды рабіла, калі трапляўся хто-небудзь яшчэ больш гаваркі, чым яна сама. Але і кароткіх, скупых рэплік, якія Зіна раз-пораз кідала ў трубку, было яму дастаткова, каб здагадацца: здарылася штосьці надзвычайнае.

– Кажу, дома быў, – больш ужо з упартасці, чым з жадання даказваць, што не хлусіць, зноў загаварыў ён.– Спаў на канапе.

Жанчына няўцямна зірнула на яго пустымі вачыма, адвярнулася да сцяны. І нават тады, калі ён, выходзячы з кватэры, знарок моцна грымнуў дзвярыма, яна не схамянулася, як стаяла, так і засталася стаяць нерухома пасярод прыхожай.

* * *

Увесь вечар Васіль Сцяпанавіч прабавіў на беразе. Раскінуўшы ўбакі рукі, моўчкі ляжаў на сцюдзёным пяску, да рэзі ў вачах узіраўся ў маленькія постаці, што імкліва снавалі па мосце. Людзі ж уверсе, наадварот, здавалася, зусім не заўважалі яго. Гэта было непрыемна і... крыўдна: ураджанне, што яго дачасна выкінулі, выкраслілі з жыцця, усё больш і больш авалодвала інжынерам. Але і ісці адсюль не хацелася: быццам якая д’ябальская сіла ўтрымлівала яго тут, на закінутым спусцелым пляжы. Няўжо так і не знойдзецца нікога, хто б паспагадаў, хоць сабе і знянацку, ягонаму суму і адзіноце?

Гадзін пад дзесяць на пляж прываloкся адзінокі рыбак, лядашчы вірлавокі мужчына ў непрамакальным вайсковым плашчы. Акінуўшы бераг абыякавым позіркам, ён ціха свіснуў, моўчкі паплёўся па сцяжыне ўгору.

Яшчэ праз колькі хвілін з'явілася пара. Дзяўчына першая заўважыла Васіля Сцяпанавіча, войкнула, і маладыя людзі, пабраўшыся за рукі, кінуліся наўцёкі.

Васіль Сцяпанавіч падняўся, хацеў ужо падацца ўслед за параю, як раптам у лазняку штосьці зашамацела і на бераг выйшаў чалавек у касцюме. Ён борзда зняў з ног туфлі, шкарпэткі, не падкасваючы калашын, ступіў у ваду.

– Ну, як табе? – спытаў бадзёрым голасам. – Трымаеш эстафету?

– Трымаю, – азваўся незадаволена Дзівак. – Прападзі яно!

– Во, бачыш, а з мяне смяяўся, – папікнуў незнаёмец. – Жонка, дзеці ёсць у цябе?

– Ёсць, а як жа, – не здагадваючыся, куды хіліць той, адказаў Васіль Сцяпанавіч. – Жонка ёсць, і дачка.

– Ну, і як яны?

– Ніяк. – Інжынер ніякавага ўсміхнуўся.

– Ладна, давай адрас. – Мокрая халодная далонь легла Дзіваку на плячо. – Давай адрас, схаджу да іх, спытаю пра цябе. – Ён хітравата ўсміхнуўся. – Пэўна ж, хвалююцца...

– Бэзавая, восем, кватэра трыццаць два, – узрадаваны, што яны так добра і галоўнае хутка, без лішніх допытаў і слоў, паразумеліся, сказаў Васіль Сцяпанавіч. – Маю жонку завуць Зінаіда.

Чалавек пайшоў, а ён зноў застаўся ў самоце на пустым беразе. І зноў шчымліва-трывожнае адчуванне адзіноты і непатрэбнасці ахапіла Васіля Сцяпанавіча. Ці не сон усё тое, што адбываецца з ім? Рака, пляж, брудная ярмолка... Цікава, што скажа Зіна, калі ўбачыць яго тут, у пранізлівым гэтым, белым нежывым тумане? Зрэшты, яна прыйдзе, а больш нічога і не трэба яму...

– Што ты мне галаву дурыш, хлус няшчасны? – секанўў сіплы, здзекліва-нахабнаваты голас незнаёмца. – Чужы адрас даў. Чалавек з трыццаць другой кватэры даўно спіць.

Начаваць дадому Васіль Сцяпанавіч не пайшоў. Да раніцы блукаў па звілістых цьмяных вулках, разважаў, дакараў сябе за даверлівасць і залішнюю чуллівасць: спагады, бач ты, цеплыні захацелася. На досвітку, не вытрымаўшы ранішняй, з прымаразкам, сцюжы, ён нарэшце пракраўся ў пад'езд. Але ў кватэру не пайшоў, а ўскараскаўся па лесвіцы на гарышча і там заснуў прама на дошках, што каторы ўжо год служылі і лаваю, і сталом рокерам, байкачам ці звычайным прыхільнікам Бахуса – усім, хто як вось ён зараз, не

горнецца сэрцам да хатняга цяпла і ўтульнасці. Канечне, ён яшчэ з вечара мог бы пайсці дадому, а раніцою зноў непрыкметна збегчы, але ўцякаць употай, па-зладзейску, з уласнае кватэры не дазваляў гонар.

Дзесьці ўнізе грымнулі дзверы, лёгкія, гулкія крокі данесліся з прыступак. Васіль Сцяпанавіч здрыгануўся, устаў, кінуўся да акенца. З пад'езда выбегла Зіна, выстукваючы абцасікамі па тратуары, весела пашыбавала да магазіна.

Васіль Сцяпанавіч счакаў, пакуль яна знікне за вуглом, стараючыся не грукаць дошкамі, асцярожна злез па лесвіцы з гарышча, спусціўся на сваю пляцоўку.

Рытачка яшчэ спала.

Ён праціснуўся ў кладоўку, дастаў з паліцы стары рабочы пінжак, штаны, туфлі, склаў усё ў пляцак. Затрымаўшыся на хвіліну ля спячай дачкі, хуценька выбег на вуліцу, пайшоў у бок пляжа. Непадалёку ад моста ён спыніўся ля тэлефоннай будкі, зірнуў на гадзіннік. Зіна ўжо павінна была вярнуцца. Інжынер набраў нумар тэлефона, зашчаміўшы нос вялікім і ўказальным пальцамі, павольна прагугніў у мікрафон незнаёмым голасам:

– Прабачце, паклічце, калі ласка, Васіля Сцяпанавіча.

– Вы што, п'яны? Званіць у гэткую рань! – абурылася Зіна. – Дзіця разбудзілі. Спіць Васіль Сцяпанавіч.

– Дома?

– Дома, а дзе ж яшчэ? – Прыцішаны адлегласцю жончын голас гучаў незадаволена.

Васіль Сцяпанавіч паклаў трубку на месца, аддыхаўся, не зважаючы на калдобіны, кінуўся ўніз, на пляж. Там ён пастаяў колькі часу ў адзіноце ля вады, затым дастаў з плецака адзенне, пачаў акуратна выкладаць ім на пяску мужчынскую постаць.

Пудзіла атрымалася добрае, але занадта тонкае і пляскатае. Прыйшлося падкласці ў пінжак і штаны лісця, якога ён нацерабіў у лазняку прама з галінкамі. Цяпер заставалася яшчэ змайстраваць галаву, гэта было складаней за ўсё. Васіль Сцяпанавіч задумаўся. Чамусьці яму ўспомнілася, як даўным-даўно, гадоў трыццаць назад, ён з іншымі хлапчукамі і дзяўчынкамі ладзіў у сваёй вясковай маленечкай школцы лялек для суседзяў – выхаванцаў дзіцячага дома. Колькі радасці прыносілі небаракам няхітрыя тыя, самаробныя падарункі: саламяны, перавязаны ніткамі торс, драўляныя ногі, размаляванае алоўкам курынае яйка замест галавы. Нос, які

звычайна ляпілі з пластыліну, чамусьці атрымліваўся ва ўсіх наўздзіў доўгі, таму амаль усе лялькі былі падобнымі на Бураціну. Але ж шчаслівы быў час...

Васіль Сцяпанавіч прагнаў успамін, зірнуў на гадзіннік. Была ўжо палова дзевятай, да пачатку змены заставалася менш як паўгадзіны.

Ён хуценька нагроб далонямі пяску ў тое месца, дзе канчаўся ў пудзіла каўнер, затым паклаў зверху ярмолку, задаволены, што ўсё так добра атрымалася, упэўнена пакрочыў сцяжынкаю ўверх, да трамвая.

Два разы, у час абедзеннага перапынку і надвячоркам, у пяць (Зініна змена канчалася а чацвёртай) Васіль Сцяпанавіч званіў дадому. Млеючы ад хвалявання, чужым, дэфармаваным голасам прасіў паклікаць да тэлефона «таварыша Дзівака». Першы раз жонка сказала, што ён на рабоце, а калі інжынер сказаў, што на рабоце яго ніхто не бачыў, ледзяным голасам зазначыла, што «тады, бадай, сабакам сена косіць». Другі раз яна і ўвогуле не пажадала гаварыць, спаслаўшыся на тое, што з хвіліны на хвіліну адыходзіць на заключны канцэрт, паклала трубку і больш, колькі Васіль Сцяпанавіч ні названьваў, так яе і не зняла.

За некалькі хвілін да заканчэння ягонай змены ў прыёмнай раздаўся званок, і сакратарка, якую ён загадзя аб усім папярэдзіў, сказала, што яго на працы няма і ніхто яго з раніцы не бачыў. Васіль Сцяпанавіч выхапіў у сакратаркі з рук трубку, каб паслухаць, што скажуць у адказ, але было позна: на тым канцы провада змоўклі.

– Яна што-небудзь сказала вам? Была сумная? Сказала, што хвалюецца? – кінуўся ён распытваць сакратарку.

– Сказала, што ведае, дзе вы, – падцінаючы вусны, адказала жанчына.

Шалёная радасць ахапіла Васіля Сцяпанавіча.

– Дапякло-такі! – гукнуў ён і, не зважаючы, што рабочы час яго яшчэ не скончыўся, стрымгалоў кінуўся на вуліцу.

* * *

Пудзіла па-ранейшаму ляжала на пяску. Васіль Сцяпанавіч зірнуў на яго з моста, і трапяткое адчуванне блізкай перамогі агарнула яго, сэрца забілася так хутка і весела, што ён ледзь утрымаўся, каб не пусціцца пасярод вуліцы ў скокі. Зрэшты, гэта наўрад каго зараз здзівіла б: людзі рухаліся да амфітэатра такім шчыльным натоўпам,

так усе былі занятыя сабою, што яго дзівацтва, можа, ніхто і не заўважыў бы.

Ён сaступіў крок да парэнчы і... знерухомеў ад нечаканасці. Прама на яго ішла, прыціскаючы да грудзей вялізны букет чырвоных сакавітых гваздзікоў, Зіна. Яна спынілася побач з Васілём Сцяпанавічам, пачала пільна ўзірацца ў твары прахожых. Хутка з натоўпу выпырхнула Валянціна, і яны, пабраўшыся, як школьніцы, за рукі, падаліся тратуарам да амфітэатра. Зіна зірнула ўніз, убачыла на пяску пудзіла, скубнула сяброўку за рукаў.

– Бач, і не скарчэе ж за ноч, – данёсся да Васіля Сцяпанавіча яе бадзёры, крыху здзіўлены голас. – Я і паўгадзіны, здаецца, не вытрымала б такой халадэчы.

Валянціна таксама глянула ўніз, войкнула, але не адхіснулася, толькі мацней сціснула сяброўку за локаць.

– Мо'... нежывы? – выгукнула ледзь чутна. Яна яшчэ штосьці сказала, але што – Васіль Сцяпанавіч не пачуў: на мосце нечакана з'явілася госця фестывалю, славутая спявачка з Масквы, і ўсе з гучнымі воклічамі кінуліся да яе навыперадкі за аўтографамі.

Адчуванне незвычайнай лёгкасці і абыякавасці авалодала інжынерам. Кроў нібыта запаволіла нястрымны свой рух, зморанае бяссоннем і марным чаканнем сэрца забілася роўна і вольна. Такое ўжо аднойчы было з ім – пасля аперацыі, калі сарваўся і засеў у лёгкіх тромб. Быццам на свет тады зноўку нарадзіўся, гледзячы на ўсё шырока раскрытымі вачыма, сцішана радаваўся доўгачаканаму збавенню пасля некалькіх сутак болю і пакут.

І ўсё-такі спакою не было: іржа трывогі не-не ды і давала аб сабе знаць, прабіваючыся час ад часу праз тоўшчу нетрывалай абыякавасці, поўніла свядомасць адчуваннем прыкрай непатрэбнасці і адзіноты. Што за невядомая хвароба пазбаўляе яго моцы, адбірае энергію і волю? Што за дзікунская сіла выбівае са звыклае паўсядзённасці, прымушае рабіць тое, што ніводзін нармальны чалавек не стане рабіць ні за якія грошы?

Ён счакаў, пакуль схлыне з тратуара апошняя хваля гледачоў, цешачыся бязлюддзем, няспешна і паважна, як бусел на поплаве, прайшоў колькі разоў узад-уперад па дрыготкім мосце. Удалечыні, у цэнтры горада, бушаваў фестываль: раўлі дынамікі, гулі сірэны, высвечвалі абімжэлае нябеснае прадонне магутныя пражэктары. То быў перадапошні акорд.

* * *

У нядзелю фестываль скончыўся. Змоўклі мікрафоны. Непрыкметна параз'язджаліся госці. Вулкі і плошчы на вачах спусцелі, зрабіліся сумнымі і панылымі. Горад зноў зажыў звыклым сваім, санлівым жыццём, спакваля ачомваўся ад перажытага ўзруху. Зноў усё стала, як было заўсёды, і толькі засмечаныя больш звычайнага тратуары ды нястомныя дворнічыхі, што з раніцы снавалі па іх з венікамі і мётламі, напаміналі пра нядаўняе свята. Вярталіся да сябе і гараджане: зручна ўладкаваўшыся пасля работы ля тэлевізара, старанна вытручвалі за нетаропкаю размоваю налёт фестывальнай раскаванасці і легкадумнасці.

* * *

У панядзелак, як заўсёды, Васіль Сцяпанавіч Дзівак вяртаўся а шостай гадзіне са сваёй змены. Седзячы ля акна ў пярэднім вагоне, ён з задавальненнем думаў пра тое, як уваліцца ў кватэру, спехам перахапіўшы тое-сёе са стравы, падасца ў парк ці якое-небудзь іншае глухое месца, далей ад натоўпу, будзе доўга, ажно пакуль не загудуць ад стомы ногі, блукаць па бязлюдных, аднаму яму вядомых завулках, цешыцца адзінотай. Як гэта ўсё-такі цудоўна – быць вольным!

Трамвай узехаў на мост, сцішыўшы ход, павольна, як сляпы на пераходзе, папоўз уперад. Васіль Сцяпанавіч зірнуў уніз і страпянуўся ад нечаканасці: пудзіла, якое ён так старанна выводзіў на пяску два дні таму, не было. Ні пінжака, ні штаноў, ні ярмолкі – нічога не засталося на беразе, апроч глыбокіх няроўных слядоў, што пятлістаю дарожкай вялі праз увесь пляж ад краю вады да лазняку.

«Ото неспадзяванка, – падумаў інжынер. – Паглядзець, ці што?» Ён выйшаў на прыпынку з трамвая, вярнуўся тратуарам назад, да моста. Трымаючыся аберуч за кустоўе, спусціўся ўніз.

Пусты пляж нагадваў сметнік. Прыпарушаныя зжоўклым лісцем бутэлькі, кучы паперы, банкі з-пад кансерваў – усё тут было, апроч таго, што больш за ўсё карцела ўбачыць. Васіль Сцяпанавіч старанна абшнарыў некалькі разоў кусцікі навокал, нават пакорпаўся ў пяску, але дарэмна: пудзіла знікла.

Адчуванне абыякавасці і спакою зноў ахапіла інжынера. Ён лёг на пясок побач з камлюкаватаю лазінаю, што адзінока высілася якраз пасярод пляжа, сашчапіў пад патыліцаю рукі. «Вось каб заўжды гэтак было, як зараз, – падумаў ціхамірна, заплюшчваючы вочы. – Як добра: ні мітусні, ні беганіны, ні людзей...»

Прачнуўся ён ад нейкага незразумелага грукату ўверсе. Усхапіўся з месца і не паверыў вачам: з трамваяў, што спыніліся на мосце, сыпаў, як спелы гарох са струкоў, народ, шугаў уніз, суцэльнаю страхавітаю лавай насоўваўся на пляж.

Васіль Сцяпанавіч скінуў чаравікі, абдзіраючы аб ажыннік рукі і твар, подбегам кінуўся ўверх, да процілеглага ад трамвайнае лініі схілу гары. Што ім тут трэба ўсім, што яны хочуць ад яго зараз, калі ягоная душа гэтак прагне адзіноты?

Ён ускараскаўся па адхоне на пагорак, азірнуўся: натоўп імкліва набліжаўся да пляжа. Паперадзе ўсіх, размахваючы, як сцягам, хусткаю, бегла Зіна.

www.kamunikat.org

# ПЕКЛЫ

Маленькая гэтая, утульная вёсачка яшчэ здалёк прывабіла іх сваёю маляўнічасцю. Абкружаная з трох бакоў старым разгалістым сасоннікам, яна нечакана вывернулася з-за высакаватага пагорка, заіскрылася на сонцы вузкімі, аздобленымі рознакаляровымі аканіцамі шыбамі.

– Бакшы, – сказала адна са студэнтак. Яна была тутэйшая і хоць афіцыйна ў групу па зборы дыялекталагічнага матэрыялу не ўваходзіла, ахвотна вадзіла аднакурснікаў па наваколлі.

Першых старых, мужчыну гадоў пад семдзесят пяць і гэткую ж немаладую жанчыну, спаткалі на самым уваходзе, ля першай хаты. Мужчына шчапаў дровы, жанчына корпалася ў градах. Абое, нягледзячы на гарачыню, былі цёпла апранутыя.

– Мы з інстытута, гэта студэнты, а я аспірант, кіраўнік іхні, – павітаўшыся, сказаў Герман. – Гаворкі запісваем, дык ці не маглі б вы нам сёе-тое расказаць?

– Гаворкі? – падазрона пазіраючы на незнаёмых людзей, сказаў стары. – А нашто вам гэта?

– Кнігу збіраемся пісаць, – коратка, каб не марнаваць час на тлумачэнні, адказаў ён.

– Ого, кнігу! – хмыкнуў гаспадар і хітануў галавою ў бок жанчыны. – З ей гаварыце.

Кабета падышла бліжэй. З ёю дамовіцца аказалася значна прасцей, чым з мужчынам. І праз колькі хвілін сядзелі на бэльках пад дрэвам, запісвалі аповяд пра тое, як даўней жаніліся. Скончылася тым, што і мужчына ўзахвоціўся што-нішто расказаць. Калі і ён сціх, на касеце дыктафона заставалася плёнкі недзе на чвэрць гадзіны.

– Вунака да Тэські схадзіце, – адказала на Германава запытанне, ці ёсць тут яшчэ старыя, кабета і паказала на другі канец нешырокай, пабітай конскімі капытамі і коламі рэдаляў вуліцы.

Тэсьчына хата, неабшаляваная, са старога цёмнага бярвення, уразіла Германа адсутнасцю гародчыка. Пэўна, ён дзесьці быў, але недзе за будынкамі. Тут жа, перад уваходам у сені, рассцілалася аж да бліжэйшага кустоўя вялізная пожня.

На іхні стук на панадворак выйшла жвавая кабета, зусім, як падалося Герману, старая, у квяцістым стракатым халаце і гэткай жа квяцістай хустцы. Прытрымліваючы ўказальным пальцам левай рукі павека над левым вокам, яна павольна сышла з ганка, асцярожліва наблізілася да чужых людзей.

– Нехажалыя нейкія, – сказала, не адымаючы пальца ад вока.

Герман збольшага растлумачыў ёй мэту іхняга прыходу. Старая аказалася жанчынай кемлівай і пагаварыць згадзілася лёгка.

– Раскажыце, бабуля, як моліцеся, – папрасіла адна з дзяўчат, ці не знарок стараючыся скіраваць размову падалей ад абрыдлых за колькі дзён згадак пра вайну ды перыпетыі калгаснага жыцця.

– Молімся, анягож, – сказала гаспадыня і адняла нарэшце палец ад павека. Тое адразу абʼехала ўніз, на зрэнку, і амаль закрыла ўсё вока. – Ну, так... У будзень дзень ружанец мовім па хатах, кажан сам сабою. У нядзёлю ў касцёл ідзём. Там імша, ксёндз навуку кажаць. Паспавядаешся, кумунію возьмеш. А як жа! Мне восемдзесят чатыры, збірацца на той свет пара, во і сам раз. Як яно там ёсці, нікому няведама, а гатовіцца нада. – Яна хвіліну памаўчала, затым, быццам што ўспомніўшы, рэзка павярнулася тварам да Германа. – Вы мне во што скажыце... Мяне матка малую катахізмаў па-польску вучыла. Дык у польскіх малітвах скрозь – пеклы... Гэта кругі такія, праз іх нябожчыкава душа павінна прайсці. Іх многа, кругоў. У адным чалавечак папячэцца, у другім, у трэцім... Цяперака ксёндз у нас малады, па-беларуску моліцца. Дык ён не «пеклы», а «пекла» кажаць. Бытта адно яно. Чаго так?

– Гэтага, бабуля, мы не ведаем, – заспеты знянацку, сказаў Герман і, дастаўшы з кішэні пачак з цыгарэтамі, накіраваўся воддаль – пакурыць. Хоць амаль усе дзеўкі ў групе, здагадваўся, цішком палілі, кепскага прыкладу падаваць не хацелася. Да таго ж і прыкрага адчування няёмкасці перад імі, што не змог адказаць на пытанне няграматнай сялянкі, як найхутчэй хацелася пазбавіцца.

Не паспеў ён адысціся ад хаты і з паўсотні крокаў, як адтуль пачулася гамана. Ён азірнуўся: другакурсніцы, пакінуўшы старую адну, гуртам беглі на пожні, а паперадзе іх, пятляючы ўбакі, кульгавіла маладое зайчаня. Адкуль яно тут узялося, было незразумела, хутчэй за ўсё выбегла з зарасніку, да людзей, ратуючыся ад якога-небудзь драпежніка.

– Бабуля, вы гаварыце! – крыкнула адна з дзяўчат жанчыне і паказала на кінуты пасярод услона дыктафон. – Гаварыце, ён уключаны.

Герман хацеў вярнуцца назад, да старой, але перадумаў. Хай пагамоніць адна, можа, так яшчэ лепшы атрымаецца запіс.

Тым часам заяц сігануў у хмыз, і студэнткі, пагалёкаўшы колькі хвілін ля кустоўя ў яго пошуках, пабрылі да хаты.

Калі і Герман вярнуўся да іх, яны збіраліся адыходзіць. Касета была запісаная цалкам, і больш рабіць у Бакшах не было чаго.

Вярнуўшыся ў інтэрнат, у якім каторыя суткі жылі са згоды знаёмага дырэктара школы, як толькі паабедалі, адразу заселі апрацоўваць запісанае. Герман круціў касету, дзяўчаты выпісвалі словы на карткі. Характэрных для тутэйшых мясцін выразаў было шмат, але многія даводзілася апускаць, бо яны ўжо сустракаліся ў папярэдніх запісах.

Апошнім слухалі аповяд Тэські.

«...Смерці – не, не баюся, – казала яна пасля паўзы – той самай, калі кінулі яе адну, ганяючыся па пожні за зайцам. – Адно страшна, каб, як памру, не звязлі куды. Манька, сістра, грaзіцца. А мне тутака нада. ...Тутака ўнук у міне пахаваны. Дваццаць гадкоў было, як бандзюгі павешалі. Мы легкавуху яму справілі, за яе і павешалі, каб забраць. У гайку, на бярэзіне... Думала па першасці, усё, капцы будуць, не вытрываю. Вытрывала. Праўда, падупала. Вока само пачало закрывацца, дактары кажуць – з нэрву. Аліна, дачка, мальцава матка, не вытрывала. Два гады пахадзіла чорная і памёрла. Тожа тут, на нашым магільніку, пахаваная. Нізашто ляглі. Цяжка. Каторага разу лягу спаць, а сон ня йдзець. Усё яны ў вачох, як жывыя. Тады ўстану і хаджу, хаджу, як дурная. Тады знова лягу... І знова ня сплю. І так кажан дзень. Пеклы адны. Нашто мне тыя восемдзесят чатыры гады, каб да такога дажыць».

Маналог абарваўся. Герман зірнуў на дзяўчат, тыя сядзелі, бы скамянелыя. Тэсьчына споведзь, бачна было, ашаламіла іх не менш, чым яго самога.

– Скончым заўтра, – сказаў ён і выключыў дыктафон.

Усю ноч ён, уражаны аповядам старой, не мог заснуць. І з самага вечара, і потым, калі дзяўчаты пабеглі ў клуб на вечарыну, усё круціўся на спружыністым інтэрнацкім ложку, думаў адно і тое.

Некалькі разоў сон ужо нібыта і адольваў яго, але ў апошнюю хвіліну перад вачыма паўставаў маршчыністы, з паўзачыненымі павекамі твар старой, і пакуты пачыналіся нанова. Як яна яшчэ жыве з гэткаю трагедыяй? Але больш за ўсё вярэдзіла душу зняверанасць жанчыны, яе словы «нашто мне тыя восемдзесят чатыры былі...» Хацелася яе неяк падтрымаць, падбадзёрыць. Але як? Словам? Ці значыць яно што-небудзь для яе пасля ўсяго перажытага?

Калі ён урэшце заснуў, прымроілася і зусім страшнае: віселья, а на ёй чалавек. Потым сон перарваўся, бо вярнуліся з клуба студэнткі і нарабілі сваім прыходам вэрхалу. І болей Герман не заснуў ажно да раніцы. Двойчы выходзіў на двор ганяць мясцовых падшыванцаў, што стукалі ў вокны. А як толькі развіднела, апрануўся і, загадаўшы дзяўчатам самастойна даапрацаваць пачатую напярэдадні касету, памчаўся напрасткі, полем, у накірунку Бакшаў.

Ля першай хаты, той самай, дзе ўчора запісвалі жанчыну і мужчыну, заспеў дождж. Герман хіснуўся пад бліжэйшае дрэва. Але лівень аказаўся занадта моцны, і яму нічога не заставалася, як шукаць паратунку ад яго ў хаце.

– А, вы, – сказала, выходзячы на ягоны стук у сені, гаспадыня, – знова да нас? Ці не забыліся што?

– Забыўся, – зманіў ён. – У той суседкі вашай, у Тэські.

– Яна ў хаце, нядаўна тэпала, відалася. Бедная баба – такое перажыць...

– Не дзе дзенецца, пераживець, – сказаў, высунуўшы галаву з дзвярэй істонкі, гаспадар. – Меней насіцца было з мальцам! Малако на губах не абсохла, а ўжо ровар, тады марцыклет, машына! Усё Валерачку!

Зласлівасць ягоных слоў і здзівіла Германа, і збянтэжыла. Як жа так: упобачкі жыць і гэтак ставіцца да суседскае бяды? Ён хацеў запярэчыць мужчыну, але ў горле ад абурэння сціснула, і ён не змог вымавіць ні слова. Так і пайшоў, ледзь толькі дождж аціх, з тым камяком у грудзях. І ўжо ідучы ўсцяж паркана да Тэсьчынай хаты, чуў, як жанчына штосьці гучна выгаворвала мужу.

Надзіва, ля суседняе сядзібы, хоць тая і знаходзілася ў некалькіх сотнях метраў ад папярэдняй, дажджу нібыта і не было. Наўкола было суха, каб табе лужына, каб кропля вады. Тэська сядзела на тым самым месцы, дзе ўчора запісвалі яе аповяд, апусціўшы галаву,

драмала. Пачуўшы Германавы крокі, яна падняла з дапамогаю пальца павека, твар яе кранула ўсмешка.

– Ты, дзяцёнак? – сказала і пасунулася ўбок, каб даць яму месца побач. – Знова ці не пытацца што будзеш? Дзе ж цацка твая?

– Няма. Я другое... Пра пеклы прыйшоў вам распавесці.

– Пра пеклы? – здзівілася яна. – Дзеля таго ляцеў? Дай ты рады!

– Вось і дайце, – Герман злёгку дакрануўся да жанчынінай рукі. – Значыць, так, слухайце. Вось па-польску пеклы, кажаце... А ў нашай, беларускай, мове пераклад з рускай прыжыўся; ад слова «ад» – у адзіночным ліку. І атрымалася пекла, таксама у адзіночным. Тое, што па-польску пеклам і называецца, у рускай кругамі завецца. Выраз такі ёсць: «круги ада». – Ён стараўся гаварыць як найменш блытана, але ці зразумее яго старая, упэўнены не быў.

Але яна, здаецца, зразумела.

– Цяперака ясна мне, – сказала, калі ён скончыў тлумачыць. – Дзякуй за навуку. – І, счакаўшы хвіліну, неяк быццам неўпапад дадала: – Я не хачу ў пеклы.

– Вы і не трапіце туды, – паспяшаўся запэўніць яе Герман.

– А не скажы, – запярэчыла жанчына. – Затым яна нахінулася бліжэй да Германа, ціха, як апавядаючы найвялікшую таямніцу, зашаптала: – Ёсці адно... Як мне хто дрэннае зробіць, і я пра тое дазнаюся – усё, памрэць чалавек. Гэта я ўжо даўно замеціўшы, не адзін раз спраўджвалася. Як што, так і памрэць.

– У тым няма вашай віны, – сказаў ён. – Гэта ж не вы забіваеце. Думкаю нельга забіць.

– Ого, нельга! Можна, і яшчэ як. Нячысцік падсуклеціць чалавека дрэннае думаць, во і смерць. Не глядзі, што з табой я добрая. Добрая – бо і ты добры. А з дрэннымі я саўсім не так гавару. Ім так кажу, як благое зробяць: няхай у вас тое будзець, што мне зробілі. Во так, дзяцёнак. О і не пападзі ў тыя пеклы пасля гэдакіх слоў.

– Вы не пападзеце.

– А то йшчэ во, – не зважаючы на Германавы словы, працягвала старая. – Нічога дрэннага не зробіш чалавеку, а ён ваўком да цябе. Ні з таго, ні з сяго, без дай прычыны. Во хош бы суседзі некаторыя... Я не кажу нічога ім, а ўсё віджу. І дзе ж стрываеш, каб нядобрае што не падумаць. І зноўака грэх.

Яна змоўкла, застыла на месцы, бы нежывая. Герман хацеў зноў загаварыць да яе, але не асмеліўся. Што ён мае сказаць з таго, што яна не ведае?

Ды як толькі ён варухнуўся, каб падняцца з услона і пайсці, як старая тут жа ажыла.

– Во скажы ты, яно ёсці на свеце, – сказала глухім голасам, быццам самой сабе. – Адзін і падумаць баіцца благое. А другі заб'еуць, і нічога яму, спіць спакойна. –І, па-ранейшаму не адымаючы рукі ад твару, толькі крыху пасунуўшы палец убок, бліжэй да скроні, дадала: – Ты не дзеля слова, малец, ішоў, міне не ашукаеш. Дзякуй табе.

– За што? – робячы выгляд, што не разумее, сказаў Герман.

– Сам знаеш. – Жанчына падалася да яго, быццам перапрашаючы, датыкнулася вольнаю рукой да ягонай далоні. – Ідзі сабе.

– Пайду. – Герман падняўся з услона, моўчкі пакрочыў пожняю да сцежкі. Параўняўшыся з беразняком, не вытрымаў, азірнуўся.

Тэська сядзела, злёгку прыгорбіўшыся, на ранейшым месцы і глядзела з-пад рукі яму ўслед.

www.kamunikat.org

# РЭФЛЕКСІЯ: СМЕРЦЬ

## Досвед

Бачу яе кожны дзень. У сне і наяве. У аўтобусе па дарозе на працу. На стадыёне. Пры дыялогу з выпадковым суразмоўцам. У тэатры. Бачу нават і тады, калі і блізка нішто пра яе не нагадвае. Падчас адпачынку на стракатым ліпеньскім лузе. Пад тугімі струменямі вады ў ванным пакоі. У звярынцы падчас экскурсіі. Бачу ўсюды незалежна ад настрою і звестак метэацэнтра. У цяжкай хадзе старога. У прытомленым, у драбнюткія, ледзь заўважныя яшчэ, зморшчыны твары жанчыны. У дачасна пасівелай скроні дужага з выгляду дзецюка. Яна як насланнё, як ідэя фікс – такая ж навязлівая, учэпістая, бесцырымонная. Я да такой ступені прызвычаіўся да яе пастаяннай прысутнасці, што кожнае яе з'яўленне выклікае ўва мне не больш эмоцый, чым, скажам, гадзіннік на руцэ ці вось гэты аркуш паперы.

Учора яна нагадала пра сябе сама меней дзесяць разоў. Так, дзесяць – менавіта гэтулькі чалавек сядзела ў чарзе да лекара. Стаіўшыся да часу ў іх хворых нырках, печані, вантробах, яна ў каго плямаю выступіла на твары, у каго бляскам вачэй прабілася вонкі, у каго слязінаю выкацілася з-пад павека па выхадзе з кабінета. Хто-ніхто з дзесяткі здолее ашукаць шчарбатую, але ненадоўга, ва ўсялякім разе не больш як на чалавечы век.

Я ашукаў сваю тры гады таму, своечасова зрабіўшы аперацыю. Урачы ажно на тыдзень даўжэй, чым звычайна пры такіх працэдурах, трымалі мяне ў бальніцы, мусіць, баяліся казаць праўду. Бо за пару дзён перад тым адзін маладзён, даведаўшыся пра свой кепскі дыягназ, спрабаваў выкінуцца з шостага паверха. Яго паспелі ўхапіць за калашыну, але пасля гэткага пярэпалаху дактары парабіліся асцярожнымі, бы той прамудры курмель. Што да мяне, дык іх перасцярога была залішняй. Сяганне з акна вышэй другога паверха

мяне ніколі не вабіла. Ёсць куды больш прыстойныя спосабы скончыць самагубствам. Напрыклад, застрэліцца. Альбо атруціцца. Апошні, праўда, спаконвеку лічыцца спосабам жаночым, але за адсутнасцю іншага ўпаўне можа прыдацца і мужчыну.

«У вас усяго пару клетак благіх было, – сказалі мне падчас выпіскі з бальніцы і, мусіць, каб канчаткова ашчаслівіць, дадалі: – Без метастазаў». Я падзякаваў за гасціннасць і папраставаў дадому – вучыцца жыць у новай, зусім іншай, чым дагэтуль, сістэме каардынат.

«Вучыцца» аказалася не так проста. Усё, што раней складала сэнс існавання, цяпер здавалася нікчэмным і неістотным. Нічога не хацелася. Людзі раздражнялі. Асабліва даймалі іх несупынныя развагі аб шчасці. Падазраю, што якраз дзеля процівагі іх неўтаймоўнай любові да жыццёвых радасцей і пачала нагадваць аб сабе яна, СМЕРЦЬ, дакладней, яе прывід.

І вось зараз я бачу гэты прывід так часта, што калі яго доўга няма, пачынаю сумаваць. А кожнае яго з'яўленне найперш успрымаю як чарговую магчымасць зрабіць сякія-такія назіранні. Паасобныя з іх я занатоўваю. Можа, гэта і цынізм, але што зробіш, калі рука міжволі цягнецца ў такія хвіліны да алоўка. Асабліва, калі людзі, не зважаючы на тое, што смерць – рэч усё-такі аб'ектыўная, насуперак прыродзе робяць усё, каб наблізіць яе прыход. У запісах тых шмат прыкладаў на гэты конт. Напрыклад, у адным згадваецца, як адзін даволі бедны чалавек вельмі хацеў пахмяліцца, але жонка не дала грошай, і ён павесіўся. У другім апавядаецца пра іншага, сярэдняга дастатку, які еў каўбасу і, добра не разжаваўшы, спрабаваў праглынуць. Кавалак трапіў «не ў тое горла», і небарака задыхнуўся. У трэцім – пра бізнесоўца з «новых»; гэты напхаў поўныя кішэні купюр і пайшоў бавіць час у рэстаран, а па дарозе яго абрабавалі і забілі. Фіксую я і выпадкі, калі людзі паміраюць ад хваробы.

Каля дзесяці год таму ад хваробы памерла мая цётка. Калі яна, схуднелая да непазнавальнасці, ляжала ў труне, дзядзька Чэсь, яе муж, які усё жыццё бязлітасна муштраваў няшчасную сваімі п'янымі выхадкамі, пастаяўшы дзеля прыліку ля нябожчыцы некалькі хвілін, падаўся ў кухню, дзе рыхтаваўся памінальны стол, і так напіўся «з гора», што не змог праводзіць жонку ў апошні шлях. Тады і зарадзілася ўва мне ўпершыню падазрэнне, якое з часам перарасло ва ўпэўненасць: ЛЮДЗІ КРАДУЦЬ АДНО Ў АДНАГО ЖЫЦЦЁ. Пазней я неаднойчы меў магчымасць у тым пераканацца.

Так, адна з сябровак маёй сястры памерла... ад грукату ў дзверы. Напярэдадні яна выпісалася з бальніцы, дзе знаходзілася пасля інфаркту, а яе трыццацігадовы сын, якому яна не хацела адчыняць, бо ён не даваў ёй спакою, патрабуючы грошай на вясёлае жыццё, так заўзята драгаўся ў хату, што аслабелае, недалечанае сэрцайка не вытрымала таго жаху, спынілася.

Ці вось яшчэ выпадак. Адзін з маіх калег усё жыццё марыў пабудаваць дачу, на якой мог бы збіраць сяброў-аднадумцаў і прыемна бавіць час. Як на тое, ягоная жонка захварэла. Паўстала дылема: альбо яе здароўе, якое, як і ўсё на свеце, патрабуе матэрыяльных выдаткаў, альбо дача. Калега выбраў другое. Пабудаваў велізарны гмах, абставіў яго. А жонка памерла. На хаўтурах у новым доме было шмат цікавых людзей. Пілі, елі. Было весела.

А ўзяць такую бяскрыўдную на першы погляд рэч, як сваркі. Дастаткова часам самай дробязнай, нязначнай, каб наш арганізм зрабіў збой у выглядзе функцыянальнага, як кажуць дактары, парушэння. Адно такое парушэнне, другое, трэцяе – і вось вам функцыянальнае перарастае ў арганічнае, і маеце хваробу. Стрэсы, што да яе прыводзяць, падчэкваюць нас усюды: у транспарце па дарозе на працу, на вуліцы, у кабінеце начальніка. Словам, месцаў, дзе людзі крадуць адно ў аднаго жыццё, так шмат, што хоць збольшага іх пералічыць заняло б, пэўна, некалькі старонак. Адны войны чаго вартыя. А «мірныя» наўмысныя забойствы!

Здараюцца, людзі падманваюць сябе: мяркуючы, быццам крадуць жыццё, на самой справе КРАДУЦЬ СМЕРЦЬ.

Так, адзін мой знаёмы любіць хваліцца, якая ў яго далікатная і ўважлівая жонка. Маўляў, штодня праводзіць уранні на працу аж да трамвая. І сапраўды, заўчора я спаткаў яе на вуліцы а восьмай гадзіне, калі яна вярталася з прыпынку дадому. «Як вы клапоціцеся пра мужа», – сказаў, успомніўшы ягоную пахвальбу. – «Што вы! – засмяялася яна. – Гэта ж я знарок выходжу разам з ім, каб пасля ў краму зайсці. Яго пакармлю чым-нічым, што з вечара застанецца, а потым, праводзіўшы на трамвай, па дарозе назад забягу ў мясны аддзел па што смачнейшае. Сасіскі вельмі люблю і вяндліну, вось і зараз купіла... Але вы, барані Бог, яму нічога не кажыце. А то ўчыніць скандал, а мне хвалявацца нельга: халестэрынавыя бляшкі ў сасудах прызналі. Пахвалюешся і няўрокам інсульт заробіш».

Зрэшты, гэтая калі і заробіць інульт, дык не ад хвалявання. Затое другая, яе равесніца, дакладна зарабіла. Муж падгульваў, а яна, як вяртаўся за поўнач дахаты, усчынала «разборку». Затым клаліся спаць. Гуляка тае ж хвіліны засынаў як забіты, а яна ўсё круцілася на ложку, не магла супакоіцца. Далей – болей, ціск стаў падскокваць. Урэшце дайшла, тыдзень таму левы бок і рука адняліся.

Абставінаў, калі пад выглядам жыцця насамрэч крадуць смерць, ані не менш, чым калі крадуць жыццё. Узяць хаця б банальную сітуацыю, звязаную з паступленнем у прэстыжную навучальную ўстанову. Якія жарсці тут кіпяць, колькі слёз, бачных і нябачных, ліецца! А між тым самыя простыя назіранні ў гэтай сферы пераконваюць: пераважная большасць абітурыентаў трапляе ў студэнты ў выніку пэўных маніпуляцый. Але ж няшчасныя тыя людзі, каму гэта ўдалося! Колькі сіл, энергіі, нервовых клетак страцяць яны, грызучы граніт непасільных навук! Як скароцяць сваё жыццё ў надзеі атрымаць запаветны дыплом! А няздольнасць пацвердзіць той дыплом наяўнасцю практычных ведаў! А пакуты сумлення, што будуць адольваць іх штодня, нагадваючы, што занялі не сваё месца! І хацеў бы, не прыдумаеш больш прамой дарогі ў магілу.

Канечне, думаць увесь час адно і тое ж, асабліва благое,– кепска. Бо на псіхіку негатыўна ўплывае. Але гэта, пэўна, у каго як. Мне, напрыклад, сузіранне кепскага дае моц глядзець на свет з гумарам. Як вось сёння на таго чыноўніка ў адной высокай установе, што псаваў усім настрой сваёй раздражнёнасцю. Варта мне было падумаць, што некалі ён памрэ, як усе яго недарэчныя выбрыкі падаліся мне нявартымі ўвагі, нават смешнымі. Так што думаць пра смерць калі і ўпадніцтва, дык карыснае.

А бачу яе, сапраўды, штодня. Бо ж, прынамсі, усё на свеце рана ці позна памірае. Трава памірае. І дрэвы. І птушкі. Добрыя намеры, ледзь нарадзіўшыся, здараецца, канаюць. І краскі найпрыгажэйшыя, і свяцілы. І ідэі – асабліва калі аб'ектыўнай неабходнасцю не падмацаваныя. Словам, усё. А яго, гэтага ўсяго, так шмат наўкола! Таму і бачыш ЯЕ кожны дзень, кожную хвіліну. І гэта няблага, мяркую. Бо бачанне прароцтву — не таму, што прадказвае, а таму, што на існаванне паводле Боскіх запаведзяў скіроўвае, — найбліжэйшы сваяк.

Вось і атрымліваецца, што смерць – зусім не вораг нам, а суддзя найлепшы і дарадца. Але да гэтага кожны сам, сваім розумам, павінен дайсці. Не хачу хваліцца, але я, здаецца, дайшоў. Уявіце,

некалі прозвішча ўласнае – Смерцеў – да нервовых колікаў ненавідзеў. А зараз, каб і прасіў хто на менш змрочнае памяняць, – нізавошта б гэтага не зрабіў.

Не, смерці не варта баяцца. Тым больш што бойся, не бойся, а яна заўсёды блізка. Дастаткова блізка, каб, як даводзіў адзін філосаф, не баяцца ЖЫЦЦЯ.

www.kamunikat.org

# НАМАЛЮЙ ВАГОН-ДРУГІ

Пасля вулічнае слаты ў доме быў рай: цёпла, суха, утульна. На падваконніках лесвічнага пралёта – кветкі, перад уваходам у ліфт і ў самім ліфце – дыванкі. Усе, хто ні трапляў сюды ўпершыню, дзівіліся: няўжо такое магчыма? Пра гэты пад’езд нездарма ведалі ўсе ў горадзе. Аднаго разу нават прыязджала тэлебачанне здымаць сюжэт для нейкай праграмы. І ўжо двойчы пісалі ў мясцовых газетах. Ніна, як і астатнія жыльцы, употайкі ганарылася сваім пад’ездам. І знарок калі-нікалі прыводзіла сяброўак, каб зірнулі на ўсё гэтае хараство. Вось і сёння яна запрасіла колішнюю аднакашніцу па тэатральнай вучэльні Анжэлу.

Анжэле пад’езд спадабаўся.

– Хораша! – дакранаючыся далонню да чысцюткай, без аніводнае плямы, сцяны, сказала яна нізкім сваім, добра пастаўленым голасам. – Ажно не верыцца, што такое можа быць.

Дзверы ў кватэру ім адчыніў Леанід, Нінін муж. Ён прывітаўся з госцяю, шоргаючы цыратавым фартухам, хіснуўся назад, у кухню, з якой даносіўся, запаўняючы ўсё жытло, пах смажаных грыбоў.

– Зараз і вячэраць будзем, – сказала Ніна і павабіла сяброўку ў залу.

– Ён займаецца гатаваннем? – міргаючы ў бок кухні, спытала тая.

– Ён.

– Прыгожы мужчына. – Анжэла, хоць і сябравалі з Нінаю ўжо колькі гадоў, раней Леаніда ніколі не бачыла. – Твар такі далікатны... як у дзеўкі.

Звыклай да камплімента ў на адрас маладзейшага за яе на восем гадоў мужа Ніне гэты, аднак, не спадабаўся. Яна дастала з шуфляды сямейны альбом, падала госці. Ледзь паспелі яго збольшага пагартаць, як Леанід паклікаў есці.

– Вы выдатны кухар, – калі здаволілі апетыт апенкамі пад белае віно, сказала Анжэла. – Не раўнуючы бы жанчына.

Ніне параўнанне зноў не спадабалася, і яна, каб неяк зарэтушаваць сяброўчыну іронію, вырашыла даць размове іншы накірунак.

– Лёня добры гаспадар, – сказала. – Ведаеш, уся гэтая чысціня ў пад'ездзе – ягоная заслуга. Ён за старшага ў нас.

– І кветкі ён разводзіць? – нібыта жартам, але з ноткаю кплівасці ў голасе, спытала Анжэла і эфектна адкінула рукою на патыліцу доўгія свае, пафарбаваныя ў нейкі неверагодны колер валасы.

– А што, калі і ён! – пачынаючы ўжо крыху злавацць, запальчыва сказала Ніна. – Мужчына ўсё мусіць умець.

– Канечне, мусіць, – пагадзілася госця. – Прабач, я нічога такога не хацела сказаць...

Вечар, аднак, быў падпсаваны. Таму, калі Анжэла недзе праз паўгадзіны сабралася адыходзіць, Ніна нават узрадавалася. Яна праводзіла сяброўку да ліфта, цмокнула ў шчаку.

– Муж твой дзіўны ўсё-ткі, – усміхаючыся, сказала на развітанне тая. – Ежу гатуе, кветкі разводзіць... Не крыўдуй, але на здымках, я заўважыла, ён усюды з маладымі хлопцамі. Ён не блакітны ў цябе часам?

– Ну ты скажаш, Анжэлка! – нервова адказала Ніна. – Мы семнаццаць гадоў разам, няўжо б я не даўмелася.

Яна хуценька праводзіла Анжэлу да выхада з пад'езда, пешкі пасунулася на свой, трэці, паверх.

Леанід мыў посуд. Гаварыць з ім пасля недарэчнай размовы з Анжэлай не было ахвоты, і Ніна накіравалася прама ў залу. Узяла пакінуты на канапе альбом, пачала гартаць.

Сапраўды, як казала сяброўка, муж амаль на ўсіх здымках быў побач з мужчынамі. «Ат, глупства, супадзенне», – падумала яна і паклала альбом у шуфляду. І тут нечакана ўспомніла заўчарашнюю неспадзяваную сустрэчу з Леанідам ля крамы ў цэнтры горада. Яна выйшла з універсама, а ён якраз спыніўся ля тратуара на працілеглым баку вуліцы. Выпусціў з салона нейкага хлопца, той пайшоў у краму, а Леанід паехаў далей. Яна хацела сказаць яму ўвечары, што бачыла яго, але за хатняю мітуснёй зусім забылася. І вось цяпер толькі ўспомніла. Той хлопец быў зусім малады, выглядаў ад сілы гадоў на пятнаццаць. Яе саракагадовы Леанід у сябрукі яму відавочна не падыходзіў. Дык няўжо Анжэлка ў самую кропку трапіла, і яе муж сапраўды блакітны?

Ад гэткіх думак Ніне зрабілася млосна. Яна легла на канапу, стараючыся супакоіцца, зможыла павекі.

Тым часам Леанід скончыў мыць посуд і некуды зазбіраўся. Ніна чула, як ён абуўся, затым зашамацела ў прыхожай ягоная новая палістыролавая куртка, якую днямі купілі з палучкі. Неўзабаве і сам ён паказаўся ў дзвярах.

– Схаджу на прагулянку, – сказаў, пазіраючы на гадзіннік.

– Схадзі сабе, – ледзь чутна вымавіла Ніна і прыкрыла твар газетаю. Наогул, яна звычайна ўмела хаваць эмоцыі, але зараз вельмі хвалявалася, таму баялася, каб, Крый Бог, не выдаць дачасна свайго падазрэння.

Леанід пайшоў.

Ніна паляжала яшчэ колькі хвілін на канапе, потым паднялася, падышла да акна.

Леанід шпарка крочыў ад пад'езда ў накірунку галоўнай вуліцы. Яна прыгадала, як ён нецярпліва зіркаў на гадзіннік, і хісткае, няяснае падазрэнне свідранула мозг. Яна апранулася, не выключыўшы святла ў прыхожай, кінулася следам за мужам на двор.

Яна нагнала Леаніда ля гандлёвых шапікаў. Хаваючыся па-за кустоўем, падкралася як мага бліжэй, стаілася ў чаканні. Да прыпынку падруліў маршрутны аўтобус. З яго выскачыў той самы малады чалавек, якога яна бачыла з мужам два дні таму. Хлопец быў у джынсах і кароткай вельветавай куртцы са скураным каўняром. Ён быў вельмі прывабны – сапраўдны прыгажун. Юнак падышоў да Леаніда, яны парукаліся, няспешна пакрочылі да бліжэйшага сквера.

Ніна колькі хвілін у здранцвенні глядзела на іх. Што гэта такое? Мусіць, праўду казала Анжэла: ёсць нешта такое у Леаніду, што выклікае падазрэнне... Хлус! Сказаў, што ідзе на шпацыр, а на самой справе... Думка, што яе свядома падманваюць, водзяць, бы дзяўчо, за нос, была асабліва невыноснай. Яе, якая за ўсё жыццё, можа, пару разоў усяго схлусіла, і то не па сваёй віне, а таму, што змусілі абставіны! Ёй здраджваюць – і з кім? З нейкім малалеткам. Іх дачка, якая зараз у турпаездцы ў Польшчы, можа, толькі на пару гадоў старэйшая за гэтага хлюста. Як яна будзе пачувацца, даведаўшыся такое пра ўласнага бацьку?

Але, нягледзячы на ўсё, недзе ў дальнім куточку свядомасці тлела і надзея. Што, як гэта проста якое-небудзь дзелавое спатканне? Таму, канечне, цяжка даць веры, ды чаго не бывае на свеце.

Яна крыху яшчэ пачакала ў сваім схове і, як толькі муж і яго спадарожнік зніклі ў глыбіні сквера, подбегам памчалася ім наўздагон.

Яны сядзелі ўпобачкі на пашэрпанай лаве пад дрэвам і ціха перагаворваліся. Леанід раз-пораз клаў хлопцу руку на плячо, і той не пратэставаў, наадварот, стараўся пасунуцца бліжэй. І, напэўна, аж вочы заплюшчваў ад задавальнення – на жаль, яны сядзелі да Ніны спінамі, і іхніх твараў яна не бачыла.

Сумненняў больш не было. Ніна выйшла з-за хмызу, не бачачы нічога перад сабою, як ашпараная кіпенем кінулася назад да аўтобуснага прыпынку.

Леанід вярнуўся дахаты даволі хутка пасля яе. Ніна толькі-толькі паспела паслаць ложак, як у прыхожай пачуліся ягоныя сцішаныя крокі.

– Ужо кладзешся? – спытаў ён, зазіраючы ў спальню.

– Галава баліць, – сказала яна, трымаючы далонь на ілбе. – Далёка дзе быў?

– Так, крыху паштурхаўся на тратуары, – адказаў муж і пайшоў у залу.

Ніна чула, як ён уключыў тэлевізар, ці не збіраўся глядзець фільм.

Заснуць, як яна сябе ні змушала, яна не магла. У галаў лезла розная непатрэбшчына і найбольш – Леанід з мужчынамі. Як яна раней не здагадалася пра ягоныя схільнасці? Але галоўнае, што ні кажы, – хлусня. Значыць, ёсць што ад яе хаваць. Зараз, бачыце, тэлевізар глядзіць! Пэўна, які-небудзь сексуальныя выбрыкі аднадумцаў смакуе. Во, гук прыглушыў, найначай, баіцца, каб яна не ўчула, што там, на тым экране... Сядзіць перад камерай які трансвестыт ды апавядае пра сваю нетрадыцыйную арыентацыю. А дурню ўцеха – як жа, не адзін ён гэткі.

Праз колькі хвілін Леанід зноў адчыніў дзверы ў спальню.

– Спіш? – спытаў ціхім голасам.

– Сплю, – прыкідваючыся соннай, адказала яна і перавярнулася тварам да сцяны.

– Тады я ў зале лягу. Цікавая тэлепраграма, дык хачу да канца даглядзець.

Ён пайшоў, а Ніна зноў засталася сам-насам са сваімі думкамі. На гэты раз, аднак, без сну ляжаць давялося нядоўга. Стомленая за дзень, збітая з панталыку падзеямі апошніх гадзін, што гэтак

бесцырымонна ўварваліся ў яе размеранае, немітуслівае існаванне, яна і не заўважыла, як заснула.

Але і снілася тое, што не давала спакою ўдзень. Леанід у лазні ў хаўрусе нейкіх маладзёнаў – усе голыя, лашчаць адно аднаго і называюць жаночымі імёнамі. Яна – у прылазніку, таксама голая, мужчыны грэбліва тыцкаюць у яе пальцамі, рагочуць. Затым яна абгортваецца прасцінай, ідзе да іх. Яны кладуцца ніцма, а яна пераходзіць у сярэдзіне круга ад аднаго да другога і, пакуль яны цалуюцца, шаруе далонямі іх рудыя, вільготныя целы. Потым яны па чарзе набліжаюцца да Леаніда, пачынаюць прызнавацца яму ў каханні. Усе яны на адзін твар – адыстар той хлопец з машыны. Яна ў роспачы крычыць, каб не чапалі яе мужа... і прачынаецца.

З залы не даносілася ні гуку.

Ніна нацягнула коўдру на галаву, згарнулася абаранкам. Але як ні намагался, больш у гэтую ноч так і не заснула.

А дзесятай уранку пазваніла Анжэла. Доўга, хвілін сем, расказвала пра паліто, якое бачыла на кірмашы і ўжо сабралася купіць, але ў апошнюю хвіліну перадумала.

– Ты на мяне учора не пакрыўдзілася? – спытала напрыканцы. – Ну, што я на мужыка твайго сказала, быццам ён блакітны.

– Не, – адказала Ніна і, развітаўшыся, паклала трубку.

Леаніда ні ў зале, ні ў ванным пакоі не было. Гэта, як ні дзіўна, Ніну не кранула. Прыбраўшы ложак, яна пасунулася ў кухню снедаць. Згатавала каву, села збоч стала тварам да акна. І тае ж хвіліны натыкнулася вачмі на надпіс на цокальнай частцы дома насупраць. «Если ты не голубой, нарисуй вагон-другой!» – заклікаў ён. Ён красаваўся тут каторы дзень, але сёння чамусьці Ніне такім смешным, як тады, калі ўбачыла яго ўпершыню, не падаўся.

Тым часам у пралёце між дальніх будынкаў двара з'явіліся дзве постаці. Ніну быццам токам працяла, ледзьве іх убачыла. Цяжка было даць веры ўласным вачам, але то былі яны, хлопец той і Леанід. Аб нечым перагаворваючыся, яны ішлі акурат да пад'езда. Ніна войкнула, апёкшы вусны і язык гарачаю кавай, кінулася прэч ад акна.

Званок коратка дзынкнуў і тут жа сціх. Ніна выйшла ў калідор, неслухмянымі ад хвалявання рукамі адчыніла цяжкую жалезную дзверыну.

– Гэта я, не палохайся, – сказаў Леанід і прапусціў наперад маладога чалавека. – Пазнаёмся, гэта...

– Навошта ты яго прывёў? – задыхаючыся ад абурэнная, крыкнула яна. – Як ты мог! Сюды, у наш дом!

– Супакойся, калі ласка, – спакойна працягваў муж. – Учора ты ўвесь вечар выглядала вельмі ўзбуджана... Я падумаў, што ты, мабыць, здагадалася, што да чаго, вось і вырашыў расставіць усё на свае месцы. Да таго ж, як-ніяк, ён мой сын, і мой абавязак...

– Сын? – Ніна на хвіліну анямела. – Што ты трызніш!

Леанід падхапіў яе пад руку, папрасіўшы ў хлопца прабачэння, павёў у кухню.

– Памятаеш, жанчына мне пісала пасля маёй паездкі ў дом адпачынку? – загаварыў хутка, азіраючыся на прыхожую, у якой застаўся госць. – Ну, тое пісьмо, што да цябе трапіла ў рукі... Нібыта яна цяжарная ад мяне... Я тады сказаў табе, што ўсё лухта, але гэта праўда была. Дык вось, Ігар сын той жанчыны... і мой.

– Твой? – нечакана для сябе самой пераходзячы ад абароны да атакі, выгукнула яна. – Адкуль ты ведаеш?

– Тэст прайшоў, вось адкуль. Ды ты не бойся, ён праездам у нас, дакучаць не будзе.

Больш заставацца ўдваіх тут, у кухні, было няёмка, і яны пайшлі назад да госця.

Тое, што хлопец аказаўся мужавым сынам, хоць і ўзрушыла Ніну, і абурыла, ды не настолькі, каб яна не змагла зараз жа, у прысутнасці чужога чалавека, даць сабе рады. Тады, атрымаўшы ліст ад хлопцавай маткі, яна, папраўдзе, як ні балюча тое было, усё-ткі паверыла ёй больш, чым Леаніду. Занадта ж няўклюдна ён выкручваўся. Яна нават падумвала падаваць на развод, але тут падышла чарга на гэтую самую кватэру... Жыць з ягонымі бацькамі ёй не хацелася, вось і давялося памірыцца. Пазней у той жа год яна двойчы адпомсціла мужу з ягонымі сябрамі і канчаткова супакоілася.

– Вып’ем па кілішку за спатканне, – калі крыху пагаманілі, сказала Ніна і прынялася накрываць стол.

За сталом сядзелі, аднак, зусім мала: хлопец спяшаўся на цягнік. Ніна знарок, каб хоць неяк падпсаваць настрой мужу, ведаючы ягоную сквапнасць, прапанавала выклікаць таксі.

Аўто прыехала праз чвэрць гадзіны.

– Ну, шчаслівенька табе, – развітваючыся з сынам, прачулым голасам казаў злёгку ахмялелы Леанід. – Як што – звяртайся. Чым змагу, памагу. – І торкнуў вадзіцелю грошы на праезд да станцыі.

Таксі павольна вырулíла з двара на праезную частку.

– Пяцёркі мнагавата, можа, – калі яно знікла за паваротам, сказаў Леанід. – Хапіла б і траяка.

– Не збяднеем, – любуючыся новымі гардзінамі на акне пляцоўкі, сказала Ніна.

Яна яшчэ крыўдавала на мужа, але хутчэй ужо не насамрэч, а так, як казаў некалі яе нябожчык бацька, – строна людскога вока. Урэшце, які гуляка ні гуляка Леанід, а не блакітны, дзякаваць Богу.

www.kamunikat.org

# КАМАР ВЕНІКІ ВЯЗАЎ

Віталь Андрэевіч суцішыўся, замёр пад коўдраю. Камар на гэты раз праляцеў так нізка над ягоным тварам, што ён, здалося, адчуў шчакою дотык крылцаў. Счакаўшы, пакуль жамярына сядзе, Віталь Андэевіч рэзка выпрастаў руку, ляпнуў сябе па лбе. І амаль адначасова шчоўкнуў другою ўключальнік таршэра. Камар, маленечкі, зусім несамавіты, разгублена папятляў колькі хвілін на святле і тут жа знік у запавуціненым праёме між ложкам і шафаю.

Тым часам загарэлася святло ў адным з вокнаў у доме насупраць. Зграбная маладзіца з ручнікам вакол галавы, размахваючы рукамі, кружылася па пакоі, нібы танцавала. Твару яе разгледзець было нельга, а вось мухабойку ў руках Віталь Андрэевіч заўважыў адразу. «Таксама ці не камар'ё дапякло», – падумаў і ўсміхнуўся: тая акалічнасць, што не аднаму яму блага, чамусьці дадала бадзёрасці.

Ягоны камар прыкметаў жыцця не падаваў. Мабыць, чакаў, стаіўшыся, калі гаспадар зноў выключыць святло.

І ён выключыў. Але не паспеў і некалькі хвілін паляжаць спакойна, трызнячы пругкімі грудзьмі студэнткі Мішчышынай, як зноў пачуў ля самага вуха працаўны манатонны піск. Камар не марудзячы спікіраваў ніжэй і нахабна куснуў Віталя Андрэевіча за голае плячо.

Грудзі студэнткі Мішчышынай здрабнелі, рассыпаліся ў друз. Віталь Андрэевіч перавярнуўся на бок, дацягнуўся рукою да ўключальніка. Напалоханы святлом камар імгненна знік у міжсценні пад дываном. Віталь Андрэевіч падхапіўся з пасцелі, пачаў абмахваць ложак і яго ваколіцы складзенаю ўдвая газетаю ў надзеі прымусіць нягодніка пераляцець на больш адкрытае месца.

Аднак камара нібы карова языком злізала.

Згубіўшы ўсялякую надзею на поспех у справе гвалтоўнай перадыслакацыі насякомага, Віталь Андрэевіч у адчаі перавёў пагляд на суседні дом. Там таксама гарэла святло, але ўжо ў іншай кватэры. Трыбухаваты дзяцюк у квяцістых трусах, накруціўшы на далонь

нейкую лашыну, са звераватым выразам твару гойсаў па пакоі ў пошуках крыўдзіцеля.

Ходзікі над тэлевізарам паказвалі палову трэцяй.

Віталь Андрэевіч шпунуў газеціну на падлогу, зноў кульнуўся ў ложак. Палова трэцяй! У восем пачынаюцца заняткі, дык як ён будзе выглядаць у аўдыторыі?

Напамін аб занятках і асабліва аб студэнтцы Мішчышынай канчаткова растрывожыў ягоны і без таго растузаны бяссоннем мозг. «Што рабіць? – задаваў ён сабе пытанне і ніяк не мог знайсці на яго адказу. Думкі, хаатычныя, бязладныя, раіліся ў галаве, не адважваючыся аформіцца ў штосьці дакладнае, патаналі адна ў адной.

Як ён усё-ткі даў маху, адчыніўшы фортку ў той час, калі ўсе наўкола спалі? У яго ў аднаго гарэла святло, вось гэты праклятты крывасмок і заляцеў на агеньчык. Злосць на камара і на самога сябе зноў ахапіла Віталя Андрэевіча. Трэба ж: выкапаць яму, каб пасля ў яе зваліцца! Зрэшты, у яго ўсё жыццё гэтак, па лініі найменшага супраціву. На трэцім курсе закахаўся ў дзяўчыну-гуцулку, а яна аказалася уніяткаю, і ягоная маці забараніла сустракацца. Пераадолеў сябе, кінуў Алесю. Дзяўчына з’ехала ў свой Ужгарад, а ён так больш нікога і не ўпадабаў. Ці яшчэ вось. Юнаком захапляўся філалогіяй, а паступіў у медыцынскі, бо бацька, тады загадчык раённага аддзела аховы здароўя, настояў. Сказаў, уладкуе без праблем, і ён згадзіўся. Як ні карцела на філфак, стаў вучыцца на лекара. У выніку – доктар, участковы эскулап. Праца – адна пісаніна і ніякае творчасці. Добра, днямі пазванілі з родненькай альма-матэр, папрасілі правесці колькі заняткаў па агульнай тэрапіі – хоць нейкае адхланне. Там, у інстытуце, дарэчы, ён, 33-гадовы халасцяк, і Мішчышыну спаткаў. Адчайная дзеўка. Першы раз уляцела ў аўдыторыю хвілін праз дзесяць пасля званка. «Што ж спазняецеся? – пачаў ушчуваць. – Вось выключаць з інстытута, тады будзеце ведаць». – «Мяне? Выключаць? – зрабіла круглыя вочы. – Дзеля таго я, філфак кінуўшы, сюды з трэцяга заходу трапіла, каб зараз выключылі? Не!» – «Дык вы на філфаку вучыліся? Я калісьці хацеў паступіць...» – «Дык чаму ж не паступілі?» – «Э-э...» – ён запнуўся, не ведаючы, што адказаць, перапыніў размову. Але сама дзяўчына так яму спадабалася, што ён знарок, каб лішні раз зірнуць на яе паставу, калі будзе вяртацца ад кафедры да свайго месца, даручыў ёй зрабіць да наступных заняткаў невялікае паведамленне.

І вось – камар, ненажэрнае стварэнне...

Недзе з паўгадзіны ён праляжаў спакойна і пачаў ужо засынаць, як раптам пачуў над вухам усё той жа знаёмы працяглы дыскант. Камар, дарэшты, відаць, згаладнелы, кружыў над чалавекам, не зважаючы на святло. Віталь Андрэевіч у роспачы скінуў з сябе коўдру, ускочыў з ложка. Нахіліўся, каб падняць з падлогі газету, але спрасонку замест яе схапіў тапорык, якім штосьці стругаў у гэты дзень на балконе і які па рассеянасці забыўся занесці на месца, у цёмны пакой. Камар тае ж хвіліны перастаў звінець, растаяў у паветры, нібы яго і не было. Віталь Андрэевіч падышоў да акна.

На двары было цёмна, толькі рэдкія аўто, праразаючы фарамі густую цямрэчу, імкліва вынырвалі з тунеля і тут жа знікалі ў бліжняй лесапасадцы.

Ён у адчаі прыхінуўся лбом да халаднаватай шыбы. Божа, калі скончыцца гэтая пакута, гэтая ноч? А як скончыцца, на каго ён будзе падобны? Апошняя думка вярнула яго да рэальнасці. Ён адарваўся ад шыбы, пачаў метадычна, сантыметр за сантыметрам, даследаваць вачамі столь пакоя. Не знайшоўшы таго, што шукаў, ліхаманкава перавёў пагляд на сцяну. Абгледзеўшы і яе і ўпэўніўшыся, што камара няма, машынальна паклаў тапорык на тумбу для абутку, зноў узяў газету, пачаў вымахваць ёю куткі па-за мэбляю.

Камара не было. Але ж ён дакладна сядзеў дзесьці побач і чакаў зручнага моманту, каб, як толькі чалавек ляжа, пра сябе нагадаць.

Зноў успыхнула святло ў доме насупраць. Віталь Андрэевіч хіснуўся назад ад акна і знерухомеў ад нечаканасці. Маладзіца з ручніком вакол галавы ляжала на канапе і старанна загортвала сябе з усіх бакоў, бы коканам, прасцінай. Ні шыі жанчыны, ні яе ног – нічога ўжо не было відно, апроч вузкай палоскі на жываце, накшталт той, што пакідаюць хірургі падчас аперацыі, ды далоні з выключальнікам. Затым святло пагасла.

Віталь Андрэевіч вярнуўся да свайго ложка. Таемныя дзеянні маладзіцы яго заінтрыгавалі. Ды не настолькі, каб прасядзець рэшту ночы зусім без сну. Але калі зноў успыхнула святло над суседнім балконам, ён не раздумваючы рынуўся да акна.

Жанчына ляжала на ранейшым месцы і выцірала анучкаю кроў на незакрытым прасцінаю лапіку цела. Дык вось што яна зрабіла: звузіла поле дзеяння насякомага да мінімуму, а потым знішчыла яго адным-адзіным жэстам! Геніяльнасць як вынаходзіцтва так ашаламіла Віталя Андрэевіча, што ён яшчэ доўга не мог варухнуцца, як зачараваны

глядзеў на жанчыну з-за гардзіны. Затым кінуўся да свайго ложка – з цвёрдым намерам зрабіць тое самае, што зрабіла яна.

Але было позна, на двары раптоўна развіднела, час быў збірацца на працу. Ды і распачынаць нанава паляванне не мела сэнсу: камар, як яго ні выманьвай, пры дзённым святле са схову не вылезе. І Віталь Андрэевіч, падакараўшы сябе за някемлівасць, пасунуўся ў ванны пакой галіцца.

* * *

Калі ён увайшоў у аўдыторыю, студэнтка Мішчышына ўжо сядзела за партаю і аб нечым размаўляла з суседкаю. Твар яе быў бледны, рухі запаволеныя, як з недасыпання. Убачыўшы Віталя Андрэевіча, яна падышла да яго.

– Прабачце, я не падрыхтавала паведамленне, – сказала, нібы незнарок датыкаючыся грудзьмі да ягонага пляча.

– Чаму? – напускаючы на сябе строгасць, спытаў ён.

– З-за камара,– адказала яна. – Дзве ночы не даваў заснуць. Але ўчора я ўрэшце яго ўпалявала. А вашы справы як?

– Мае – так сабе, – збіты з панталыку яе прызнаннем, а яшчэ больш – здагадкаю, што жанчына ў кокане і была яна, Мішчышына, і што яна бачыла, як ён гойсаў голы сярэдначы па пакоі, адказаў Віталь Андрэевіч і скрушліва дадаў: – Параілі б, як палепшыць.

– О, гэта нескладана! – Яна рашуча трасянула галавой, дастала з сумкі візітоўку. – Вось мой тэлефон, калі што – званіце. А яшчэ лепш – заходзьце, вы ж ведаеце, дзе я жыву. Пагамонім, чаю пап'ём. І галоўнае – памятайце: за камаром не ганяюцца з тапаром.

# ЗМЕСТ

## АПОВЕСЦІ

ТРОЕ

МЯЦІНА ДАЧКА

ТАМ, ДЗЕ НАЙЛЕПШ

УДОГ

ГОЛАС

БОТЫ СІНЬЁРА ПАСКУАЛІНІ

ЧАЛАВЕК З АРМЯНСКІМ ПРОЗВІШЧАМ

## АПАВЯДАННІ

ВЫПАДАК НА ЗГОНЕ ЗІМЫ

ЛЯ СХОВУ

МАНАГРАФІЯ

ШАНЦ

ПІКЕТ

МЕТАМАРФОЗА

ГОСЦЯ

ПРЫГОДА ІНЖЫНЕРА ДЗІВАКА

ПЕКЛЫ

РЭФЛЕКСІЯ: СМЕРЦЬ

НАМАЛЮЙ ВАГОН-ДРУГІ

КАМАР ВЕНІКІ ВЯЗАЎ

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год